Мінскі культурна-асветніцкі

клуб «Спадчына»

Фонд Анатоля Белага



Святлана Белая

# Яраслаўль у лёсе Максіма Багдановіча

(дакументальнае эсэ)

Мінск
2006

УДК 00
ББК 00
Б 43

**Белая Святлана**

Б 43 Яраслаўль у лёсе Максіма Багдановіча (дакументальнае эсэ) / С. Белая. – Мн.: УП «Тэхнапрынт», 2006. – 194 с.: іл.

ISBN 985-000-000-0.

Кніга пра таленавітага паэта, класіка беларускай літаратуры, публіцыста, літаратурнага крытыка, перакладчыка, пра горад Яраслаўль, які натхняў Максіма Багдановіча на стварэнне твораў пра яго радзіму – Беларусь, яраслаўскі перыяд яго жыцця, росквіт тут ягонага паэтычнага таленту і не толькі пра гэта, а і пра многае іншае расказваецца ў асобных нарысах і эсе, якія складаюць адно закончанае цэлае – мастацкі аповед пра Максіма і яго Яраславію.

Разлічана на выкладчыкаў вну, літаратуразнаўцаў, аспірантаў, студэнтаў, усіх тых, хто цікавіцца жыццём і творчасцю Максіма Багдановіча.

**УДК 00**
**ББК 00**

**ISBN 985-000-000-0**
© Белая Святлана., 2006
© Мастацкае афармленне. Нога Вадзім, 2006

*Любай матулечцы,*
*Белай Але Мікалаеўне,*
*маёй даражэнькай яраслаўчанцы,*
*прысвячаю гэтую кнігу.*

# Замест прадмовы

Культура нацыі вызначаецца ў многім адносінамі людзей да сваёй гістарычнай спадчыны. На жаль, мы на доўгі час забыліся пра тое, што гісторыя ствараецца людзьмі і што асоба – гэта не апошні складальнік гісторыі, а наадварот – асноўны. Шматлікія пакаленні людзей не валодалі дакладнай інфармацыяй аб мінулым, правам на ўласную ацэнку падзей не вельмі далёкага мінулага.

Сёння мы спрабуем прачытаць некалькі старонак нашай гісторыі і літаратуры, вывучыць больш падрабязна лёс людзей, якія жылі і тварылі ў мінулым.

Адным з такіх дзеячаў, які аказаў велізарны ўплыў на развіццё беларускай літаратуры і культуры, з’яўляецца класік беларускай літаратуры Максім Багдановіч. Яго імя непарыўна звязана з гісторыяй і літаратурай Беларусі, з пачаткам яе нацыянальнага і культурнага адраджэння ў пачатку XX стагоддзя. Максім Багдановіч належыць да тых славутых постацей, якія не толькі аб’ектыўна асэнсоўвалі гістарычную рэальнасць, але і актыўна змянялі яе аблічча.

Біяграфія кожнага чалавека пачынаецца з зямлі бацькоў, бацькавай хаты, дзе ён прыйшоў на свет Божы.

Максім Адамавіч Багдановіч нарадзіўся 9 снежня 1891 года ў Мінску ў сям’і беларускага этнографа, гісторыка культуры, мемуарыста, удзельніка рэвалюцыйна-народніцкага руху Адама Ягоравіча Багдановіча. Раннія дзіцячыя гады М. Багдановіч правёў у Гродне. У 1892–1896 гадах жыў ў Ніжнім Ноўгарадзе. З 1896 года жыў і вучыўся ў Яраслаўлі. Скончыў юрыдычны ліцэй у Яраслаўлі ў 1916 годзе і восенню пераехаў на сталае месцажыхарства ў Мінск. Непрацяглы час працаваў сакратаром Мінскай губернскай харчовай камісіі. У лютым

1917 года цяжка хворы на сухоты М. Багдановіч выехаў на лячэнне ў Ялту (Крым), дзе і памёр 25 мая 1917 года. Там, на гарадскіх могілках, у Ялце ён і быў пахаваны.

М. Багдановіч стаў рэвалюцыйным інтэлігентам, абараняючы пазбаўленага правоў прыгнечанага чалавека, родны край, «як выкляты Богам», абуджаючы ў мужыка-беларуса пачуццё чалавечай годнасці.

Творчая эвалюцыя М. Багдановіча-паэта на пераналах першага і адзінага прыжыццёвага зборніка вершаў «Вянок» вынікала са слушнага багдановічаўскага патрабавання развіцця беларускай народнай культуры.

Над Волгай, у Яраслаўлі, таварышы па вучобе ў Дзямідаўскім юрыдычным ліцэі здзіўляліся, як ён у такую пераважна сялянскага каларыту літаратуру, як беларуская, уносіць вобразы, матывы, формы старажытнагрэчаскія, рымскія, міфалагічныя, адраджэнскія. Каму гэта патрэбна, мужыку? Ён жа адаеазначна разумеў, што гэта патрэбна мужыку, народу, якія дасюль былі пасынкамі роду чалавечага! А ці ж у гэтым была справядлівасць?

М. Багдановіч упэўнена глядзеў у бязмежную далячынь, значна апярэджваючы свой час. Ён быў універсальным дзеля будучай усеабдымнасці і мастацкай адкрытасці.

М. Багдановіч падтрымліваў цесную сувязь з Яраслаўскай беларускай радай (таварыствам). Гэта рада – беларуская грамадская арганізацыя – існавала ў Яраслаўлі ў 1916–1918 гадах. Яна аб'ядноўвала бежанцаў-беларусаў першай сусветнай вайны. Яе аснову складалі выкладчыкі і слухачы Мінскага настаўніцкага інстытута У. М. Ігнатоўскі, М. І. Мароз, Х. Бурван, Х. Імшэнік, А. Кабервейн, М. С. Кахановіч, С. Курчэвіч-Сеўрук, Г. Нікіфарава, Дз. А. Сцяпура, М. Шымель, М. Ярац, святар У. Біруля. Беларуская рада ставіла на мэту згуртаванне беларусаў-бежанцаў вакол нацыянальнай ідэі, пасільнае аказанне матэрыяльнай і юрыдычнай дапамогі пацярпелым ад першай сусветай вайны, правядзенне дабрачынных акцый, культурна-асветных вечарын.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 года разам з арганізацыяй «Маладая Беларусь» яна актывізавала дзейнасць па нацыянальнаму ўсведамленню беларусаў-бежанцаў. Яны актыўна супрацоўнічалі з Яраслаўскім Саветам рабочых і салдацкіх дэпутатаў, падтрымлівалі цесную сувязь з Беларускім нацыянальным камітэтам у Мінску, Беларускай народнай грамадой у Маскве.

Яраслаўская беларуская рада дэлегавала сваіх прадстаўнікоў на Першы з'езд беларусаў-бежанцаў у Маскве ў кастрычніку 1917 года, на Усебеларускі з'езд у снежні 1917 года. Яраслаўская беларуская рада спыніла сваю дзейнасць вясной 1918 года.

Горад Яраслаўль узнік каля 1010 года пры ўпадзенні ракі Котараслі ў Волгу на месцы старажытнарускага паганскага (язычніцкага) пасялення Мядзвежы вугал, якое мясцілася ў сутоку рэк на высокім мысе – Стрэлцы. Паводле падання, якое дайшло да нашых дзён, горад заснаваў вялікі князь кіеўскі Яраслаў Мудры (978–1054), які правіў Кіеўскай Руссю ў 1019–1054 гадах. Яраслаў Мудры зарубіў тут сякераю свяшчэннага мядзведзя, якому пакланяліся жыхары пасяленння, і ў знак перамогі над ім заклаў у гэтым месцы горад і назваў яго сваім іменем. Рублены з дрэва горад займаў тэрыторыю Стрэлкі і з паўночнага захаду абмяжоўваўся Мядзвежым ровам.

У летапісах Яраслаўль упершыню згадваецца пад 1071 годам. У XI–XII стагоддзях пагранічны горад Растова-Суздальскага княства.

Ажыўленне Волжскага гандлёвага шляху ў канцы XII – пачатку XIII стагоддзяў садзейнічала росту і развіццю горада. З 1218 года – цэнтр Яраслаўскага княства. У другой палове XII стагоддзя на заходняй і паўночнай ускраінах горада Яраслаўля паўсталі магутныя фарпосты – манастыры Спаскі і Пятроўскі. Крапасныя сцены, іншыя збудаванні, жылыя дамы, цэрквы былі драўлянымі. Першыя мураваныя храмы – Успенскі сабор у яраслаўскім крамлі – пабудаваны ў 1215 годзе і Спаса-Праабражэнскі сабор, пабудаваны ў 1216–1224 гадах з прыдзельным храмам Уваходу Ісуса Хрыста ў Іерусалім, узведзены ў 1218 годзе ў Спаскім манастыры.

У сярэдзіне XIII стагоддзя Яраслаўль неаднаразова разбураны мангола-татарскімі заваёўнікамі.

З 1463 года горад у складзе Маскоўскага княства. Ядром горада ў той час быў крэмль (крэпасць) на Стрэлцы. За крамлём уздоўж узбярэжжа Волгі і Котараслі пачаў развівацца гандлёва-рамесны пасад.

З другой паловы XV стагоддзя Яраслаўль – буйны транзітны пункт Маскоўскай дзяржавы ў гандлі паміж Захадам і Усходам. У XVI стагоддзі Яраслаўль буйны гандлёвы і рамесны цэнтр Паволжа. У пачатку XVII стагоддзя ў горадзе былі створаны народныя апалчэнні – горад стаў адным з арганізатараў адпору польскім інтэрвентам. Пажар у Яраслаўлі ў 1658 годзе знішчыў амаль увесь драўляны горад, што паскорыла тут мураванае будаўніцтва. У канцы XVII стагоддзя ў горадзе было ўжо 90 мураваных пабудоў, у тым ліку 50 цэркваў, 19 мураваных будынкаў замянілі драўляныя пабудовы крамля і пасада. Тут склалася асобая яраслаўская школа дойлідства.

У XVII стагоддзі Яраслаўль лічыцца другім па значэнню горадам Расіі, буйным цэнтрам еўрапейскага гандлю з краінамі Усходу і Захаду. У ім пражывала шостая частка «гостей государевой сотни», якія прадавалі рускія тавары ў Заходнюю Еўропу і Азію, трымалі розныя канторы і лаўкі галандскія, дацкія, нямецкія і французскія гандляры. Англічанам было дазволена мець суднабудаўнічую верф, адпраўляць караблі па Волзе і Каспійскім моры ў Персію. Шырока славіліся ў той час на міжнародным гандлёвым рынку многія яраслаўскія прамысловыя вырабы, напрыклад, белае мыла, якое – па водгукам еўрапейскіх гандляроў – ніякая нацыя не магла рабіць за танейшую цану. У 1722 годзе ў Яраслаўлі заснавана Яраслаўская вялікая мануфактура.

У 1710 годзе Яраслаўль у складзе Пецярбургскай губерні, з 1727 года ў Маскоўскай губерні, у 1777 годзе цэнтр Яраслаўскага намесніцтва, з 1796 года – цэнтр Яраслаўскай губерні.

У 1790-х гадах вядомы збіральнік рускіх старажытнасцей А. І. Мусін-Пушкін набыў у былога архімандрыта Спаскага манастыра ў Яраслаўлі Іаіля Быкоўскага яго ўласную бібліятэку. Сярод іншых каштоўных кніг і рукапісаў ён знайшоў рукапіс невядомага аўтара. Гэта было «Слова аб паходзе Ігаравым» — славуты літаратурны помнік XII стагоддзя, які





прынёс сусветную славу старажытнарускаму паэтычнаму мастацтву.

Быкоўскі Іаіль, свецкае імя – Іван (30 сакавіка 1726, ёсць звесткі, што паходзіць з Беларусі – 25 жніўня 1798, Яраслаўль, пахаваны ў Толгскім манастыры), рускі духоўны дзеяч XVIII стагоддзя. Вучыўся ў Кіеўскай духоўнай акадэміі, у 1754 годзе пастрыжаны ў манахі, быў рэктарам Яраслаўскай духоўнай семінарыі, цэнзарам друкаваных выданняў, якія выходзілі ў Яраслаўскай вольнай друкарні. У 1787 годзе па старасці і хваробе выйшаў на пенсію. З імем І. Быкоўскага звязваюць пэўны перыяд гісторыі бібліятэкі Спаса-Яраслаўскага манастыра, дзе захоўваўся рукапіс «Слова аб паходзе Ігаравым», да пакупкі яго А. І. Мусіным-Пушкіным.

Да сярэдзіны XIX стагоддзя Яраслаўль быў поўнасцю адбудаваны па рэгулярнаму плану забудовы горада. Цэнтр горада перамясціўся ў пасад. На месцы ўмацаванага пасада і па набярэжнай Волгі быў разбіты гарадскі бульвар. У горадзе ўшчыльняецца забудова цэнтральных вуліц горада за кошт даходных мураваных дамоў з крамамі на першых паверхах. У 1870–1898 гадах Яраслаўль злучаны чыгункаю з Масквой, Волагдай, Кастрамой, Пецярбургам. У канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў у Яраслаўлі кіравалі рэвалюцыйным рухам Я. М. Свярдлоў, Я. М. Яраслаўскі, М. І. Падвойскі, В. Р. Мянжынскі і іншыя.

З горадам Яраслаўлем звязаны імёны вядомых дзеячоў рускай культуры: заснавальніка першага прафесіянальнага тэатра ў Расіі, акцёра Ф. Р. Волкава, рускага паэта М. А. Някрасава, паэта-дэмакрата, аўтара вядомай песні «Когда я на почте служил ямщиком» Л. Трэфелева, рускага спевака Л. В. Собінава, мастака А. К. Саўрасава, вядомага педагога К. Дз. Ушынскага і многіх іншых.

«Ярославль красоты неописанной. Всюду Волга и всюду история», – так пісаў вядомы рускі паэт, літаратурны і тэатральны крытык Апалон Аляксандравіч Грыгор'еў.

Вось у гэты старажытны з багатаю гісторыяй горад і пераехала сям'я Адама Ягоравіча Багдановіча восенню 1908 года. Тут было наканавана Максіму Багдановічу жыць 8 гадоў.

9 студзеня 1891 года – 25 мая 1917 года. Паміж гэтымі лічбамі 26 няпоўных гадоў. Столькі пражыў Максім Багдановіч – класік беларускай літаратуры. Такі кароткі перыяд жыцця нашага земляка і столькі цікавых і важных падзей у яго жыцці.

Яму не споўнілася і пяці гадоў, як ён развітаўся з Бацькаўшчынай. Волжскія краявіды доўгі час нагадвалі яму родную старонку. Але і яны не здолелі замяніць Максіму прыгажосці беларускай зямлі. Там, сярод Волжскага прастору, ён адчуваў сябе выгнаннікам і марыў толькі аб адным — аб роднай Беларусі.

З 22-х гадоў, праведзеных на чужыне, амаль восем гадоў Максім прабыў у Яраслаўлі. Гэта была самая плённая ў літаратурным плане частка яго жыцця. На яраслаўскай зямлі паэт пазнаў першае каханне і горыч стратаў. Тут ён сплёў свой паэтычны «Вянок». А ў хаце па вуліцы Любімская ўпершыню пабачыў свой адзіны прыжыццёвы зборнік вершаў «аб беднай, далёкай сваёй стране». Але Яраславія падарыла яму не толькі натхненне і настальгію па Маці-Краіне. Тут ён зразумеў: няма на свеце лепшай зямлі, чым тая, што дадзена табе Богам.

Пра таленавітага беларускага паэта, класіка нашай літаратуры, які стаіць поруч з такімі карыфеямі беларускай літаратуры, як Янка Купала, Якуб Колас, Алесь Гарун і іншымі, публіцыста, літаратурнага крытыка, перакладчыка, пра рускі горад Яраслаўль, які натхняў на стварэнне твораў пра сваю радзіму – Беларусь, пра яраслаўскі перыяд жыцця Максіма Багдановіча і не толькі пра гэта, і расказваецца ў гэтай кнізе.



# Яраслаўль у лёсе Максіма Багдановіча (Максімава Яраславія)

# Цвяток радзімы – васілёк

Сцюжа, мрок... Я ізноў хвараваты.
Ў сэрцы – думак дакучных цяжар.
Заварыць бы гарачай гарбаты,
Разагрэць бы хутчэй самавар...

«Сцюжа, мрок... Я ізноў хвараваты...», 1915–1916 гг.

Пяро выпала са слабай Максімавай рукі і павольна скацілася з коўдры на падлогу. Падняць яго Максіму не было ўжо сілаў. Ён хацеў паклікаць каго-небудзь з хатніх, але з грудзей вырваўся толькі ціхі стогн. І зноў, трэці раз за вечар, удушлівай хваляй падкаціўся пакутлівы, сухі кашаль. Разам з ім пачаўся галаўны боль. Цела стала налівацца гарачым свінцом. А на грудзі быццам бы забраўся нябачны, такі сівавусы, згорблены вадзянік. Той заўсёды прыходзіў да яго ўначы, калі ён хварэў, і сваімі халоднымі, ліпкімі, як вужака, рукамі сціскаў горла. Максім прыклаў да губ хустачку і паспрабаваў павярнуцца на бок. Сілы з кожнай хвілінай пакідалі яго. А душу, сэрца, грудзі раздзірала хвароба. Яна пачалася нечакана – напярэдадні Новага 1913 года.

...Максім ляжаў на ложку у сваім пакоі і пісаў ліст ў рэдакцыю газеты «Наша ніва». Вясёлы, звонкі голас бацькі, які пасля смерці жонкі Марыі, маці Максіма, вельмі рэдка вось так радасна і бестурботна гучаў, перабіў думку. Юнак адклаў ліст і прыслухаўся.

– Ну дзеці, – данасілася з сталовай, якая адначасова служыла і залай, і бібліятэкай, і дзіцячым пакоем, – будзем на наступным тыдні пераязджаць на новую кватэру. Мне параілі адно добрае месца. Сёння я аглядаў яго. Вельмі ўтульны дом. Вокны выходзяць на сонечны бок. Пакоі ўсе светлыя, вялікія і цёплыя. Якраз для вас, каб вы не хварэлі зімою. Перабірацца пачнем на гэтым тыдні, каб святы сустракаць на новым месцы. Ну, згодны ці не?

Малыя радасна зашчабяталі, але Аляксандра Апанасаўна, цётка Максіма, прыкрыкнула на іх, каб не шумелі так моцна.

– А на якой вуліцы ты знайшоў кватэру? – нягромка спытала яна.

Пераезд, прымеркаваны якраз пад самыя святы, калі ў гаспадыні столькі справаў, ёй здаваўся неабдуманым.

– На Любімскай. Там, дзе царква Міколы Мокрага. Гэта недалёка ад Максімавага ліцэя, – адказаў бацька і раптам успом-

ніў: – А дзе ж Максім? Зноў пайшоў у бібліятэку ці ў сваёй келлі замкнуўся?

Максім не стаў чакаць, пакуль бацька пакліча яго. Ён паклаў незакончаны ліст на пісьмовы стол і пайшоў у сталовую, дзе сабралася ўся сям'я.

– Максім, – пачаў бацька. – Ёсць прыемная навіна. Мы пераязджаем на новую кватэру. Яна даволі вялікая. Будуць асобныя пакоі і для бібліятэкі, і для гасцей. Можаш потым і сяброў сваіх да нас запрасіць. А то ты ўсё адзін ды адзін... Што ж ты маўчыш? Табе што, не цікава?

Максіму сапраўды было абыякава: ці тут, на Лясной пляцоўцы, яны будуць жыць, ці пераедуць на іншае месца. Ён ведаў, што новая кватэра не палепшыць яго ўзаемаадносінаў з сям'ёй, у якой ён адчуваў сябе апошнім часам нікому непатрэбым. Добра ведаў, што і гасцей наўрад ці ён зможа запрасіць да сябе дадому. Бо справа не ў маленькай кватэры, у якую сорамна запрасіць каго-небудзь, а ў бацькі, які так і не зарэгістраваў шлюб з Аляксандрай Апанасаўнай, роднай сястрой яго маці.

– Чаго ты маўчыш? – зноў спытаў бацька.

– Што мне казаць, калі ты ўсё вырашыў. Здаецца мне, Любімская вельмі старажытная вуліца. Калі не памыляюся, то некалі тут па загаду Пятра I пабудавалі аружэйны двор, які выпускаў стрэльбы. Але пажар знішчыў яго. І аружэйную вытворчасць больш у Яраслаўлі не аднаўлялі. Але не гэта галоўнае. Думаецца, вуліца знаходзіцца недзе на ўскраіне горада.

– Як бы не так! – запярэчыў бацька. – Табе адтуль да ліцэя нават бліжэй будзе. Тым больш, што недалёка ад дома праходзіць трамвай. У выпадку чаго, можна хутка на ім дабрацца да цэнтра. Вось пабачыш – добрае месца. Блізка ад дома народная чытальня і электрычны тэатр. Насупраць жыве добры спецыяліст – доктар Бібікаў... А галоўнае, за кватэру гаспадар просіць няшмат. Напалову менш, чым наша мадам Волкава. Так што вырашана. Пераязджаем!

Пераезды з месца на месца былі для сям'і Багдановічаў з'явай звыклай. Яраслаўль быў чацвёртым горадам пасля Мінску, Гародні, Ніжняга Ноўгарада, куды бацька перавёз сям'ю. Адам Ягоравіч трапіў сюды, дзякуючы сваёй службе, няўрымсліваму і прынцыповаму характару. З Ніжагародскага аддзялення Сялянскага банка, якому было прысвечана амаль 11 гадоў сумленнай працы, надворны саветнік Адам Ягоравіч Багдановіч перайшоў у Яраслаўскае. Пэўна, быў вымушаны зрабіць гэта не па сваёй уласнай волі, а пад націскам ніжагародскага дваранства, самага багатага





зямельнага ўласніка Верхняга Паволжа. Больш за 70 працэнтаў самых лепшых зямель губерні трымалі яны ў сваіх руках. Праўда, дзе-нідзе траплялiся ў іх уладаннях і благія надзелы. Вось іх па высокіх цэнах і задумалі прадаць найбольш кемлівыя гаспадары. Адам Ягоравіч быў чалавекам сумленным і прынцыповым. Ён і павёў барацьбу супраць гэтых злачынстваў. Але дзе там! Скупшчыкі зямель былі заўзятымі спекулянтамі, якія дзейнічалі арганізаванымі шайкамі. Праўда, на некаторы час іх рабаўніцкая дзейнасць спынілася. Але поўнасцю пакончыць са спекуляцыяй не ўдалося. Бо не паспеў Адам Ягоравіч пачаць тую справу, як на яго навалілася лавіна даносаў, скаргаў з боку раззлаваных дваран. І хаця надворны саветнік Багдановіч карыстаўся павагай і меў нагоду праз нейкія пяць-шэсць гадоў стаць адным з загадчыкаў банка, гэта не выратавала яго ад гневу губернатара горада. Прыйшлося падаваць прашэнне аб пераводзе. Губернатар, які толькі і чакаў моманту, каб пазбавіцца ад такога пільнага і прынцыповага чалавека, з радасцю задаволіў яго просьбу.

Месцам службы прызначаўся Яраслаўль – «горад белакаменны, вясёлы, прыгожы, з садамі, старажытнымі... царквамі, вежамі і брамамі, горад са сваім тварам». У ім добра развівалася сельская гаспадарка і прамысловасць. Ды і ад сталіцы Яраслаўль знаходзіўся недалёка. Звязваўся Яраслаўль з Масквой водным шляхам і чыгункай.

І вось новы пераезд, ужо ў Яраслаўлі і ўжо не першы. Дом Ржэўскага, дзе Адам Ягоравіч вырашыў зняць кватэру, быў новым. Гаспадар казаў, што пабудаваны ён у 1901 годзе і лепшага месца яны не знойдуць ва ўсім Яраслаўлі. Усё гэта мажліва і было так, калі б не адна акалічнасць. Пасярэдзіне вуліцы некалі працякала невялікая рачулка. Хаця ў пачатку XIX стагодзя «бацькі» Яраслаўля і правялі сцёкавую канаву, але гэта не вырашыла праблему. На месцы ракі засталіся сажалкі, якія вясной разліваліся па вуліцы і затаплялі ніжнія паверхі будынкаў. Таму ў дамах на Любімскай вуліцы была значная вільготнасць. Тутэйшыя жыхары ведалі пра гэта, але Адама Ягоравіча не папярэдзілі. Ён са спакойнай душой і вырашыў пераехаць сюды, не ведаючы, што тут яго сын Максім страціць сваё апошняе здароўе.

У нядзелю, 29 снежня 1912 года, сям'я Багдановічаў ад'язджала на новую кватэру. Максім займаўся бібліятэкай. Нарэшце, ён спакаваў апошні стос кніг і пачаў выносіць іх на вуліцу. Вася Ржэўскі, у бацькі якога яны здымалі кватэру, грузіў іх на сані. Але ўсе кніжкі адным разам не ўвайшлі.

– Нічога, – падбадзёрыў Максім свайго памочніка, – ты адвозь, а я пачакаю!

– Я хутка, – паабяцаў хлапец. – Праз некалькі хвілін, вось пабачыш, вярнуся.

– Добра, добра, – усміхаючыся, пагадзіўся Максім.

Яму падабаўся гэты спрытны гаспадарскі сын. Каб час прайшоў хутчэй, Максім пачаў гартаць кніжку. Раптам адтуль выпаў пажаўцелы лісток паперы. Толькі і паспеў М. Багдановіч прачытаць: «Даражэнькаму і любаму...». Почырк быў да болі знаёмы. Максім вельмі даўно бачыў яго, але дзе? Ён нагнуўся, каб падняць лісток, але вецер-баламут выхапіў яго з рук, закруціў, завярцеў, быццам бы сам хацеў прачытаць. Але, не разабраўшы дробных дрыжачых літар, падкінуў высока ўгору і панёс у няведамую бясконцую далечыню. Максім кінуўся наўздагон. Толькі дзе там! Вецер быццам бы дражніў яго. Юнак прыбавіў ходу. Шапка зляцела з яго галавы, але ён, не прыпыняючыся і нічога не заўважаючы, бег далей. Некалькі разоў ён спатыкаўся і падаў у снег. Але, нарэшце, дагнаў. Кроў ударыла ў твар, калі пачаў чытаць. Стала горача і душна. Не задумваючыся што робіць, Максім скінуў шынель. Ён не адчуваў, што мароз бярэ яго ў свае халодныя абдымкі, забірае апошняе цяпло кволых лёгкіх. У гэты момант ні на што не хацелася звяртаць увагі. Максім быў шчаслівым, бо, нарэшце, знайшоў Вадзімаў ліст, апошні братаў ліст-запавет.

– Вадзімка, родненькі, як жа цяпер мне не хапае цябе! – ціха паўтараў ён сам сабе. – Братка, даражэнькі! Божа мой, чаму ты так рана пайшоў ад нас?

Раней, калі Вадзім жыў, Максім не ўсведамляў, як горача ён яго любіў. Так, малодшы брат заўсёды браў з старэйшага прыклад. Хацеў быць такім жа ўпэўненым і непахісным. Але чамусьці тады Максім не адчуваў, што Вадзім не толькі любы брат, а быццам бы яго другая палавіна. Толькі калі яе не стала, і юнак апынуўся самнасам са сваімі цяжкімі думкамі, ён зразумеў, што згубіў.

Максім зноў і зноў перачытваў тыя некалькі радкоў, якія брат напісаў яму за дзень да смерці. Гэта была другая смерць у Максімавым жыцці. Праўда, адыход маці ён памятаў не так ясна, бо яму ішоў усяго пяты год. У памяці застаўся толькі шэры дзень, усхваляваны бацька, які бегаў па хаце, сумныя вочы доктара, што ўвесь час паўтараў: «Такая маладая і такая прыгожая...» Як і маці Вадзім згарэў ад сухотаў. Хавалі яго паспешліва, цёмнай красавіцкай ноччу. І пахавіны, як і тая зорачка, што свяціла брату ўвесь апошні яго шлях, стаіць у вачах:





Ой, скацілася зорачка, скацілася,
Ты ушла ад нас– і не прасцілася,
Не прасцілася, не развіталася,
І куды ушла – не сказалася...

«Ой, скацілася зорачка,
скацілася...», 1914–1915 гг.

Вокліч цёткі Шуры, якая ўбачала яго праз вакно і выбегла на вуліцу, прывёў Максіма ў сябе. Ён адчуў, як халоднымі крыламі б'е яго вецер. Асцярожна, каб не пагнуць ліст, ён паклаў яго ў кішэню. Стаў апранаць шынель і, нібы праз сон, глядзець, як бегла да яго Аляксандра Апанасаўна. Яна нешта крычала яму, паказвала на шапку... Ён вярнуўся да рэалій толькі тады, калі прыехаў Вася. Разам хутка пагрузілі рэшткі бібліятэкі і паехалі на новую кватэру.

Шпарка ў срэбным снежным пылу ляцелі коні. Перад вачыма плылі прыгожыя цэрквы, вуліцы, дамы, людзі. На Максімавым твары скакалі чырвоныя прамяні вячэрняй зарані. У галаве ўсё змяшалася, пературарылася ў нейкі калейдаскоп. За паваротам бліснула царква св. Іллі. Максім успомніў, як некалі ён прыходзіў сюды глядзець незвычайнай прыгажосці іканастас, зроблены майстрамі з Беларусі. Ён хацеў прыгадаць драўляныя карункі яго ўзору, але перад вачыма з'явілася адна фрэска, якая тады моцна ўразіла яго. Гэта быў збор ураджаю. Так-так, замест рэлігійнага сюжэта мастак намаляваў свята сялянскай працы. Вялікая прастора жытняга палетка, прыгожыя людзі, што працуюць на ім. Палетак зжаты чыста і застаўлены снапамі. Нябеснага колеру фарбы красуюць на ім. А можа, раслі васількі тут і раней. Не хацелі жнейкі зразаць іх, бо радавалі яны душы працавітых людзей.

І раптам уявілася Максіму: залацісты дзень, залаты палетак, загарэлыя людзі, што сцелюць жыта. А да іх, разам са святымі Пятром і Юрыям, ідзе Хрыстос. Вось бачыць ён сярод калоссяў блакітную кветку і, павучаючы спадарожнікаў, кажа: «Агляніцеся навокал! Ці ж не ніва калыхаецца каля нас? Цяжка працаваў ля яе гаспадар і вось бачыць: паміж збожжам узраслі васількі. І сказаў ён у сэрцы сваім: хлеб адбіраюць у мяне гэтыя сінія кветкі, бо поўныя вагі каласы маглі б узрасці на месцы васількоў. Але яшчэ з маленства краса іх прыйшлася мне да душы. Таму я не вырву з корнем іх, як усякае благое зелле. Няхай растуць і радуюць, як у маленстве, сэрца маё...»

– Усё, прыехалі! – пачуў Максім голас Васі. – Я дапамагу выгрузіць кнігі і паеду за Адамам Ягоравічам і Аляксандрай Апанасаўнай.

Максім увайшоў у хату. Пуста, няўтульна, мэбля паскідана абыяк. На падлозе ён знайшоў некалькі лісткоў паперы. Нераспранаючыся, сеў за стол і пачаў паспешліва запісваць тыя думкі, што прыйшлі яму ў дарозе. Ён пісаў ліхаманкава, бо баяўся, што хвароба, набліжэнне якой ён адчуваў, не дазволіць яму запісаць той голас Гасподні. «Калі скончылася сем тысяч год ад стварэння свету, Хрыстос зноў зышоў на зямлю і хадзіў па ёй, каб споўнілася тое, аб чым казалі прарокі. І хадзіў ён па ўсяму краю: і па Міншчыне, і па Віленшчыне, і па Магілёўшчыне, і па Задзвінскай зямлі. І разам з ім былі святы Пётра і святы Юрый. Але ніхто з людзей не пазнаў яго...». Максім бачыў, як Хрыстос, нешта сказаўшы людзям, пайшоў далей. Усё бліжэй і бліжэй падыходзіў ён да небасхіла. І ў момант, калі яго белы сілуэт знік з зямлі, на небе заззяла яркая знічка. Максім адчуў яе гарачыя праменні. У вачах пацямнела. Ён страціў прытомнасць і пачаў спаўзаць на падлогу. Цётка, толькі што ўвайшоўшы ў хату, падхапіла яго. Разам з бацькам перанеслі Максіма на ложак. Але Максім нічога гэтага не адчуваў. Ён быў на прыгожым вясновым лузе. Да яго шчаслівая і вясёлая бегла маці.

– Хочаш ісці са мной? – пытаецца яна.

– Матулечка, а куды мы пойдзем? – кажа ёй Максім і не пазнае свайго голасу.

– Калі прыйдзеш, сам даведаешся, – смяецца яна і цягне яго за руку.

І яны крочаць разам. Усё зіхаціць, звініць. Вакол шмат прыгожых красак, але ўсе незнаёмыя Максіму. І раптам ён заўважыў блакітны васілёк. Максім нахіліўся, каб сарваць яго і падарыць матулі, але тая глядзіць на яго вялікімі шэрымі вачыма і з сумам пытаецца: «Навошта ты гэта робіш, сынку, навошта губіш красу? Паслухай, што я табе скажу: добра быць коласам, але шчаслівы той, каму давялося быць васільком. Гэтая простая краска – сімвал радзімы беларусаў. Помні гэта, Максімка! Калі ты нарадзіўся, у цябе вочкі былі, як васілёчкі, такія ж прыгожыя, сінія. Я хачу, каб і ты, тут, на чужыне, стаў васільком, гонарам свайго народу. Я ведаю, Богам табе гэта наканавана. Любі, Максімка, красу зямную. Бо нашто на зямлі каласы, калі няма васількоў?.. Навошта хлеб, калі няма прыгажосці?..»



## «Я, бальны, бесскрыдлаты паэт»

Гэта была не скарга. І не трызненне яго гарачай галавы. То крычала змучаная душа Максіма:

Ты ночкаю калядна́й варажыла
І ў воду воск напоўправідны ліла,
Цікавячы, што выхадзіла мне:
Курганчык... белы крыжык... так, магіла!
У гэты рок я буду ўжо ў труне...

«Ты ночкаю калядна́й варажыла...», 1909–1913 гг.

Адам Ягоравіч знайшоў гэты верш выпадкова: вечарам ён зайшоў у пакой сына, каб даведацца аб яго здароўі. Максім у той момант спаў. Каля ложка на падлозе ляжаў скамечаны ліст паперы. Адам Ягоравіч падняў яго, разгарнуў... і ўсё зразумеў. Сын пісаў гэтыя радкі ў кароткую хвіліну адступлення хваробы, якая, здавалася, ніколі не адступіць. Яго запаленне лёгкіх стала выпрабаваннем для ўсіх. Максім, змучаны высокай тэмпературай і кашлем, які не даваў спаць ні яму, ні сям'і, адчуваўся, быў на апошняй мяжы адчаю. Арганізм, выматаны штоночнай працаю, тугою па Бацькаўшчыне, адзіноцтвам, не мог больш змагацца з хваробаю. А тая з кожным днём набірала ўсё большую ўладу над яго хворымі лёгкімі.

– Галоўныя лекі, – казаў сусед – доктар Бібікаў, – добрае харчаванне і спакой.

Так проста і так складана. Купляць у святочныя дні на Мытным двары мёд, малако, масла, мяса было для сям'і Багдановічаў вар'яцтвам. Цэны ў пачатку 1913 года з надыходам калядаў падскочылі, як ніколі. За збанок малака прасілі 20 капеек, за фунт масла – 60, за дзюжыну яек – 33 капейкі. Для сям'і Багдановічаў, у якой на той час было 8 чалавек і ў якой працаваў толькі бацька, – гэта было ні па кішэні. Грошай ледзь хапала на самае неабходнае. Да таго ж фінансавай дапамогі патрабаваў і сын Лёва, які вучыўся на фізіка-матэматычным факультэце Маскоўскага універсітэта.

Адам Ягоравіч перачытаў верш. У памяці ўсплыло, як за некалькі дзён памёр ад сухотаў старэйшы сын Вадзім. А такі ж моц-

ны і здаровы быў ён у дзяцінстве! Хто б мог падумаць! Вадзім вясёлы, рухавы, жвавы, быццам бы ртуць. А Максіма маці звала мямляй, таму што ён ледзь што – усё хныкаў. Таму з ім ніхто з дзяцей сябраваць не хацеў. А можа малыя не прызнавалі яго зусім па іншай прычыне? Маленькія дзеці чамусьці не даруюць тым, хто не такі, як яны, хто вылучаецца з іх агульнай кагорты. У дзяцінстве Максім, менавіта, такім незразумелым для іншых дзяцей і заставаўся. У той час талент яго драмаў. Дарослыя аб ім не здагадваліся, і толькі чыстыя дзіцячыя душы тую невытлумачаную для іх адметнасць Максіма адчувалі добра.

Праўда, потым ён быццам бы перарос сваю замкнёнасць. Хлапца, здавалася падмянілі. Ён стаў такім спрытным і вясёлым, хаця крыху спакайнейшым за аднагодкаў, але ўсё роўна душа любой кампаніі. А чытаў ён так шмат, што з ім сябравалі і старэйшыя. Калі ў час вучобы ў Ніжагародскай гімназіі пачаліся мітынгі гімназістаў, ён стаў у сваім класе арганізатарам усіх сходак і нават лідэрам анархісцкай групы. Прыклад, пэўна, падаваў Вадзім, кіраўнік моладзі. Ён належаў да партыі эсэраў, шмат чытаў забароненай літаратуры, быў цудоўным прамоўцам.

Максім жа, паводле гімназісцкай канстытуцыі, не меў права ўдзельнічаць ў сходах, на якіх збіраліся старэйшыя. Але ж яму не хацелася адставаць ад Вадзіма. Таму аднойчы ён, з'явіўшыся на чарговую сходку, сказаў гарачую прамову аб супрацоўніцтве і еднасці ўсіх гімназістаў. Але раззлаваныя слухачы сцягнулі яго са стала, на якім ён палымяна заклікаў да брацтва, і выштурхнулі за дзверы.

Але на гэтым Максім не супакоіўся. Разам з сябрам Крыловым, не без удзелу братоў Вадзіма і Лёвы, ён стаў саўдзельнікам выбуху ў гімназіі. Пад лесвіцу была падкладзена самаробная бомба, якая чамусьці пры выбуху ніякіх пашкоджанняў, акрамя разбітых шыбаў, не прынесла. Але паліцыя зацікавілася гэтай справай і пачала расследванне. Хутка высветлілася, што за некалькі хвілін да выбуху з месца здарэння знік гімназіст Дзмітрый Крылоў. Таксама стала вядома, што да вобыску ў яго на кватэры пабываў Максім Багдановіч, які, пэўна, хацеў схаваць сляды, але не паспеў. Некаторыя доказы ўсё ж засталіся. І Максіма таксама абвінавацілі ў прыналежнасці да арганізацыі выбуху. На шчасце, справу замялі хутка, хаця і не абышлося без выкліку бацькі да дырэктара. Максім, як і належала анархісту, трымаўся на допыце





смела і даволі развязна. Увесь час спрачаўся з педагагічным камітэтам. Свой удзел у падрыхтоўцы выбуху ён адмаўляў і імкнуўся выратаваць сябра. Не гледзячы на тое, што тон яго адказаў быў рэзкім і не спадабаўся многім выкладчыкам, справа не выйшла за сцены гімназіі.

Толькі перыяд бурнай рэвалюцыйнай дзейнасці хутка прайшоў. Разам з ім знікла і Максімава бестурботная вясёласць. Засталася толькі ўсмешлівасць і незвычайная натхнёнасць твара.

Вось і цяпер Максім спіць, а крышку сумная ўсмешка грае на яго неспакойных, напружаных губах.

Ад яе Адаму Ягоравічу нешта павярнулася ў сэрцы:

– Нічога сынку. Усё будзе добра. Ты ж у мяне такі моцны духам, як і твая высакародная мэта, – ціха прамовіў ён.

І, быццам бы ў адказ, пачуў стогн Максіма. Цяжкі, працяглы. Нібы нешта раздзіралася ў ягоных грудзях.

За Волгу заходзіла пурпуровае сонца. Белыя сцены пакоя сталі ружовымі. А коўдра, якая ўкрывала Максіма, – чырвонай. Здавалася, што ён ляжаў у крывавай рацэ. Раптам на твары сына загарэліся два агеньчыкі – гарачыя і такія светлыя Максімавы вочы.

– Як добра, што ты тут, – сказалі яны бацьку і паспрабавалі ўсміхнуцца.

Але замест усмешкі выбухнуў кашаль. Калі ён сціх, Максім ледзь чутна папрасіў ліст паперы і канверт.

– Навошта? Ты ж не маленькі і ведаеш, што доктар забараніў табе пісаць, – папракнуў Максіма бацька.

– Гэта ты забараняеш, а доктар казаў толькі пра спакой.

Голас у Максіма быў жаласны і танюткі. Але вочы, цёмныя сумныя вочы, глядзелі непахісна.

– Пакуль ёсць сілы, хачу напісаць пісьмо ў рэдакцыю «Нашай нівы». Трэба падзякаваць Вацлава Ластоўскага за паштоўку і клопаты аб зборніку вершаў «Вянок».

Адам Ягоравіч разумеў, што сыну цяпер ні чытаць, ні пісаць нельга. Але пярэчыць хвораму і нерваваць яго не хацеў. Моўчкі прынёс ліст паперы і ціха выйшаў.

Максім напісаў некалькі слоў і прагледзеў напісанае. Літары хісталіся ў розныя бакі. Зусім не яго почырк. Але што паробіш, калі рука так аслабла.

*«Што да выдання кніжкі, – пісаў ён, – дык бачу, што яно спыняецца галоўным чынам праз недахват грошай, але ніяк не*

*прыдумаю, як Вам дапамагчы. Сам я не зарабляю, у бацькі прасіць, дык ён многа даць не можа, бо жыве ад 20-га да 20-га, да таго-ж і вінен шмат каму. Але вось што: калі я ачуняю, дык паспрабую заняць пад кніжку ў розных сваіх знаёмых грошы. Значыцца, прадасца колькі сот экзэмпляраў яе, вы мне надашлёце тыя грошы. Другое, Вы мне не шліце аўтарскіх экзэмпляраў, я іх куплю і куплю шмат.*

*Калі вам тыя займы здадуцца прыдатнымі, дык напішыце мне.*

*Максім».*

Ён ужо скончыў ліст, калі ўспомніў пра верш, які спалохаў бацьку. Падумаўшы, зрабіў прыпіску: *«R. S. Я напісаў колькі новых вершаў. Ачуняю – надышлю».* Паклаў пісьмо ў канверт, напісаў адрас рэдакцыі «Нашай нівы» і раптам, нібы маланка, пранеслася думка: ён жа можа сабраць грошы, адкладаючы дзякло за артыкулы. Некалькі яго зацемак ужо друкавалася ў газеце «Голос», і ён ведаў, колькі можна атрымаць нават за невялікі артыкул.

Тое, што Максім вырашыў супрацоўнічаць з яраслаўскай газетай «Голос», дзіўнага нічога не было. Яна лічылася адной з самых дэмакратычных і прэстыжных выданняў у Яраслаўскай губерні. Яе выдаўцом быў пляменнік паэта Мікалая Някрасава – Канстанцін Някрасаў. Не гледзячы на дваранскае паходжанне, за свае погляды ён быў вядомым у горадзе ліberalам. Быў ён аматарам літаратуры і душэўным чалавекам. Усю маёмасць, якая засталася яму ў спадчыну пасля смерці маці, Някрасаў патраціў на выдавецтва: добрую, але дарагую і зусім недаходную ў камерцыі справу. Галоўным рэдактарам газеты запрасіў вядомага ў горадзе журналіста М. П. Дружыніна. Той, хаця і належаў да кадэцкай партыі, па перакананню быў дэмакратам і мог прапусціць у нумар матэрыялы, якія моцна перахіствалі ўлева супраць кадэтаў. Часамі, пад яго кіраўніцтвам у «Голосе» праходзілі артыкулы, якія пярэчылі ліберальнаму напрамку газеты. Таму цэнзар неаднойчы штрафаваў газету на вялікую суму грошай. Сам рэдактар арыштоўваўся, але кірунку «Голоса» не мяняў.

Супрацоўнікамі газеты былі журналісты, якія раней працавалі ў вядомых расійскіх выданнях: «Северный край», «Речь», «Вестник». Многія з іх за сваю дзейнасць і ідэі сядзелі за кратамі, некаторыя пабывалі ў ссылцы. У «Голос» іх прыцягнуў дэмакратычны ўхіл газеты.

Канстанцін Някрасаў друкаваў не толькі газету, але і кнігі, мастацкі часопіс «София», шыкоўныя альбомы вершаў. Але выдавецкая дзейнасць прыносіла яму толькі страты. Таму ў 1915 годзе ён прадаў газету супрацоўнікам «Голоса», а сам пераехаў у Маскву, куды і перанёс сваё выдавецтва. (У ім, між іншым, пазней і выйшлі брашуры Максіма Багдановіча «Червонная Русь», «Братья-чехи»).





Максіму ўспомніўся яго першы прыход у газету. Ён толькі што паступіў ў Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй і пад уражаннем падзей, якія адбываліся ў яго Alma mater, напісаў невялікую нататку.

...Стаяла позняя восень 1911 года. З раніцы крапіў дождж. Максім ужо некалькі разоў абыйшоў вялікі двухпавярховы будынак на Духаўскай вуліцы і не мог рашыцца ўвайсці ў сярэдзіну. Нарэшце ён адчыніў масіўныя дубовыя дзверы і... апынуўся ў цішыні. У рэдакцыі нікога не было. Хацеў ужо вяртацца, але нечакана заўважыў яшчэ дзверы. Пастукаў і пачуў: «Уваходзце».

У кабінеце сядзеў малады мужчына з прывабным тварам і з шчырай усмешкай сініх вачэй. Апрануты быў густоўна, але шырокія, грубыя далоні выдавалі сялянскае паходжанне. Ён з цікавасцю глядзеў на маладога чалавека ў вільготным ад восеньскага дажджу плашчы, з-пад якога выглядала новенькая ліцэйсцкая тужурка з бліскучымі гузікамі.

– Серж Кан, – чамусьці сваім псеўданімам назваўся журналіст, – Чым магу быць карысным?

Прыемная гаворка, шчырая ўсмешка схілялі да размовы. Максім проста без усялякай сарамлівасці расказаў Сержу, што ён студэнт Дзямідаўскага юрыдычнага ліцэю, захапляецца літаратурай. Піша вершы, апавяданні. І хацей бы супрацоўнічаць з газетай.

– Цудоўна, – адказаў Каныгін. – Маладыя людзі, здольныя да літаратуры, нам патрэбны. Можа Вы што-небудзь прынеслі з сабою? Разам бы і паглядзелі.

Максім працягнуў ліст паперы, спісаны дробнымі літарамі. Гэта была невялікая нататка пра ліцэй. Серж прафесійна хутка прачытаў яе і падбадзёрыў Максіма, які крыху хваляваўся:

– Вельмі добра напісана. Думаю, што рэдактар хутка надрукуе Ваш матэрыял. Ён павінен прыйсці пазней. Гэта я сёння спяшаюся дадому, таму рана прыйшоў на працу. Астатнія з'явяцца праз гадзіну – дзве. Вы можаце пачакаць іх. Але лепш прыходзце да мяне на наступным тыдні. І абавязкова прынясіце свае апавяданні.

Праз некалькі дзён 26 кастрычніка 1911 года ў газеце «Голос» на трэцяй бачынцы з'явілася невялікая нататка Максіма Багда-

новіча «У ліцэі». Як і большасць хранікальных зацемак, што змяшчаліся ў газеце, яна была без подпісу. Але Максім быў задаволены. На наступным тыдні ён зноў прыйшоў у рэдакцыю. Кан сустрэў яго, як добрага знаёмага. Ён усяго на 13 гадоў быў старэйшы за Максіма, але розніца ва ўзросце не стала перашкодаю для іх сяброўства.

– А ты ведаеш, – неяк, успамінаючы іх першую сустрэчу, сказаў Каныгін, – я таксама не адразу рашыўся прыйсці ў рэдакцыю «Голоса», хаця ўжо і друкаваўся ў газеце «Северный край». Дапамог выпадак. Знаёмы патаемна ад мяне аднёс мой фельетон у рэдакцыю. А калі яго надрукавалі, прымусіў пайсці на размову з рэдактарам. Той ужо недзе чуў маё імя і жадаў пазнаёміцца. Пасля сустрэчы рэдактар М. П. Дружынін прапанаваў мне застацца ў газеце. З таго часу я і працую тут. Думаю, і ты з цягам часу зможаш знайсці працу ў «Голосе». Таленавіты ты, браце, ды і працаўнік вялікі. Адчуваецца, ты штодзень займаешся літаратурнай працай. А я, братка, цяпер яе закінуў, часу зусім няма. Хаця раней часта ў часопісах друкаваліся мае апавяданні.

– Вось таму я і не хачу быць прафесійным журналістам. І мой вам, Серж, савет: кіньце газету, яна знясіліць вас, а ў белетрысты вы знойдзеце славу.

– Не, Максім, не змагу я так проста развітацца з газетай. Звыкся так, што і нялёгкі журналісцкі хлеб мне ў радасць. А падругое, дзе я яшчэ знайду іншы, звязаны з літаратурнай дзейнасцю кавалак хлеба? Буду працаваць, пакуль хопіць моцы. А табе раю: будуць патрэбны грошы, прыходзь у рэдакцыю. Тут ты заўсёды зможаш зарабіць пару рублёў на свае патрэбы.

Максім успомніў савет Кана і на душы стала весялей. Нейкая цёплая хваля расплылася па целу. Трэба, не марудзячы, брацца за працу. Аб чым толькі напісаць у газету? Зрабіць рэцэнзію на новую кніжку або....

Думаць далей ужо не хапіла моцы. Нібы вычарпаўшы ўсе сілы, апусціліся вейкі. Пачаўся кашаль. Усё паплыло перад вачыма. Зноў падняўся жар...

Рэдкая для зімы яркая зараніца дагарала ў марозным небе.



# «Шмат у нашым жыцці ёсць дарог»

Жар трымаўся амаль чатыры месяцы, Максім не ўставаў. Ніхто акрамя хатніх і доктара не наведваў хворага. А ўначы да яго зноў прыходзілі маці, Вадзім. Аднекуль здалёк ляцела ў срэбранай збруі Старадаўняя Літоўская Пагоня... Прыходзіў дзень. Сонца заглядала ў яго пакой і начныя цені-прывіды знікалі. Максім купаўся ў пяшчотных сонечных праменнях, і на нейкі момант сілы вярталіся да яго. Тады ён даставаў схаваны ад бацькі аловак і пісаў. Максім працаваў над кнігай і вельмі хацеў паспець скончыць яе. Ён пісаў пакуль хапала сілаў. Потым зноў упадаў у забыццё. Начныя жахі чаргаваліся з цеплынёй сонца, блакітам неба, з надзеяй на папраўку. І вера перамагла. Трызненні адступалі. Яны з'яўляліся ўсё радзей.

Пачало прыходзіць узбуджэнне. І як ніколі раней – жаданне працаваць. Максім пісаў ужо адкрыта, не хаваючыся ад бацькі. Ён зразумеў, што толькі вершы выратуюць яго. Бо,

...Няма горш бяды,
Як рыдаць ні з чаго, –
Без надзей і нуды,
У мяне шмат бяды.

Гэтыя словы П. Верлена часта прыходзілі яму на памяць у час хваробы. І, нарэшце, яна адступіла.

...Раніцай Максім прачнуўся і адчуў такі прыліў сіл, што ўстаў з ложка. Праз акно ўбачыў край узыходзячага сонца. Зямля пералівалася ўсімі колерамі і весяліла душу. Тады ён узяў пяро і напісаў у рэдакцыю «Нашай нівы».

*«Дабрыдзень!*

*Вось ужо колькі дзён, як у мяне жару няма. На што я хварэў, чорт яго ведае, але думаюць, што на васпаленне лёгкіх; два разы рабілі бактэрыялагічны агляд харкавіны ды адзін раз крыві, і кажуць, быццам нічога не знайшлі. Уставаць з ложка дасюль яшчэ няможна. Бацька атрымаў ад банка падмогу на лячэнне, так што я напэўне летам куды-небудзь паеду.*

*Украінцы дасюль не заплацілі мне за пераклад з беларускага на расійскі. Напісаў ім, каб яны выслалі грошы да Вас. Ці атрымалі? Гэта на зборнічак.*

*Карэктуру пасылайце мне на кварціру, а не на ліцэй, бо адтуль я цяпер нічога атрымліваць не здолею.*

*Максім.*
*27/IV 1913 р.*

**P. S.** *Пасылаў Коршу на 70-цілецце павіншаванне па-беларуску (звычайна, ад свайго імені). Ці пасылалі Вы?*»

Максім скончыў і задумаўся. Бачыў праз акно, як пайшоў на працу бацька. Потым цётка Шура з дзецьмі пакрочыла на Мытны двор за прадуктамі. Дзень быў незвычайны, сонечны блакіт неба клікаў да сябе. І тады ён не вытрымаў. Максім ведаў, што гэта вар'яцтва, але інакш ён не мог. За 4 месяцы хваробы без паветра, горада, сяброў ён настолькі засумаваў, што не мог больш усядзець у сваім пакоі.

Выйшаў на вуліцу. Удыхнуў у поўныя грудзі свежага ветрыка, што прыемна дзьмуў у твар, і адчуў, як з вачэй пакаціліся слёзы. *«Ці ж не мінулае маленства, згадаўшыся, і ўсхвалявала... грудзі, выціснула слёзы з вачэй? Можа і яно. А мо тое чыстае, мяккае паветра, што ціха шчакатала хілыя лёгкія, забіраючыся ў самыя далёкія, ужо адвыкшыя дыхаць, куткі; тая ўсё напаўняючая светласць, каторая п'яніла вочы; тая бяскрайняя хваля ясных калёраў і зыкаў, што лілася праз яго істэрычную душу, уздымала яе і з салодкім болем прakраnывалася да чуткіх пасля хваробы нерваў? Хто скажа? Невядома з чаго, але перапоўнілася душа яго, і чуццё, успляснуўшы за край, вылілася праз слёзы».* («Вясной». М. Багдановіч).

Божа мой, як добра! Сонца, неба, трава, птушкі – хацелася спяваць ад радасці. Не, ён не пойдзе цяпер у сваю камору...

Максім крочыў па вясенняй зямлі, «успаёнай растануўшым снегам, поўнай жыццёвых сокаў, каторыя так і выпіралі з яе, наліваючы кожную гібкую галіну, кожны ярка-зялёны сцебель». Ён ішоў да былога Спаса – Праабражэнскага манастыра.

Гэта было, мабыць, самае прыгожае месца ў Яраслаўлі. Магутныя сцены абрамлялі белакаменныя вежы, на якіх некалі размяшчаліся вартавыя вышкі, прыгожую святую браму. За ёю ўзнімаліся саборы. Іх залатыя купалы ззялі на сонцы, быццам шаломы магутных воінаў, што сталі на бяссменную варту. І над усімі імі ўзвышалася званіца.





Максім заўважыў яе ў першы ж дзень прыезду ў Яраслаўль. Потым ён напісаў у сваім апавяданні «Шаман»: «На высокім, змрочным берагу чорным зломам падымалася званіца». Такой яна прадстала яму ўпершыню. Цяпер жа званіца іншая. Белакаменная, высокая, урачыстая. Сонца адбіваецца ў яе званах, у іх мілагучных галасах, што зберагаюць згадкі манастыра.

Адзін з паважанейшых Максімам настаўнікаў Яраслаўскай гімназіі – Парфірый Мізінаў– расказваў, што манастыр, які з 1787 года ператварыўся ў рэзідэнцыю Яраслаўскіх архіепіскапаў, быў заснаваны ў канцы XII стагоддзя. Доўгі час ён быў адным з буйнейшых ў Маскоўскай дзяржаве. Тут захоўваліся зброя, дзяржаўная казна і дзяржаўныя тайны. У манастыр ссылаліся апальныя вольнадумцы і няўрымслівыя праўдашукальнікі. Потым, калі ў канцы XVI стагоддзя пабудавалі мураваныя сцены і вежы, манастыр стаў хаваць і дзяржаўных асоб. Нават Іван Жахлівы хаваўся тут, калі ў 1517 годзе войска крымскага хана Гірэя падыйшло да Масквы.

Але самыя вялікія таямніцы хавала манастырская рызніца, у якой ва ўсе часы захоўваліся старадрукі. У ёй і знайшоў яраслаўскі памешчык, даследчык расійскіх старажытнасцей граф А. І. Мусін-Пушкін зборнік са «Словам аб паходзе Ігаравым». У 1792 годзе (па некаторых крыніцах у 1795 годзе) ён набыў яго ў архімандрыта манастыра Іаіля Быкоўскага. А ў 1800 годзе апублікаваў тэкст і пераклад «Слова аб паходзе Ігаравым».

Максім яшчэ ў дзяцінстве пазнаёміўся з гэтым помнікам славянскай культуры. То была адна з першых кніжак самастойна ім прачытаная. Гераічны эпас надоўга запаў у яго ўражлівую душу. Асабліва запамяталіся два паданні. Адно пра князя Ізяслава, які «пазваніў мячамі аб шаломы літоўскія... а сам, ізрублены, пад чырвонымі шчытамі, на крывавай траве, усхапіў на гэтае ложка славу і прамовіў: «Дружыну тваю, княжа, скрыдлы птах прыадзелі і звяры кроў палізалі».

У другой казцы-песні апавядалася пра князя Ўсяслава, што «атварыў вароты Ноўгарада, расшыб славу Яраслававу і datаркнуўся кап'ём да залатога трону Кіеўскага». Ужо потым, у яраслаўскай гімназіі, рыхтуючыся да рэферату для літаратурнага гуртка, Максім захапіўся вобразамі і параўнаннямі, якія сустрэў у «Слове аб паходзе Ігаравым». «Толькі народ, – разважаў Мак-

сім, – усімі думкамі, усім рухам жыцця свайго прыкуты да хлебаробства, мог апісаць бітву ў такіх словах: «На Нямізе снапы сцелюць галавамі, малоцяць цапамі харалужнымі, на таку жыццё кладуць, веюць душу ад цела. Нямігі крывавыя берагі не збожжам былі па сеяны – пасеяны касцямі рускіх сыноў».

Настаўнік Мізінаў, вядомы яраслаўскі калекцыянер рукапісаў і старажытных кніг (у яго бібліятэцы налічвалася больш за паўтары тысячы рэдкіх экзэмпляраў), аднойчы павёў сваіх гімназістаў у рызніцу былога манастыра. Максім быў у захапленні ад той экскурсіі. Нарэшце, ён глытнуў «*як сіняваты дым нявідзімых кадзіл*» прыгожы, лёгкі пыл стардрукаў, адчуў пах манастырскага жыцця. *«Тут ціша, тут спакой – ні шуму, ні клапот».* Тут цяжкія псалтыры, пакрытыя няжорсткай бурай кожай. Некалі тут ішла нетаропкая праца. Летапісец, годны веры сведак, пісаў «*...Што тут чынілася ў даўнія гады, Што думалі, чаго жадалі мы тады, За што змагаліся, як баранілі веру...»*

А яшчэ Максім вынес з манастыра для сябе адну згадку. Мізінаў сказаў, што Быкоўскі паходзіў аднекуль з захаду Расійскай дзяржавы. Усе кнігі, якія набыў у яго А. І. Мусін-Пушкін, ён прынёс з сабой. Заходняй часткай Расіі ў тыя часы была Беларусь. Выходзіла, Быкоўскі, «*душой стаміўшыся ў жыццёвых цяжкіх бурах*», прыйшоў канчаць свой век у манастырскіх мурах Спаса-Праабражэнскага манастыра, менавіта, з Беларусі. І «Слова» тады ён прынёс адтуль. Значыць... значыць, «Слова аб паходзе Ігаравым» доўгі час знаходзілася на Максімавай Бацькаўшчыне. А можа і напісана яно было там?

Гэтая думка доўгі час непакоіла Максіма. І, быць можа, пад яе ўражаннем ён аднойчы напісаў у чыстым аркушы паперы «Песню пра князя Ізяслава Полацкага»:

Ізяслаў-князь, сын Васількоў,
Даўнымі часамі
Аб літоўскія шаломы
Пазваніў мячамі;
Адняў славу ён ў сваго
Дзеда, у Ўсяслава,
І улёгся нерухома
На траве крывавай
Пад чырвовнымі сваімі





Роднымі шчытамі,
Ўвесь іссечаны, ізбіты
Ворагаў мячамі.
Усхапіў ён тую славу
І прад смерцю кажа:
«Скрыдлы птах тваю дружыну
Прыадзелі, княжа,
І звяры кроў пalізалі...»
У баі крывавым
Не было ні Ўсеваладa,
Ані Брачыслава,
Ураніў самотна з цела
Ён душу ўдалую
Цераз пацерку на шыі,
Цераз залатую.
Засмуцілася вясёласць,
Песні замаўкаюць,
І жалобна, сумна трубы
У Гародні граюць.

Максім прыгадаў гэта, ідучы па набярэжнай Волгі. Трава мякка паддавалася пад нагамі. «*Незлічонымі, нявідзімымі воку дзірачкамі дыхалі маладыя, шчэ не запыленыя лісцікі дзярэўяў, а пад імі на зямлі былі кінуты лахмоцці ценяў, хаваўшых чыстае золата, каторае ясна блішчэла праз кожную іх дзіру*». Ззялі купалы сабораў, адбівалі час званы манастыра. Каля Сямёнаўскага спуску ён звярнуў улева. То быў яго любімы маршрут: ад Спаскага манастыра да гімназіі.

Светлы трохпавярховы будынак мужчынскай гімназіі вылучаўся ад іншых на Сямёнаўскім пляцы бездакорнасцю класічных формаў. Але нейкім холадам цягнула ад яго мураваных сцен. Такім стылым быў ён і ў сярэдзіне. Строгі распарадак, зубрэнне і ніякага вальнадумства.

Калі Максім ужо скончыў гімназію, у адным з нумароў яраслаўскай газеты «Голас» ён прачытаў правілы паводзінаў вучняў, выкладзеныя дырэктарам вучылішчаў Яраслаўскай губерні ў 1835 годзе. У іх значылася, што навучэнцы павінны заўсёды мець страх Божы. Кніг, якія не належалі да выкладаемых навук, зусім не чы-

тацць. А тыя, што тычыліся свяшчэннага пісання, толькі пасля пісьмовага дазволу інспектара. Вечарам у адным месцы вучням не дазвалялася схадзіцца ні пад якой падставай, нават для сумеснай падрыхтоўкі заняткаў. Каб выйсці за горад, у лес, патрабаваўся асабісты дазвол дырэктара. На шчасце, у гады вучобы Максіма тыя парадкі адмянілі. Гімназія вярнулася да тых прагрэсіўных асноў, якія закладваліся ў першыя гады яе існавання.

А заснавальнікамі былі прафесары Маскоўскага універсітэта. Менавіта яны адабралі ў жніўні 1805 года на экзаменах 50 самых падрыхтаваных юнакоў. Выкладчыкаў падбіралі таксама старанна. Гэта былі людзі перадавых поглядаў. Таму нядзіўным было і тое, што на лекцыях гаворка ішла не толькі аб навуковых законах і адкрыццях, але выказваліся смелыя погляды на літаратуру, тэатральныя пастаноўкі Яраслаўскага тэатра і, нават, на парадкі, якія існавалі ў царскай Расіі. Якраз гэта і не спадабалася імператару Аляксандру I, які ў 1823 годзе наведаў гімназію. Ён застаўся незадаволены станам справаў, аб чым і паведаміў дырэктару і інспектару гімназіі. Тыя, перапужаныя, пачалі выпраўляць становішча. Адразу паменшылася колкасць гадзінаў, адведзеных на вывучэнне матэматыкі, фізікі, гісторыі. Палітычную эканомію наогул выключылі з праграмы. А вось часу на старажытнакласічныя мовы, наадварот, павялічылі. Амаль кожны дзень у раскладзе заняткаў стаялі латынь або грэчаская мовы. Потым да іх далучылі і царкоўнаславянскую мову. А тут без зубрэння ніяк не абыйсціся.

Прасякнутая вернападданніцкім духам, гімназія згубіла свой прагрэсіўны характар, што спадабалася імператару Мікалаю I, які праз восем гадоў пасля свайго папярэдніка, наведаў яе. Ён пабачыў строгасць, паслухмянства, беспярэчнае выкананне загадаў выкладчыкаў і дырэктара. Усё, як і належала быць узорнай гімназіі яго імператарскай светласці. У выніку гэтага прыезду гімназія хутка набыла новы статут. Ён стаў больш вышэйшым. Разам з ім змяніўся і тэрмін навучання. Ужо не чатыры, а восем гадоў пакутавалі вучні. Адзінае, што давала гімназія, дык гэта права паступлення ва ўсе універсітэты Расійскай імперыі.

Але, як кажуць, час лепшы лекар. Хутка наказы імператараў забылі, і гімназія стала самай звычайнай: з непаслухмянымі, але кемлівымі вучнямі, і добрымі, усё разумеючымі выкладчыкамі. І адразу гімназія набыла славу. Сапраўды, ёй было чым ганарыцца. У 1832–1837 гадах тут займаўся вядомы расійскі паэт Мікалай Някрасаў. У 1881–1890 гадах славуты оперны спявак Леанід Со-





бінаў. Атрымалася, што вучыліся яны ў розных будынках гімназіі. У Яраслаўлі іх так і называлі: някрасаўскі і собінаўскі.

Максіму Багдановічу давялося хадзіць у трэці, новы будынак гімназіі. Яго збудавалі на сродкі земства ў 1901 годзе. Калі Максім упершыню ўвайшоў у яго, ні ён сам, ніхто наогул нават і не здагадваліся, што гэты русавалосы з блакітымі вачыма хлапец, сціплы і сарамлівы ў прысутнасці незнаёмых людзей, будзе гонарам і легендай трэцяй гімназіі, што праз 48 гадоў на яе будынку з'явіцца мемарыяльная дошка:

ЗДЕСЬ, В БЫВШЕЙ
МУЖСКОЙ ГИМНАЗИИ,
В 1908–1911 ГОДАХ
УЧИЛСЯ ИЗВЕСТНЫЙ
БЕЛОРУССКИЙ ПОЭТ
МАКСИМ
БОГДАНОВИЧ

Максіму гімназія падабалася перш за ўсё сваімі настаўнікамі. Асабліва запалі ў душу два выкладчыкі: Уладзімір Белавусаў, класны настаўнік і лацініст і Парфірый Мізінаў, кіраўнік літаратурнага гуртка і гімназісцкага тэатру, славіст, гісторык і географ.

Уладзімір Белавусаў ведаў некалькі моваў, цікавіўся літаратурай і мастацкімі перакладамі. Цудоўны меў ён і характар. То быў вельмі добры, чулы чалавек. Трохі летуценнік, узвышаная натура, якому чорная рэчаіснасць не давала перадыху. Свае сумныя думкі ён спрабаваў схаваць у віне. Але, нават ведаючы гэтую слабінку настаўніка, вучні паважалі яго. Складаны ўрок латыні ён ператвараў у цікавы аповяд. Настаўнік мог адказаць на любое пытанне па літаратуры і мовазнаўству. Акрамя таго, ніколі не ставіў дрэнных адзнак (а гэта так любяць вучні!). Калі Белавусаў даведаўся, што Максім піша вершы і наогул займаецца літаратурай, ён параіў яму больш углыбленна вывучаць грэчаскую, італьянскую і французскую мовы. А потым, убачыўшы зацікаўленасць Максіма, стаў кіраваць яго заняткамі. Настаўнік увесь час паўтараў, што літаратуру лепш ведаць у арыгіналах, чым у перакладах. Максім, пад яго ўплывам настолькі захапіўся мовамі, што пачаў перакладаць на беларускую мову Генрыха Гэйне, Верлена, Гарацыя, Верхарна. Ён марыў вывучыць акрамя заходнееўрапейскіх усе славянскія мовы. «*Беларусы павінны быць знаёмы з мовамі*

*славянскіх народаў. І беларусам гэтае лягчэй даецца»,* – лічыў ён. *У свабодны ад заняткаў час ён чытаў Евангелле і яго пераклады. Займаўся чэшскай і сербскай мовамі. Пазней, калі ўжо скончыў гімназію, думаў вывучыць польскую. У адным з лістоў у рэдакцыю «Нашай нівы» ён прасіў, каб яму выслалі кнігу Л. Васілеўскага «Літва і Беларусь», а таксама польска-расійскі слоўнік. «Па Васілеўскаму я і хачу вучыцца. Маю надзею, што за лета здолею-такі яго прачытаць»*, – пісаў Максім сваім сябрам.

Другім настаўнікам, які аказаў на Максіма Багдановіча моцны ўплыў, быў Парфірый Мізінаў. Калісьці ён сам вучыўся ў Яраслаўскай мужчынскай гімназіі і ўсе «радасці» яе жыцця пазнаў на сабе. Пасля заканчэння гімназіі з залатым медалём, ён паступіў у Маскоўскі універсітэт на гісторыка-філалагічны факультэт. А калі скончыў яго, пайшоў працаваць настаўнікам у тую ж Яраслаўскую мужчынскую гімназію, Пэўна, што праца не магла задаволіць гэтага адукаванага чалавека з надзвычай шырокім светапоглядам. Дванаццаць гадоў ён чытаў публічныя лекцыі пад агульнай назвай «Гісторыя і паэзія»: «Пушкін, як гістарычны белетрыст», «Рускія за мяжой у XVII стагоддзі», «І. А. Ганчароў і яго галоўныя творы», «Пушкін – сын стагоддзя». Потым гэтыя гістарычна-літаратурныя лекцыі-нарысы ўвайшлі ў яго зборнік аб паэзіі. Другой навуковай працай П. Мізінава стала кніга «З мінулага Яраслаўскай мужчынскай гімназіі», якую ён напісаў на падставе сваіх архіўных знаходак.

Максім быў у захапленні ад Парфірыя Мізінава, свайго старэйшага сябра і дарадчыка. На яго ўроках не патрабавалася зубрыць. Не бяздумнае завучванне спісу імёнаў і прозвішчаў, лічбаў і падзей патрабаваў ён ад сваіх вучняў, а стройнае ўяўленне аб законах гістарычнага развіцця народаў і дзяржавы, аб іх узаемных уплывах. Падабалася і тое, што Мізінаў ніколі не хаваў сваіх дэмакратычных поглядаў. Калі хто-небудзь з гімназістаў пачынаў па падручніку хваліць манархічны лад, ён заўсёды імкнуўся перавесці гэта выступленне ў іншы кірунак. Безумоўна, такому чалавеку дырэкцыя гімназіі шмат у чым перашкаджала. Неаднойчы яна выказвала сваё незадавальненне літаратурным гуртком старшакласнікаў. На яго пасяджэннях разглядаліся пытанні класічнай літаратуры, абмяркоўвалася новая паэзія, сучасныя літаратурныя плыні.

Максім наведваў гурток пастаянна. Часамі чытаў рэфераты. Не гледзячы на тое, што ён прысвяціў сябе вывучэнню беларусіцы, па многіх пытаннях расійскай літаратуры ён быў больш дасведчаны, чым іншыя аматары гуртка. Яго даклады заўсёды здзіўлялі слухачоў сваёй глыбінёй і трапнасцю назіранняў. Максім знаёміў гурткоўцаў з апошнімі павевамі ў літаратуры, выказваў свой погляд на прыгажосць твораў, мастацкае майстэрства Л. М. Талстога, А. С. Пушкіна, М. Ю. Лермантава. Думкі яго былі даволі смелыя, часам рызыкоўныя. Максім наогул любіў спрачацца, прычым атрымоўвалася ў яго гэта вельмі эмацыянальна. Ён размахваў рукамі, жэстыкуліраваў, гарачыўся.





Адна спрэчка разгарэлася на гуртку з-за Лермантава. Мізінаў чамусьці не ўспрымаў яго паэзію сурьёзна і лічыў, што сумныя вобразы лермантаўскіх вершаў – гэта даніна модзе. Такое меркаванне склалася ў яго пасля знаёмства з успамінамі нейкай сучасніцы паэта, якая не пашкадавала чорных фарбаў, апісваючы асабістае жыццё Лермантава. Максім жа лічыў, што вартасць паэта вызначаецца не наяўнасцю ўспамінаў, якія да таго ж выклікаюць сумненні, а тым, якую спадчыну пакінуў ён нашчадкам. Бо, не гледзячы на кароткае жыццё, дараванае лёсам, Лермантаў напісаў па-сапраўднаму цудоўныя творы. У іх багата такога, што зрабілася радасцю жыцця для многіх людзей. І таму яны з пачуцём жывой удзячнасці ўспамінаюць гэтага геніяльнага, але адзінокага, на самога сябе пакінутага чалавека.

Лермантаў быў, як месяц, адзінокі. Гэта Максім адчуваў сэрцам. Аднойчы, пры чытанні томіка вершаў, яго ўразіла рэдкасная, амаль непарушаемая аднароднасць лермантаўскіх эпітэтаў. Амаль у кожным вершы ён знаходзіў «халодны розум», «магільную цемру», «злобы атруту», «крывавую клятву», «адскія слёзы». Максім уважліва прыглядаўся да яго тропаў, эпітэтаў і раптам яму пачало здавацца, што ўся кніжка напоўнена толькі імі. Пад уражаннем нечаканага адкрыцця ён пачаў праглядаць тамы акадэмічных выданняў. І перад ім зноў пачалі праходзіць доўгім ланцужком знаёмыя вобразы: «лёсавыя буры», «нябёсная гарачыня», «халодны погляд», «сардэчная атрута», «атрута пакут». Ён адчуў, што сумныя вобразы напаўняюць усю спадчыну паэта. Максім бачыў, як білася адзінокая душа Лермантава ў коле розных хваляванняў, якія ператварылі ягоную творчасць у нейкі «паўтор пройдзенага». Якім вялікім было адзіноцтва Лермантава і наколькі моцны яе ўплыў, што нават вялікая сіла талента не здолела зламаць яе. Максіма Багдановіча гэта вельмі ўразіла!

Як Максім Багдановіч тонка разумеў паэта! Яму, таксама рана асірацеламу, пачуццё адзіноты было добра вядома. Асабліва ўзмацнялася яно, калі ён хварэў і нікуды не выходзіў. Кола падзей тады звужалася і дзень здаваўся доўгім-доўгім. Адчувалася, як сумным натоўпам праходзяць у яго галаве надакучлівыя вобразы, круцяцца неадчэпныя, ужо тысячу разоў передуманыя думкі. Яны прыходзілі ўчора. І зноў прыйдуць заўтра. Максім не аднойчы разважаў, што патрэбна, каб даць імпульс такому застыламу жыццю? Шукаць новыя сродкі для прымянення сваёй сілы? Абагаціць жыццё свежымі ўражаннямі? Але гэтага якраз і няма ў адзінокага чалавека. І таму вяртаецца ён ужо на знаёмыя шляхі, узнімаецца ў неба на аблокі сваіх летуценняў. Думае, марыць аб тым жа, як і раней.

У яго душы нарастае сум, які гняце яго і тады нават не дапамагаюць любімыя кнігі, музыка, творы мастацтва. Патрэбна жывая, чулая душа. Але ў Максіма такога чалавека, хто б мог развеяць яго жахлівы сум адзіноты, цёмныя хмары змрочных дум, ужо не было. Памерлі маці і Вадзім, разышліся кожны сваёй дарогай гімназісцкія сябры, настала доўгае растанне з Аняй.



# «Ўчора шчасце толькі глянула нясмела»

Аня ўвайшла ў яго жыццё нечакана. Вось так жа, пасля навальніцы, якая разарве сваімі стрэламі чорнае неба, раптам успыхне над горадам вясёлка, і адроджаная зямля запахне палын-травою.

...Максім прабудзіўся разам з сонцам. Нечакана адчуў, што дзень будзе незвычайны. Шчаслівая ўсмешка расплылася на ягоным твары. Сёння ён чытае на літаратурным гуртку даклад пра беларускую літаратуру

У хаце ціха. Чутна, як на суседнім ложку спакойна пасапвае Лёва. Максім ціхенька, каб не пабудзіць брата, прайшоў босы да стала. Узяў зборнік Янкі Купалы і зноў прылёг. З «Жалейкі» ён і пачне свой агляд. Праўда, трэба будзе падкрэсліць, што гэта не самы ўдалы том Купалы, бо шмат у ім яшчэ шурпатых вершаў, што амаль зусім зліваюцца з тагачасным слоям беларускай паэзіі. Толькі ці можна вінаваціць Янку Купалу за тое, што пісаліся тыя вершы пад Францішка Багушэвіча? Што з'яўляліся яны найчасцей перапевамі толькі некалькіх тэмаў? Безумоўна, не. Бо Янка Купала, таксама як і ён, поўнасцю захоплены вобразамі роднай Беларусі. І яго цікавіць больш сама з'ява, а не як, у якую форму выліваюцца думкі. Але што ні кажы, як дробязна не прыглядайся, а Янка Купала будзіць душы чытачоў. Максім адчуў гэта на сабе. Вершы, напісаныя на беларускай мове, нібыта пераліваюцца з шчырага сэрца паэта ў тваю душу. І ўжо ў першым зборніку адчуваецца вялікі талент Янкі Купалы. Яго «Жалейка» сваім мастацкім словам гучна апавясціла ўсяму свету, што беларусы ёсць, што падняліся яны на вялікую барацьбу за свабоду і роўнасць, што яны, як і ўсе, хочуць «людзьмі звацца». А гэта не можа не захапляць!

Максім адклаў кніжку і задумаўся, што яшчэ трэба ўзяць з сабой у гімназію. Даклад быў напісаны даўно, але ўчора, калі ён пераглядаў яго, падумалася: для слухачоў больш карысным будзе пачуць вершы-галасы беларускіх паэтаў, чым агляд іхняй творчасці. Таму ён абавязкова прачытае на гуртку купалаўскія «Жніво», «Адгукніся, душа». Буйны, шпаркі рытм вершаў павінен захапіць слухачоў, загіпнатызаваць іх.

А вось які ўзяць яму зборнік Якуба Коласа? Той жа на працягу чатырох гадоў не зрабіў значнага кроку ўперад. І ў самых

апошніх вершах спявае аб тым жа, што і ў пачатку сваёй творчасці. Тэм у Якуба Коласа няшмат: бедныя краявіды роднага краю, доля беларускага народа, турэмныя думкі і жыццё на волі. Не збіцца тут на старое амаль немагчыма. Таму ў Якуба Коласа паўтараецца не толькі агульны змест вершаў, але і асобныя фразы, вобразы. Але, усё роўна, ягоныя вершы нікога не пакінуць абыякавым. Трэба будзе пакласці з сабою кніжку «Песні жальбы». Яна выглядае больш цэлай па светапогляду, роднымі па зместу здаюцца яе вершы. Так, не забыцца б пра Алеся Гаруна, Гальяша Леўчыка і Канстанцыю Буйло. Добра б было прачытаць па 2–3 творы кожнага аўтара. Але ці паспее ён за гадзіну, адведзеную для даклада? Хацелася б пазнаёміць гурткоўцаў і з беларускай прозай. Вунь на стале які стос кніг ляжыць. Тут і бойкія казкі-апавяданні Ядвігіна Ш., і драмы Каруся Каганца, і апавяданні Алеся Гурло, Янкі Окліча, Якуба Коласа. Хоць і невялікія гэтыя здабыткі, але без іх нельга паказаць агульны рост беларускай пісьменнасці.

Максім разважаў, не заўважаючы, што ў доме ўсе прачнуліся. Пачаў тупаць у суседнім пакоі бацька, збіраючыся на працу. Загудзеў самавар, які паставіла Аляксандра Апанасаўна. Сонечнае святло зрабіла хату ўтульнай, унесла ў ранішнюю мітусню нейкі прыўзняты настрой. Нават бацька, які ў апошні час рэдка быў вясёлы зранку, нешта спяваў за сценкай. Раптам песня абарвалася і пачулася:

– Максім, Лёва! У гімназію будзеце сёння збірацца або думаеце ляжаць да апошняй хвіліны ў ложку?

Усё, трэба ўставаць. А то можна і не паспець. Багдановічы здымалі кватэры заўсёды недалёка ад гімназіі. Толькі браты ўсё роўна часцяком прыбягалі ў клас за некалькі хвілін да пачатку заняткаў. Так атрымалася і на гэты раз.

Першы ўрок – Закон Божы. За ім арыфетыка. Прадмет не з любімых. Лёва яго не разумее. Ён гадзінамі можа займацца матэматыкай і рашаць складаныя задачы, якія змяшчаюць спецыяльныя навуковыя часопісы. Бацька хоча, каб Лёва паступаў у Маскоўскі універсітэт. Але меншы брат, які мае незвычайны матэматычны талент і якому ўсе дакладныя навукі даюцца лёгка, асабліва не дбае пра будучыню. Яму пакуль што ўсё роўна. А вось Максім ужо вырашыў свой далейшы шлях. Ён хоча прысвяціць сябе беларускай філалогіі. І сённяшні даклад – гэта адзін крок да запаветнай мэты.





Задачы не выходзяць. Усе думкі аб выступленні. Як перадаць у невялічкім аглядзе ўсю прыгажосць твораў беларускіх аўтараў? Як зачараваць сяброў іх талентам? Вельмі хочацца, каб і яны адчулі самабытнасць яго роднай літаратуры.

...Праз некалькі гадзінаў усе хваляванні, трывогі – усё шчасліва мінула. Максім хацеў скончыць свой даклад вершам Янкі Купалы «А хто там ідзе?». Але не паспеў прачытаць: «А чаго ж, чаго захацелася ім, Пагарджаным век, ім, глухім, сляпым? – Людзьмі звацца», – як з усіх бакоў пачулася: «Чытай яшчэ, працягвай далей!»

І ён, расчырванеўшыся ад хвалявання, стаў дэкламаваць вершы без перапынку. Максім быў па-сапраўднаму горды за беларускую літаратуру і яе паэтаў. Тады ж ён упершыню адважыўся прачытаць перад гурткоўцамі свае творы.

Выступленне Максіма спадабалася ўсім. А сябра Дзябольскі папрасіў прынесці яму пару зборнікаў беларускіх аўтараў.

– Прыходзь сёння да мяне вечарам. Разам пойдзем на канцэрт.

– Які канцэрт? – здзіўлена запытаў Максім. – Нічога не чуў.

– Я сам, браце, сёння ўпершыню ад Рафаіла Какуева даведаўся – аб'яваў я нідзе не бачыў. Але Рафаіл сказаў, што ў Яраслаўлі сёння праездам адзін нейкі дужа вядомы скрыпач з Польшчы. Адзіны канцэрт прызначаны на вечар. Адбудзецца ў нашай гімназічнай залі. Так што прыходзь да мяне а шостай гадзіне. І не забудзь, калі ласка, пра беларускія кніжкі.

Сябры развіталіся на нейкі час. Дзябольскі спяшаўся дамоў, а Максім, пад уражаннем выступлення, вырашыў крыху прайсціся па вуліцах горада.

Сэрца радасна сціскалася і ўсё спявала на душы, калі ўспамінаў зычлівыя твары сяброў, што ўважліва слухалі ягоныя вершы. Максім хваляваўся, калі выносіў на суд гурткоўцаў свае творы. Можа, нават болей, калі паказаў першую пробу пяра сваёй хроснай маці Вользе Епіфанаўне Сёмавай. Сталася гэта ў 1901 годзе, у Ніжнім Ноўгарадзе, калі Сёмава прыязджала адведаць свайго хросніка з Бацькаўшчыны. Хросная стала яго першым чытачом і крытыкам. З яе лёгкай рукі Максім пачаў атрымоўваць газету «Наша ніва», у якую і даслаў адзін з сваіх твораў. Божа мой, колькі радасці было, калі ў ліпеньскім нумары газеты за 1907 года пабачыў ён свайго «Музыку». І недзіва. Усю душу ўклаў Максім у гэтае невялікае апавяданне. Першы надрукаваны твор Максіма Багдановіча стаў яго праграмай на ўсё жыццё.

Так, ён стаў за мастацтва, якое *«...як гром, гудзіць і грозна будзіць ад сну і завець... народ».* Ён ставіў яго лёс у залежнасці ад таго, з кім яно – з беднымі ці багатымі. Калі душа Музыкі ведала ўсё тое гора, што бачыў ён на людзях, то гэта гора і грала на скрыпцы, *«...гэта яно вадзіла смыкам па струнах; і ніводзін сыты не мог так граць, як грала народнае гора».*

Гэтым апавяданнем Максім сцвярджаў, што мастацтва толькі тады мае сваю дзейсную, неадольную сілу, калі выражае народныя спадзяванні, думкі людзей, яго лёс. Інакш не заб'ецца моцна сэрца ў грудзях народа, не заблішчаць вялікім гневам ягоныя вочы, не прачнецца ён ад цяжкага сну.

Дэбют Максіма Багдановіча заўважылі не толькі на Бацькаўшчыне, але і ў суседняй Украіне. Літаратуразнаўца Іларыён Свянціцкі ў сваёй кнізе «Відраджэнне білоруського письменства» другі раздзел, прысвечаны агляду беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя, пачынае радкамі яго «Музыкі». Кніга выйшла прыкладна праз год пасля з'яўлення апавядання Максіма Багдановіча ў газеце. І калі б літаратуразнаўца больш уважліва сачыў за беларускім друкам, ён пэўна зацікавіўся б: чаму гэты таленавіты аўтар больш нідзе не друкуецца? І адкуль жа яму было ведаць, што ўсе дасланыя Максімам у газету «Наша ніва» вершы адкладваюцца ў папку для архіва. Складаюцца туды таму, што некаторым супрацоўнікам газеты яны здаліся штучнымі і не народнымі. Змагаючыся за радкі ў «Нашай ніве», яны называлі ягоныя вершы бязглуздзіцай. А самі, праз некаторы час спрабавалі пісаць ў яго «філасофска-дэкадэнцкім» стылі. Пэўна, што з гэтага нічога не атрымалася. Акрамя таленту ім не хапала таго пакутлівага настальгічнага болю па Бацькаўшчыне, які пранізваў усе ягоныя творы, дасланыя ў газету. Дзякуй Богу, трапілі тыя вершы аднойчы ў рукі Янкі Купалы і Сяргея Палуяна, якія і настаялі на тым, каб вершы надрукавалі. Так, амаль пасля паўтарагадовага перапынку творы Максіма Багдановіча зноў з'явіліся на старонках «Нашай нівы».

Асноўная тэматыка творчасці Багдановіча была наскрозь беларуская. Апрача асабістых перажыванняў, разважанняў на агульначалавечыя тэмы, паэт чуйна рэагаваў на падзеі, што адбываліся на Бацькаўшчыне. Ён захапляўся народнай паэтычнай творчасцю беларусаў і выкарыстоўваў у сваіх вершах матывы народнага эпасу, звяртаўся да гістарычнай мінуўшчыны Беларусі. Ён, паэт Адраджэння, хацеў ахапіць усё. Але яго адарванасць ад радзімай старонкі стала галоўнай прычынай таго, што ў ранніх творах





Максіма Багдановіча Беларусь не набыла выразна канкрэтнага характару. Яна прадставала ў яго вершах такой, якой толькі ўяўлялася паэтам.

Паэты, якія жылі ў той час на Бацькаўшчыне, сваё веданне беларускага народнага жыцця і мовы вынеслі з роднае хаты. Пазней яны паглыбілі веды, дзякуючы цеснай сувязі з беларускім народам. Зусім інакш было з Максімам. Слоўнік Івана Насовіча стаў адзіным зялёным куточкам Беларусі ў далёкай чужыне. Здавалася б, яму лягчэй было б пісаць па-расійску, перадаваць свае ўражанні аб шырокіх прасторах Паволжа, прыўральскага стэпу, дзе ён некалькі разоў лячыўся, апяваць прыгожыя расійскія гарады. Але Максім Багдановіч амаль не вяртаўся да тых блізкіх, але чужых яму краявідаў. Усё сваё жыццё ён цалкам прысвяціў Бацькаўшчыне, знаходзячыся за сотні кіламетраў ад яе, ён быў разам з ёю.

Вось і цяпер ён праходзіць велічны храм святога Міколы Мокрага, а думае пра беларускія цэрквы. Гучаць звонкія галасы званоў. Колькі ж ён блукаў па вуліцах? Няўжо дзве гадзіны? Трэба хутчэй ісці дамоў, бо бацька не любіць, калі нехта спазняецца на вячэру.

Калі Максім увайшоў у дом, усе ўжо сядзелі за сталом.

– Чаму так позна, браце? – строга запытаўся бацька: адчувалася, што ён зноў без настрою прыйшоў з працы. – Так можна і без вячэры застацца. Распранайся і сядай есці, пакуль не астыла ўсё!

За сталом нават малыя сядзелі моўчкі, дрэнны настрой бацькі быццам бы перадаўся ўсёй сям'і. Гаварыла толькі мачаха. Яна расказвала аб новым спектаклі Волкаўскага тэатра. Бацька нешта адказваў на яе словы. Але, адчувалася, ён думаў аб нечым сваім.

Нарэшце, вячэра скончылася. Усе падзякавалі Аляксандру Апанасаўну і паспешліва разыйшліся па пакоях.

– Як прачытаў даклад? – пацікавіўся Лёва, гартаючы часопіс па матэматыцы.

У думках, ён, як і бацька, быў недзе далёка. Максім адчуў гэта і таму без усякага энтузіязму адказаў:

– Добра. Здаецца, спадабалася ўсім. Прачытаў нават свае вершы.

– Вось бачыш, – быццам бы ўзрадаваўся Лёва. – А ты хваляваўся, – і, памаўчаўшы, дадаў. – У мяне, Максім, нешта задачка адна не выходзіць. Другі дзень не дае мне спакою. Ты сёння куды пойдзеш?

– На канцэрт, у гімназію.

– Добра, схадзі, развейся. А я папрацую.

Лёва пачаў раскладаць на стале кнігі і канспекты. Ён і не заўважыў, як Максім узяў з паліцы тоненькую кніжку ў сціплай вокладцы, на якой было напісана «Жалейка» і выйшаў з пакою. Праз некалькі хвілінаў яго высокая, крыху сутулая постаць, прамільгнула ў вокнах дома.

Максім спяшаўся на Пятніцкі спуск, да Дзябольскага або, як яго называлі сябры, да Добіка. Ён любіў наведваць гасцёўны дом сябра, дзе яго прыходу заўсёды былі рады. З Добікам Максім пасябраваў адразу, як толькі прыехаў у Ярослаўль і пайшоў у гімназію. Дзябольскі быў першы з гімназістаў, каму юнак прызнаўся, што піша вершы на беларускай мове. То быў шчыры, разумны і разважлівы хлапец, які любіў літаратуру, музыку. Ён з цікавасцю чытаў «Нашу ніву» і навінкі беларускай літаратуры, якія Максім разам з іншымі кнігамі прыносіў яму з бібліятэкі бацькі. З Добікам паэт дзяліўся сваімі перажываннямі і думкамі. Менавіта, яму ён прысвяціў верш «Быць можа, пуціна жыцця Лягла пярсцёнкам друг...», які потым назваў «Д. Д. Дзябольскаму».

Дзябольскія ўжо чакалі Максіма.

– Махім прыйшоў! Махім прыйшоў! – шчасліва закрычала маленькая пляменніца сябра, Вераніка. Яна цягнулася да Максіма, які любіў дзяцей, і заўсёды прасіла, каб ён расказаў ёй цікавую казку. Максім не мог пайсці ад Дзябольскіх, каб не паслухаць вясёлую шчабятушку. Ён любіў гэтую маленькую істоту не менш, чым любіў бы сваё дзіця. Але на гэты раз пагуляць з Веранікай не давялося. Трэба было спяшацца на канцэрт.

У іх мужчынскай гімназіі была лепшая ў Ярослаўлі канцэртная зала. Часта ў ёй праходзілі канцэрты прыезжых гастралёраў. Гімназісты маглі заўсёды наведваць іх. Праўда, іх кантрамаркі сядзячых месцаў не гарантавалі і канцэрт даводзілася часам слухаць стоячы. Толькі на гэта ніхто ўвагі не звяртаў.

Максім з дзяцінства любіў музыку. У сям'і да яе былі здольныя ўсе, асабліва маці, якая цудоўна іграла на раялі і мела прыемны голас. Пасля смерці матулі за выхаванне дзяцей узяліся сёстры бацькі – Магдалена і Маша. Калі ў цёткі Машы было сумна на сэрцы або наадварот, вясёлай птушкай спявала ў грудзях радасць, яна выконвала свае любімыя: «А дзе ж тая крынічанька, што голуб купаўся» або «Перапёлачку». Простыя мелодыі песняў нарадзілі ў Максіма вялікую любоў да народнан музыкі. Яго захапленне падтрымоўваў і бацька. Той лічыў, што музыку павінен ведаць і разумець кожны. Калі Адам Ягоравіч ездзіў па службовых справах па губерні, то браў з сабою невялікі грамафон і набор кружэлак. Ён не толькі даваў сялянам слухаць музыку, але расказваў аб яе аўтарах. Ягоная апантаннасць перадалася ўсім дзецям. Старэйшыя заўсёды сачылі за апошнімі музычнымі навінкамі. Як і на кнігі, грошаў на кружэлкі не шкадавалі. А Лёва нават спецыяльнае даследванне правёў, каб палепшыць акустычныя якасці грамафоннага запісу. Па яго чарцяжах у хатняга грамафона перарабілі рупар. Амаль кожнаму музычнаму твору падбіралі спецыяльную іголку.





Максім ішоў на скрыпічны канцэрт з нейкім незразумелым яму хваляваннем. Ён любіў скрыпку, асабліва творы Р. Веняўскага. Праўда, яму падабалася і гітара. Сын цёткі Машы Артур быў сапраўдным віртуорзам гэтага інструмента. Ён сам перакладаў клавісінную і фартэп'янную музыку Баха, Бетховена для гітары. Цудоўна выконваў Артур і народныя творы. Максім быў у захапленні ад яго музычнага таленту. І ўсё ж скрыпцы ён аддаваў перавагу.

Сябры крыху спазніліся. Музыкант ужо стаяў на сцэне і рыхтаваўся пачаць канцэрт. Зала, на дзіва, была амаль пустая. І Максім з Добікам зручна ўселіся і чакалі прадстаўленне.

– Пашчасціла як... – Добік не паспеў скончыць фразы, бо, як зачараваны, стаў услухоўвацца ў мелодыю, якая палілася ў залу. Скрыпка спявала. Яна то плакала, быццам бы ўбітая горам, то смяялася, нібы дзіця. Але такая была ў той песні нуда, што аж за сэрца хапала. І ўявілася Максіму, што гэта не скрыпач на сцэне, а ягоны Музыка. *«Плача скрыпка, льюць людзі слёзы, а музыка стаіць і выводзіць яшчэ жаласней, яшчэ нудней. І балела сэрца, і падступалі к вачам слёзы: так і ўдарыўся б груддзю аб зямлю ды ўсё слухаў бы музыку, усё плакаў бы па сваёй долі...»*.

Раптам Музыка зайграў мелодыю, да болі знаёмую Максіму. То была «Калыханка», якую маці спявала яму ў дзяцінстве. Словы яе ён ужо дрэнна памятаў, але мелодыя ўрэзалася ў памяць на ўсё жыццё. Максім быццам бы ўвачавідкі ўбачыў маці, схіленую над ім. Ён бачыць усмешку яе вуснаў, што напяваюць яму «Калыханку», пяшчотныя рукі, што туга сплятаюць касу. Ён чуе яе звонкі чысты голас...

Песня абарвалася на самай высокай ноце. Маці так і не скончыла яе. Апошні гук зазвінеў у цішыні зала і застыў у паветры.

Ніхто не мог паверыць, што Музыка скончыў. І ў гэтай звінячай цішы Максім пачуў голас маці. Яе голас, яе інтанацыі: «Брава!» Ён міжволі павярнуў галаву ў той бок, адкуль данёсся гук і ўбачыў прыгожую стройную дзяўчыну, якая паднялася са свайго месца. Яе вочы, нібы зоркі, свяціліся ў застылай залі. І тады яму здалося, што гэта яго маці, маладая і шчаслівая, вярнулася да яго. Пляск удзячных далоняў перапоўніў залу. Публіка доўга не хацела адпускаць скрыпача са сцэны. А ў Максіма не выходзіў з галавы вобраз дзяўчыны. Добік таксама знаходзіўся пад уражаннем ад пачутага.

Моўчкі сябры выйшлі на вуліцу і павольна пайшлі на набяражную Волгі. І тут Максім убачыў Яе. Прыгожа і лёгка яна крочыла насустрач. Разам з ёй ішоў знаёмы Максіму па гімназіі Рафаіл Какуеў. Яны параўняліся. У чорных, як ноч, вялікіх вачах дзяўчыны гучала музыка. Чаму гэта сэрца ў Максіма так моцна забілася? Што робіцца з ім?

– Вось дык сустрэча! – пачуў ён голас Добіка. – Як вам спадабаўся канцэрт?

Дзяўчына ўважліва глядзіць на Дзябольскага, потым пераводзіць вочы на Максіма.

– Выбачайце! Я не прадставіў вам майго сябру! Знаёмцеся – паэт Максім Багдановіч.

Іх позіркі сустрэліся. І ён адчуў: здарылася нешта незнаёмае. Але чаму ён разгубіўся, быццам бы ўбачыў дзіва?

– Аня Какуева! – пяшчотная тонкая рука яе лягла ў Максімаву далонь.

– Вельмі рады бачыць вас! – голас Максіма чамусьці асёкся. – Вы, пэўна, любіце музыку? Я палюбіў яе з дзяцінства. Мая маці цудоўна спявала. Я тады маленькі быў, але ўсе яе песні памятаю.

– А цяпер маці спявае? – уступае ў размову Рафаіл.

– Маці памерла, калі мне не было і пяці гадоў.

– Мая матулечка таксама мела добры голас. – Аня на хвіліну замаўчала, а потым нечакана для ўсіх і, мабыць для самой сябе, дадала. – Калі вы любіце музыку, то прыходзьце да нас заўтра. У нас будзе невялікі сямейны канцэрт.

...Максім на крыллях ляцеў дамоў. Усё спявала навокал. І аднекуль здалёк ліліся вершы.

Ўжо позна. Мрок вясенняй ночы
На вузкіх вуліцах ляжыць.





А мне – вясёла. Блішчаць вочы,
І кроў ад шчасця аж кіпіць.

Іду я радасны, харошы,
Знікае з сэрца пустата...
А пад рызінавай калошай
Ціхутка хлюпае слата.

«Першая любоў», 1911 г.

Каля набярэжнай ён затрымаўся. Даўно ўжо сышла на зямлю ноч, і залацісты стоўп ад поўнага месяца ўжо лёг на люстраную гладзь Волгі. Ён дрыжаў, пераліваўся агнямі і, папаўшы раптам пад хвалі, шырыўся, драбіўся. Здавалася, быццам на вадзе ззяе залатая кальчуга калісьці патануўшага тут велікалюда або быццам залаты невад калышацца на цёмнай гладзі ракі, а ў ім кішма кішыць залатой рыбы. *«Але патроху рассыплюцца звенні кальчугі, распадзецца залаты невад на безліч паблутаных, узвіваючыхся светлых ніцей, ды зліюцца паміж сабой пераліўчатыя ніткі, – і ізноў будзе дрыжаць на рацэ ясны, бліскучы стоўп, быццам залаты шлях да блізкага шчасця».*

*«Шаман», [1914 г.]*

# «Заціхніце, мукі кахання...»

У час вячэрні шэра-ружаваты ў ціхай старасвецкай хаце Какуевых гучала «Месячная саната» Бетховена. Слухачоў сабралася няшмат: Максім, Добік, браты Рафаіл і Мікалай Какуевы, сястра Ані Варвара і яе цётка Таццяна Рафаілаўна. Вясёлы і прыгожы гук раяля роўнай дарожкай разліваўся па вялікай залі і старому, падобнаму на парк, саду.

Аня хадзіла ў лепшых вучаніцах Яраслаўскай жаночай гімназіі, апякункаю якой была Праскоўя Анціпава. Гэтая прывабная, на рэдкасць таленавітая мецэнатка, зрабіла ўсё, каб яе гімназісткі змаглі атрымаць добрую адукацыю. У гімназіі выкладаліся музыка, жывапіс, літаратура, замежныя мовы. Сцены класаў упрыгожвалі творы вядомых мастакоў і графікаў, якія ўсё жыццё збірала Анціпава (яе багатая калекцыя ў будучым паклала пачатак Яраслаўскаму мастацкаму музею, які быў створаны ў снежні 1908 года). Сёстры Какуевы вылучаліся сярод сваіх сябровак не толькі прыгажосцю. Варвара цудоўна малявала. Аня была здольная да замежных моваў, музыкі, коннай язды. Выкладчыкі гімназіі прадказвалі ёй будучыню піяністкі, але дзяўчына толькі з усмешкай слухала іх прароцтвы. Яна, як і некалі яе маці, шчыра любіла музыку. Аня проста жыла ёю.

Тонкія пальцы перабіралі клавішы раяля, і кожны яго гук адбіваўся ў душы Максіма. Яму здавалася, што ён бачыць чароўны сон. Разам з музыкай набягалі хвалямі шчасця радкі.

Ўчора шчасце толькі глянула нясмела, –
І развеяліся хмары змрочных дум.
Сэрца чулае і млела, і балела,
Радасць душу мне шчаміла, быццам сум.

Ўсё жыццё цяпер, як лёгкая завея.
Кнігу разгарнуў – а не магу чытаць.
Як зрабілася, што пакахаў цябе я, –
Хіба знаю я? Ды і нашто мне знаць?

«Ўчора шчасце толькі глянула нясмела...», 1910–1913 гг.

І хаця саната скончылася, ад яе «шчэ доўга веяў пах, як ад цвятка». Максім не мог надыхацца тым музычным водарам. Аб





гэтым ён і хацеў сказаць Ані, калі падыйшоў да яе. Юнак зазірнуў у яе чорныя, як ноч, вочы і – разгубіўся. Гэта былі іншыя, зусім не тыя, што толькі што глядзелі ў ноты, вочы. У іх жыў сум і незразумелая яму таямнічасць. Але яны пацяплелі, калі ён пачаў гаварыць. Можа таму, Максім, пачырванеўшы, нарэшце, прызнаўся: «Калі вы гралі, Ваш вобраз адбіваўся на крышцы раяля. Але згіне адтуль ваш вобраз і следу не кіне. А ў маёй душы яму ўжо не згінуць».

Маўчанне панавала ў залі. Ён зразумеў што сказаў тое, чаго нельга было цяпер казаць. І адчуваючы, як сэрца яго моцна забілася ў грудзях, амаль выбег з пакоя.

Потым яны сядзелі на прыгожай верандзе і пілі духмяную гарбату з яблычным варэннем. Аня была побач, і калі яе тонкая рука крышку дакранулася да ягонай, ён адчуваў сябе самым шчаслівым на зямлі. Ён не чуў, аб чым гаварылі навокал. Не разумеў, з чаго смяюцца сябры. Максім бачыў толькі Аню.

Як праз нейкую заслону далятаў голас Таццяны Рафаілаўны. Яна расказвала пра Фёдара Шаляпіна.

Нечакана цётка звярнулася да Максіма:

– А вы, малады чалавек, бывалі калі-небудзь на канцэрце Шаляпіна?

На пытанне трэба было адказваць:

– Так, і не аднойчы. Мы тады ў Ніжнім Ноўгарадзе жылі, а Фёдар Шаляпін у гэты час даваў там канцэрты. Наш сваяк Максім Горкі сябраваў з ім, і спявак перабраўся на яго кватэру. Мы амаль кожны дзень прыходзілі ў госці да Максіма Горкага паслухаць Фёдара Шаляпіна. Перад канцэртам той абавязкова меў рэпетыцыю. У час, калі ён спяваў, каля дома збіраліся людзі. Слухачы прасілі, каб мы адчынілі вокны. І спявак з ахвотай спяваў для іх.

– О, вы асабіста былі знаёмы з славутым спеваком? – дзівіцца жанчына. – А хто, калі не сакрэт, вам будзе Максім Горкі? Ведаеце, я з цікавасцю чытаю ягоныя апавяданні. Некаторыя з іх напісаныя вельмі жыва.

– Ягоная жонка, Кацярына Паўлаўна Волжына, была роднай сястрой маёй мачахі.

– Пэўна, і вы самі вядомым чалавекам станеце, калі ў вас такое сваяцтва, – смяецца Таццяна Рафаілаўна. – Глядзі, Анечка, некалі і ты будзеш усім расказваць, што цябе слухаў Максім Багдановіч. Што ж я вельмі рада, што вы наведалі наш дом. Спадзяюся, што малады чалавек будзе нашым частым госцем.

Так пачалася самая шчаслівая Максімава вясна. Вясна яго кахання. Амаль кожны дзень ён прыходзіў у гасцінны дом Какуевых. У ім заўсёды было ўтульна і па-хатняму цёпла. З цяністага адзічэлага сада, дзе без усякага парадку раслі шыпшына і клён, чарэшнявыя кусты і тонкі хмель, – веяла кветкамі і яблыкамі. Вясной пакоі поўніліся тонкім водарам яблыневых пялёсткаў. Летам – пахучымі пладамі антонавак, ранетак. Двор, як і сад, быў вялікі. Тут заўсёды ішлі спрэчкі: хто самы спрытны, дакладны ў гульнях, самыя любімыя з якіх– лапта і гарадкі. Вечары ператвараліся для ўсіх у сапраўдныя святы. Потым, у сваёй паэме «Вераніка», Максім Багдановіч так успомніць той незабыўны час:

Вясёла йшлі гулянкі нашы:
Пад шум і гук размах рукі
Збіваў здалёку гарадкі,
Быў чутны смех пры відзе «кашы»,
І кожны стрымліваў свой плач,
Калі ўразаўся ў плечы мяч.

А вечаркам мы выпускалі
Ў паветра белых галубоў.
Зрабіўшы некалькі кругоў,
У вышыню яны шыбалі,
Як чысты снег, кружылі там
і падалі на дахі к нам.
Калі ж сачыўся бледнаваты
Зор сініх свет праз небасхіл
І уплятаўся вулак пыл, –
Мы ўсе пялі каля хаты,
І напаўняў нягучны хор
Маркотнай песняй сціхшы двор.

«Вераніка», 1911–1913 гг.

Максім, безумоўна, прыходзіў да Какуевых не толькі, каб пагуляць у гарадкі або пагаманіць з сябрамі. «Усё адна цяпер мне думка сэрца сушыць, Як пабачыцца з табой, к табе прыйсці, А палын-трава няхай сабе заглушыць пазабытыя даўнейшыя пуці», – прызнаўся ён Ані ў адным з сваіх вершаў.





Кожнае спатканне з ёю прыносіла яму такую вялікую радасць, што яна не магла змясціцца нават у ягоных вершах. Аня стала самым дарагім і блізкім яму чалавекам.

Вясна Максімавага кахання праляцела хутка. Зайграла восень свой развітальны залаты вальс, і заплакала лета, зямлю пакідаючы. Пачаліся заняткі ў гімназіі і пра гульні прыйшлося забыцца. Максім стаў усё радзей прыходзіць да Какуевых. Ён спадзяваўся на новую вясну, але ягоным марам не суджана было збыцца. Пасля заканчэння гімназіі, ён паехаў на Бацькаўшчыну. Калі вярнуўся, Ані ў Яраслаўлі не было. Так іх шляхі і размінуліся. Яна паступіла ў Пецярбургскую кансерваторыю, ён – у Яраслаўскі Дзямідаўскі ліцэй.

Максім ніколі не думаў аб ліцэі. Рэдакцыя «Нашай нівы» даўно дала яму рэкамендацыю на кафедру прафесара А. А. Шахматава ў Пецярбургскі універсітэт. Але бацька і слухаць не хацеў пра філалагічны факультэт:

– Сваім беларусазнаўствам ты зможаш займацца і ў Яраслаўлі. Не абавязкова для гэтага ехаць у Пецярбург. Для жыцця трэба мець такую прафесію, якая дала б верны кавалак хлеба.

Потым ужо больш спакойна, бацька казаў Максіму:

– Пецярбург – горад не для твайго здароўя. Туманы, дажджы, заўсёды вільготнасць. Ты і дома, у цёплай, напаленай хаце, пры добрым харчаванні, то кашаль, то яшчэ якую хваробу схопіш. А што будзе там? І хто стане глядзець за табой, калі ты, не дай Божа, захварэеш?

Адам Ягоравіч гаварыў доўга. Прыводзіў розныя довады. Але Максім стаяў на сваім. Нарэшце, бацька сказаў:

– Не змагу я адначасова цябе і Лёву вучыць ва універсітэтах. Ты ж ведаеш, твой брат пасля гімназіі паедзе ў Маскву. Пашкадуй ты нас, Максім, заставайся ў Яраслаўлі. Паступіш у Дзямідаўскі ліцэй. Будзеш суддзёй або юрыстам...

Максім у запале тады сказаў: «Пракурорам быць не хачу. Адвакатам і суддзёй таксама. Хачу быць літаратарам або вучоным». Але прыйшлося падпарадкавацца бацьку, нягледзячы на тое, што жаданне прысвяціць сябе вывучэнню беларусікі, з кожным днём у Максіма Багдановіча станавілася ўсё мацней.

Прыгожая форма ліцэіста з бліскучымі гузікамі і форменнай тужуркай. У кішэні – новенькі гадзіннік, які бацька падарыў з нагоды заканчэння гімназіі. Максім – ліцэіст. Гучыць прывабна і чамусьці прыгадваецца Царскасельскі ліцэй. Можа таму, што

там некалі выхоўвалі вальнадумцаў, праўдашукальнікаў і дзекабрыстаў.

Яраслаўскі ліцэй працягваў гэтую свабодалюбівую традыцыю. Неаднойчы тут разгараліся студэнцкія хваляванні, пасля якіх звычайна адбываліся арышты. Ці мог прадбачыць падобнае праўнук вядомага багацея Мікіты Дзямідава, калі ў 1805 годзе адчыняў на свае сродкі ліцэй? Праўда, тады ён называўся інакш: Вышэйшае навук вучылішча. Потым яно пераўтварылася ў камерцыйны ліцэй, а 30 жніўня 1870 года, калі пасля судовай рэформы тут пачалі выкладаць юрыспрудэнцыю, адбылося ўрачыстае адкрыццё юрыдычнага ліцэя.

З гэтага часу і пачынаецца яго гісторыя. Хаця ён рыхтаваў будучых вартаўнікоў закону, але навучэнцы самі неаднойчы парушалі яго. Асабліва ў пачатку XX стагоддзя. Студэнцкія сходкі, мітынгі, дэманстрацыі сталі звыклай з'явай. Максім быў сведкам адной з іх. Неяк вяртаючыся з сябрамі з гімназіі, ён убачыў групу студэнтаў, якія з песнямі шлі на Стрэлку. Сябра Максіма па класу расказаў, што дзямідаўцы выйшлі на вуліцу ў знак пратэсту супроць выхадкі аднаго з прафесараў. Прымаючы ў ліцэістаў экзамен, ён пачуў на карыдоры смех і вясёлую размову. Выкладчык палічыў, што ў такой атмасферы ён не зможа далей працягваць экзамен. Таму сабраўся і пайшоў дахаты. Абураныя студэнты вырашылі арганізаваць мітынг. Але атрады коннай і пешай паліцыі не далі ім нават пачаць яго. Ліцэісты сабраліся зноў, на наступны дзень. На гэты раз іх было больш, бо да іх далучыліся ліцэісты іншых курсаў і некаторыя гімназісты.

Але Максім ні ў гэтых, ні ў іншых падзеях не ўдзельнічаў. Ён больш не марыў стаць палітычным лідэрам. Беларусіка захапіла яго поўнасцю. Паступіўшы ў ліцэй, юнак наогул адыйшоў ад палітычнай барацьбы. Максім рэгулярна хадзіў на заняткі. Але нават сябры па курсу бачылі яго не заўсёды. Не, ён паважаў выкладчыкаў ліцэя, якія акрамя ўсяго вялі вялікую асветніцкую работу і разам са студэнтамі ладзілі канцэрты і спектаклі, на якіх збіралася шмат гледачоў і... паліцыі, бо часцей за ўсё ў ліцэі чыталіся забароненыя цэнзурай творы. Максіму падабаліся многія з гэтых самаахвярных людзей. Але вось да навук, якія яны выкладалі, у яго ніякай цікавасці не было. Адзінае, што яго суцяшала, гэта была сістэма, па якой ацэньваліся веды ліцэістаў.

За адказы выстаўлялася толькі «вельмі здавальняюча», «здавальняюча» або «нездавальняюча». Таму па новых правілах, уве-





дзеных у 1906 годзе, званне кандыдата юрыдычных навук прысвойвалася і ліцэістам з вельмі сціплымі вучэбнымі поспехамі. Максіма гэта задавальняла, бо заставаўся час для любімай справы. Адседзеўшы на адной больш-менш цікавай лекцыі, ён ішоў у ліцэйскую бібліятэку, якая па колькасці юрыдычнай і гістарычнай літаратуры, каштоўнасці выданняў лічылася адной з лепшых сярод вышэйшых навучальных устаноў Расіі. Да яе фондаў звярталіся вучоныя галоўных універсітэтаў. І не толькі па юрыдычных пытаннях, але і па краязнаўству, этнаграфіі, фальклору. Сюды паступалі ўсе цэнтральныя часопісы і газеты, якія бацька Максіма не выпісваў. Прыходзіла і новая мастацкая літаратура.

Максім амаль увесь час праводзіў тут. Хіба маглі цікавіць яго такія навукі, як тое ж права: дзяржаўнае, адміністрацыйнае, крымінальнае, царкоўнае, фінансавае, міжнароднае, рымскае, грамадзянскае і іншае? Або грамадзянскае судаводства, гісторыя філасофіі права, судовая медыцына, якія выкладаліся ў поўным аб'ёме юрыдычных факультэтаў універсітэтаў. Праўда, вывучалася ў ліцэі і гісторыя расійскай літаратуры, усеагульная гісторыя, нямецкая і французская мовы. Але гэта ж была кропля ў моры. Таму вучоба не задавальняла Максіма. Ад смутку не ратаваў і моцны прафесарскі склад кафедраў, якім ганарыўся Яраслаўскі дзямідаўскі ліцэй. У свой час тут выкладаў вядомы расійскі педагог К. Дз. Ушынскі. Кафедру гісторыі расійскага права ўзначальваў буйнейшы гісторык права Уладзімірскі-Буданаў. Лепшыя педагагічныя традыцыі ў ліцэі ашчадна зберагаліся. Але яны Максіма не цікавілі, хаця на лекцыях двух выкладчыкаў ён прысутнічаў амаль заўсёды.

Гісторыю расійскага права выкладаў Валерыян Шыраеў. Гэты высокаадукаваны чалавек, акрамя юрыдычных пытанняў цікавіўся расійскай гісторыяй. Максім ведаў аб ім ад свайго настаўніка Парфірыя Мізінава, з якім сябраваў Шыраеў, і таму яшчэ да паступлення ў ліцэй сачыў за яго артыкуламі ў газеце «Голос». Шыраеў лічыўся асобай перадавых ідэй. І яго лекцыі вылучаліся неардынарным поглядам на тыя працэсы, што адбываліся ў Расіі. Ён марыў аб пераўтварэнні ліцэя ва універсітэт і гэта пытанне не раз уздымаў на старонках газет. Максім падзяляў думку свайго прафесара. На жаль, іх мара спаўнілася толькі ў лістападзе 1918 года. Валерыян Шыраеў, былы выпускнік ліцэя, стаў першым рэктарам Яраслаўскага універсітэта.

Другі выкладчык, лекцыі якога Максім імкнуўся не прапускаць, быў дырэктар ліцэя Уладзімір Шчаглоў. На заняткі, якія ён

вёў па дзяржаўнаму праву і ўсеагульнай гісторыі, усе студэнты хадзілі з ахвотай. Лекцыі прафесара Шчаглова заўсёды выклікалі бурныя спрэчкі. Ягоныя навуковыя артыкулы друкаваліся ў ліцэйскіх часопісах «Временник Демидовского юридического лицея» і «Юридической библиографии», адзіным у Расіі юрыдычным бібліяграфічным часопісе, які разам з «Юридическими записками» выходзіў у ліцэі. У. Шчаглоў быў таленавітым літаратарам. Яго кніга «Высшее учебное заведение в г. Ярославле им. Демидова» карысталася папулярнасцю сярод ліцэістаў. Тыя часта любілі на лекцыі задаць прафесару пытанне не па тэме. Напрыклад, што адбывалася сёння дзесяць гадоў таму? Прафесар, трошкі падумаўшы, адказваў: «10 гадоў назад у гэты дзень быў падпісаны загад на зацвярджэнне стыпендыі імя стваральніка расійскага тэатра Фёдара Волкава». Для студэнтаў гэта была толькі зачэпка, каб пачаць гаворку аб тэатральных навінках. Да іх размовы падключаўся і сам прафесар. І гутарка пра культуру магла працягвацца гадзінамі.

Такія размовы Максім Багдановіч любіў. У ліцэі ў яго не было блізкіх сяброў. Яго аднакурснікі больш цікавіліся пытаннем: кім лепш стаць пасля заканчэння ліцэя – юрыстам-практыкам ці юрыстам-тэарэтыкам. Максіма гэтая праблема не хвалявала. Пасля сваёй паездкі на радзіму ён па-сапраўднаму адчуў сябе беларускім паэтам і сваю будучыню звязваў толькі з літаратурай. Вучобу ў ліцэі юнак разглядаў, як вымушаны крок. Шкада было часу, які прыходзілася адрываць ад сваёй беларусікі на вывучэнне юрыдычных дысцыплін. Акрамя таго, нямала гадзінаў займала праца ў бібліятэчнай камісіі, сябрам якой яго выбралі ліцэісты. Супакойвала і тое, што ён мог у першую чаргу карыстацца фондамі бібліятэкі, першым знаёміцца з літаратурнымі навінкамі.

Звычайна Максім шукаў зборнікі па этнаграфіі і фальклору. Народная творчасць беларусаў даўно цікавіла яго. Хаця ў яго бацькі, які ў свой час займаўся этнаграфіяй, была добрая падборка кніг па фальклярыстыцы, у ліцэйскай бібліятэцы, гартаючы зборнікі вясковых прыпевак расійскіх губерняў, зборнікі песень і казак, Максім яшчэ раз упэўніўся, наколькі багатая спадчына яго народа. І таму, уводзячы ў беларускую паэзію тэмы і матывы заходнееўрапейскай і сусветнай літаратуры, ён лёгка знаходзіў у роднай мове мастацкія сродкі для перадачы тых матываў. А яшчэ ён цвёрда пераканаўся: нельга развіваць чужое, не развіваючы свайго. Потым тыя думкі, што прыходзілі ў час працы ў бібліятэ-





цы, знайшлі адлюстраванне ў яго літаратурна-крытычных працах. *«Як кожны народ мае сваю нацыянальную душу, так ён мае і свой асаблівы склад (стыль) творчасці, найбольш прыдатны да гэтай душы. Ёсць ён і ў нас, беларусаў, і мы мусіма звярнуцца да яго, каб улажыць што-небудзь сваё ў скарбніцу светавай культуры, каб уліць у нашую паэзію свежыя сокі, каб стаць бліжэй да душы роднага народа, лепш паталіць яе духоўную смагу і запраўды ўзяцца за вялікую працу:* ***развіццё беларускай народнай культуры****»*, – пісаў ён у артыкуле «Забыты шлях». І да гэтай тэмы ён звяртаўся неаднойчы. Максім апісваў побыт, адзенне, песенную творчасць украінскага насельніцтва ў нарысах «Червонная Русь», «Угорская Русь». Звяртаўся да этнаграфічнага матэрыялу, працуючы над брашурай «Братья-чехи», артыкуламі «Белорусы», «Украинское казачество» і іншымі. Яго невялікія нататкі пра вершы Аляксандра Пушкіна сталі глыбокімі даследваннямі расійскага, беларускага і ўкраінскага фальклору. Наогул, народная творчасць стала для Максіма не толькі глебай для натхнення. Гэта той шлях, які на яго думку, павінен весці паэтаў да сапраўднай беларускай паэзіі. Беларускай не толькі па мове, але і па духу. Складанай і няпростай дарогай і пайшоў Максім Багдановіч.

Пасля расстання з Аняй, яго душа пачала нудзіцца і знемагаць. І ў беларускіх песнях ён, нечакана для сябе, знайшоў аналагічныя думкі і пачуцці. Іх складаў народ на працягу тысячагоддзяў.

А весткі ад Ані прыходзілі ўсё радзей. Казалі, што яна мела вялікі поспех як піяністка, што за ёй заляцаецца шмат хлопцаў. Максім верыў і не верыў чуткам. Каханне да Ані было настолькі моцным і чыстым, што ён быў удзячны лёсу нават за тыя кароткія хвіліны яго шчасця. Пытацца ў каго-небудзь пра Аню ён не мог. Яе цётка, якая разумела яго пачуцці, не хацела, каб пляменніца, якую яна выхоўвала з дзяцінства, была разам з Максімам. Жанчына здагадвалася аб хваробе юнака і ведала, што сухоты, ад якіх памерлі яго маці і брат, рана ці позна забяруць і яго. Цётка хацела шчасця сваёй пляменніцы... Максім адчуваў тую непрыязнь сэрцам. Ён разумеў, што Таццяна Рафаілаўна ніколі не пагодзіцца на іх шлюб, і ўсё ж спадзяваўся на лепшае, бо надзея заўсёды памірае апошняй. Кожны вечар Максім выходзіў на набярэжную Волгі, праходзіў тыя мясціны, якія ён некалі наведваў з Аняй.

Над зямлёй узыходзіла яркая зорка Венера, якая несла з сабой светлыя згадкі і светлыя пачуцці.

# «Я не самотны, я кнігу маю»

Напярэдадні яму прыснілася маці. Такой шчаслівай і прыгожай ён ніколі больш яе ўжо не бачыў. Залатым дажджом струіліся яе шаўкавістыя валасы, дзівосным агнём гарэлі вочы. А сама яна была такая сляпуча белая, аж гарачая. Ён адчуваў цяпло яе прысутнасці, цеплыню яе голаса. І яму нясцерпна хацелася падыйсці і дакрануцца, прытуліцца да яе. Але Максім баяўся звархнуцца. Ён не хацеў, каб маці знікла.

Матуля іграла на фартэпіяна. Але калі яна заспявала: «Ой, чаму ты стаў паэтам у нашай беднай старане?..» – ён забыўся і зрабіў крок насустрач ёй. Песня абарвалася і маці ператварылася ў музыку. Яна стала мелодыяй, якая ляцела да зорак, да вечнасці, пакідаючы за сабой цішыню і надзею.

У хаце было ціха. Максім падыйшоў да фартэпіяна, якое, здавалася, яшчэ выпраменьвала пяшчотнасць яе пальцаў. На чорнай лакіраванай крышцы ляжаў вянок з васількоў. Ён узяў яго ў рукі і – прачнуўся...

А вечарам паэт трымаў свой вянок. «Вянок», дзе засушыў ён на паперы «*краскі, свежыя калісьці, думак шчырых і чуцця*». Кніга пахла друкарскай фарбаў пана Марціна Кухты і яго роднай Бацькаўшчынай. Ён верыў і не верыў у гэта. Няўжо споўніліся яго мара і сон, ягонае выратаванне?

А да «Вянка» яшчэ трэба выдаць «Красавік», а яшчэ «Шыпшыну», і нават «Палын-траву», каб расквітнела беларуская літаратура чароўнай кветкай, загучала ў яе паэзіі музыка садоў, лясоў і палеткаў.

Максіму радасна. Усё спявае ў душы. Але пісаць вершы сёння ён чамусьці не можа. Усе блытаецца ў галаве. «Думкі з розуму ліюцца, Пачуццё з душы бяжыць...» Таму, замест вершаў, ён падпіша зборнік блізкім людзям. Максім з замілаваннем узяў кніжку і пачаў выводзіць на першай бачынцы, пад сваім прозвішчам: «Тете Маше от любящего ее автора. М. Богданович». Атрымалася прыгожа.

Тады ён узяў другую кніжку для Ані. Як шкода, што ён не атрымаў трэццяга ліста карэктуры, і не змог выправіць усе памылкі. А галоўнае, паставіць над раздзелам «Мадонны» тры літары А. Р. К. – Ане Рафаілаўне Какуевай ён прысвяціў гэтую частку зборніка. Анечка даўно была ягонай Мадоннай.





А можа гэтая памылка да лепшага? Пэўна, гэта лёс. Калі ім не суджана быць разам, дык навошта і гэтае пісьмовае прызнанне ў каханні – А. Р. К.? Навошта, каб нехта ведаў, што яго Вераніка – гэта Аня Какуева? Няхай думаюць, што яна – яго выдумка. Лепш так – яна будзе ягонай тайнай. Паэт мае права на гэта.

Максім падпісаў кнігу брату Ані, Мікалаю, які абавязкова пакажа «Вянок» ёй. І Аня ўсё зразумее. Так будзе лепш.

Яшчэ адзін экзэмпляр ён падпісаў Мікалаю Агурцову, свайму сябру па газеце «Голос». Мікалай Агурцоў рэдагаваў літаратурны раздзел газеты і яе бібліяграфічны аддзел. Менавіта да яго прыносіў Максім свае рэцэнзіі і апавяданні. З Мікалаем яго звязвала даўняе сяброўства, але не толькі на літаратурнай глебе. М. Агурцоў быў краязнаўцам. Ён аб'ездзіў усю Яраслаўскую губерню, напісаў некалькі прац на аснове сваіх вандровак. У рэдакцыі Мікалай, маючы неўрымслівую натуру, быў незаменнай асобай. Ён на працягу гадоў збіраў картатэку ўсіх яраслаўскіх выданняў. Не было ніводнага значнага артыкула па гісторыі і культуры Яраславіі, якога б не было ў ягонай калекцыі. І не было ніводнага чалавека ў рэдакцыі, хто б не карыстаўся ягонай картатэкай.

...Максім зайшоў да Агурцова ў рэдакцыю газеты «Голос» пасля ліцэю. Той быў не адзін. У кабінеце сядзеў сярэдняга веку чалавек, прыемнай знешнасці. Максіму здалося, што ягоны твар знаёмы яму. Мажліва, яны сустракаліся з ім у рэдакцыі, але як яго імя? Незнаёмец нешта абмяркоўваў з Агурцовым, і Максім спачатку падумаў, што зайшоў не ў час, але памыліўся.

– О! Нарэшце, Максім прыйшоў! Як пажываеце, малады чалавек? Чаму дарогу да нас забыліся? – радасна вітаўся Мікалай, пераходзячы ад слоў да справы.

– Ці пазналі Вы, шаноўны пан, нашага публіцыста Пятра Крыцкага? Той, як і Вы, доўгі час прападаў невядома дзе. А сёння ашчасліві нас сваім візітам. Прыйшоў з цікавымі прапановамі. Ён, разумееце, даражэнькі Максім, задумаў выдаваць часопіс. І нават першы нумар здаў у набор. А вось на другі – цікавага матэрыялу ў яго не хапае. Так ён прыйшоў да мяне і пытаецца грозна, дзе Ваш паэт Максім Багдановіч? Жадаю запрасіць яго ў свой часопіс для супрацоўніцтва.

Голас у Агурцова, як і заўсёды, жартаўлівы, але адчувалася, што на гэты раз ён не разыгрывае Максіма. У рэдакцыі «Голоса» супрацоўнікі паважалі і любілі Агурцова. Ён лічыўся адным з найлеп-

шых аўтараў літаратурнага аддзела і падаваў вялікія надзеі, як будучы сталы супрацоўнік. Ягоны нарыс, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння паэта С. Дружыніна, рэцэнзія на раман «Трыстан і Ізольда» ў перакaзе Ж. Бедзье, былі высока ацэнены ў рэдакцыі.

– Так што Вам застаецца загладзіць сваю віну, – працягваў далей Агурцоў, – толькі адным шляхам: стаць супрацоўнікам часопіса «Русский экскурсант» – першага на Русі экскурсійнага выдання.

– Я маю чым выкупіць віну, – сказаў Максім і працягнуў Мікалаю Агурцову свой «Вянок».

– Максім Богдановіч. «Вянок», – не паверыў сваім вачам Мікалай. – Віншую Вас! Ад шчырага сэрца віншую і жадаю, каб гэтая сціплая на выгляд кніжка прынесла Вам вядомасць і папулярнасць не толькі ў Беларусі, але і ў Яраслаўлі. Але ж Вы і змянілі ўсе мае планы, шаноўны дружа. Думаў дадому пайду, а прыдзецца застацца. Буду ўдыхаць водар Вашага «Вянка» і вывучаць беларускую мову. А так як, магчыма, буду мець некаторыя пытанні, то вельмі прашу завітаць да нас у чацвер. Тым больш, што рэдактар запрашае Вас у гэты дзень да сябе!

Вяртаўся з рэдакцыі Максім разам з Пятром Крыцкім. Па дарозе той расказваў яму пра новае выданне – часопіс «Русский эскурсант», які ставіў на мэту пазнаёміць чытачоў з гісторыяй і развіць тэму экскурсійнай справы, з цікавымі куточкамі дзяржавы, з гісторыяй народаў і іх культурай.

– Мы будзем друкаваць артыкулы па гісторыі і культуры розных куткоў Расіі, справаздачы экскурсій, рэкамендацыі іх кіраўнікоў, ураджанні экскурсантаў, хроніку, крупіцы вопыту аматараў паходаў, бібліяграфію новых кніг па гісторыі і культуры. Я ведаю, што Вы, Максім, вельмі назіральны малады чалавек. Тое, што мне даводзілася чытаць на старонках газеты «Голос», пацвярджае маю думку і сведчыць аб Вашым таленце. Так што дзверы нашай рэдакцыі заўсёды адчынены для Вас. З радасцю будзем чакаць Вас і Вашы новыя творы, – сказаў на развітанне Крыцкі.

У чацвер Максім, як і абяцаў, зайшоў у рэдакцыю. Агурцоў сустрэў яго радасна і, паказваючы на кніжку, якая ляжала на ягоным стале, сказаў:

– Я з цікавасцю прагледзеў зборнік. Тое-сёе, што зацікавіла мяне, адзначыў. Але растлумачце мне, чаму Вы, народны беларускі паэт, напоўнілі Вашу кніжку санетамі, рандо, трыалетамі і іншымі чужымі народу формамі? Да таго ж, Вы амаль да кожнага верша далі па эпіграфу ледзь не на ўсіх еўрапейскіх мовах. Навошта гэта?





Максім пачаў, хвалюючыся, горача даказваць, што гэта, менавіта, і трэба было зрабіць:

– За беларускай мовай не хочуць прызнаваць самастойнасці і самабытнасці. Не хочуць дапускаць і думкі, што на гэтай мове можна выказаць усе рухі чалавечай душы і даць любую літаратурную форму. Я сваёй кніжкай хацеў паказаць, што ўсё гэта мажліва. А для гэтага трэба беларускую мову паставіць побач з еўрапейскімі мовамі. Глянуўшы на беларускую пісьменнасць, мы бачым, што за апошнія гады сярэдняя вартасць твораў падвышаецца, што цяпер кожны піша так, як некалькі год таму маглі пісаць найлепшыя нашы пісьменнікі. А гэта можа азначаць адно: у беларусаў з’явілася літаратурная мова. Не трэба цяпер ісці ў чужыя людзі, шукаючы глыбокіх і трывожных дум, чулага і хвалюючага пачуцця, душу радуючай красы. Не трэба, бо і ў саміх ёсць. Мала таго, яны самі могуць да нас звярнуцца, бо іншы раз таго, што маем мы, не знойдзецца ў іх. І гэта не толькі таму, што ў нас ёсць пісьменнікі зусім асобага духу, як напрыклад, Янка Купала, Якуб Колас, Алесь Гарун, Ядвігін Ш., Змітрок Бядуля і іншыя. І не толькі таму, што яны апісваюць беларускае, мала дзе вядомае жыццё. Не, і апроч гэтага знойдзецца шмат чаго, вось хаця б нацыянальнае пачуццё: не звінелі, ды і не могуць звінець у расійцаў, напрыклад, струны так, як у нашай пісьменнасці і ясным робіцца праз гэта, што не толькі нашаму народу, але і ў сусветнай культуры яна нясе свой дар...

Ён так і не закончыў сваю думку. У кабінет зайшоў сакратар і запрасіў іх да рэдактара. Там усе ўжо былі ў зборы. Малады фатограф заклікаў да цішыні і ўсмешак.

– Багдановіч, не саромцеся – станавіцеся ў цэнтр, – сказаў нехта, бачачы разгубленнасць Максіма.

– Давай, давай, браце, – падбадзёрыў яго Мікалай Агурцоў, – гэта фатаграфія некалі ўвойдзе ў гісторыю. А для гісторыі трэба цярпець!

Пасля фатаграфавання рэдактар павіншаваў Максіма з выхадам ягонай кніжкі і на развітанне сказаў:

– Уважліва чытайце «Голос». Хутка мы змесцім нешта цікавае для Вас. А наогул, я хацеў, каб Вы часцей прыходзілі да нас. Чытачы засумавалі без Вашых твораў.

Пасля размоў у рэдакцыі Максім прыйшоў да хаты акрылёным. Адразу ўзяўся за працу. Ён ужо даўно задумаў напісаць серыю артыкулаў, прысвечаных развіццю расійскай і беларускай літаратур. А цяпер гэта жаданне толькі ўзмацнілася.

За кароткі час былі закончаны артыкулы «Краса и сила», «Памяти Т. Г. Шевченко», напісаныя ў сувязі са 100-годдзем з дня нараджэння паэта Тараса Шаўчэнкі, «Одинокий», прысвечаны Міхаілу Лермантаву, «Безумец», напісаны да 350-годдзя нараджэння Галілея Галілео, «Н. К. Михайловский». Амаль кожны тыдзень у газеце, у раздзеле бібліяграфія з'яўляліся рэцэнзіі Максіма на новую мастацкую або навуковую літаратуру.

За працай час ляцеў хутка. Максім і не заўважыў, як вясна ўступіла на зямлю, як пабірузіла неба і Волгу, зрабіла ўсё навокал святочна прыгожым і маладым. У Максіма пачаўся ўздым творчых сіл, ён працаваў і дзень і ўноч. А тут яго добры прыяцель па ліцэю Міхась Аржэнцкі, які спрабаваў сам пісаць вершы, пазнаёміў з багатай бібліятэкай яго бацькі, выкладчыка палітычнай эканоміі і статыстыкі ў Дзямідаўскім ліцэі. Калекцыя мела ўнікальны збор кніг на польскай мове. Чаго толькі варта прыжыццёвае выданне А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш»! Міхась прапанаваў Максіму абменьвацца кнігамі з бацькоўскіх бібліятэк. Багдановічу ідэя спадабалася і ён вырашыў вывучыць польскую мову. А за дапамогай звярнуўся ў газету «Наша ніва».

«*Пане Вацлаве!*

*Скончыўшы вясеннія экзамены, адразу хачу прыступіць да свайго даўняга жадання, – а ўласне хачу выўчыць польскую мову. Дзеля таго надашліце мне накладной платай на Дзямідаўскі ліцэй вось якія кнігі: 1) Leon Wasilewski. «Litwa i Bialorus», 2) Слоўнік польска-рускі, не надта вялікі па Вашаму выбару. Па Васілеўскаму я і хачу вучыцца. Маю надзею, што за лета здолею-такі яго прачытаць. Калі ёсць польская граматыка на расійскай мове, таксама не занадта вялікая, дык надашліце і яе.*

*Заўтра прымуся за Скарыну або за расказікі. Гэтымі днямі надышлю ў «Нашу ніву» колькі новых вершаў. Што да Скарыны, дык вось якая рэч: я напісаў апроч яго ўласнай біяграфіі асобны раздзел, дзе падаў характарыстыку папярэдняга беларускага культурнага жыцця і пісьменнасці. Але гэты раздзел заняў столькі ж месца, як і сам Скарына. Здаецца, занадта. А між тым гэты раздзел удаўся. Што рабіць– скараціць ці не? Кланяюся ўсім.*

*М. Багдановіч.*
*23 мая, 1914 г.*»





Да сканчэння экзаменаў заставаліся лічаныя дні. На нейкі час Максім пагрузіўся ў ліцэйскія клопаты і перастаў заходзіць у рэдакцыю. Але нечакана «Голос» нагадаў аб сабе.

...Максім вяртаўся з ліцэю. Толькі што ён лёгка і хутка здаў экзамен і таму вырашыў прайсціся па набярэжнай Волгі. У парку ля Стрэлкі, месца, дзе Котарасль упадае ў магутную Волгу, ён прысеў на лаўку. Дзень быў сонечны, прыгожы. Ні думаць, ні рабіць нічога не хацелася. Прыемна дзьмуў ветрык, граючы з газетай, якую нехта выпадкова пакінуў на лаўцы. Гэта быў № 123 «Голоса». Максім не мог не прагледзець яго. Ён бегла перачытаў перадавіцу, апошнія навіны, потым разгарнуў «Голос» і не паверыў сваім вачам. У самым цэнтры стаяла: «Максим Богданович. Вянок. Кніжка выбраных твораў». Гэта была другая рэцэнзія на яго зборнік. Газета «Наша ніва» змясціла крытычны артыкул на ягоны «Вянок». Максім не пакрыўдзіўся, але напісаў верш «Пану Антону Навіне» на спамін ад аўтара:

Дзень добры, пане! Вось Вам просты надпіс:
Ёсць гэткая японская забаўка, –
Кідаюць дробныя аскёпкі дрэва
Ў ваду – і робяцца яны цвятамі.
Ўсё гэта мне згадалась мімаволі,
Калі чытаў я Вашую стаццю
Аб вершыках «Вянка». І шлю падзяку
І цісну руку. Ваш М. Багдановіч.

«Дзень добры, пане!», 1914 г.

Цяпер перад Максімам новая рэцэнзія. Няўжо ж таксама ў ёй будуць крытыкаваць яго. На адзіным дыханні Максім прачытаў яе:

*«Лежащая перед нами книга стихов на белорусском наречии иллюстрирует стремление белорусской интеллигенции к «национальному» подъёму, если можно вообще говорить о белорусской литературе. Вместе с тем ясно стремление вдвинуть область белорусского творчества в общее русло литературы.*

*Автор рецензируемой книжки не ограничивает себя узким кругом «народных» сюжетов, как это наблюдалось до сих пор в Белоруссии. Как по сюжетам, так и по обработке стихи г. Богдановича ничего «народного» не заключают, если не принимать во внимание простоты его произведений. Несомненно, это произведения – продукт общей «интеллигентской» литературы, и рассчитаны они, по-видимому, не на простого читателя: книжка пестрит иностранными эпиграфами. Не беремся судить насколь стихи г. Богдановича связаны с «народной» психологией белоруса, но такие стихотворения, как «Слуцкія ткачыхі», являются безусловно откликом народной души. Эти чудесные стихи даже для человека незнакомого с белорусским диалектом, открывают истинную красоту выражения на таком казалось бы грубом и неподдающемся наречии. Прекрасно передано настроение «бездольных» ткачих взятых на панский двор «ткаць залатые паясы». За стеной «смеется поле», сияет небо за окном, а они сидят и ткут, переживая за станком родные впечатления «ясных далей», синеющих «милыми васильками».*

Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся рука,
Заміж персідскага ўзора
Цвяток радзімы васілька».

Максім скончыў чытаць. У Беларусі была вясна. І ягоныя думкі імкнуліся міжвольна на Бацькаўшчыну, туды, дзе «блішча збожжа ў яснай далі, Сінеюць міла васількі, Халодным срэбрам ззяюць хвалі Між гор ліючайся ракі...» Максім душою быў там.

А над Яраславіяй плыў абедзенны звон. Нізкім басам спяваў сабор Успення над Стрэлкаю. Звонка, пранізліва гучалі званы храма Іллі Прарока. Аднекуль здалёк даносіўся гук Толгінаўскага манастыра. І над гэтай празрыстай вясёлкай гукаў плыў адзіны звон, ад якога шчаміла сэрца. Плакала званіца былога Спасаўскага манастыра. І ў гэтым трывожным гуку, чуўся жалобны, сумны плач труб яго роднай Гародні. Плакаць званам было чаго. Хоць газеты аб гэтым і не пісалі, але пах пораху першай сусветнай вайны ўжо вісеў у паветры. Званы прадчувалі яе. І таму плакалі.



# «Ты не згаснеш, ясная зараначка»

І зноў восень. І зноў заплакала неба, зямлю пакідаючы. І зноў пачаліся заняткі ў ліцэі.

Гусі адляталі ў вырай і зіму на хвастах цягнулі. Першы снег, такі белы, пушысты, выпаў у верасні. Ён ператварыў белакаменны горад у нейкае зачараванае царства, з белымі царквамі, бялюткімі дамамі, сляпуча-светлымі дрэвамі. Назіраць з вакна такую прыгажосць было немагчыма. Максім выйшаў на вуліцу, каб на першароднай зямлі пакінуць свае сляды. Ён ішоў да Волгі, на Стрэлку. Але бераг ракі нярадасна сустрэў яго. Холадам веяла ад пацямнеўшай вады, непрыветна глядзеў круты бераг. Тут жа адзінока стаяў апусцелы гмах даўно ўжо зачыненага і закалочанага летняга тэатра, а на яго сцяне вецер трапаў і прабаваў сарваць старую слізкую, напалову адляпіўшуюся афішу. Максім хацеў павярнуць назад, але раптам яго паклікаў голас. З баковай дарожкі набліжалася панна, якая, павітаўшыся, заглянула ў яго вочы і весела сказала: «Вы чулі, Аня Рафаілаўна выходзіць замуж за Яна? Шлюб прызначаны на заўтра».

Пасля такіх слоў яму стала зусім дрэнна. Максім нязграбна ўзмахнуў рукамі, немаведама чаму пачаў папраўляць белы каўнерык ды, скончыўшы, апусціўся на лаўку і закрыў далонямі твар, схіліўшы галаву амаль да кален. Напружыліся жылы на яго шыі, і як затрэсліся, так і не пераставалі трэсціся яго вузкія плечы. Губы яго, як закляцце, шапталі: «Аня... мая.. нікаму не аддам».

Колькі ж ён прасядзеў так, Максім не памятаў. Да дому прыйшоў, калі было ўжо цёмна. Над горадам ціха ішоў снег. Ён замятаў сляды Максіма, хаваў сілуэты прахожых, і толькі тую сцяжынку кахання, якая вяла яго да Ані, снегапад не ў сілах быў прыхаваць. Максім спрабаваў не ўспамінаць тых шчаслівых хвілін спаткання з Аняй, але памяць зноў і зноў вяртала яго да іх. Ён хацеў хутчэй схавацца ад сваіх, ад сумных думак у сваім пакоі, але каб трапіць туды, трэба было праходзіць праз пакой стрыечнага брата Пятра Гапановіча. Той жыў у іх доме і працаваў разам з бацькам у банку. Пётр лічыў, што Максім мае заўзятыя адносіны да самастойнай Беларусі, якія да рэшты паглыналі ўсе яго турботы і ўсю ўвагу. Яму здавалася, што ягоны брат замыкаецца ў сваім пакоі, ізаляваным ад жыцця, паглыбляецца ў гэтыя пы-

танні і ў такой шчыльнай падвойнай абалонцы праводзіць свае маладыя гады. Яму, пэўна, хацелася вылячыць яго ад той заўзятасці. Таму ён увесь час імкнуўся весці размовы, якія паказвалі нязбытачнасць гэтых мараў. Для гэтай нагоды ён выкарыстоўваў любы момант: у час абеда за сталом, у хвіліну, калі Максім некуды збіраўся. Вось і ў той вечар, не зважаючы, што Максім прыйшоў сам не свой, ён пачаў гутарку адносна немажлівасці свабоды Беларусі. Але Максім першы раз нічога не сказаў яму на тыя прыкрыя заўвагі. Маўкліва ён пайшоў у свой пакой. Узяў у рукі пяро і паліўся з душы плач ягонага сэрца:

Магда, Магдачка,
Мая кветачка-пралесачка!
Не кахацца мне, хлопу, з табою,
Ваяводы старога дачкою.
Сёння з войтам цябе заручаюць,
Рушнікі вынімаюць,
Русу косу тваю прапіваюць.
Тож траўка-павіліка. расплятаецца, –
Наша вернае каханніца канчаецца.

«Максим и Магдалена», 1915 г.

Ён поўнасцю аддаўся творчасці, пісаў шмат рэцэнзій для газет «Голос», «Наша ніва», часопіса «Русский экскурсант», працаваў над новым цыклам вершаў «На ціхім Дунаі». Але і гэта не дапамагло. Тады юнак вырашыў паехаць на лета ў Ніжні Ноўгарад, да цёткі Машы, якая ў дзяцінстве яго гадавала, і якую ён вельмі любіў. У Ніжнім Ноўградзе жыла Нюта, яго стрыечная сястра. Максім заўсёды меў да дзяўчыны цёплыя пачуцці. Ёй прысвяціў ён рукапісны зборнік «Зеляня», у якім пераклаў на расійскую мову 22 вершы з «Вянка». Але здароўе, якое пагоршылася, не дало наведаць Ніжні Ноўгарад. Каб крыху падлячыцца, ён едзе ў Крым. Там яго чакалі знаёмства з Клавай, прыгожай але замужняй маладой жанчынай, захапленне ёю і новыя пакуты расстання. Ён вярнуўся ў Яраслаўль вонкава паздаравеўшы, але змучаны душою. Над ім вісеў нейкі рок, які не дапускаў да яго звычайнага чалавечага шчасця.

...Максім сыйшоў з цягніка і не пазнаў Яраслаўля. Рэха першай сусветнай вайны дакацілася і да гэтага ціхага волжскага горада. Ён напоўніўся бежанцамі. Змучаныя, галодныя і без усяля-





кай веры, яны шукалі паратунку і прыстанішча. Не далёка ад дома Багдановічаў, на Уласьеўскай вуліцы ў невялікім памяшканні знайшлі прытулак 800 бежанцаў-яўрэяў. Умовы, у якіх прыйшлося жыць людзям з маленькімі дзецьмі, былі жахлівымі. Для іх не знайшлося нават маленькай кухні. І за ежай, шклянкай гарачай гарбаты прыходзілася ісці на суседнюю Барысаглебскую вуліцу, дзе таксама мясціліся яўрэі-бежанцы. Прытулак не належыў няшчасным людзям. Гарадскія ўлады загадалі ім да 15 жніўня вызваліць гэта памяшканне. Максім, для якога чужое гора было яго ўласным, не мог спакойна назіраць за мытарствамі бежанцаў. Узрушаны, ён напісаў артыкул у газету «Голос», у якім з абурэннем казаў аб тым, што гораду трэба быць больш гуманным у адносінах да бежанцаў. Ён добра разумеў, як цяжка ім тут на чужыне, далёка ад радзімы, ад дома, родных, бо і сам жыў у далёкай чужой старане. Максім ведаў, што сярод людзей, якія прыехалі ў Яраслаўль, ёсць і ягоныя суайчыннікі. Таму ён пільна ўглядаўся ў твары бежанцаў, услухоўваўся ў іх гутарку, пытаўся ці не з Беларусі яны. Нарэшце, шчасце ўсміхнулася яму.

Дзень быў цёплы, нават вельмі цёплы для ранняй вясны. Максім, паабедаўшы ў студэнцкай сталовай, сядзеў за сталом і глядзей праз вакно, як вецер гоніць па небу аблокі. Раптам да яго даляцела беларуская гаворка. Так-так, ён не мог памыліцца. За суседнім столікам сядзела некалькі маладых людзей і на прыгожай беларускай мове дзяліліся ўражаннямі ад заняткаў. Максім падхапіўся, падбег да іхняга стала. Вочы яго гарэлі, сам ён быў незвычайна ажыўлены ад нечаканай радасці.

– Адкуль вы?

– З Мінску. Студэнты Мінскага настаўніцкага інстытута.

– Як даўно вы прыехалі з Бацькаўшчыны? Ці прыляцелі ўжо ў нас гракі?

– Гракі ўжо, пэўна, прыляцелі.

– А дзе гнёзды робяць сабе буслы? – Максім засыпаў гэтых маладых беларусаў пытаннямі. Тыя ледзь-ледзь паспявалі адказваць на іх.

– А бярозавік ужо пайшоў? А які ён на смак? Якія першыя кветкі на Беларусі? Пралеска? Яна блакітная, так? Бо інакш і быць не можа, чыстаму блакітнаму веснавому небу зямля павінна нарадзіць адпаведны падарунак.

Студэнты былі здзіўлены.

– Хто Вы, адкуль! – хацелі запытацца яны, але не паспелі. Максім Багдановіч папрасіў прабачэння, што перашкодзіў хлапцам абедаць і пайшоў на свае месца. У галаве насіліся вобразы, музыка вясны гучала вакол яго. І яму так хацелася апынуцца на сваёй Бацькаўшчыне, у гэтай блакітнай краіне. Удыхнуць водар яе паветра...

Ён не заўважаў нічога і пісаў у сваім блакноце:

Вось чмель прагудзеў аксамітны,
Вось ярка-зялёная мушка...
І ўрэшце з краіны блакітнай
Ўлятае маленькая птушка.

Потым ён зноў падыйшоў да сваіх новых знаёмых.

– Давайце знаёміцца! – з нейкай асаблівай цеплынёй сказаў ён беларусам. – Вы нікуды не спяшаецеся?

Пачуўшы, што яны маюць вольны час сказаў:

– Тады я прапаную прайсціся да Волгі.

Максім павёў землякоў па сваім любімым мясцінам. Ён чытаў вершы, быў узрушаны і, нарэшце, шчаслівы. З таго дня яны амаль не расставаліся. Пасля заняткаў, разам з новымі сябрамі Максім то ішоў у бібліятэку, дзе яны сумесна шукалі цікавыя звесткі па гісторыі Беларусі, то рыхтаваўся да вечароў мастацкай самадзейнасці, на якіх часта чытаў свае вершы. Даведаўшыся, што хлопцы яшчэ ні разу не былі ў Волкаўскім тэатры, запрасіў іх на оперу Міхаіла Глінкі «Іван Сусанін» або, як яна называлася раней, «Жыццё, аддадзенае за цара».

Прэм'ера оперы была прызначана на нядзелю. Вечар быў прыгожы, і Максім прапанаваў землякам выйсці з хаты раней, каб мець магчымасць прайсціся па горадзе. Яны крочылі нетаропка, і ў цішы ўрачыста гучаў голас Максіма, які расказваў гісторыю першага нацыянальнага прафесійнага тэатра Расіі, што вёў свой адлік з 1749 года.

– Менавіта, тады яраславец Фёдар Волкаў сабраў аматараў для гульні камедыі і пачаў даваць спектаклі для гараджан. Спачатку ў дамах багатых купцоў, а ў 1750 годзе Волкаў стаў рэгулярна рабіць свае паказы ў вялікім памяшканні амбара купца Палушкіна. Вось тады, мае шаноўныя сябры, і нарадзіўся расійскі тэатр. Хачу засяродзіць вашу ўвагу, што гэта сталася ў сярэдзіне XVIII стагоддзя. Першы ж тэатр ў Беларусі – нашая батлейка, вядзе свой летапіс з XVI стагоддзя. У XVI стагоддзі на нашай зямлі працавалі пры калегіумах і брацкіх школах – школьныя тэатры з характэрнымі для яго паказаў народнымі ўстаўкамі-інтэрмедыямі. А ў сярэдзіне XVIII стагоддзя ствараюцца прыватныя тэатры ў Нясвіжы, Слуцку, Шклове, Магілёве, Чачэрску, Слоніме, Свіслачы, Плешчаніцах, па ўсёй Беларусі.





– Але вернемся да Волкаўскага тэатра, – з імпэтам працягваў Максім. – У 1751 годзе Волкаў знайшоў для яго новае спецыяльнае памяшканне. Але праз некаторы час ён быў вымушаны пакінуць свой родны горад. Па загаду імператрыцы волкаўцы былі ўзяты на сцэну сталічнага тэатра. А яраслаўскі тэатр сталі ўзначальваць браты Фёдара – Аляксей і Гаўрыла. Толькі матэрыяльныя прычыны не дазволілі ім працягваць распачатую справу. З 1756 года тэатр перастаў існаваць. І адрадзіўся толькі ў пачатку 80-х гадоў XVIII стагоддзя. Для яго пабудавалі спецыяльнае памяшканне.

Калі Багдановічы прыехалі ў Яраслаўль старога будынка тэатра ўжо не было, і ў горадзе ішлі дэбаты, якім быць новаму тэатру. Нарэшце, 28 верасня 1911 года адбылося афіцыйнае яго адкрыццё, на якое з'ехаліся многія вядомыя сцэнічныя дзеячы. К. С. Станіслаўскі, які не змог прыехаць, даслаў тэлеграму-віншаванне. А шматлікія мецэнаты ахвяравалі тэатру творы мастацтва. Адкрываў тэатральны сезон спектакль А. Астроўскага «Навальніца». Цудоўная трупа, надзвычай прыгожыя дэкарацыі. І аб тэатры хутка загаварылі ў сталіцы Расійскай імперыі.

І сапраўды, антрэпрэнёр Варатнікоў сабраў цудоўны творчы калектыў. Выдатныя пастаноўкі, прыгожае афармленне прынеслі вялікі поспех. Кожны новы спектакль быў лепшы за папярэдні. Усё гэта патрабавала шмат намаганняў і сродкаў. Не дзіўна, што Варатнікоў, не вытрымаў такога напружанага рытму і пакінуў тэатр.

Другі сезон трупай кіраваў багаты, але бяздарны антрэпрэнёр П. Каралі. Ён адразу змяніў рэпертуар. Афішы стракацелі гучнымі назвамі мяшчанскіх меладрамаў: «Жалезная маска», «Зладзейка дзяцей» і іншых падобных пастановак, якія прыносілі прыбытак.

З імем П. Каралі і яго трупай у Максіма адбыўся такі выпадак. Аднойчы рэдактар газеты «Голос» заказаў яму зрабіць агляд яраслаўскага часопіса «Микроскоп», які даволі часта бестактоўна і беспадстаўна нападаў на газету «Голос» і яго супрацоўнікаў. То быў штотыднёвы невялікі часопіс, які насіў шантажны характар.

Досціпам, едкасцю сатыры ён не вызначаўся. Затое адзначаўся грубымі выпадамі супроць грамадскіх дзеячоў ці гандлёвых фірмаў і прадпрыемстваў. Ад яго можна было адкупіцца, змясціўшы ў ім абвестку. Такім чынам ён і набыў сабе кліентуру. Пакуль Каралі не карыстаўся паслугамі «Микроскопа», той змяшчаў на яго карыкатуры і вершыкі кшталту:

Купец именитый Каралли
Поддался наживы дурману,
Он верен единой морали:
Служи не искусству – карману.
Купец именитый Каралли
Сменил на торговлю искусство...

Але як толькі Каралі прынёс ў часопіс першую аб'яву Волкаўскага тэатра, «Микроскоп» адразу надрукаваў вялікі артыкул. У ім апавядалася аб тым, як публіка чакае адкрыцця сезона, як з тэатрам звязаны ўсе яе надзеі. Гэты і іншыя факты і прывёў Максім у сваім артыкуле «Жёлтые цветы», надрукаваным ў «Голосе» 12 лютага 1914 года. А праз тыдзень «Микроскоп» змясціў на сваіх старонках адразу тры матэрыялы, прысвечаныя «Жёлтым цветам».

...У тую раніцу Максім адкрыў часопіс і здзівіўся. Не, ён чакаў, што «Микроскоп» адкажа на «Жёлтые цветы» і паспрабуе яго абліць брудам. У гэтым ён не сумяваўся, бо добра вывучыў хамелеонапрадажнае аблічча часопіса. Але каб тры матэрыялы, прысвечаныя яго артыкулу і ў адным нумары... Занадта! Такога Максім сабе не ўяўляў. Пісалі самыя злосныя аўтары часопіса. Відаць, моцна закранула выступленне Максіма Багдановіча, калі сам рэдактар Семяноўскі ўзяўся за пяро. Ён спрабуе адыграцца, піша, што не вельмі закрануты заўвагамі аўтара. Але чаму тады ён так хапаецца за кожны, нават самы нязначны факт? Рэдакцыя спрабуе такім чынам набыць індульгенцыю? Але не хапіла ў раз'юшаных апанентаў ні фактаў, ні таленту для сур'ёзнага абвяржэння. Максім з абыякавасцю чытаў артыкул «Расшаркивающиеся лжецы».

*«Долго и прочувственно молчал «Голос» в отношении нашего журнала, даже о предстоявшем его выходе в свет не обмолвился ни словом, уделяя в то же время место таким общественным явлениям, как кражи, неметенные улицы, грязь и проч., долго не замечал, не видел журнала, хотя журнал и бросал ему иногда не совсем приятные обвинения в лицо, и наконец, заметил!*

*Да еще как! – посвятил журналу чуть не полномера!*

*С большой, вероятно, не заслуженной нами добросовестностью, г. Богданович, автор статьи «Желтые цветы», занялся изучением журнала за целый год. Шаг за шагом усидчиво и кропотливо собирал в журнале «факты», имеющие повергнуть его в прах. Эта внимательность и добросовестность нам несказанно польстили.*

*Но грянул гром!.. Неожиданный, не из тучи и мы... Остались невредимы.*

*Добросовестности у г. Богдановича хватило только на чтение журнала, но это не смутило «Голос» и он напечатал его статью.*

*Приступая с душевным трепетом к ее чтению, мы думали увидеть оценку общественной роли журнала, оценку его идейной работы за целый истекший год и обнаружили передергивание «фактов», попутно расшаркивание перед его высокостепенствами и просто степенствами – «местными уважаемыми общественными деятелями» и их прислужниками, переставшими, очевидно, давать «гонорар» объявления.*

*... К сожалению, недостаток места не позволяет распространиться о причинах, вызвавших появление статьи «Желтые цветы». Причины эти так очевидны!*

*... Мы не станем в этой заметке касаться вопроса о театре и «рекорде», о которых в этом номере печатался фельетон «демона», и отзыва «южанина», укажем лишь на полную необоснованность ссылки на объявления Н. А. Донцева.*

*После распродажи, когда Н. А. Донцев открыл «Венский магазин», по «Голосу», раз мы писали о Н. А. Донцеве, нам нужно было отказаться от предложенного Н. А. Донцевым объявления?*

*Так что ли?*

*Этого удовольствия мы «Голосу» не доставили, и он здравствует устами г. Богдановича.*

*Дальше – г. Новиков и магазин обуви г. Дмитриева. Всякому читателю журнала известно, что магазин Дмитриева вовсе не печатает своих объявлений в журнале, если не считать нескольких объявлений в начале прошлого года, т. е. почти год назад. И вот Богданович прибегает к гнуснейшему средству лжи.*

*«Фирма Дмитриева, – пишет он – печатает объявления в «Микроскопе» постоянно».*

*Пусть читатели перечитают «Микроскоп» за год и увидят, что Богданович – лжет.*

*...Частный факт с Новиковым, взятый для характеристики справок института о кредитоспособности, для Богдановича повод увидеть защиту «дельца».*

*...Мы могли бы привести еще много фактов из вашей полезной деятельности, не в пользу степенств и высокостепенств, если обладали желанием ответить такой же добросовестностью, но общество уже оценило вашу деятельность и выработало определенное отношение. И если читает «Голос», то только потому, что в Ярославле нет газеты.*

*Мы не настолько уязвлены статьей г. Богдановича, чтобы опускаться до серьезной полемики с вами. Ведь это только ваши статьи, только ваши передергивания, ну а с вами не принято серьезно считаться».*

Максім Багдановіч перачытаў артыкул спакойна, ён быў падрыхтаваны на нешта падобнае. А ўсё ж моцна закранулі за жывое ягоныя «Желтые цветы» рэдакцыю. Ніжэй рэдактарскага артыкула стаялі яшчэ дзве публікацыі. Невядомыя асобы, схаваўшыяся за псеўданімамі Южанин і Демон, недалёка адыйшлі ад свайго патрона па ператасоўцы фактаў. А па паклёпу нават пераўзышлі яго. Асабліва Южанин, які, будучы зусім незнаёмым з Максімам, у артыкуле «По поводу «Желтых цветов» піша:

*«Богданович удивляется, откуда мы раньше знали, что М. Муравцев – премьер, первый герой-любовник, а П. Максимова известная провинциальная актриса с амплуа молодой героини. И что всего интереснее, – говорит он, – написано это в то время, когда новая труппа П. Каралли не успела еще дать ни одного спектакля.*

*Для г. Богдановича это, правда, очень большой секрет.*

*Потому что человек совсем незнакомый с театром, и, как он мне сам признался, был в театре только раз и то 10 лет назад».*

Гэта быў такі падман і паклёп, што Максім, які зусім звыкся з хлуснёй «Микроскопа» і то здзівіўся. Хацеў паказаць артыкул бацьку, які раней у Горадні быў прадстаўніком таварыства дра-





матычных пісьменнікаў і оперных спевакоў, каб разам пасмяяцца, але потым перадумаў. А сапраўды, калі ён апошні раз быў у тэатры? Звычайна ён хадзіў толькі на значныя спектаклі, або калі ролю выконваў вядомы расійскі акцёр. Але апошнім часам рэпертуар быў настолькі пасрэдны, што Максім перастаў наведваць тэатр. І вось выдаўся выпадак паказаць сябрам прыгожы палац Волкаўскага тэатра.

Вялікая напоўненая святлом тысячаў агенчыкаў, зала тэатра імя Ф. Волкава. Партэр, ложы, галёрка, – усюды крыху ўсхваляваная публіка. Хаця сябры паклапаціліся і прыйшлі загадзя, сесці ім разам не ўдалося. І таму сустрэліся толькі ў антракце. Максім быў усхваляваны, яго зачаравала прыгажосць тэксту, музыка оперы. Ён адчуваў, што яе сіла ў народнасці.

– Дзе народ, там і хараство, там і сіла, там і праўда, – горача казаў ён сябрам. – Фігура Сусаніна! А арыі, а хор! Сапраўды, так можа спяваць толькі народ. Думаеце, не мае ў сабе гэтай прыгажосці і беларуская песня? Толькі, на вялікі жаль, мала я іх чуў.

Максіму Багдановічу пашанцавала. Васіль Гарбацэвіч, будучы беларускі драматург, які ведаў шмат песень з усіх беларускіх абрадаў, пад уражаннем пачутага, вырашыў зрабіць канцэрт беларускай песні. Максім Багдановіч не верыў, ён настойваў, каб неадкладна, пасля спектакля. Але быў позні час і вырашылі перанесці канцэрт на наступны дзень.

Пасля заняткаў Максім не ішоў, а ляцеў быццям на крыллях на кватэру Васіля Гарбацэвіча. Ён гарэў жаданнем хутчэй пачуць родныя мелодыі і ўсё прыспешваў сябраў. Канцэрт пачаўся з вясельных песень. Расказваючы пра кожны абрад, Васіль спяваў характэрную песню. Асабліва ўсхвалявала Максіма «Ой, ляцелі гусачкі цераз сад», «Няма горшага ка́та ад родненькага брата», «У гордае цёшчы стой зяць за варотамі», «Наляцела сівых галубоў».

Калі Васіль скончыў спяваць, Максім падбег да яго, пацалаваў і пачаў горача дзякаваць, паўтараючы: «Якое багацце! Якая музыка! Зрабіць бы гэта фонам для беларускай оперы». Трохі супакоіўшыся, ён дадаў: «Вось толькі скончу гэты праклятыя ліцэй і паеду ў Беларусь, дадому. Абавязкова пабуду на вяселлі. Годзе ўжо бадзяцца па свеце. І ніякая сіла мяне тут не ўтрымае».

...Да заканчэння ліцэя і вяртання на радзіму заставаліся лічаныя дні. Становішча на беларускім фронце яшчэ больш ускладнілася. Многія пакідалі Беларусь, адракаліся ад яе. Але Максім за-

ставаўся верны ёй, сваёй Маці-Краіне, негледзячы на кволае здароўе, якое станавілася ўсё горшым, на сурьёзныя рознагалоссі ў сям'і. Бацька, стрыечны брат Пётр Гапановіч не падзялялі яго поглядаў у адносінах да Беларусі. Яны не верылі ў яе свабоду і незалежнасць. Максім жа прачытаў у вершы «Беларусь, твой народ дачакаецца» (1915 г.):

Беларусь, твой народ дачакаецца
Залацістага, яснага дня.
Паглядзі, як усход разгара<ецца>,
Сколькі <ў хмарках залётных> агня.

Ён скончыў ліцэй і вярнуўся ў Беларусь за некалькі месяцаў да Лютаўскай рэвалюцыі і да сваёй смерці. Нават паветра радзімы, атмасфера яе прыфрантавых будняў здавалася яму лепшай за ўсё. Максім хацеў, як з крыніцы, напіцца водару роднага краю. Бо адчуваў, што толькі ён дапаможа яму.

Ён пакідаў Яраслаўль зранку. І калі ў вакне цягніка апошні раз убачыў шырокую роўнядзь шэрай неспакойнай Волгі, калі напаследак узніклі такія знаёмыя сілуэты цэркваў і званіц, якія здавалася плылі ў сіняй вышыні, нешта сціснула яму ў грудзях. І тады ўспомнілася першае адчуванне горада: ноч, высокі змрочны бераг, на якім чорным зломам падымалася званіца, светлыя агеньчыкі Яраслаўля, дзве-тры чырвоныя плямы – бартавыя ліхтары параходаў, што стаялі на прыстані. Хіба ведаў ён тады, што пазней гэты горад стане для яго блізкім і дарагім. Максім быццам бы адчуў, што ўжо ніколі больш ён не ўбачыць Яраславію, з якой яго столькі звязвала: юнацтва, першае каханне, «Вянок», незбыўныя мары і шмат такога, што словамі не перадаць. У думках пранеслася:

Шмат зазнаў я горычы з нудою,
Што шчаміла, мучыла, пякла..
Усё ўжо прайшло, сплыло вадою, –
Маладосць не знікла, не прайшла!

І радасць, як іскарка шчасця, успыхнула ў ягоным сэрцы. Горад яго маладосці на развітанне прадстаў ва ўсёй сваёй прыгажосці.





Максім Багдановіч назаўсёды пакідаў свой яраслаўскі дом – ён ехаў у Беларусь.

У Мінску ён знойдзе часовы прытулак у Змітрака Бядулі. Цэлымі днямі будзе працаваць на карысць радзімы ў камітэце бежанцаў, а па вечарах і ноччу пісаць вершы.

Але адкрытая форма туберкулёзу не дазволіць яму ўбачыць вясну ў Беларусі. Ён зазірне ў яе блакітныя вочы ў Ялце, куды сябры ўгавораць яго паехаць лячыць здароўе. Але мора не прынясе суцяшэння. Максім прадчуваў канец. Адзінае, што ён хацеў, дык гэта памерці на радзіме. Але лёс вырашыў інакш: 25 мая 1917 года яго не стала.

У апошнія дні Максім часта ўспамінаў родную Беларусь, блізкіх яму людзей. Дзеля светлага дня роднай Бацькаўшчыны ён, зусім хворы, працягваў працаваць над лямантаром для дзетак-беларусаў, сваім зборнікам вершаў. Але часам прыгадваўся яму белакаменны горад на Волзе, дзе ўпершыню ўбачыў ён Аню, свой «Вянок». І тады ў сэрца наплывала радасць, з ёю – лёгкі сум. Тыя пачуцці грэлі яго ў апошнія цяжкія дні адзіноты. Можа таму, нават паміраючы, бачыў ён сваё жыццё ў яркіх колерах, дні маладосці – у залатых агнях. Ён быў не самотны. І гэтыя пачуцці падарыла яму яго Яраславія – яго другая радзіма.

# Перапісчык

Вясна 1912 году была ў поўным разгары. Падыйшоў, нарэшце, і жаданы дзень роспуску на летнія вакацыі. Наперадзе было некалькі экзаменаў і ўсё – пачыналася шчаслівейшая пара студэнцкага жыцця. З гэтым радасным настроем ліцэіст 1 курса Дзямідаўскага юрыдычнага ліцэю Максім Багдановіч вяртаўся дадому. Добрае надвор'е, цёплы вецер, што час ад часу падымаў у блакіт майскага неба лёгкія празрыстыя аблокі з яблыневых пялёсткаў, – спрыялі радаснаму творчаму настрою. І ад навакольнай прыгажосці, ад пачуцця завяршэння першага, такога складанага году вучобы ў нелюбімым ліцэі, усё спявала ўнутры.

Максім ішоў уздоўж набярэжнай. Над Волгай плыў прыгожы перазвон званоў Спаскага манастыра. Званы склікалі манахаў і яраслаўцаў у Спаскі сабор.

– Якое ж свята сёння? – падумаў Максім, параўняўшыся з Святой брамай манастыра. І раптам, як маланка, пранеслася думка: калі сёння свята, то можа і прыехаўшы архімандрыт дазволіць яму паглядзець музей Спаскага манастыра?

Пазнаёміцца з багаццем скарбаў аднаго з найбагацейшых і таямнічых музеяў Яраслаўля было складана, але ганарова. Спаскі манастыр быў заснаваны ў Яраслаўлі ў канцы XII стагоддзя. У 1216–1218 гадах на яго тэрыторыі былі пабудаваны першыя мураваныя храмы. У тыя ж годы, тут была закладзена бібліятэка, якая ўжо на пачатку свайго існавання налічвала тысячы кніг. Пажары і войны неаднойчы знішчалі бібліятэку, але Спаскі манастыр папаўняўся новымі выданнямі. Патронам манастыра быў Іван Жахлівы, які неаднойчы хаваўся за яго сценамі ад ворагаў, то можна толькі здагадвацца, якія шчодрыя дары атрымоўваў манастыр.

Музей манастыра размяшчаўся ў рызніцы. І толькі архімандрыт даваў дазвол на яго наведаванне. Праўда, часамі добры вартаўнік-манах, дазваляў на некалькі хвілінаў зайсці ў рызніцу і паглядзець, якія незвычайныя скарбы мае музей, але гэта здаралася вельмі рэдка.

Першы раз Максім наведаў рызніцу манастыра, будучы гімназістам. Экскурсію для сваіх гадаванцаў арганізаваў настаўнік гісторыі Парфірый Мізінаў. Максіма тады ўразіла калекцыя старажытных рукапісных кніг. Па сутнасці, гэта было ягонае першае





знаёмства з рукапісамі. Пасля, у час свайго наведвання Вільні, ён бачыў старадрукі і рукапісы ў Беларускім музеі Івана Луцкевіча. Пэўна, што за некалькі гадзін, якія Максім правёў у музеі, ён мог толькі бегла пазнаёміцца з багаццем беларускага народу. Але яму вельмі хацелася яшчэ раз прагледзець старажытныя пажаўцелыя старонкі пергаменту, учытацца ў радкі, поўныя глыбокага сэнсу, у якія ўкладалі ўсю сваю душу і ўменне манахі-перапісчыкі і летапісцы.

Каля Святой брамы, якая адгароджвала манастыр ад знешняга свету, Максім прыпыніўся. Нейкае незразумелае хваляванне ахапіла яго. Ён пастаяў крыху, а пасля рашуча адчыніў дзверы брамы. Вартаўніка не было, і Максім без перашкод увайшоў на тэрыторыю манастыра. Здзівіла яго незвычайная цішыня і бязлюднасць. Нікога не ўбачыў ён і каля манастырскіх келляў і Спаскага сабору. Цішыня была і каля рызніцы. Дзверы ў яе таксама былі адчынены. Максім Багдановіч увайшоў у будынак рызніцы, прайшоў некалькі крокаў цёмным карыдорам...

– Малады чалавек, жадаеце пазнаёміцца з музеям манастыра?

Голас належыў старэнькаму сівому манаху, які з'явіўся так нечакана і бесшумна, што Максім Багдановіч нават разгубіўся.

– Так, вельмі хачу, – нарэшце, прамовіў Максім. І з надзеяй запытаўся: – Калі мажліва, то я хацеў бы пабачыць рукапісны аддзел.

– Рукапісы – гэта добра, – сказаў манах. – Сёння мы якраз маем новыя паступленні. Архімандрыт прывёз.

Максім увайшоў у невялікую залу. Тут пахла ладанам і воскам. Рукапісы стаялі ў шкляных шафах. Манах адчыняў шафы і даставаў з іх кнігі. Дастаўшы некалькі фаліянтаў, ён сказаў:

– Можаце пакуль праглядаць гэтыя, а я пасля прынясу Вам новыя рукапісы.

Максім застаўся адзін. Кнігі былі пакрыты бурай скурай, з медзянымі і сярэбранымі філігранямі. Пісаліся яны, відаць, гадамі, бо можна было прасачыць, як з часам мяняўся почырк перапісчыка. Некаторыя рукапісы перапісваліся, відаць, зусім старымі людзьмі, бо літары тэксту ледзь прыкметна дрыжалі. Але якія прыгожыя былі застаўкі, у выглядзе незвычайных кветак, звяроў, птушак! Немагчыма было адарваць вачэй ад гэтага суквецця завіткоў і ўпрыгожванняў. Максім уважліва ўчытваўся ў радкі летапісаў, некаторыя з якіх ён занатоўваў на паперы. Так у чытанні і

роздуме прайшло некалькі гадзін. Працу прыпыніў вартаўнік музея, які прынёс невялікі фаліянт.

– Гэтую кнігу архімандрыт Маскоўскі сёння падарыў нашаму манастыру. Вы толькі паглядзіце, што гэта за рукапіс. Ніколі я яшчэ не бачыў такога.

Максім паглядзеў і здзівіўся. Не, змест рукапісу быў звычайны, бо *«адны і тыя ж рукапісы знаходзіліся як у Кіеве, так і ў Полацку, і ў Уладзіміры, вытвараныя, напрыклад, у XI–XII сталецці, чыталіся і перапісываліся нават цераз колькі сто гадоў».* Нешта незвычайнае бачылася яму ў роўным, быццам бы друкаваным тэксце кнігі. Не было характэрных завітушак, малюнкаў кветак і звяроў, але была такая незвычайная лёгкасць, такая ажурнасць! Літаркі былі напісаны так роўна, што проста не верылася, што кніга пісана чалавекам, а не надрукавана ў друкарні. Глянуў на год стварэння кнігі – 1022 год. Месца – Полацак.

Дрыжыкі прабеглі па яго целу. У гэты ж час вялікая Еўфрасіння Полацкая папрасіла епіскапа Полацкага Іллю, што кіраваў прастолам святой Сафіі ў Полацку, дазволіць ёй жыць у царкве святой Сафіі ў мураванай келлі. І той дазволіў. *«І яна ўвайшла туды, і ўспрыняла найпадзвіжнейшы подзвіг посту, і пачала пісаць кнігі сваімі рукамі і прыбытак [ад продажу іх] аддавала тым, хто папросіць».*

І пайшлі па свету кнігі Еўфрасінні Полацкай. І неслі гэтыя кнігі не толькі асвету і праўду жыцця, але і цяпло светлай душы полацкай манашкі. Ад яе, Еўфрасінні, пайшла добрая традыцыя асветніцтва, развіцця пісьменнасці беларусаў. *«І развіццё беларускай пісьменнасці ішло чым далей, тым усё больш бардзеючым крокам і павялічывалася не ў арыфметычнай, а ў геаметрычнай прагрэсіі; так камень, ідучы да дна соннага става, робіць на яго люстранай гладзі спачатку ледзве відны, але ў сто раз болей пашыраючыся круг; такім жа парадкам узрастала і нашая пісьменнасць».*

Можа калісьці і да гэтай кнігі, якую Максім трымаў у руках, дакраналіся рукі Еўфрасінні Полацкай.

Зноў зазванілі званы, якія клікалі на вячэрнюю службу.

– Малады чалавек, – звярнуўся вартаўнік. – Пара зачыняць рызніцу і ісці на вячэрнюю службу ў Спаскі сабор.

– Якое сёння свята? – спытаў Максім, прыслухоўваючыся да велічнага спеву званоў.





– Дзень святой Еўфрасінні, княгіні Полацкай. Гэта адна з першых праваслаўных святых, і сёння вельмі вялікае свята.

І тут Максім усё зразумеў: і чаму, менавіта, сёння яму захацелася прыйсці ў Спаскі манастыр, і чаму сёння яму пашчасціла пабачыць старажытныя рукапісы, і чаму сёння ён убачыў рукапіс з Полацку, Яе, цяпер Максім не сумняваўся, Еўфрасіннеўскі рукапіс. І ў спеве званоў чуўся яму голас самой Еўфрасінні. Ёй некалі маліліся ягоныя продкі, просячы выратаваць іх ад няшчасцяў. Ёй малілася і ягоная маці:

Калі я малюся штоpанак, Табе,
прэпадобная Еўфрасіння,
І прашу вярнуць памяць майму народу,
Ты сумна глядзіш на мяне
І нічога ў адказ не гаворыш.

Калі я стаю прад Табою апоўдзень
З надзеяй, што ты знойдзеш
краіне маёй ратаванне
Ты быццам не бачыш мяне сроз слёзы,
І я бязгучна сама пачынаю плакаць

Калі я прыхожу пасля заранiцы
І звяртаюся зноў да Цябе,
прэпадобная Еўфрасіння,
Даць маёй Беларусі Веру, Надзею, тваю апеку
Ты зноў маўчыш, але ў тваім маўчанні, я чую адказ.

Таму шторанак, штопоўдзень, штовечар
Я іду да цябе ізноў,
І прашу за мой народ
і яго загубленыя святыні,
З надзеяй, што Ты,
прэпадобнейшая Еўфрасіння,
Выканаеш маю адзіную просьбу.

Разам з вартаўніком Максім выйшаў з рызніцы і накіраваўся да Спаскага сабору. Служба, у гонар Еўфрасінні Полацкай, пача-

лася ўрачыста і велічна. Максім стаяў у царкве і ціха дзякаваў Еўфрасінню за тую ласку, якую яна аказала яму сёння. І стоячы ў царкве, звяртаючыся ў малітве да яе, заступніцы беларускага народа, нараджаліся аднекуль забытыя радкі, навеяныя ўражаннем сустрэчы з святой Еўфрасінняй Полацкай.

На чыстым аркушы, прад вузенькім акном,
Прыгожа літары выводзіць ён пяром.
Устаўляючы паміж іх чорнымі радамі
Чырвоную страку: усякімі цвятамі,
Рознакалёрнымі галоўкамі звяроў
І птах нявіданых, спляценнем завіткоў
Ён пакрашае скрозь – даволі ёсць знароўкі –
Свае шматфарбныя застаўкі і канцоўкі
І загалоўкі ўсе, – няма куды спяшыць!

«Перапісчык», 1914 г.



# Пакліканы Адраджэннем

У снежні 1915 году Максім Багдановіч паехаў у Маскву да гісторыка Уладзіміра Іванавіча Пічэты, які выкладаў курс гісторыі ў Практычнай Акадэміі камерцыйных навук. У. І. Пічэта не быў беларусам, але ягоныя творы зрабілі яго вядомым у беларускім асяроддзі. У сваіх навуковых працах «Літоўска-польскія вуніі і адносіны да іх літоўска-рускай шляхты», «Літоўска-руская дзяржава», «Гедымін», «Гістарычны нарыс славянства» ён разглядаў і беларускія пытанні. Максім ехаў да Пічэты за парадай. Ён даўно ўжо вывучаў гісторыю Беларусі і адчуваў, што прыйшоў час падзяліцца некаторымі сваімі думкамі з прафесійным гісторыкам. Многія свае творы юнак пісаў інтуітыўна, ведаючы, што, менавіта, так, а не інакш падзея адбывалася ў мінулым. Гэтую падсвядомую прадбачлівасць, якая ўзнікала ў час напісання вершаў, ён перанёс і ў сваю мастацкую публіцыстыку, а пазней і крытычныя артыкулы. Што б не пісаў ён: рэцэнзіраваў збор твораў ці рабіў агляд творчасці пісьменніка, даследваў генеалогію верша ці ягоныя паэтычныя рытмы і рыфму – усюды імкнуўся разгадаць загадку той эпохі. І ягоныя свежыя назіранні, трапныя заўвагі, характэрызуюць не толькі літаратурны талент Максіма Багдановіча, але і ўменне адчуць той далёкі час і сітуацыю, у якой пісаліся гэтыя творы.

Усе Максімавы артыкулы былі сугучным сінтэзам паэзіі, гісторыі, слова. Але ці правільная яго інтуіцыя? Дзесяткі, сотні перачытаных кніг па гісторыі і культуры Беларусі не давалі пэўнага адказу. Патрэбен быў час, які б пацвердзіў правату ягоных здагадак. Час або вопыт чалавека, які шмат гадоў вывучаў гісторыю, хто, дзякуючы свайму багатаму даследчыцкаму вопыту, мог адказаць, ці сапраўды ўсё так яно і было.

Максім адчуў патрэбу параіцца з І. І. Пічэтам, калі пачаў працаваць над артыкулам «Белорусское возрождение». Хаця артыкул і быў надрукаваны ў часопісе «Украинская жизнь», але некаторыя дэталі, асабліва тыя, што тычыліся ўзаемасувязі Беларусі з гісторыяй Расіі, Максім хацеў абмеркаваць з выдатным знаўцам гісторыі славянства. Уладзімір Пічэта, які жыў далёка ад Беларусі і ад Яраслаўля, як здавалася Максіму, быў адзіным чалавекам, які мог яму нешта параіць і дапамагчы. Таму ён і рашыў ехаць да І. І. Пічэты.

Хатнім Максім сказаў, што паедзе да брата Лёвы, які вучыўся на фізіка-матэматычным факультэце Маскоўскага універсітэту. Ад таго даўно не было ніякіх лістоў, і бацька пачаў хвалявацца. Таму Адам Ягоравіч нават узрадаваўся намеру Максіма паехаць у Маскву, каб адведаць брата і сваіх знаёмых і нават даў на дарогу грошаў.

Ноч перад ад'ездам была суровая. Круціла завіруха. З Волгі дзмуў халодны вецер. І толькі пад раніцу снег спыніўся, і ранак сустрэў прыгожым краявідам зачараванага снежнага царства. З светлым пачуццём Максім адправіўся ў Маскву.

Цягнік ляцеў шпарка, заснежаныя краявіды мільгалі ў вакне. За доўгую снежную ноч усё змянілася. Толькі па ледзь бачных арыенцірах можна было здагадацца аб знаёмых некалі мясцінах. Недзе там, за ўзгоркам, каля прыгожых залаташлемных събораў схавалася пад глыбокім ільдом і снегам прыгожае возера Неру. На яго берагах, як на далоні, раскінуўся Растоў Вялікі, равеснік Полацку. Максім ведаў, як і горад-радзіма Скарыны, што ганарыцца сваім Сафійскім саборам, так і Растоў Вялікі меў гонар ад старажытнага крамля. Здалёк былі бачны яго 10 вежаў і купалы пяці цэркваў. А недалёка ад Крамля Спаса-Якаўлеўскі манастыр, у якім захавалася адна з найбагацейшых бібліятэк старажытных рукапісаў. Старадрукі заўсёды цікавілі Максіма. Яны былі сведкамі той далёкай мінуўшчыны, якая не можа ні вабіць чалавека. Юнаку ўжо даводзілася бачыць рукапісы рызніцы Спаскага манастыра ў Яраслаўлі і пажаўцелыя старадрукі з прыватнай бібліятэкі ягонага настаўніка Парфірыя Мізінава. Найбольшае ўражанне пакінулі фаліяты, якія паказваў яму Вацлаў Ластоўскі ў музеі Івана Луцкевіча. Музей, экспанаты якога ягоны заснавальнік Іван Луцкевіч збіраў усё жыццё, былі сапраўды рэдкасныя.

Пад уражаннем пабачаных рукапісаў, Максім напісаў цыкл твораў пра старажытную культуру беларускага народу «Старая Беларусь». Пазней ягоныя маленькія шэдэўры здзівілі даследчыкаў багдановічаўскай творчасці. Тыя доўгі час не разумелі, як ён за кароткі час экскурсіі па музею Івана Луцкевіча змог убачыць самае істотнае ў старадруках, адчуць дух тых далёкіх часоў, настрой далёкіх стагоддзяў. Толькі па інтуіцыі зрабіць гэта немагчыма, нават генію. Даследчыкі доўга не ведалі аб той вялізарнай працы, якую правёў Максім Багдановіч ў старажытным Яраслаўлі, вывучаючы старадрукі, якія захаваліся ў яраслаўскіх храмах.





Без той штодзённай працы, магчыма, і не нарадзіўся бы ягоны цыкл «Старая Беларусь».

Максім сядзіць ля вакна. Здаецца, пазірае на навакольныя краявіды, але ў думках ён ўжо у Маскве. Як сустрэне яго Пічэта? Ці збудуцца ягоныя надзеі на супрацоўніцтва або ён, як гаворыць бацька, летуценнік, занёсся ў далёкія далягляды? А цягнік ужо не ляціць, а цягнецца. Чым бліжэй Масква, тым марудней ідзе час. Максім спрабуе не думаць аб сустрэчы, засяродзіць увагу на прыгожых краявідах, але кожны горад, станцыя, якую ён праязджае, наводзяць на нейкія паралелі з Беларуссю. Узяць бы той жа Аляксандраў. Калісьці тут была вядомая гістарычная Аляксандраўская слабада, калыска друкарства ў Маскоўскай Русі: тут была наладжана пры Іване Жахлівым адна з першых друкарняў на тэрыторыі Маскоўшчыны. Сталася гэта ў сярэдзіне XVI стагоддзя. А першую кнігу на максімавай Радзіме, ў Вільні, Ф. Скарына выдаў у 1522 годзе. Так што «Малая падарожная кніжка» апярэдзіла расійскія выданні на некалькі дзесяткі гадоў.

Альбо славутая Троіцка-Сергіеўская лаўра. У пачатку XVII стагоддзя пад яе сцены падыйшлі разам з войскам Сапега і Лісоўскі. Шмат беларусаў загінула пад сценамі горада-крэпасці, які выстаяў 16-месячную аблогу сапегаўскага войска...

Каля Сергіеўскага пасаду цягнік прыпыніўся на нейкі час. Спадарожнікі па дарозе выйшлі на перон, Максім застаўся сядзець у вагоне. Праз заледзянелыя снежныя карункі вакенца ён глядзеў на людзей, што шпацыравалі па перону. Раптам ён убачыў (а можа гэта толькі яму здалося?) стройную фігуру Ані. Не, ён не мог памыліцца: яе кажушок, які прыгожа аблягаў яе статную фігуру, белая пуховая хустка. Быццам бы маланка ўдарыла ў галаву, Максім падхапіўся, схапіў капялюш і, як сядзеў у легкім касцюме, так і выбег на перон.

Дзяўчыны ўжо не было, але гэта не прыпыніла Максіма. Ён бег па перону, і крычаў наколькі хапала моцы «Аня!», «Аня!». На ягоны воклік аглядаліся маладыя дзяўчаты, але сярод іх не было той, якая была так падобна на яго цемнавокую пані. І толькі калі моцны прыступ кашлю ўскалыхнуў ягоныя грудзі, Максім апамятаўся. З нейкім цяжкім пачуццём вярнуўся ён у вагон. Сэрца шалёна білася ад бегу і адчування загубленага шчасця. Увесь астатні шлях Максім з нейкай абыякавасцю глядзеў у вакно і ўжо не думаў аб сустрэчы з У. І. Пічэтам.

Нарэшце, белымі саборамі паказалася Масква. Яраслаўскі вакзал. Сотні людзей. Максім адразу ўцягнуўся ў віхор бурлівага сталічнага руху. Паддаючыся пачуццю нечакана нахлынуўшай свабоды, юнак накіраваўся на адрас Пічэты.

У. І. Пічэта жыў на другім паверсе вялікага трохпавярховага дома. Максім з незразумелай яму цяжкасцю падняўся па лесвіцы і пазваніў у дзверы. На ягоны званок выйшаў высокі мужчына, гадоў на 13 старэйшы за Максіма. На пытанне: «Ці магу я пагаварыць з Уладзімірам Пічэтам», той неяк суха адказаў: «Я – Пічэта. Чым магу быць карысным, малады чалавек?».

Максім прадставіўся як студэнт Яраслаўскага дзямідаўскага ліцэю і аўтар паэтычнага зборніка «Вянок». Расказаў пра сваё захапленне беларусістыкай, сваіх сувязях з рэдакцыяй газеты «Наша ніва», падзяліўся сумненнямі, сваімі думкамі аб вывучэнні роднай літаратуры. Пічэта слухаў быццам бы ўважліва, але, як паказалася Максіму, было ў ягоным поглядзе больш ветлівай цікавасці, чым сапраўднага жывога інтарэсу. Да таго ж з суседняга пакою даносіўся моцны, клакочушчы кашаль нейкай асобы. Таму, падумаўшы, што ягоны прыход у нечым перашкаджае, Максім паспяшыў адкланяцца.

– Заходзьце яшчэ калі-небудзь, – сказаў больш цёпла на развітанне Уладзімір Пічэта. – Вельмі было цікава пазнаёміцца з Вамі. Вашыя гістарычныя назіранні вельмі слушныя, і я думаю, што час пацвердзіць іх вартасць і праваТУ.

Гэтыя словы працягвалі гучаць у вушах Максіма, калі ён выйшаў на вуліцу. Можа ён дапусціў памылку, калі так рана развітаўся з гісторыкам? Юнак ужо хацеў павярнуць назад, зноў зайсці да вучонага і запытацца аб тым, што не паспеў запытаць. Але прыродная сціпласць і нейкае ўнутранае пачуццё сарамлівасці казалі яму адкласці сустрэчу на наступны раз. Ад Пічэты Максім накіраваўся да брата.

Лёва быў здаровы, як заўсёды ўвесь у клопатах. Не пісаў доўга таму, што не меў часу. Лёва збіраўся на фронт і перад ад’ездам вырашаў тысячы важных і другарадных справаў. Вось і цяпер, пагутарыўшы з паўгадзіны з братам, той мусіў бегчы на спецыяльныя вайсковыя курсы.

Максім сядзеў у невялікім Лёвіным пакоі, праглядаў рукапіс свайго «Белорусского возрождения». Ён хацеў яшчэ раз перачытаць артыкул перад тым, як аддаць яго К. Някрасаву, у выдавецтве якога ўжо выйшлі ягоныя брашуры «Червонная Русь», «Угорская Русь», «Братья-чехи». «Белорусское возрождение» займала у творчасці М. Багдановіча прыкметнае месца, бо як і творы «За сто лет», «Новый период в истории белорусской литературы», «Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XVI сталецця» артыкул пісаўся, як частка падручніка па гісторыі беларускай літаратуры. Максім доўга працаваў над гэтым творам. Тут ён упершыню паказаў асноўныя этапы развіцця беларускай літаратуры, узлёты нашай культуры і тыя моманты, калі яе крокі былі непрыкметнымі і малымі. Доўга не атрымоўвалася ў яго характарыстыка новага перыяду беларускай літаратуры, які пачаўся, на думку аўтара, з пераломнага 1905 года. У гэтай частцы нарыса Максім даў падрабязную характарыстыку розным беларускім выданням, ацэнку творчасці паэтаў і празаікаў Бацькаўшчыны. Усе гэтыя шматлікія факты ён мусіў пераасэнсаваць, але не толькі як летапісец. Ён хацеў, спалучаючы лагічны і эмацыянальна-вобразны пачатак, распрацаваць аспект фарміравання беларускай літаратуры. Складанасць была яшчэ і ў тым, што артыкул, замоўлены украінскім часопісам «Украинская жизнь», мусіў быць напісаны эмацыянальна, каб чытач меў цярпенне поўнасцю прачытаць яго.





Перачытваючы матэрыял, Максім выносіў на паперу зноскі і заўвагі. Нечакана ў дзверы нехта пастукаў. Два студэнты ўвайшлі ў пакой і здзіўлена паглядзелі на Максіма. Адзін з іх быў шыракаплечы, каржакаваты, з прыгожай чорнай кучаравай шавялюрай і карымі вачыма. Другі – хударлявы, шэравокі меў нейкае хваравітае адценне твару.

– Маё імя Паўло, – сказаў, прывітаўшыся, чарнявы, – а майго сябра клічуць Андрэй. Мы аднакурснікі Лёвы. А кім будзеце Вы?

– Мяне завуць Максім, я брат вашага сябры, – неяк без асобага энтузіязму адказаў Багдановіч. – Лёва абяцаў вярнуцца хутка. Так што вы можаце пачакаць яго.

Паўло скінуў шынель і сеў каля стала, за якім працаваў Максім. Андрэй, моўчкі апусціўся на ложак.

Пакуль Максім заварваў гарбату на кухні, Паўло праглядзеў артыкул.

– Я ўжо чытаў ваш артыкул, – сказаў ён, калі Максім вярнуўся.

– Дзе? – здзіўлена спытаў Максім.

– У рэдактарскім адбітку часопіса «Украинская жизнь», у першым нумары за 1915 год.

– Няўжо мой артыкул пастаўлены ў першы нумар? – здзівіўся Максім. – Я не думаў, што рэдакцыя так хутка надрукуе яго.

– Добры артыкул, – працягваў Паўло. – І ведаеце, што я вам параю: аддайце яго ў «Вiсник Союзу Вызвалення Украiны».

– Першы раз чую пра «Вiсник», – адказаў Максім. – Ці не можаце Вы расказаць пра гэтае выданне.

– Чаму не, – з радасцю згадзіўся Паўло. – «Вiсник» выдаецца «Союзом Вызволення Украïнi» (СВУ), палітычнай арганізацыяй эмігрантаў з Расійскай імперыі ў Аўстра-Венгрыі і Нямеччыне з 1914 году. Саюз рэпрэзентуе інтарэсы ўсіх украінцаў пад расійскім панаваннем. Мы намагаемся, выкарыстоўваючы вайну Аўстра-Венгрыі і Нямеччыны супраць Расіі, здабыць самастойнасць Украіны. Украіна мусіць быць канстытуцыйнай манархіяй з дэмакратычым ладам.

– А хто ўваходзіць у саюз? – пацікавіўся Максім.

Сярод сваіх знаёмых ён меў некалькі сяброў украінцаў, і яму было цікава даведацца, ці ўваходзяць яны ў саюз.

– Большасць сябраў «Союза Визволення Украïны» ёсць украінцы, якія апынуліся на аўстрыйскай тэрыторыі, ратуючыся ад рэпрэсіяў сталыпінскай рэакцыі, карацей кажучы, украінская інтэлігенцыя. Можа вы чулі імёны О. Скорапіса-Йалтухоўскага, В. Дарашэнка, А. Жука, А. Меленеўскага?

– Здаецца, імя Дарашэнка мне знаёма. Быццам бы, я сустракаў яго артыкулы ва ўкраінскай прэсе.

– О так, пан Дарашэнка добры літаратар. Між іншым, пад ягонай рэдакцыяй і пачаў выходзіць са жніўня 1914 году «Вiсник Союзу Визволення Украïнi», а таксама штотыднёвікі «Ukrainishe Nachrichten», «Revue Ukrainienne». Рэдакцыя, як і Саюз, знаходзяцца ў Вене, але я магу даць вам адрас і вы пашліце свой артыкул. Я думаў, што Дарашэнка надрукуе яго, бо ён адпавядае духу і нацыянальна-вызваленчым ідэям Саюзу, які пры дапамозе ўкраінцаў – культурных дзеячоў з Галіччыны і Букавіны і з дазволу нямецкіх і аўстра-венгерскіх войскаў — наладзіў шырокую дапамогу па культурнаму выхаванню сярод палонных украінцаў з расійскай арміі ў Аўстрыіі, Венгрыі, Нямеччыне. Захадамі СВУ былі арганізаваны школы, бібліятэкі, чытальні, хары, аркестры, тэатры, курсы ўкраінскай гісторыі і літаратуры, кааперацыі, палітэканоміі, нямецкай мовы. Для асветніцкай працы, якая праводзілася сярод палонных, нам патрэбны артыкулы, якія паказваюць працэс нацыянальнага адраджэння.





– Ты думаеш, што мая праца зацікавіць арганізацыю «Союза Визволення Украïнi»? – запытаў Максім.

– А чаму не. Арганізацыю, якая дбае пра незалежнасць свайго краю, не могуць не цікавіць праблемы нацыянальнага руху на суседніх беларускіх землях. Твой нарыс напісаны гістарычна дакладна, публіцыстычна ярка. Ён дае цікавы матэрыял для роздуму*.

Падумаўшы, Паўло дадаў:

– Акрамя таго, для кіраўнікоў украінскага руху важна, што ты ўпамянуў у сваёй працы імя Сяргея Палуяна, які шмат зрабіў для нацыянальна-адраджэнскага друку Украіны.

– Сяргей Палуян шмат зрабіў і для нацыянальнага адраджэння Беларусі. Я таксама абавязаны яму многім. Быў нейкі час, калі мае творы не друкаваліся ў газеце «Наша ніва», і Сяргей пісаў мне лісты, у якіх заахвочваў працягваць пісаць свае вершы.

– Ты асабіста ведаў Палуяна? – са дзіўленнем запытаў Паўло.

– Нажаль, не. Мы пазнаёміліся толькі дзякуючы перапісцы. Сяргей быў на год старэйшы за мяне, і я яму многім удзячны.

---

* Нарыс «Білоруське відродженне» быў надрукаваны ў «Віснику», які выдаваўся «Союзом Визвалення України» пад час першай сусветнай вайны. Дзейнасцю СВУ кіраваў прэзідыум у складзе: О. Скорапіс-Йалтухоўскі, В. Дарашэнка, А. Жук, А. Меленеўскі. Ім дапамагалі дзеячы галіцкіх і букавінскіх аддзелаў (С. і Р. Смаль-Стоцкі, В. Сімовіч, М. Возняк, Б. Лепкій, М. Лазінскі, Л. Ганкевіч, і Крып'якевіч, С. Рудніцкі і інш.).

Штаб СВУ спачатку быў у Львове, а са жніўня 1914 года ў Вене. У Вене і пачаўся выходзіць пад рэдацыяй В. Дарашэнкі, А. Жука, В. Возняка «Вiсник Союзу Визволення Украини».

Рэдакцыі «Вісника», відаць, былі вядомы артыкулы М Багдановіча «Червоная Русь», «Угорская Русь», «Братья-чехи», «Образы Галиции в художественной литературе». Таму, можна прадбачыць, што рэдакцыя «Весника» праз сваіх прадстаўнікоў у часопісе «Украинская жизнь», з якімі Максім Багдановіч падтрымліваў цесную сувязь, замовіла ў яго агляд украінскай паэзіі. Чаму ён не пабачыў свет, невядома. Але лёс нарыса «Білоруське відродженнэ» быў больш шчаслівы.

Нарыс «Білоруське відродженнэ» быў надрукаваны асобнай кніжкай не раней сакавіка—красавіка 1916 года, бо іншыя два матэрыялы, якія таксама друкуюцца ў кнізе і тычацца «до праці д. М. Багдановіча про національно-культурнае відродженне Білорусинів», маюць канкрэтную дату – люты 1916 года.

Верагодна, выдавецтва СВУ мела багдановічаўскі арыгінал, бо інакш, перадрукоўваючы нарыс з часопіса «Украинская жизнь» або з брашуры, якая выйшла ў Маскве, у выдавецтве К. Някрасава, яна абавязкова змясціла і Postscriptum, які апавядае аб падзеях, што адбыліся пасля ліпеня 1914 года (часу, калі быў напісаны нарыс), а таксама багдановічаўскую заўвагу, якая зроблена ў выглядзе зноскі. Пры публікацыі артыкула, рэдакцыя «Вісника» робіць дадатковыя зноскі, якія адсутнічаюць ў тэксце нарыса, надрукаванага ў часопісе «Украинская жизнь».

Максім хацеў яшчэ сказаць, што ён разумее, чаму Палуян так заахвочваў яго пісаць. Ён таксама як і Максім Багдановіч быў пасутнасці адзінокім.

Але прыход Лёвы абарваў іхнюю размову. Лёвіны сябры адразу забыліся пра адраджэнне, палітыку, нацыянальны рух і ператварыліся ў вясёлых студэнтаў, якія толькі што здалі экзамены. Іх бяспечны настрой перайшоў да Максіма, і больш у гэты вечар ён за пісьмовы стол не прысеў. Выдаўцу Канстанціну Някрасаву ён перадаў свой артыкул на наступны дзень.

– Невялікія змены я можа прыйшлю пазней, – папярэдзіў ён.

– Якія змены? – здзіўлена запытаўся Някрасаў. – Артыкул цудоўны, будзем друкаваць.

Вечарам Максім ад'язджаў у Яраслаўль. Калі цягнік без прыпынку праляцеў Сергіеўскі пасад, дзе ён бачыў Аню, у юнака нешта сціснула ў грудзях.



# Сны аб Беларусі

Нешта дзіўнае адбывалася з Максімам у тую ноч. Спачатку ён пачуў звон. То сярэбраным смехам звінелі сіняватыя зоры. І ў іх зове яму чуўся голас маці. Ён гучаў так пранікнённа, так моцна, што яму стала жахліва. Раптам Максім адчуў, што ён пачынае раздвайвацца. З яго быццам бы выходзіць другі чалавек, ягоны двайнік. І калі ён, Максім, бездапаможны і хворы, не можа нават паварухнуцца ў ложку, то той, другі, ірвецца да маці, да зорак, да свабоды. Паміж Максімам і ягоным двайнікам зыбкая, халодная прастора, якая таксама не стаіць на месцы, а раскачваецца ўсё мацней і мацней. І ён, быццам бы як у дзяцінстве, ляціць на арэлях у далечыню. Арэлі раскачваюцца ўсё хутчэй і хутчэй. Галава пачынае кружыцца, і ён ужо не разумее, дзе ён сам, а дзе ягоны двайнік. Усё блытаецца. Максіму становіцца жахліва. Ён адчувае: яшчэ момант і ён выпадзе з сваіх арэляў. «Госпадзі, дапамажы мне, – бязгучна шэпчуць губы. – Госпадзі, не дай мне памерці. Дай мне сілы... Госпадзі, не пакідай мяне».

Што сталася далей, ён не памятаў. Ён толькі адчуў, што яго кволае цела становіцца бязважкім і ён ляціць. Ляціць да зор!

Было зусім цёмна. І толькі зверху, адтуль, дзе залатым дажджом раскінуліся пацеркі зор, лілося незямной прыгажосці святло. Там была праўда, свабода і роўнасць. І ён ляцеў туды. А пад ім вялікай, бязмежнай ракой плыла Яраславія. І дзіва, з вышыні гэты халодны і суровы край здаваўся яму так падобны на яго родную, закінутую ў балотах Беларусь. Над ёю цяпер стаіць глыбокая цемень. І народ яе спіць непрабудным сном. Стогн вырваўся з Максімавых грудзей.

Народ, Беларускі Народ!
Ты – цёмны, сляпы, быццам крот.
Табою ўсягды пагарджалі,
Цябе не пушчалі з ярма,
і душу тваю абакралі, –
У ён нават мовы няма.

«Народ, Беларускі Народ!», 1913 г.

Цяжка, вельмі прыкра асэнсоўваць гэтае. Лепш бы і не бачыць зверху, з вышыні свайго палёту пакуты гэтага быццам бы

выклятага Богам краю. Хмары, балоты... бедныя хаткі, таполі, бярозкі, усюды панурыя людзі. Госпадзі, няўжо мой народ так і не дачакаецца залацістага, яснага дня? Божа мой, дапамажы беларусам, асвяці яснай зараначкай маю краіну-браначку. Калі хочаш, вазьмі мой голас, мае вершы. Толькі зрабі Бацькаўшчыну свабоднай і шчаслівай. Вазьмі маё жыццё, але вярні жыццё ёй, Радзіме.

Раптам недзе далёка наперадзе над чорнай зямлёй бліснуў і паспешліва згас агенчык. Максім нейкім пачуццём адчуў: там ягоная зямля, там ягоныя продкі. Ён ляціць на радзіму сваіх бацькоў. «Туды, дзе ўпалі з грудзей пана Бога, парваўшыся пацеркі зор. Яны раскаціліся ў небе, усыпалі сіні прастор». Але ягоны народ яшчэ збярэ гэтыя зорачкі. І яны прынясуць беларусам шчасце і свабоду. Максім ведае гэта дакладна. Ён ахвяроўвае сябе дзеля гэтага.

А над Беларуссю звон. Што гэта, адкуль? Так гэта ж зямля спявае! Зямля і ягоная маці.

Нарэшце, ён бачыць сваю матулечку. Прыгожую, пяшчотную, крышку самотную, але такую добрую, такую родную, што нішто на зямлі не можа параўнацца з ёю. Разам з матуляй стаіць бабуля Таццяна. Яны спяваюць разам «У зоры, у зорачкі». Іхнія галасы, быццам бы адзін светлы прамень сонца, напаўняюць душу ціхай радасцю.

І ўспомніў ён тады словы Хрыстовыя, сказаныя да апостала Пятра: «Ты, шкадуючы долі галодных людзей, асудзіў песню, але галодныя людзі не асудзілі яе. Жыва яшчэ душа ў народзе гэтым».

Як жа яны дарагі яму. Ён іх кравінушка. Цяпер ён разумее, чаму бацька часам называў яго Малевічам. Не, не за знешняе падабенства. Яшчэ нешта іншае яднае іх. І яно такое вялікае і невядомае, што не паддаецца тлумачэнню. Можа гэта дух ягоных продкаў жыве цяпер ў ім? Талент і нялёгкая доля ўсіх Малевічаў.

Бацька не любіў Малевічаў, асабліва ягоную бабулю Таццяну. Называў яе неўраўнаважанай і надзвычай эксцэнтрычнай асобаю. Ад яго Максім даведаўся, што, будучы дзяўчынай, яна, пасварыўшыся са сваім каханым семінарыстам Рубяроўскім, дала згоду стаць жонкай Панаса Мякоты. Той быў намнога старэйшы за дзяўчыну, да таго ж удавец. Як не адгаворвалі Таццяну родзічы ад гэтага шлюбу, але нічога зрабіць не змаглі. Сваімі адгаворваннямі яны толькі падлівалі масла ў агонь. Вянчанне адбылося. І трэба такому здацца, што ў самы разгар вяселля з'явіўся Рубяроўскі. Але





было ўжо позна. Пазней бабуля прызнавалася: «Калі б ён прыйшоў на некалькі гадзінаў раней, вяселле распалася б. Я выйшла замуж толькі за яго. Ні перад чым бы не спынілася».

Але лёс не пераскочыш. Так вось і стала Таццяна Малевіч Таццянай Восіпаўнай Мякотай. Замужства не прынесла ёй шчасця, але яно і не было такім жабрацкім, як казаў Адам Ягоравіч. Старэйшая дачка Стэфанія нават выхоўвалася ў прыватным пансіёне, вывучала французкую мову.

Максім вельмі любіў сваю бабулю. Яна, дачка вясковага святара, была набожнай жанчынай. Максім памятаў, як аднойчы ён хадзіў з ёю ў царкву. Гэта было на Вялікдзень.

Максім узгадаў *«пяшчотную цемень той начы, магутнае, але мягкае гудзенне вялікага звана, вясёлы перазвон іншых, радаснае пенне, ракеты, якія з трэскам узляталі і, пабліскаўшы разнакаляровымі агнямі, рассыпаліся ў вышыні, фантастычнае палыханне чырвонага бенгальскага агню вакол белай царквы, што была ўнізаная лампіонамі...»* Максіму ўсё гэта ўзгадвалася даволі часта, але раней неяк ясна не магло прыгадацца яшчэ нешта радаснае і прыемнае. Што адбылося тады ў царкве яшчэ. Што?..

І ўспомніў ён, як, стоячы тады ў незнаёмай царкве, ён згубіў бабулю. Вакол яго стаялі чужыя людзі. Яны бязгучна маліліся і ў іх халодных вачах не было ні іскрынкі спачування да яго. Максіму стала жахліва. Ён хацеў паклікаць бабулю, але голас быццам бы анямеў. Тады ён стаў на калені і спужана, па дзіцячы, зусім не так, як вучыла яго матуля, пачаў маліцца: «Госпадзі, дзе ты? Прыйдзі сюды. Дапамажы мне адшукаць маю бабулю». Што сталася далей, ён не мог растлумачыць. Але яму здалося, што Гасподзь пачуў яго. Максім адчуў, што Бог, такі вялікі і магутны, стаіць каля яго. Гэта адчуванне цягнулася толькі адно імгненне. Але ён запамятаваў яго на ўсё жыццё. Бог пачуў яго і даў яму голас і сілы. А каля іконы святой Багародзіцы стаяла са свечкай у руцэ ягоная бабуля. Яна здавалася Максіму амаль святой. Пасля таго памятнага вечара ён і пачаў пісаць вершы.

Да голасу маці і бабулі далучаецца высокае сапрана цёткі Стэфаніды. Максім бачыць яе прывабную і разважную, якой яна была 10 гадоў назад, у 1905 годзе, калі яны з маці, Вадзімам і Лёвам гасцілі ў яе, у вёсцы Вяззе. Гэта было самае шчаслівае лета яго дзяцінства. Цэлы дзень ён быў на прыродзе з маці і братамі. Яны гулялі ў даганялкі, хаванкі, бегалі на перагонкі. Максім ба-

чыць сябе 5-гадовым хлапчуком. Вось ён бяжыць да цёткі папрасіць напіцца малака. Стэфаніда стаіць і размаўляе з нейкай жанчынай. Максім з цікавасцю слухае прыгожую беларускую мову, ён разумее яе! Але чаму гэта маці сумуе, калі ён замест «яичница» гаворыць, як і цётка Стэфаніда, «яечня», а свінку называе «парсючком»? Гэта ж так прыгожа гучыць? Максім хоча запытацца аб гэтым матулю, а таксама пацікавіцца, ці напісала яна працяг свайго апавядання «Напярэдадні каляд»? Тое друкавалася ў «Гродненских губернских ведомостях» у снежні 1984 года, але маці нечакана ідзе ў нейкую хату. Максім прыспешвае за ёю.

А там, у вялікім светлым пакоі сядзяць за сталом дзядзька Івана і Антона Луцкевіча, гаспадар хутара Ракуцёўшчына Вацлаў Лычкоўскі. Разам з ім ягоная сястра Ядзвіся Русецкая, 50-гадовая, але яшчэ сімпатычная кабета. Крыху далей іх пляменніца Эмілія, вельмі абаяльная шэравокая 25-гадовая жанчына. Яна трымае на руках маленькую дачушку Яніначку. Усе яны рады прыходу Максіма. За два летнія месяцы, якія ён правёў у 1911 годзе на Ракуцёўшчыне пасля заканчэння гімназіі, гэтыя людзі сталі яму роднымі. Асабліва Эмілія з Яніначкай. Максім расказваў маленькай дзяўчынцы казкі. Усе разам хадзілі на шпацыю па маляўнічных мясцінах Ракуцёўшчыны. Вось і цяпер ён увайшоў, а малая кінулася да яго. Максім узяў яе на рукі і ўскінуў высока-высока, амаль да столі. Яніначка засмяялася, і ад яе вясёлага галасочка лягчэй зрабілася на душы.

– Можа гарбаткі з намі пап'іце, Максім? – запыталася Ядзвіся Русецкая.

– О, дзякую, але можа крышачку пазней. Януся, калі мы будзем піць разам з табой гарбату?

– Калі матулька будзе, – шчабеча малая Яніначка.

– Вось і добра! – кажа Максім. – Будзем піць гарбату з мамай Эміляй. А цяпер я буду расказваць табе казку.

Яніначка сядае на Максімавы калені і ўважліва слухае ягоныя казкі. Яна, як і Максім, не заўважае, што цётка Ядзвіся пачынае сварку з маці.

– Толькі не кажы, – скардзіцца Ядзвіся, – што ты не бачыш, што ён закаханы ў цябе. Чаму, калі я яму прапаноўваю кубак гарбары, ён не п'е, а калі ты гэта робіш, ніколі не адмаўляецца.

Максіму непрыемна чуць гэтую сцэну рэўнасці. Ён хоча прабудзіцца, але толькі далей паглыбляецца ў свой незвычайны сон. Вось юнак бачыць брата-нябожчыка Вадзіма. Той стаіць у асяроддзі моладзі і нешта горача гаворыць. У цесным гуртку вакол яго маладыя сацыялісты-рэвалюцыянеры, што ўваходзілі ў групу старэйшага брата, а таксама сябры Максіма па ліцэю. Вадзім прыцягвае да сябе ўвагу і старэйшых людзей, што знаходзяцца поруч. Сярод іх Максім заўважае Германа Лапаціна, перакладчыка твораў Карла Маркса. Некалі Вадзім звяртаўся да Германа з просьбай даць дазвол для напісання ягонай біяграфіі. Але Лапацін адмовіў брату, што засмуціла Вадзіма, які ўжо сабраў усе неабходныя для працы крыніцы. Праўда, супраць жадання Лапаціна ён не пайшоў і зрабіў правільна, бо гэта была не ягоная справа. Рэвалюцыя, сходкі, забароненная літаратура, – усё гэта цяпер здавалася Максіму такімі наіўнымі марамі. Чаму Вадзім так і не зразумеў, што ўсё, чым яго так шчодра надзяліў Гасподзь, ён мусіў быў аддаць на адраджэнне Бацькаўшчыны. Ён стаў бы, абавязкова стаў бы рыцарам свайго краю. І тады б яны разам змагаліся за свабоду беларусаў.





Гэта было, напэўна, летам. Раніцай. Калі сонца ў зыходзіць над Беларуссю. Тады заціхае ўсё на зямлі. Перастаюць спяваць птушкі, гаманіць дрэвы. І ў гэтай цішыні, грукаючы срэбнай збруяй, ляцяць грозныя коні Старадаўняй Літоўскай Пагоні. Чырвонае сонца асвятляе мужныя твары ваякаў. Яны суровыя і стрыманыя. Такім не страшны канец. Такіх «не разбіць, не спыніць, не стрымаць». Сярод іх постацей Максім заўважае Вадзімаву і сваю. Яны таксама ляцяць, каб у вечнай бітве за волю, перамагчы. Пэўна, яны загінуць. Загінуць, каб уваскрэсла іхняя радзіма. Каб няпраўдзе, хлусні, няволі прыйшоў, нарэшце, канец. А на іх месца выйдуць дзесяткі новых змагароў, і будуць будзіць, як і яны з Вадзімам, людзей к свету, праўдзе, брацтву і свабодзе. І так будзе заўсёды, пакуль на зямлі застанецца хоць кропля жорсткасці і хлусні. Змаганне працягваецца.

Усё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

Пагоня і выратавала яго. Дала сілы вярнуцца на зямлю.
Пацеркі зор агністаю слязой асыпалі зямлю Яраславіі.
А над Беларуссю пачынаўся новы дзень.

# Мастацкая публіцыстыка Максіма Багдановіча

Гаварыць пра беларускую мастацкую публіцыстыку пачатку XX стагоддзя – гэта перш-наперш гаварыць пра з'яўленне і арганізацыю новага пакалення беларускай інтэлігенцыі, якое вырашала розныя пытанні жыцця нацыі. У выніку ўздыму дзейнасці прагрэсіўнай часткі інтэлігенцыі нацыя пераходзіць да вышэйшай ступені свайго развіцця. Гэты этап у беларускай гісторыі, літаратуры і мастацтве пачатку XX стагоддзя вядомы ў нашай літаратурнай крытыцы пад назовам – Нашаніўства.

Гістарычная роля і значэнне нашаніўскай пары выступаюць у двух асноўных аспектах: нацыянальна-палітычным і літаратурным. Гэтыя аспекты не былі незалежнымі, асобна існуючымі плынямі, але існавалі як ўзаемадапаўняльныя струмені адной вялікай ракі Беларускага Адраджэння. Беларуская літаратура гэтае пары разглядалася яе стваральнікамі і ўспрымалася чытачамі не толькі як мастацкі фактар і паказчык культурнага развіцця нацыі, але адначасова і як найвастрэйшая ў дадзены момант зброя ў змаганні за нацыянальнае, сацыяльнае і палітычнае адраджэнне беларускага народу. І нацыянальна-сацыяльная і палітычная праграма лідэраў Адраджэння фарміравалася не толькі ў творах літаратуры нашаніўскіх паэтаў і празаікаў, але і ў перадавіцах і публіцыстычных артыкулах газет «Наша доля» і «Наша ніва». Вось чаму ва ўмовах уздыму нацыянальна-адраджэнскага руху ўзрастае роля публіцыстыкі, як адной з найбольш хутка рэагуючых на праявы часу плыняў літаратурнага руху.

Станаўленне беларускай мастацкай публіцыстыкі адбывалася ў няпростых і спецыфічных абставінах, звязаных з тымі складанымі ўмовамі, у якіх развівалася сацыяльная, нацыянальная і эстэтычная свядомасць беларускага народа, яго культура і мастацтва. Умовы гэтыя былі настолькі непадобнымі на тыя, у якіх ішло развіццё суседніх заходнееўрапейскіх літаратур, што часам вельмі цяжка знайсці агульныя рысы паміж імі, супаставіць шляхі іх развіцця ў тую пару. Некаторыя жанры мастацкай публіцыстыкі, якія знайшлі сваё развіццё ў заходнееўрапейскай літаратуры (эсэ, панфлет) адсутнічаюць у беларускай публіцыстыкі пачатку XX ста-





годдзя. А такі публіцыстычны жанр як падарожны нарыс толькі пачынаў распрацоўвацца ў пачатку XX стагоддзя. З другога боку, тыя агульныя тэндэнцыі, якія былі характэрны для развіцця мастацкай публіцыстыкі літаратураў іншых народаў, знайшлі сваё адлюстраванне ў беларускай мастацкай публіцыстыцы.

Каб увогуле пазнаць ідэалагічную накіраванасць мастацкай публіцыстыкі пачатку XX стагоддзя, варта прасачыць публіцыстычныя творы газет «Наша доля» і «Наша ніва». Каб агульна ўсвядоміць асноўныя мастацкія тэндэнцыі літаратуры пачатку XX стагоддзя мы зноў жа павінны звярнуцца да мастацкай публіцыстыкі. Творы мастацкай публіцыстыкі пачатку XX стагоддзя даюць уяўленне не толькі пра эпоху, але пра цэлы пласт беларускага жыцця XX стагоддзя. Да публіцыстычнага жанру звярталіся не толькі празаікі, але, амаль без выключэння, усе беларускія паэты. Публіцыстыка была тым змагарскім жанрам новай беларускай літаратуры, які клікаў беларусаў да Адраджэння, да вырашэння сваіх запаветных мараў і надзеў. Вось чаму такое вялікае значэнне прыдаюць сённяшнія даследчыкі вывучэнню беларускай мастацкай публіцыстыкі пачатку XX стагоддзя, вытокі якой мы знаходзім у разважлівых прадмовах да «Бібліі» Францыска Скарыны. палымяных прамовах Кастуся Каліноўскага ў ягонай «Мужыцкай праўдзе», нешматлікіх творах беларускіх народавольцаў, якія ў 1884 годзе выдавалі часопіс «Гоман», у нумарах неаднойчы канфіскаванай газеты «Наша доля». Аднак найбольшага свайго развіцця мастацкая публіцыстыка пачатку XX стагоддзя атрымала на старонках газеты «Наша ніва» у творах такіх таленавітых пісьменнікаў і публіцыстаў як Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Сяргей Палуян, Алесь Гарун, Змітрок Бядуля, Максім Гарэцкі, Цішка Гартны, Карусь Каганец і іншых.

Нястомнай працай гэтых волатаў адраджэння закладаўся падмурак мастацкай публіцыстыкі, праводзіўся шлях, па якому ў далейшым ішло ўсё яе развіццё.

Мастацка-публіцыстычная спадчына Максіма Багдановіча налічвае звыш 20 твораў. Тэматычна іх можна згрупаваць як нарысы з жыцця славянскіх народаў, падарожны нарыс, фельетоны. Асаблівае месца ў творчасці Максіма Багдановіча займае распрацоўка тэмы славянства.

Да пытанняў грамадска-палітычнага, культурнага і асветніцкага жыцця славянскіх народаў Максім Багдановіч звяртаўся не-

аднойчы. Перш за ўсё праз разгляд творчасці вядомых славянскіх пісьменнікаў. Напрыклад, у сваім публіцыстычным артыкуле «Памяти Т. Г. Шевченко» М. Багдановіч паказаў асноўныя напрамкі паэзіі Т. Шаўчэнкі. Ён падкрэсліў, што творчасць украінскага паэта мае агульначалавечае значэнне (як прыклад, пераклады з Тараса Шаўчэнкі, якія маюцца ў заходнееўрапейскай літаратуры – нямецкай, французскай, чэшскай, польскай, швецкай). А агульначалавечы сэнс насычаны нацыянальным зместам і формай. Таму і кранаюць так душу чытача вершы творцы.

Як паэт Максім Багдановіч разумеў самабытнасць паэзіі Т. Шаўчэнкі, прыгажосць пабудовы яго вершаў. Як добры знаўца ўкраінскай літаратуры і мовы, ён адчуваў усе танчэйшыя адценні слова.

«Возьмем хотя бы такое четверостишие:

Орiся ж тi, розвернiся,  
Полем розстелiся,  
Та посiйся добрiм жiтом,  
Долею полiйся!

Конечно, – развяжаў Максім Багдановіч, – «розстелiся» и «полiйся» неболее, как ассонансы, но нельзя же закрывать глаза на то, что вместе с тем все стихотворение пронизано внутренними рифмами, т. е. рифмами необязательными. А между тем это постоянный прием Шевченко»

У сваіх нарысах М. Багдановіч не толькі даследаваў творчасць славянскіх пісьменнікаў (Тараса Шаўчэнкі, Міхаіла Лермантава і інш.), але разглядаў этапы развіцця славянскай літаратуры, уздым нацыянальнай свядомасці славянаў. Тэме, якую ўмоўна можна назваць «Нацыянальны рух славянаў», прысвечаны многія ягоныя нарысы. Дастаткова нагадаць «Червонную Русь» і «Угорскую Русь», якія выйшлі асобнымі кніжкамі ў выдавецтве былога выдаўца газеты «Голос», пляменніка паэта М. А. Някрасава К. Ф. Някрасава, нарыс «Львов», «Образы Галиции в художественной литературе». Сярод няскончаных твораў былі «Галицкая Русь», «Украинскае казачество». Гэтай тэме прысвечаны многія багдановічаўскія даследванні на глебе беларускага матэрыялу. Гэта ў першую чаргу нарысы «Белорусское возрожденне», «О гуманизме и неосмотрительности», «На белорусские темы», «Деятельность Минского белорусского комитета».





Максім Багдановіч бярэцца за нялёгкую працу публіцыста не толькі каб пазнаёміць чытачоў з творчасцю славянскіх літаратараў. Галоўная мэта, як нам здаецца, гэта спроба паказаць, што на суседніх з Беларуссю землях адбываюцца роднасныя працэсы нацыянальнага адраджэнне – ёсць з'ява, якая характэрна для ўсіх народаў, што доўгі час жылі пад прыгнётам.

Зварот да творчасці выдатных украінскіх пісьменнікаў і паэтаў, даследванне развіцця нацыяльнага руху, – сталі перадумовамі таго, што М. Багдановіч пачаў супрацоўнічаць з замежным нацыянальна-адраджэнскім друкам Украіны. Гэтае супрацоўніцтва, як нам здаецца, пачалося з канца 1914 – пачатку 1915 гадоў. Да гэтага часу было надрукавана большасць багдановічаўскіх твораў, якія закранаў пытанні эвалюцыі свядомасці ўкраінскага народа і вызваленчыя матывы нацыянальнага руху.

Сярод аўтографаў М. Багдановіча знойдзены няскончаны артыкул на ўкраінскай мове «Забуты шлях». Аўтар хацеў прасачыць у ім шлях развіцця нацыянальнай формы ўкраінскага верша. У невялічкім урыўку артыкула яскрава прасочваецца адна з думак, мажліва, потым яна павінна была стаць адной з дамінуючых: «...звертаючися до ўкра'інської поезії за часів Котляревського, Артемовського, Гребiнки, зауважимо, що вона була українською тiльки з боку мови. А вiрш iх – це звичайний росiйский вiрш тоi епохi. Тут е форми, що виросли на глебi французького неокласицизму: олександрiйський вiрш (напр., «Солопiй та Хiвря» Атремовського), канонiчна байкова форма (байки Артемовського, Боровиковського, Гребiнки)».

Цікава, што ў другім сваім артыкуле «Забыты шлях», дзе М. Багдановіч робіць агляд беларускай паэзіі і разглядае яе асаблівы стыль творчасці, аўтар таксама праводзіць думку аб спалучэнні ў нацыянальнай паэзіі мовы і яе складу. Мажліва, гэтыя артыкулы не здарма маюць аднолькавую назву. Хутчэй за ўсё яны пісаліся як розныя раздзелы адной працы. Але якой? Для якога выдання рыхтаваў яе М. Багдановіч?

Артыкул «Забыты шлях», напісаны ў 1915 годзе, быў надрукаваны ў газеце «Вольная Беларусь» толькі пасля смерці М. Багдановіча, 28 красавіка 1918 года. Мажліва, што ён не адразу дасылаўся ў рэдакцыю газеты, бо інакш бы ён быў надрукаваны значна раней. Артыкул пра ўкраінскую літаратуру пісаўся паўкраінску. І хутчэй за ўсё М. Багдановіч рыхтаваў сваю працу пра

беларускую і украінскую паэзію для «Вісніка Союзу Візволення». Але па нейкім прычынам артыкул пра ўкраінскую літаратуру быў няскончаны, і Максім Багдановіч адаслаў «Забыты шлях» у газету «Вольная Беларусь».

«Віснік» выдаваўся Саюзам Візвалення Украіні, палітычнай арганізацыяй эмігрантаў з Расійскай імперыі ў цэнтральных дзяржавах (Аўстра-Венгрыі і Германіі), пад час першай сусветнай вайны. Саюз называў сябе выказнікам інтарэсаў украінцаў пад расійскім панаваннем. Ён намагаўся, выкарыстоўваючы вайну Аўстра-Венгрыі і Германіі супраць Расіі, здабыць самастойнасць Украіны і зрабіць яе канстытуцыйнай манарыхіяй з дэмакратычым ладам і аднапалатнай сістэмай заканадаўства. Большасць членаў «Союза Візволення Украіны» былі сацыялісты, якія апынуліся на аўстрыйскай тэрыторыі, ратуючыся ад рэпрэсій сталыпінскай рэакцыі. Былі гэта людзі з высокай адукацыяй і складаным жыццёвым лёсам. Дзейнасцю СВУ кіраваў прэзідыум у складзе: О. Скарапіс-Йалтухоўскі, В. Дарашенка, А. Жук, А. Меленеўскі. Ім дапамагалі дзеячы галіцкіх і букавінскіх аддзелаў (С. і Р. Смаль-Стоцкі, В. Сімовіч, М. Возняк, Б. Лепкій, М. Лозінскі, Л. Ганкевіч, і Крып'якевіч, С. Рудніцкі і інш. Штаб СВУ спачатку быў у Львове, а са жніўня 1914 года ў Вене. У Вене і пачаўся выходзіць пад рэдацыяй В. Дарашэнкі, А. Жука, В. Возняка «Віснік Союзу Візволення Украіні».

Рэдакцыі, відаць, былі вядомы артыкулы М. Багдановіча «Червонная Русь», «Угорская Русь», «Братья-чехи», «Образы Галиции в художественной литературе» і іншыя. Яны адпавядалі патрабаванням і нацыянальна-вызваленчым ідэям Саюзу, які пры дапамозе ўкраінцаў – культурных дзеячоў з Галіччыны і Букавіны і з дазволу нямецкіх і аўстрыйска-венгерскіх войскаў – наладзіў шырокую арганізацыйную дапамогу па культурнаму выхаванню сярод палонных украінцаў з расійскай арміі ў Аўстрыіі, Венгрыі, Германіі. Захадамі СВУ арганізавана культурна-нацыянальная выхаваўчая праца: школы, бібліятэкі, чытальні, хары, аркестры, тэатры, курсы ўкраінскай гісторыі і літаратуры, кааперацыі, палітэканоміі, нямецкай мовы. Для асветніцкай працы, якая праводзілася сярод палонных, патрэбны былі артыкулы, якія паказвалі працэс нацыянальнага адраджэння Таму, можна прадбачыць, што рэдакцыя «Весніка» праз сваіх прадстаўнікоў у часопісе «Украінская жізнь», з якімі беларускі публіцыст падтрымліваў





цесную сувязь, замовіла ў яго агляд украінскай паэзіі. Чаму ён не пабачыў свет, невядома. Але лёс наступнага багдановічаўскага твора быў больш шчаслівы. Нарыс «Білоруське відродженне» быў надрукаваны ў 1916 годзе.

«Білоруське відраджэннэ» займае ў творчасці М. Багдановіча прыкметнае месца, бо, як і творы «За сто лет», «Новы период в развитии белорусской литературы», «Кароткая гісторыя беларускай пісьменнасці да XI сталецця» ён пісаўся, як частка падручніка па гісторыі беларускай літаратуры. Гэты нарыс належыць да аднаго з асноўных твораў у публіцыстычнай спадчыне Максіма Багдановіча. У ім упершыню паказаны асноўныя этапы развіцця беларускай літаратуры, узлёты нашай культуры і тыя моманты, калі яе крокі былі непрыкметнымі і нязначнымі. Асабліва цікавай з'яўляецца характарыстыка новага перыяду беларускай літаратуры, які пачаўся, на думку аўтара, з пераломнага 1905 года. У гэтай частцы нарыса дадзена падрабязная характарыстыка розных беларускіх выданняў, ацэнка творчасці паэтаў і празаікаў Бацькаўшчыны. Твор выяўляе яшчэ адну грань Багдановічаўскага таленту – яго публіцыстычныя здольнасці. Аналіз праблемы беларускага адраджэння ён прапускае праз сваё ўнутранае «я». Спалучаючы лагічны і эмацыянальна-вобразны пачатак, аўтар распрацоўвае аспект фарміравання беларускай літаратуры.

Нарыс «Білоруське відродженне» быў надрукаваны асобнай кніжкай не раней сакавіка–красавіка 1916 года, бо іншыя два матэрыялы, якія таксама друкуюцца ў кнізе і тычацца «до праці д. М. Багдановіча про національно-культурнае відродженне Білорусів» маюць канкрэтную дату– люты 1916 года. Рэдакцыя адзначае, што дадаткі да багдановічаўскага артыкула не звязаны з ім непасрэдна, але «не будуть і зайвімі прі н'ій, бо лучать мінулае з найсвіжійшім сучаснім, хоч і без освітлення останнього пол'ітічного факту, якій в однаковій мірі відіноситься до Літві й Білорусі». Гэта яшчэ раз даказвае цікавасць рэдакцыі да працэсаў, якія адбываліся ў суседняй Беларусі.

Верагодна, выдавецтва СВУ мела багдановічаўскі арыгінал, бо інакш, перадрукоўваючы нарыс з часопісу «Украінская жізнь», або з аднайменнай кнігі, яна абавязкова змясціла і Пост Скріптум, які апавядае аб падзеях, што адбыліся пасля ліпеня 1914 года (часу, калі быў напісаны нарыс, а таксама багдановічаўскую заўвагу, якая зроблена ў выглядзе зноскі). Пры публікацыі нарыса, рэдак-

цыя робіць дадатковыя зноскі. М. Багдановіч піша: «В Італії повстають артістічні творі на всіх ії пятнадцятьох мовах, від французької літературі відломлюеться провансальська, від еспанської – катальонська, від чеської – словацька, від сербської – словінська... від руської (велікоруської) відкололася ўкраўнська і нарешті белоруська». Рэдакцыя пры гэтым заўважае: «Погляд мільний. Українська та білоруська мова, як і інш. словянські, війшлі з згальйоі праславянської групы». Другая зноска, якая адсутнічае ў тэксце нарыса, надрукаванага ў часопісе «Украінская жізнь», звязана з датай прыняцця ў 1697 годзе польскім Сеймам пастановы, у якой абвяшчалася, што з гэтага часу пісар павінен па-польску, а не па-руску пісаць усе выпісы і позвы. Рэдакцыя зазначае: «Се закріплено законом 1696 года». Больш прынцыповых разыходжанняў з тэкстам нарыса, надрукаванага ў часопісе «Украінскаіі жізні», не заўважана.

Чым жа зацікавіла гэтая праца арганізацыю «Саюза Візволення Украіні», якая за 4 гады дзейнасці выдала 50 кніжак і 30 брашур пра Украіну на ўкраінскай, нямецкай, французкай, італьянскай, венгерскай, турэцкай, шведскай, румынскай, харватскай, чэшскай і балгарскай мовах, сярод якіх «Украінство в Росії» В. Дарашэнкі, «Галічына в жітіі Украіны» М. Лозінского, «Нац. відродження австро-угорскаіх украї'нцев» В. Гнатюка, «Украінскае Війско» І. Кріп'якевіча? Чаму «Саюз» выдае гэтую працу, нягледзячы на тое, што да 1916 году ён ўжо не атрымлівае фінансавую дапамогу з аўстрыйскага боку? Думаецца, што арганізацыю, якая дбала пра незалежнасць свайго краю, не маглі не цікавіць праблемы нацыянальнага руху на суседніх беларускіх землях. Нарыс напісаны гістарычна-дакладна, публіцыстычна ярка і даваў цікавы матэрыял для роздуму. Для кіраўнікоў украінскага руху праца была важная і таму, што ў ёй упаміналася імя Сяргея Палуяна, які шмат зрабіў, як для нацыянальна-адраджэнскага друку як Украіны, так і Беларусі.

Чым цікавы нарыс «Біларускае відраджэнне»?

Па-першае, на сённяшні дзень гэта адзіная вядомая нам багдановічаўская праца, выдадзеная за межамі Расійскай імперыі, што сведчыць пра важкасць укладу М. Багдановіча ў агульначалавечую скарбніцу культуры. Творы публіцыста М. Багдановіча адпавядалі патрабаванням і пошукам складанай эпохі, у якой





жыў паэт. І ў іх, як у люстэрку, адбіўся еўрапейскі ўзровень беларускай літаратуры.

Па-другое, нарыс узбагачае наша ўяўленне аб перакладчыцкім таланце класіка беларускай літаратуры, яго веданні славянскіх моваў.

Па-трэцяе, гэтая праца сведчыць аб удзеле М. Багдановіча ў нацыянальна-вызваленчым руху Украіны, факт, які падкрэслівае высокую грамадзянскую пазіцыю Максіма Багдановіча.

# Псеўданімы Максіма Багдановіча

Першыя творы Максіма Багдановіча былі надрукаваны ў «Голосе» за подпісамі «Эхо». На прыналежнасць гэтых псеўданімаў Максіму Багдановічу ўказваў былы рэдактар газеты С. С. Каныгін. Разам з навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры АН БССР І. І. Гарэцкім ён у свой час прагледзеў газету «Голос» за 1909–1917 гады і пацвердзіў, што Максім Багдановіч з'яўляецца аўтарам некаторых твораў, у тым ліку і такога, як «Цензурные мытарства Н. А. Некрасова». Факт гэты да апошняга часу не ставіўся пад сумненне. «Цензурные мытарства...» ўвайшлі ў II том акадэмічнага выдання збору твораў (Мн., 1968). Праўда, ён стаіць паасобку сярод твораў, якія прыпісваюцца Багдановічу. Але дагэтуль іншых дакументаў, якія ўказвалі б на прыналежнасць або на не прыналежнасць матэрыялу Максіму Багдановічу, не было знойдзена.

Мне трапіла кніга былога супрацоўніка газеты «Голос» М. Р. Агурцова «Опыт местной библиографии. Ярославский край». Ён вёў у свой час у газеце літаратурны аддзел. Добра ведаў не толькі Максіма, але і яго бацьку. Між іншым, у сваёй кнізе ён прысвяціў Адаму Ягоравічу некалькі радкоў. М. Р. Агурцову ўдалося расшыфраваць некаторыя прозвішчы карэспандэнтаў, творы якіх падпісваліся псеўданімамі або няпоўнымі прозвішчамі. Прычым дабаўляемая частка бралася ў квадратныя ці паўкруглыя дужкі.

Зацікавіўшыся гэтай заўвагай, я шукаю, каму належаў псеўдонім Б. М. Р. Агурцоў указвае на прыналежнасць яго Бурцаву. Напрыклад, у «Голосе» друкаваліся пад гэтым подпісам яго творы «Новое строительство в деревне», «Пошехонский уезд», «Учительское совещание», «О внешкольном образовании», а таксама «Цензурные мытарства Н. А. Некрасова». Гэты артыкул ішоў у кнізе пад № 8476. На с. 318 ідзе яго расшыфроўка: 8476 (Бурцев) Цензурные мытарства Н. А. Некрасова. 1913, № 189. Паводле артыкула Яўгеньева з «Русск. Богатства». Твор, які прыпісваўся Максіму Багдановічу, таксама друкаваўся ў № 189 «Голоса» за 1913 год. Выходзіла, што аўтары аднаго артыкула – два супрацоўнікі «Голоса». Паводле кнігі М. Р. Агурцова ім з'яўляўся Бурцаў, паводле ўспамінаў С. С. Каныгіна – Багдановіч. Якой жа





крыніцы верыць? Думаецца, што «Опыт местной библиографии» больш дакладны дакумент. На гэтую грунтоўную працу спасылаюцца вучоныя і па сённяшні дзень.

Ёсць і другі доказ прыналежнасці псеўданіма В. Бурцаву. У «Голосе» ад 11 студзеня 1914 года пад рубрыкай «Библиография» змешчаны тры матэрыялы. Першы – «Земство и его экономическая деятельность за 50 лет существования» ідзе за подпісам Б. Пад «Нижегородским ежегодником, иллюстрированным литературным календарем-справочником», 1914 г. Под ред. Г. І. Сергеева и В. Е. Чешихина (Ч. Вертиского)» і «Ежемесячным журналом» 1914 г. № 1. Ред.-изд. Миролюбов» стаіць прозвішча М. Багдановіч. Відаць, калі б Максім быў аўтарам і першай рэцэнзіі, то яна друкавалася б без псеўданіма. Усе тры матэрыялы ішлі б за яго сапраўдным прозвішчам. Бо з аналагічнай сітуацыяй мы сустракаемся ў «Голосе» ад 21 чэрвеня 1915 года. Пад рубрыкай «Библиография» ў гэтым нумары надрукаваны тры рэцэнзіі М. Багдановіча:

«А. Л. Погодин. Славянский мир», «Н. А. Рубакин. Среди книг, 1915», «Русский экскурсант, 1915». Яны змешчаны, як і ў першым выпадку, адна пад адной. А пад апошнім матэрыялам стаіць подпіс – М. Багдановіч. Тое, што «Земство и его экономическая деятельность за 50 лет сууществования» належала Бурцаву, гаворыць яшчэ адзін факт. У «Голосе» ад 22 лютага 1914 года надрукавана рэцэнзія «Наше земство и 50 лет его работы». Надрукавана яна за подпісам Бурцаў і па зместу з'яўляецца другім перапрацаваным варыянтам першага матэрыяла аўтара.

Трэба адзначыць, што М. Р. Агурцоў з'яўляецца аўтарам рэцэнзіі на зборнік Максіма Багдановіча «Вянок». Адшукала я яе зноў жа ў газеце «Голос» ад 31 мая 1914 года № 123. Паколькі ў друку яна болей не змяшчалася і даследчыкам творчасці М. Багдановіча яе тэкст невядомы, прыводжу яе поўнасцю, захоўваючы асаблівасці арыгінала. Максим Богданович. Вянок. Кніжка выбраных вершаў. Вільня.

«Лежащая перед нами книжечка стихов на белорусском наречии иллюстрирует стремление белорусской интеллигенции к «национальному» подъему родной литературы, если вообще можно говорить о белорусской литературе. Вместе с тем ясно стремленне вдвинуть область белорусского творчества в общее русло литературы. Автор рецензируемой книжки не ограничивает себя

узким кругом «народных» сюжетов, как это наблюдалось до сих пор в Белоруссии. В сборнике видим обилие сюжетов и стихотворных форм. Как по сюжетам, так и по обработке стихи г. Богдановича ничего специфического «народного» не заключают, если не принимать во внимание вообще простоты его произведений. Несомненно, эти произведения – продукт общей «интеллигентской» литературы, и рассчитаны они, по-видимому, не на простого читателя: книжка пестрит иностранными эпиграфами.

Не беремся судить, насколько стихи г. Богдановича связаны с «национальной» психологией белоруса, но такие стихотворения, как «Слуцкія ткачыхі» являются безусловно откликом народной души. Эти чудесные стихи даже для человека, не знакомого с белорусским диалектом, открывают истинную красоту выражения на таком казалось бы грубом и не поддающемся обработке наречии. Прекрасно передано настроение «бездольных» ткачих, взятых на панский двор «ткаць залатыя паясы». За стеной «смяецця поле», сияет небо за окном, а они сидят и ткут, переживая за станком разные впечатления «ясных далей», синеющих «ясными васильками».

«Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся, рука
Заміж персідскага ўзора,
Цвяток радзімы васілька».

Вядомы наступныя псеўданімы і крыптанімы, пад якімі друкаваўся Максім Багдановіч: Б-віч; Б-віч, М.; Б-віч, Максім; Ось-мак, М.; Ф. Ів.; Ф-в, Е.; Ф-в, Ів.; Февралёв, Ів.; Февралёва, Ек.; Эхо; B-cz; B-wicz; B-wicz, M; B-wicz, Maksim; B-wic, Maksim; Hrynica, Maksim; M. B.; Rion; Rionъ.

Пад гэтымі псеўданімамі і крыптанімамі былі надрукаваны апавяданні «Именинница», «Колька», «Преступление», «Чудо маленького Петрика», «Экзамен», казка «Башня мира», сцэнкі з натуры, эцюды «Волгари», «Около театра миниатюр», «На углу», «Около билетов», маленькія фельетоны «Ванька-встанька», «Жаль книгу», «О взятке», «Карлик и человек», «Калейдоскоп жизни», «Нумизматы» і іншыя.



# Максімава «адысея»

# Новыя творы Максіма-кніжніка

Пра жыццё і творчасць геніяльнага беларускага паэта, таленавітага празаіка, – апавядальніка і эсэіста, майстра паэтычнага перакладу, літаратурнага крытыка, пачынальніка навуковай гісторыі беларускай літаратуры і мастацтва, палымянага публіцыста, нарэшце, выдатнага мысліцеля рэвалюцыйна-дэмакратычнай школы Максіма Багдановіча напісана шмат кніг і артыкулаў, і з кожнай новай публікацыяй мы адкрываем для сябе ўсё новыя радкі яго біяграфіі. Але невядомых, не да канца высветленых старонак жыцця Максіма-кніжніка, яшчэ многа. Адной з такіх з'яўляецца супрацоўніцтва Максіма Багдановіча з яраслаўскай газетай « Голос».

Дакладна невядома, калі пачалася літаратурная дзейнасць Максіма Багдановіча ў газеце. У 1958 годзе былы рэдактар газеты «Голоса» Сяргей Сяргеевіч Каныгін у адказ на запыт Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР паведаміў, што Максім Багдановіч часта друкаваў у «Голосе» вершы, апавяданні, нарысы, артыкулы. Тады ж з навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры І. І. Гарэцкім быў прагледжаны архіў газеты за 1909–1917 гады з удзелам С. С. Каныгіна, прачытаны ўсе тэксты за подпісам «М. Б.» і некаторымі псеўданімамі. Каныгін пацвердзіў, што Максім Багдановіч з'яўляецца аўтарам твораў «После концэрта Яна Кубелика» (1909), «Жду я...» (1910), «Весеннее»(1910), «Из испанских мотивов» (1910), «Не сердись на меня, тихий друг» (1910) і іншых. Але захаваліся ўспаміны, напісаныя самім Сяргеем Сяргеевічам, паводле іх Максім упершыню прыйшоў у рэдакцыю будучы студэнтам Яраслаўскага юрыдычнага ліцэя (М. Багдановіч вучыўся ў ім ў 1911–1916 годах).

Улічваючы гэты дакумент, а таксама той факт, што большасць твораў, надрукаваных у газеце, тычацца 1911–1916 гадоў, можна зрабіць такія высновы. Актыўнае супрацоўніцтва з «Голосом» у Максіма Багдановіча пачалося ўсё ж у ліцэйскі перыяд жыцця, калі ён пачаў прыносіць у газету свае творы. І яго матэрыялы з'яўляліся на яе старонках даволі часта. У другім томе апошняга акадэмічнага выдання твораў Максіма Багдановіча іх налічваецца трыццаць чатыры.

Але гэта не канчатковая лічба. Праглядаючы ў Дзяржаўным абласным архіве г. Яраслаўля падшыўку «Голоса» за 1914–1916 гады я знайшла раней невядомыя рэцэнзіі Максіма Багдановіча.

Рэцэнзіі на «Нижегородский ежегодник», і «Ежемесячный журнал» змешчаны ў № 8 ад 11(24) студзеня за 1914 год. «Нижегородский ежегодник». Иллюстрированный литературный календарь-справочник Чешихина (Ч. Вертинского).

Нам уже приходилось говорить об этом прекрасном календаре-справочнике в прошлом году. Он издается уже четвертый год, не изменяя своего типа и лишь из года в год пополняясь новыми сведениями и новыми отделами. Своей главной целью ежегодник ставит разработку в общественной форме вопросов земского и городского дела, сельского хозяйства, кооперации и проч. Поэтому он представляет значительный интерес не только для нижегородского края. В выпуске текущего года введен отдел «Крестьянское дело», для которого написана интересная статья о крестьянском общественном самоўправлении втородумцем М. С. Фокеевым. Все остальные статьи принадлежат перу известных специалистов, как местных, так и столичных. Так, напр. статья по кооперации, написанная В. Кильчевскнм, статья по народному образованню «Как использовать учителю летний отдых» С. Серополком и проч.

«Ежегодник» одобрен на II агрономическом съезде 1911 года в Москве, а на II всероссийской кустарной выставке 1913 года в С.-Петербурге он удостоился похвального отзыва.

Ніжэй ішла рэцэнзія на часопіс Міралюбава.

«Ежемесячный журнал. 1914 год № 1. Ред. изд. Миролюбов.

Одним из наиболее значительных явлений современной общественной жизни следует признать несомненный рост народной интеллигенции, отлагающейся в недрах крестьянства и рабочего класса. Кадры ее неудержимо и поразительно быстро растут, начинают приобретать определенные очертания, вырабатывать строго индивидуальные черты. Обслуживать интересы этого нового слоя русской интеллигенции, удовлетворять его духовные запросы – вот задача, которую ставит себе упомянутый в заголовке рецензии, журнал. Печатаясь в два столбца, экономизируя на бумаге, он дает за четыре рубля столько же литературного материала, как и гораздо более дорогие «толстые» журналы. Что касается состава сотрудников, то, судя по проспекту, «Ежемесячный журнал» привлекает к участию едва ли не все лучшие силы беллетристики «реалистического» направления (к сожалению, отсутствует г. Короленко). Вместе с тем приглашены и некоторые представители «модернизма», художественная ценность творчества которых наименее оспорима. Несколько слабее поставлены





отделы публицистики и литературной критики, но зато есть постоянный популярно-научный отдел, отсутствующий в других толстых журналах. Это новшество сможет по достоинству оценить именно демократический читатель, для которого журнал является, иной раз единственной пищей, основным источником образования.

Первый номер «Ежемесячного журнала» закрепляет за собой симпатии, невольно возникающие по отношению к этому прекрасному начинанию. Открывается он рядом хороших стихотворений, далее идет вереница рассказов, среди которых есть вещи Венниченка и Шмелева. Из второй половины журнала особенно хороши статьи по научным вопросам. Судя по первой книжке, перед нами – не мертворожденная затея, а живое и настоятельно необходимое дело.

Во всяком случае, эта книжка имеет свою собственную литературную физиономию, оставляет после себя очень цельное впечатление и дает основание считать существование «Ежемесячного журнала» далеко не лишним».

А вось яшчэ два невядомыя раней творы М. Багдановіча, змешчаныя ў № 32 газеты ад 8(21) лютага 1914 года. «Ежегодник газеты «Речь» на 1914 год.

С некоторого времени крупнейшими органами современной печати установлен прекрасный обычай давать (на рубеже двух годов) сборник статей, подводящих итог только что истекшему году. Среди этих сборников первое место принадлежит, бесспорно, ежегоднику газеты «Речь», страницы которого украшены именами Милюков, Шингарев и проч.

Открывается сборник статьей Милюкова, посвященной обзору событий иностранной жизни; сосредоточены они, естественно, на картине взаимоотношения балканских народов, – область, в которой Милюков является лучшим специалистом в России. Далее идет очерк нашей внутренней жизни, составленный Гессеном. Экономическим темам отведены статьи Шингарева (бюджет) я Эпштейна (банки и биржа). По инородческому вопросу писали Милюков, *Clemens* и проч., остановившиеся на крупнейших фактах национального существования поляков, евреев, финляндцев и украинцев. Все это выписано чрезвычайно сжато, компактно, насыщено фактическим материалом и объединено одной руководящей точкой зрения.

Наконец, в «Ежегоднике» есть ряд статей, посвященных художественным вопросам. Годовой очерк русской литературы, сделанный г. Адриановым, содержит в себе разбор всего лишь двух вещей. С этим примиряет интересная общая часть статьи, трактующая об эволюции литературных настроений, идущих в сторону сочного жизненного реализма».

«Ежегодник Вологодской губерни.

Вышел из печати и поступил в продажу, издаваемый 5-й год в гор.[оде] Вологда, «Ежегодник Вологодской губ.». «Ежегодник» заключает в сборнике адресно-справочный отдел на вопросы губерни и очерки экономической жизни. В предыдущих изданиях «Ежегодника» в последнем отделе значительное место уделялось кооперации. Ныне кооперация затронута весьма слабо – обстоятельный очерк дан только по мелкому кредиту».

Знойдзеныя творы не толькі дапоўнілі наша ўяўленне аб Багдановічу-крытыку, але яшчэ раз пацвердзілі думку аб тым, што яго творчая спадчына поўнасцю не вывучана.

Сведчаннем гэтаму з'яўляецца адзіная прыжыццёвая рэцэнзія на зборнік Максіма Багдановіча «Вянок». Адшукала я яе ў той жа падшыўцы яраслаўскай газеты «Голос». Яе аўтарам з'яўляецца журналіст газеты, вядомы яраслаўскі краязнаўца М. Р. Агурцоў. Ведаючы, што ў савецкіх выданнях з тых часоў яна больш не друкавалася, змяшчаем яе тэкст поўнасцю, захоўваючы асаблівасці арыгінала.

«Максім Багдановіч. Вянок. Кніжка выбраных твораў.

Лежащая перед нами книжечка стихов на белорусском наречии иллюстрирует стремление белорусской интеллигенции к «национальному» подъему литературы, если вообще можно говорить о белорусской литература Вместе с тем ясно стремление вдвинуть область белорусского творчества в общее русло литературы.

Автор рецензируемой книжки не ограничивает себя узким кругом «народных» сюжетов, как это наблюдалось до сих пор в Белоруссии. В сборнике видим обилие сюжетов и стихотворных форм. Как по сюжетам, так и по обработке стихи г. Богдановича ничего специфически «народного» не заключают, если не принимать во внимание вообще простоты его произведений, Несомненно, эти произведения – продукт общей «интеллигентской» литературы, и рассчитаны они, по-видимому, не на простого читателя: книжка пестрит иностранными эпиграфами.





Не беремся судить, насколько стихи г. Богдановича связаны с «народной» психологией белоруса, но такие стихотворения, как «Слуцкія ткачыхі», являются безусловно откликом народной души. Эти чудесные стихи даже для человека незнакомого с белорусским диалектом, открывают истинную красоту выражения на таком казалось бы грубом и неподдающемся обработке наречии. Прекрасно передано настроение «бездольных» ткачих, взятых на панский двор «ткаць залатые паясы». За стеной «смеется поле», сияет небо за окном, а они сидят и ткут, переживая за станком родные впечатления «ясных далей», синеющих «милыми васильками».

Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага ўзора,
Цвяток радзімы васілька.

На вялікі жаль, сёння знойдзены не ўсе творы Максіма Багдановіча, нават тыя, што друкаваліся ў «Голосе» пад яго сапраўдным прозвішчам. І таму пошук творчай спадчыны Максіма Багдановіча працягваецца.

# З чаго пачыналася мая Яраславія

У 1987 годзе я вучылася на факультэце журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна. Неяк, гартаючы стары даведнік вандровак па Яраслаўлю, прачытала такія радкі: «У гэтай гімназіі ў 1908–1911 гадах вучыўся класік беларускай літаратуры, паэт Максім Багдановіч. Тут, у старажытным рускім горадзе, ён жыў, вучыўся, тварыў. Выканкам Яраслаўскага Савета працоўных дэпутатаў у маі 1958 года ўстанавіў мемарыяльную дошку на будынку, дзе вучыўся паэт».

Гэтыя звычайныя радкі прагучалі для мяне нечакана. Тады я і вырашыла адшукаць у Яраслаўлі тыя куточкі, што і сёння захоўваюць памяць пра яго жыццё і літаратурную творчасць. Праўда, дакладнага адрасу, акрамя аднаго – былой мужчынскай гімназіі – не ведала. Але спадзявалася: знайду абавязкова...

Яраслаўль асабліва прыгожы вясной і ў пачатку лета: у зеленаватай дымцы выступаюць сілуэты белакаменных цэркваў, а раніцай, разбуджаны першымі сонечнымі промнямі, горад напаўняецца непаўторным водарам. Успамінаюцца радкі з верша М. А. Някрасава, якія ён падарыў гораду Яраслаўлю:

Опять она, родная сторона.
С ее зеленым благодатным летом,
И вновь душа поэзией полна...
Да, только здесь могу я быть поэтом!

Сям'я Багдановічаў пераехала ў Яраслаўль з Ніжняга Ноўгарада ў маі 1908 года, адразу пасля смерці старшага сына Вадзіма. Максім быў маладзейшы за Вадзіма на два гады. Максім пачынае вучыцца ў мужчынскай гімназіі.

Трохпавярховы, упрыгожаны рэльефам (дэкаратыўнай лепкай) будынак з чырвонай страхою на былой Сямёнаўскай (цяпер Чырвонай) плошчы быў пабудаваны ў 1900 годзе. Шыльда каля ўваходу паведамляе: «Здесь, в бывшей мужской гимназии, в 1908–1911 годах учился известный белорусский поэт Максим Богданович». Побач – мураванае пажарнае дэпо з вучэбным пляцам. Вось і ўсе славутасці. Не, памыляюся. Зусім непадалёку, праз некалькі кварталаў, цячэ Волга.

Я прыйшла сюды раніцай. Цішыня. Гэта і зразумела: у студэнтаў канікулы (у будынку цяпер знаходзіцца корпус Яраслаўскага універсітэта). Цікава, а як было тут амаль 80 гадоў таму?





Над вадой ля берага,
ціха спіць асока
Ды лаза зялёная жаліцца –
шуміць.
Хвалі ціха ходзяцца
і бягуць далёка, –
І ўсё навокал сном
адвечным спіць.

Відаць, такой бачыў Максім-юнак Волгу.

Гімназія як гімназія. І па архітэктуры нічым не адрозніваецца ад дзесяткаў такіх жа пабудоў у горадзе.

Затое Волга так блізка! Усяго некалькі кварталаў – і ты ў яе спакойнай воднай гладзі. А на прыбярэжжы гэтай магутнай ракі ўзвышаецца Спаса-Праабражэнскі манастыр. Ён прывабліваў не толькі прыгажосцю цэркваў, залатымі і зялёнымі, быццам нераскрытымі бутонамі-кветкамі, купаламі, вытанчанымі профілямі фасадаў будынкаў з рознымі какошнікамі над акенцамі. Тут, у сценах манастыра, шмат гадоў захоўваўся славуты твор старажытнай літаратуры – «Слова аб паходзе Ігаравым». Відаць, ля сцен манастыра і ўзнікла ў Максіма Багдановіча думка распавесці свету праўду аб продках на мове свайго народа.

Але ж працаваць над перакладам можна было толькі дома. З ранку і да абеду цягнуліся заняткі – закон Божы, матэматыка, латынь. З філасофіяй, фізікай, гісторыяй, геаграфіяй было лягчэй. Але асабліва Максім Багдановіч любіў рускую і царкоўнаславянскую мовы.

Часу для гульняў заставалася мала – Максім Багдановіч ужо ў той час шмат працаваў. Пісаў у газету «Наша ніва» – першае сваё апавяданне «Музыка» ён паслаў туды, калі яму яшчэ не было і 16 гадоў. Максіму Багдановічу трэба было закончыць рэцэнзію на кнігу, дапісаць артыкул па гісторыі славянства. І толькі тады можна пачаць пераклад «Слова аб паходзе Ігаравым». Работа над «Словам» ішла павольна. Дзе знайсці трапнае беларускае слова, каб і за душу брала і перадавала дух той далёкай эпохі? Не раз Максім Багдановіч звяртаўся за парадаю да бацькі, а ўсё часцей – да слоўнікаў.

І як не проста было гімназісту Максіму Багдановічу стаць беларускім паэтам! Сваёй, беларускай мове і літаратуры ён павінен быў вучыцца як чужы: напачатку ён проста іх не ведаў. І, што самае

цяжкае для паэта – ён не ведаў і не чуў жывых гаворак беларускай мовы. Не ведаў, канешне, не па сваёй віне. Проста так складвалася жыццё яго сям'і. Але любоў да роднай зямлі, да сваёй Бацькаўшчыны дапамаглі яму бліскуча авалодаць беларускай мовай.

Пазнаёміўшыся з рукапісамі сына, яго бацька ўсклікнуў: «Сколько там выписок из словарей, сборников и старопечатных книг! Какой из поэтов, всосавших белорусскую речь с молоком матери, поднимал этот тяжёлый, кропатливый, крохоборческий труд? А он... поднял. И нёс его. Терпеливо и упорно».

Чатыры гады вучобы ў Яраслаўскай мужчынскай гімназіі праляцелі хутка. І толькі апошнія месяцы перад паездкай у Беларусь чамусці цягнуліся вельмі павольна і доўга. А пасля заняткаў – хутчэй дамоў. Пакуль не прыйшоў са службы бацька і не пачаўся абед – чытаць. Дома ў Багдановічаў была добрая бібліятэка. У ёй Максім адшукаў тыя кнігі, якія расказалі яму пра яго народ, пра радзіму. Тут жа знайшоў ён і слоўнікі, па якіх ужо потым вывучаў мову сваёй зямлі. А вывучаў ён яе странна, мову, на якой потым напіша «Вянок» і зробіць пераклады з латыні, нямецкай, французскай – моў Гарацыя, Гейнэ, Верлена.

А вершы? Іх было шмат. Максім пісаў і пісаў у чаканні першай паездкі на радзіму.

І вось – Вільня. Ракуцёўшчына. Больш як два месяцы на зямлі Бацькаўшчыны. Вяртаўся ў Яраслаўль шчаслівы.

Па просьбе акадэміка А. А. Шахматава рэдакцыя газеты «Наша ніва» назвала кандыдатуру Максіма Багдановіча для паступлення ў Пецярбурскі універсітэт, каб потым ён мог ўзначаліць кафедру беларусазнаўства. Максім Багдановіч не толькі будзе займацца любімай справай, але і вучыцца ў горадзе, дзе жыве і вучыцца яго дзяўчына, яго каханне, якой М. Багдановіч прысвяціў сваю паэму «Вераніка». Але ўсе надзеі паэта рухнулі.

Бацька ўгаварыў Максіма паступіць у Яраслаўскі юрыдычны ліцэй. Максім тады ў парыве нястрыманасці заявіў бацьку: «Пракурорам быць не хачу! Хачу быць літаратарам ці вучоным».

Але бацька яшчэ раз напомніў Максіму пра яго слабае здароўе, пра дрэнны сыры клімат у сталіцы, расхваліў унікальную бібліятэку ліцэя, дзе сабраны 53 тысячы кніг. Максім уступіў угаворам бацьку. І ў 1911 годзе ён пераступіў парог Яраслаўскага юрыдычнага ліцэя...





У даведніку па гораду Яраслаўлю пра будынак ліцэя нічога не сказана. Дзе ж ён знаходзіцца? Можа знайду адказ у будынку былой мужчынскай гімназіі.

Нерашуча адчыняю ўваходныя дзверы. Раней, у свой час, чатыры гады запар гэтыя дзверы адчыняў гімназіст Максім Багдановіч.

Па шырокай лесвіцы падымаюся ў рэктарат. Мне пашанцавала. У паўпустым будынку знаёмлюся з Станіславам Аляксандравічам Ягоравым:

– На жаль будынак ліцыя – аднаго з старэйшых у Расіі навучальных устаноў – згарэў у ліпені 1918 года. Загінула багацейшая бібліятэка і архіў.

– І нічога пра Максіма Багдановіча не засталося?

– На жаль, не! Але ведаеце, я раскажу вам гісторыю ліцэя, абставіны і атмасферу тых далёкіх дзён, калі там вучыўся Максім Багдановіч.

І С. А. Ягораў расказаў пра ліцэй, які напачатку называўся «высших наук училище», пра яго выдатны педагагічны калектыў, дзе працаваў вялікі рускі педагог К. Дз. Ушынскі, пра рэвалюцыйную дзейнасць студэнтаў (у кіраўніцтве яраслаўскай групы РСДРП стаяў ліцэіст А. П. Даліва-Дабравольскі) і пра многае-многае іншае.

Да нашага часу гэты ліцэй не захаваўся. Згарэў у час контррэвалюцыйнага белагвардзейскага мяцяжу ў ліпені 1918 года. Згарэў разам са сваёй каштоўнай бібліятэкай, якая налічвала 58 тысяч кніг, і усім архівам.

Пра ўсё гэта я пачула ад С. А. Ягорава, які раней займаўся вывучэннем гісторыі ліцэя. І я, слухаючы пра расклад, звычаі Яраслаўскага «вышэйшых навук вучылішча», у якім выкладаў К. Дз. Ушынскі, вучыліся рэвалюцыянеры І. І. Падвойскі і М. С. Кедраў, разумею, як цяжка было тут Максіму Багдановічу.

Калі я запыталася ў майго субяседніка: «Дзе вуліца Максіма Багдановіча?» – ён не ведаў. Не ведалі і іншыя выкладчыкі універсітэта. І я зусім страціла надзею ў гэты дзень адшукаць вуліцу. Проста блукала па горадзе. І нечакана ўжо ў гадах мужчына, у якога я запыталася, мне дапамог:

– Ды гэта ж былая Данілаўская, зусім недалёка адсюль. Можна прайсці і пешшу.

Я ляцела быццам на крылах на вуліцу Багдановіча, быццам чакаючы сустрэчы з самім Максімам. Прайшлася па гэтай вуліцы ад

першага і да апошняга дома. Вось шыльдачка на доме № 11 паведамляе: «вул. Багдановіча».

...Багдановіч пакідаў Яраслаўль другі і апошні раз у лістападзе 1916 года. Ён зноў вяртаўся на радзіму. З сабою ў маленькім сундучку, Максім вёз зборнік сваіх вершаў «Вянок» і шмат іншых ненадрукаваных вершаў. Ён прыедзе ў родны Мінск за некалькі месяцаў да смерці і да напісання гэтых прарочных радкоў:

У краіне светлай, дзе я ўміраю
У белым доме ля сіняй бухты,
Я не самотны, я кнігу маю
З друкарні пана Марціна Кухты.

Гэта кніга – «Вянок» пра родную Бацькаўшчыну была напісана ў старажытным Яраслаўлі.

Я вярталася ў Мінск крыху расчараваная. Шкадавала, што знайшла не ўсе яго мясціны. Можа захаваўся і «ціхі старасвецкі дом» Какуевых, дзе адбываліся падзеі, апісаныя ў паэме «Вераніка». Магчыма, я сама недзе крыху заспяшалася і прабегла міма дома, дзе жылі Багдановічы? І яшчэ нешта павінна захавацца... Усе ж пад грукат колаў цягніка, гартаючы старонкі «Вянка», знайшла тое, што так даўно чакала. У люстэркавым вакне возера ўбачыла шырокую роўнядзь Волгі. У доўгай вопратцы летапісца пазнала манаха Спаса-Праабражэнскага манастыра, адчула шалясценне старажытнага «Слова аб паходзе Ігаравым». У ціхіх слязінках лета пачула музыку яраслаўскіх званоў. А сярод дрыжачых вянкоў зорак, над лесам высока-высока ўзыходзіла светлая зорка Венера, якая несла з сабою ціхія згадкі...



# Пра невядомыя творы Максіма-кніжніка

...Супрацоўнікам Літаратурнага музея Максіма Багдановіча давялося адшукаць 12 новых твораў, якія належаць пяру паэта і апублікаваны ў яраслаўскай перыёдыцы («Голос», «Северная газета») у 1913, 1914 і 1916 гадах. Сярод іх 5 рэцэнзій. Вялікую цікавасць уяўляюць дзве нататкі «Под угрозой смертной казни» і «Две смерти», змешчаныя ў газетнай рубрыцы «Суд» пад псеўданімам «Ив. Февралёв». Творы на тэму судовага жыцця, напісаныя М. Багдановічам, да гэтага часу не сустракаліся. З вялікай верагоднасцю могуць належаць пяру беларускага класіка «Покушение на поджег» (псеўданім «Ив. Февр.»), «Около театра миниатюр» (псеўданім «Ив. Ф.»), «В Забаве» (псеўданім «Зритель»), «Калейдоскоп жизни» (псеўданім «Эхо»), «Именинница» («Северная газета», псеўданім «Эхо»). Дзевяць твораў М. Багдановіча амаль год назад здадзены ў друк і чакаюць свайго апублікавання ў часопісе «Нёман». Звыш дваццаці твораў паэта выяўлена супрацоўнікамі сектара тэксталогіі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР («ЛіМ», 1989 г., 5 мая).

І вось яшчэ знаходкі. У газеце «Трактор» за 25 жніўня [1989 г.] змешчана публікацыя С. Белай «Новыя творы Максіма-кніжніка». Да сваіх адкрыццяў аўтар адносіць рэцэнзіі паэта на «Нижегородский ежегодник», «Ежемесячный журнал», «Ежегодник газеты «Речь» за 1914 год» і «Ежегодник Вологодской губернии». Ці ўсе гэтыя творы з'яўляюцца новымі? Вядома, што ў акадэмічным выданні Твораў М. Багдановіча (Менск, 1928, т. 11) на с. 303–304 эмешчана рэцэцзія беларуснага класіка на «Ежемесячный журнал», якая не была пасля ўключана ў Збор твораў (Мінск, 1968). Верагодна, па той прычыне, што ў ёй упамінаецца імя ўкраінскага пісьменніка В. Віннічэнкі. Прынамсі, артыкулы М. Багдановіча пра В. Віннічэнку і Г. Чупрынку, імёны якіх у той час не ўжываліся, не былі ўключаны з гэтага выдання ў Збор твораў. Аўтару, які даследуе творчасць беларускага класіка, варта было 6 ведаць той факт, што вышэйназваная рэцэнзія ўжо друкавалася ў выданні І. І. Замоціна, і тым самым з большай адказнасцю падыходзіць да публікацыі новых твораў.

Дзве рэцэнзіі («Ежегодник газеты «Речь» за 1914 год» і «Ежегодник Вологодской губернии»), як вышэй гаварылася, былі вы-

яўлены таксама супрацоўнікамі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча. Шчаслівае супадзенне пошуку, каб не адна акалічнасць. Аўтар артыкула, неаднойчы карыстаючыся фондамі музея, ведала, што гэтыя творы ўжо здадзены намі ў друк

Цікавай знаходкай С. Белай з'яўляецца пакуль што адзіная вядомая прыжыццёвая рэцэнзія на Багдановічаў зборнік «Вянок». Толькі аўтар чамусьці не робіць дакладнай спасылкі на крыніцу яе апублікавання. Гэтаксама не дае подпісаў пад рэцэнзіямі М. Багдановіча і М. Агурцова і не называе крыніцу захоўвання ўспамінаў рэдактара газеты «Голос» С. С. Каныгіна.

Пошукавы шлях бясконцы, і ён патрабуе беражлівых адносін да каштоўнай літаратурнай спадчыны Максіма Багдановіча.

*В. МІКУТА,*
ст. навуковы супрацоўнік
Літаратурнага музея Максіма Багдановіча
«Літаратура і мастацтва». 10.11.1989 г.



# Ці справядлівыя папрокі?

Здаецца, зусім нядаўна ў газеце «Трактор» з'явілася штомесячная старонка на беларускай мове «Нашчадкі». Але стала яна вядомай у грамадска-культурных колах рэспублікі, і нават за мяжой (30 верасня і 1 кастрычніка радыёстанцыя «Свабода» дала змястоўную рэцэнзію на другі яе выпуск). На «Нашчадкі» звярнулі ўвагу журналісты рэспубліканскай прэсы, пісьменнікі. Васіль Шырко ў артыкуле «Дзеля карысці», апублікаваным у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» № 41 ад 13 кастрычніка 1989 года, пісаў: «Ёсць цікавыя публікацыі ў «Мінскай праўдзе», маладзёжных газетах, радуе «Трактор» сваімі старонкамі на роднай мове». У апошнім нумары «ЛіМа» ад 10.11.89 года з'явілася і яшчэ адна публікацыя старшага навуковага супрацоўніка Літаратурнага музея Максіма Багдановіча В. Мікуты, якая спаслалася на газету «Трактор». Такая ўвага сведчыць, безумоўна, аб зацікаўленасці старонкай «Нашчадкі» ў газеце «Трактор».

Але артыкул В. Мікуты наводзіць і на сумныя ноткі.

Ствараючы ў «Трактор» старонку на беларускай мове, рэдакцыя газеты ставіла на мэту садзейнічаць адраджэнню беларускай мовы, папулярызаваць творы беларускіх аўтараў, абудзіць у рускамоўнага чытача цікавасць да беларускай гісторыі і культуры. Гэтага можна дасягнуць толькі пры ўмове выкарыстання на старонцы выпуска «Нашчадкі» цікавых, арыгінальных, або невядомых матэрыялаў для больш трыццацітысячнага калектыву трактарабудаўнікоў Беларусі.

У другім выпуску «Нашчадкаў» пад рубрыкай «Невядомыя старонкі літаратуры» быў змешчаны мой артыкул «Новыя творы Максіма-кніжніка». Як даследчыца, я выкарыстала ў сваім матэрыяле рэцэнзіі класіка беларускай літаратуры, якія адшукала ў Дзяржаўным абласным архіве г. Яраслаўля.

Трэба адзначыць, што пошук спадчыны Багдановіча вядзецца не адзін год, прычым рознымі навуковымі ўстановамі (Літаратурны музей Максіма Багдановіча, Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР і інш.). Зразумела, гэта дапускае магчымасць паўтора знаходак, што і атрымалася з рэцэнзіямі «Ежегодник Вологодской губернии», «Ежегодник газеты «Речь» на 1914 год», названымі ў артыкуле, а таксама з нататкамі М. Багдановіча «Мы-

тарства беженцев», «Мимоходом», якія я і выявіла адначасова з супрацоўнікамі сектара тэксталогіі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Факт гэты заканамерны і станоўчы, бо ён толькі пацвярджае каштоўнаець знаходак; мае ён і адваротны бок, калі ў справу ўступаюць асабістыя амбіцыі і нейкая зайздрасць, звязаныя з прычыны першадрукавання.

Здавалася б, супрацоўнікі Літаратурнага музея Максіма Багдановіча павінны толькі радавацца, што знойдзеныя творы Максіма Багдановіча надрукаваны ў газеце больш чым трыццацітысячнага калектыву, з імі пазнаёмілася шырокае кола чытачоў, Але ў артыкуле В. Мікуты гучаць папрокі. Ці справядлівыя яны? Давайце паглядзім разам.

На першы погляд, В. Мікуту хвалюе пытанне: ці ўсе змешчаныя ў артыкуле творы з'яўляюцца новымі? «Вядома, – піша яна, – што ў акадэмічным выданні Твораў М. Багдановіча (Менск, 1928, т. 11) на с. 303–304 змешчана рэцэнзія беларускага класіка на «Ежемесячный журнал», якая не была пасля ўключана ў Збор твораў (Мінск, 1968)».

Папракаючы мяне ў недакладнасці, В. Мікута сама грашыць супраць ісціны, спасылаючыся на адзінаццаты том замест другога.

Больш таго, старшы навуковы супрацоўнік музея аказалася няўважлівым чытачом. Бо інакш яна не магла не заўважыць спасылку аўтара на тое, што названых рэцэнзій няма ў другім томе. «Словарь русского языка» С. Н. Ожегова дае гэтаму слову і такія значэнні: «вновь открытый», «недостаточно знакомый», «малоизвестный». Рэцэнзія на «Ежемесячный журнал», якая друкавалася толькі ў выданні 1928 г., што стала бібліяграфічнай рэдкасцю, амаль незнаёма шырокаму колу чытачоў. Надрукаваная зноў пасля доўгага перапынку, яна з'яўляецца як бы нанава адкрытай для яго. І гэтаму трэба толькі радавацца.

Але гэта не асноўная заўвага старэйшага навуковага супрацоўніка музея. Яе больш хвалюе тое, што ў артыкуле аўтар, які, неаднойчы карыстаўся фондамі музея (фраза гучыць так, быццам бы ён выкарыстаў крыніцы, знойдзеныя супрацоўнікамі музея, а не зрабіў гэта самастойна), надрукавала ў мясцовай газеце рэцэнзіі «Ежегодник газеты «Речь» на 1914 год» і «Ежегодник Вологодской губернии». Надрукавала, нібыта ведаючы, што яны ёсць сярод тых 9 твораў Максіма Багдановіча, якія знайшлі супрацоўнікі музея і здалі ў друк у часопіс «Нёман». Выходзіць, для таго,





каб папулярызаваць творчасць беларускага класіка, трэба мець асабісты дазвол супрацоўніка музея? Ці не дзіўна гэта?

І ўжо зусім дробязнай з'яўляецца заўвага наконт таго, што аўтар чамусьці не робіць дакладнай спасылкі на крыніцу апублікавання пакуль што адзінай прыжыццёвай рэцэнзіі на Багдановічаў зборнік «Вянок», не дае подпісаў пад рэцэнзіямі М. Багдановіча і М. Агурцова і не называе крыніцу захоўвання ўспамінаў рэдактара газеты «Голос» С. С. Каныгіна.

Хаця для маёй публікацыі і не патрэбна было даваць гэтыя выхадныя даныя, яны былі даны ў «Настаўніцкай газеце» ад 25.11.89 г., улічваючы пажаданні В. Мікуты, раблю гэта.

Рэцэнзія на зборнік «Вянок» М. Агурцова была змешчана ў № 123 за 1914 год пад псеўданімам М. Агурцова «П. П.». Пад рэцэнзіямі Максіма Багдановіча «Нижегородский ежегодник» и «Ежемесячный журнал», апублікаваных у восьмым нумары «Голоса» за 1914 год стаіць подпіс «М. Багдановіч», пад рэцэнзіямі «Ежегодник Вологодской губернии» і «Ежегодник газеты «Речь» на 1914 год», змешчаных у трыдцаць другім нумары «Голоса» за 1914 год, стаіць подпіс «М. Багдановіч». Успаміны С. С. Каныгіна змешчаны ў 2 томе «Збору твораў Максіма Багдановіча» (Мінск, 1968) на с. 556.

І яшчэ што хочацца дадаць: ці не крыўда на сябе за няўважлівы, паспешлівы пошук спадчыны Багдановіча чуецца ў гэтых папроках? Калі гартаючы адну і тую ж падшыўку «Голоса» у Яраслаўлі, супрацоўнікі музея не заўважылі дзве рэцэнзіі на зборнік «Вянок» і на «Ежегодник Нижегородской губернии». Але каго вінаваціць у гэтым?

Між іншым, у гісторыі беларускай літаратуры падобных прыкладаў шмат. Нават далёка хадзіць не трэба. Максім Багдановіч у свой час сам падвяргаўся «падобнай» крытыцы з боку часопіса «Микроскоп». Сітуацыя, якая адбылася ў тыя далёкія гады, нечым нагадвае сённяшнюю; беспадстаўныя папрокі, выкліканыя крыўдай супрацоўнікаў часопіса, няўважлівае прачытанне яго артыкула, падтасоўка фактаў.

Сёння ў «Нашчадках» мы друкуем урыўкі з артыкула рэдактара часопіса «Микроскоп» Семяноўскага, якія змешчаны ў сёмым нумары гэтага часопіса за 1914 год. У савецкі час яны друкуюцца ўпершыню.

## Расшаркивающиеся лжецы

*«Долго и прочувственно молчал «Голос» в отношеии нашего журнала, даже в предстоявшем его выходе в свет не обмолвился ни словом, уделяя в то же время место таким общественным явлениям, как кражи, неметенные улицы, гряз и проч., долго не замечал, не видел журнала, хотя журнал и бросал ему иногда не совсем приятные обвинения в лицо, и, наконец, заметил!*

*Да еще как! – посвятил журналу чуть не полномера!*

*С большой, вероятно, не заслуженной нами добросовестностью, г. Богданович, автор ст. «Желтые цветы», занялся изучением журнала за целый год. Шаг за шагом усидчиво и кропотливо собирал о журнале «факты», имеющие повергнуть его в прах. Эта внимательность и добросовестность нам несказанно польстили,*

*Но грянул гром!.. неожиданный, не из тучи и мы... остались невредимы.*

*Добросовестности у г. Богдановича хватило только на чтение журнала, но это не смутило «Голос», и он напечатал его статью.*

*Приступая с душевным трепетом к ее чтению, мы думали увидеть оценку общественной роли журнала, оценку его идейной работы за целый истекший год и обнаружили передергивание «фактов», попутно расшаркивание перед его высокостепенствами и просто степенствами – «местными уважаемыми общественными деятелями» и их прислужниками, переставшими, очевидно, давать «гонорар» объявления.*

*...К сожалению, недостаток места не позволяет распространиться о причинах, вызвавших появление статьи «Желтые цветы». Причины эти так очевидны!*

*...Мы не станем в этой заметке касаться вопроса о театре и «Рекорде», о которых в этом номере уже печатался фельетон «Демона» и отзыва «Южанина», укажем лишь на полную необоснованность ссылки на объявления Н. А. Донцева.*

*После распродажи, когда Н. А. Донцев открыл «Венский магазин», по «Голосу», раз мы писали о Н. А. Донцеве, нам нужно было отказаться от предложенного Н, А. Донцевым объявления?*

*Так, что ли?*

*Этого удовольствия мы «Голосу» не доставили и он здравствует устами г. Богдановича.*





*Дальше – г. Новиков и магазин обуви г. Дмитриева. Всякому читателю журнала великолепно известно, что магазин Дмитриева вовсе не печатает своих объявлений в журнале, если не считать нескольких объявлений в начале прошлого года, т. е. почти год назад, И вот Богданович прибегает к гнуснейшему средству лжи. «Фирма Дмитриева, – пишет он, – печатает объявления в «Микроскопе» постоянно».*

*Пусть читатели перечитают «Микроскоп» за год и увидят, что Богданович – лжет.*

*...Частный факт с Новиковым, взятый для характеристики справок института о кредитоспособности, дал Богдановичу повод увидеть защиту «дельца».*

*...Мы могли бы привести еще много фактов из вашей полезной деятельности, не пользу из степенств и высокостепенств, если бы обладали желанием ответить такой же добросовестностью, но общество уже оценило вашу деятельность и выработало определенное отношение. И если читает «Голос», то только потому, что в Ярославле нет газеты. Мы не настолько уязвлены ст. г. Богдановича, чтобы опускаться до серьезной полемики с вами. Ведь это только ваши статьи, только ваши передергивания, ну а с вами не принято серьезно считаться».*

# Гісторыя адной знаходкі

Мінула шмат часу, калі быў надрукаваны першы твор Максіма Багдановіча. Але і сёння пільныя даследчыкі знаходзяць невядомыя раней нашчадкам яго творы. Як адзначае Л. М. Мазанік, адна са складальнікаў III выдання Поўнага збору твораў М. Багдановіча, нядаўна *«былі выяўленыя (ў асноўным у яраслаўскай газеце «Голас» за 1913–1916 гг.) апавяданні «Імянінніца», «Колька», «Цуд маленькага Петрыка», «Злачынства», «Экзамен», «Валгары», «Каля тэатра мініяцюраў», «Каля білетаў», казка «Вежа міру», творы, жанр якіх быў вызначаны як «маленькі фельетон» – «Калейдаскоп жыцця», «Карлік і чалавек», «Нумізматы», «Ванька-ўстанька», «У гасцях у дзяцей», «Шкада кнігу», «Пра хабар», публіцыстычныя творы «Дзве смерці», «Дзіцячая калонія», «Кааператыўная нарада», «Мімаходам», «Пакуты бежанцаў», «Пасяджэнне гарадской думы» (дзве нататкі), «За сахарам», «У сяле Хрэст», «На вуглу», «Гадавіна народнага дома», «Справа па абвінавачванні ў разбоі», «Замах на ўзброены крадзёж», «Замах на падпал», «Пад пагрозай пакарання смерцю»; рэцэнзіі «Новыя лісты Л. М. Талстога», «Славянская бібліятэка» (№ 1), «Любоў Сталіца. Елена Дзеева», «П. А. Крапоткін пра вайну», «Ежегодник Вологодской губернии», «Ежегодник газеты «Речь» на 1914 г.», «Украинская жизнь» (1915, № 1–12), «У. Вінічэнка. Збор твораў. Т. I–VIII». (Творы былі выяўлены тэкстолагамі Інстытута літаратуры АН БССР С. В. Забродскай, К. В. Піліповіч, Т. Р. Строевай, А. І. Шамякінай, а таксама Н. Б. Ватацы, М. П. Пазняковым, В. І. Мікутай і С. Белай». (Весці Акадэміі навук БССР, № 4, 1991. С. 99–100. Серыя грамадскіх навук)».*

Нельга сказаць, што Поўны збор твораў Максіма Багдановіча будзе сапраўды поўным.

Ёсць яшчэ нямала невыяўленых твораў Багдановіча. Тых, што падпісаны невядомымі дасюль псеўданімамі або зусім не маюць подпісу, як здарылася з «Новымі лістамі Л. М. Талстога». Калі я расшуквала ў Яраслаўскім дзяржаўным архіве творы М. Багдановіча, трапіла мне ў рукі кніга былога супрацоўніка газеты «Голос» М. Р. Агурцова «Опыт местной библиографии». Агурцоў быў добрым прыяцелем Максіма, і праз яго рукі праходзілі амаль усе творы Багдановіча. Праглядаючы кнігу, у раздзеле «Аб Някрасаву» ўбачыла: М. Багдановіч – Голос, 1915, № 238, 1916,





№ 24. Творам за 1916 год была ўжо друкаваная рэцэнзія «Архив села Карабихи». Матэрыялам за 1915 год стала невядомая рэцэнзія «Новыя лісты Л. М. Талстога». Яна – без подпісу. Верагодна, ён быў зняты ў самы апошні момант у друкарні, калі наборшчык скарачаў некалькі радкоў рэцэнзіі, што не ўвайшлі ў адведзеную плошчу. Толькі добрая памяць М. Р. Агурцова і ягоная кніга дапамаглі вярнуць нам гэты цікавы твор. Але колькі яшчэ твораў М. Багдановіча чакаюць свайго адкрыцця?! Знайсці іх і данесці да чытача – вось задача і абавязак нашчадкаў!

# Дом Максіма Багдановіча: ці будзе ў ім музей?

Пачатак гэтай гісторыі паклала знаходка. У Яраслаўлі, у доме № 28 па вуліцы Чайкоўскага, была знойдзена старая зацухмоленая дамавая кніга. У ёй сярод шматлікіх прозвішчаў кватэранаймальнікаў была: Максім Багдановіч, сын надворнага саветніка, студэнт Дзямідаўскага ліцэя. На гэтай жа старонцы стаялі іншыя, таксама знаёмыя імёны. Адам Ягоравіч Багдановіч, надворны саветнік, член Яраслаўскага сялянскага банка, Леў Адамавіч Багдановіч, студэнт фізіка-матэматычнага факультэта Маскоўскага універсітэта, Аляксандра Афанас'еўна Мякота, сястра першай жонкі Адама Ягоравіча Багдановіча і яе дзеці: Павел, Мікалай, Вячаслаў, Раман.

Паводле запісу, сям'я Багдановіча наймала кватэру з 29 снежня 1912 года па 16 чэрвеня 1914 года. Потым яна пераехала ў дом Гаракаўнікоўскай па вуліцы Вялікая Данілаўская.

Адшукаў гэтую кнігу брат Максіма Багдановіча Мікалай Адамавіч. Разам з краязнаўцам П. І. Казловічам, які збіраў матэрыял аб мясцінах, дзе кватаравала сям'я беларускага паэта, яны абышлі ўсе чатыры дамы, у якіх з мая 1908 па кастрычнік 1917 года жылі Багдановічы.

У дамах па вуліцах Савецкая і Някрасава ніякіх дакументаў аб пражыванні Багдановічаў не знайшлі. Дом на Вялікай Данілаўскай згарэў у час белагвардзейскага мяцяжу ў ліпені 1918 года і толькі на вуліцы Чайкоўскага, 28 захаваўся той адзіны дакумент. З яго ўсё і пачалося.

Працяг гэтай гісторыі адбыўся праз 30 гадоў. Надзея Сяргееўна Клявакіна, старшыня секцыі гісторыі пры абласным аддзяленні Усесаюзнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (УТАПІіК), добра запомніла гэты апошні дзень лета 1985 года.

Ён тады здаваўся ёй вельмі шчаслівым.

31 жніўня Прэзідыум савета УТАПІіК прыняў доўгачаканную пастанову аб зберажэнні дома беларускага паэта Максіма Багдановіча і стварэнні у ім мемарыяльнага музея.

Яркі сонечны бязвоблачны дзень. Здавалася, такім ён і застанецца ў памяці. Але аднекуль наступілі чорныя хмары. І ў зале, дзе праходзіла пасяджэнне савета, стала цёмна, няўтульна. «Бліс-





кавіца будзе, а я парасон забылася. Ну што за няшчасці?» – яшчэ тады адзначыла пра сябе Надзея Сяргееўна. Толькі пасля і гэты трохдзённы лівень, і грымоты, і маланка, здаваліся маленькай, нязначнай дробяззю.

Сапраўдны выбух прагрымеў тады, калі яна даведалася з неафіцыйных крыніц, што, нягледзячы на прынятую пастанову дом збіраюцца зносіць. На гэтым месцы ў плане галоўнага архітэктара горада Яраслаўля стаіць новы сучасны будынак. З гэтага моманту і пачалася барацьба Надзеі Сяргееўны за захаванне дома. Без прыкрас скажу: у тым, што дом не разбурылі, не прадалі, не спалілі – заслуга толькі яе.

Тэлеграма ў Маскву ва УТАПІіК.

«У Яраслаўлі збіраюцца зносіць дом беларускага паэта Максіма Багдановіча».

Гэта выратавала будынак ад самавольнага зносу. Але, яшчэ раз падкрэслю, толькі ад яго. Восенню 1985 года высяляюцца жыхары дома № 28. Ім далі новыя кватэры. І цёмным, няўтульным адразу стаў дом, застаўшыся без гаспадароў сам-насам з восеньскімі сцюжамі, дажджамі і... рабаўнікамі. Бярвенні, аконныя рамы – усё яшчэ моцнае. А унутры – кафлевая печ, дошкі падлогі, дзверы – таксама добрыя. «Няўжо даць згубіцца гэтаму багаццю?» – меркавалі тыя, хто кожны дзень альбо ноч спрабаваў наведаць дом з карыснай мэтай.

Але вартаўнік ноччу, раніцой, вечарам Надзея Сяргееўна, якая ідучы на працу і з працы праходзіла каля яго, і закалочаныя дзверы, вокны, якія перабіваліся ёю і вартаўніком амаль кожны дзень, – усё гэта дапамагло зберагчы дом. Толькі яго як мага хутчэй трэба было ставіць на дзяржаўную ахову. Але ад просьбаў савета абласнога аддзялення УТАПІіК Яраслаўскага аблвыканкама даваў адказ: «Паставім на дзяржаўную ахову пасля пераносу дома». І разумеючы, што гэта адзіны спосаб выратавання, савет даў згоду.

Спачатку дом Багдановіча думалі размясціць... на яго ж вуліцы. Былая вуліца Вялікая Данілаўская была пераіменавана ў вуліцу Максіма Багдановіча ў жніўні 1984 года. Але даведаўшыся, што прапанаваная галоўным архітэктарам месца знаходзіцца каля гаражоў, перадумалі. Пачалі шукаць па вуліцы Чайкоўскага. Знайшлі месца каля царквы Св. Міколы Мокрага. Але два будынкі, выкананыя ў розных стылях і эпохах (царква будавалася з

1665 па 1672 гады, а дом у пачатку XX стагоддзя) не маглі стварыць цэласнага архітэктурна-гістарычнага ансамбля, і Надзея Сяргееўна прапанавала яшчэ адзін варыянт: пляцоўка, і была якраз насупраць дома Багдановіча. Дом № 27 недалёка стаяў мураваны, з чырвонай цэглы, які раней належаў земскаму доктару Бібікаву (паводле падання тут была бальніца) і драўляны дом другой паловы XIX стагоддзя. У ім раней жыў абслугоўваючы персанал. Такім чынам, стваралася як бы гістарычная мікразона. Гэтая прапанова спадабалася ўсім.

Роўна праз год пасля высялення жыхароў з дома № 28 яго пачалі пераносіць на другі бок. Атрымалася гэта нечакана, без папярэджання УТАПІіК.

Не зрабіўшы неабходныя замеры, дом пачалі разбіраць. На шчасце, у самы першы дзень працы будаўнікоў, так званую «рэстаўрацыю» убачыў член групы «Рэстаўратар» В. М. Ляпёшкін. Ён пабег да галоўнага архітэктара. Праз яго, дабіўшыся дазволу ўмяшацца ў справу, прымусіў будаўнікоў выканаць замер, пранумараваць бярвенні. Здавалася, справа зрушылася з месца. Заканчваўся 1986 год. А новы пачаўся «сюрпрызам».

Рэстаўрацыя яшчэ не была закончана, калі зніклі шалёўка, налічнікі, аконныя рамы, кафля, – тыя дэталі, што адрознівалі дом Багдановіча ад іншых. Зніклі разам з флігелем, які Надзея Сяргееўна марыла таксама потым перанесці. Ніякіх асобных дакументаў на флігель не было, але была надзея, што ўсё можна ўладкаваць і так. Толькі ёй не суджана было здзейсніцца.

Флігель згінуў за суботу і нядзелю. У панядзелак Надзея Сяргееўна, як заўсёды, бегла па вуліцы Чайкоўскага на працу. І раптам застыла: флігель знік!

Вартаўнік, які ноччу ахоўваў яго разам з домам, быў вельмі спакойны:

– Прыязджалі тут двое на машыне. Паказалі паперку ад начальніка ЖЭК-6 і пачалі разбіраць. Для якой мэты? Да не казалі: нумар машыны? Не, не запомніў.

Першая думка Надзеі Сяргееўны была: «Махлярства Скрыгі. А таму шукаць – толькі час губляць».

Скрыга быў адзін з першых, хто паклаў вока на дом. Яшчэ не выехалі яго жыхары, а ён прыходзіў, прыглядаўся, вымерваў.

Аднойчы яго і ўбачыла Надзея Сяргееўна. Як магла цярпліва растлумачыла, што ў доме зробяць музей. І прадавацца, зносіцца





ён не будзе. Але той і слухаць не жадаў. «Я – Скрыга. І дом мне застанецца. А калі не – бульдозерам знясу». Скрыга, былы ўпраўляючы швейнага аб’яднання «Чайка», свае сілы ведаў. Бо, мяркуе Надзея Сяргееўна, будучы ў добрых адносінах са службамі гарвыканкама, разлічваў на іх падтрымку. Пасля размовы з участковым міліцыянерам, які праходзіў у той час міма – больш не з’яўляўся. Толькі не верылася, што ён так проста здаўся. Але выкрадальнікам аказаўся слесар навукова-даследчага інстытута А. Д. Старноўскі. Здавалася, ён не зрабіў нічога супраць закона. Купіў за сорак рублёў флігель і прыхапіў з сабой яго маёмасць. Толькі, відаць, папярэджаны, каб не было шуму, вельмі спяшаўся. Таму член клуба «Рэстаўратар» Т. Н. Бялова, якая, на шчасце, бачыла, як разбіралі флігель, і западозрыла няладнае. Яна і раней ведала аб планах Надзеі Сяргееўны, зберагчы дом і флігель. Таму, здзіўленая, запамятала нумар машыны, па якому і выйшлі на слесара. Але толькі пасля ўмяшання праваахоўных органаў, той вярнуў рэчы, што належалі дому Багдановіча. Флігель адваяваць не ўдалося. Не было, у адрозненне ад А. Д. Старноўскага, ніякіх папер-дазволаў.

Флігель пайшоў на дачу. Частка таго, што было ў ім, – на рэстаўрацыю. Але закончваць яе не спяшаліся. Зрабілі каробку, накрылі дах, і справа зноў стала.

Калі Надзея Сяргееўна адшукала гэты адзіны дом Багдановіча, які захаваўся ў Яраслаўлі (астатніх да гэтага часу ўжо не было), яна марыла зрабіць у ім музей беларускага паэта. Але гарвыканкам даў дазвол толькі на другі, – «Пісьменнікі і паэты Яраслаўскага краю», дзе будзе спецыяльны раздзел, прысвечаны М. Багдановічу. Але потым адмовілі і ў гэтым, спаслаўшыся на нядаўна адкрыты музей у Карабіхе, сядзібе М. А. Някрасава, з такой жа назвай (кампазіцыі, прысвечанай М. Багдановічу, там не было).

А у лютым 1987 года на пасяджэнні галоўнага архітэктара, нягледзячы на пратэст грамадскасці, наогул, пастанавілі аддаць адрэстаўраваны дом пад жыллё. Знайшоўся і арэндатар – нейкая будаўнічая арганізацыя. Але калі той убачыў, у якім стане яму прапанавалі жыллё (а гэта па сутнасці была драўляная каробка без усякіх выгод), адразу адмовіўся. Толькі будынак не доўга быў без гаспадара. Ім стаў кааператыў мастакоў-афарміцеляў.

Восенню Надзея Сяргееўна казала: «Навуковая рэстаўрацыя так і не была праведзена. Стаіць каробка, кампазіцыі няма, кафля

па сённяшні дзень ляжыць у хляўчуку вартаўніка. Да таго ж пры будоўлі дома ў яго трапіла некалькі падгнілых бярвенняў (дом якніяк будавалі ў 1906 годзе). А магчымасць замяніць іх добрымі, ад дома 1908 года, які пайшоў на знос, была. Трэба было зрабіць толькі некалькі крокаў убок. Але нікому да гэтага не было справы. Б'юся адна за дом ужо тры гады, але відаць толку ніякага не будзе».

Усё, безумоўна, было па-іншаму, калі б на доме стаяў знак дзяржаўнай аховы.

І навуковая рэстаўрацыя была бы праведзена, і гаспадар бы хутка адшукаўся. І не мучыла бы пытанне: няўжо ў доме, дзе Максім Багдановіч пісаў бессмяротны «Вянок», артыкулы для «Нашай нівы», рускіх газет і часопісаў будуць пісаць шыльды, вывескі.

Няўжо дом Багдановіча, знойдзены, адваёваны, перанесены з такімі цяжкасцямі, пасцігне той жа трагічны лёс, як і самога паэта? Няўжо ўся барацьба, якую вяла яраслаўская грамадскасць была толькі дзеля будынка? Няўжо ў горадзе, дзе Максім Багдановіч правёў большую частку свайго жыцця так ніколі і не будзе яго музея?

– А можа гэта ўсё-такі вырашальныя пытанні.

Адзін з рэальных спосабаў стварэння музея – зрабіць арэндатарам будынка Яраслаўскі саюз пісьменнікаў. Тое, што залежала ад яраслаўцаў, ужо зроблена. Настала чарга падключыцца да справы Міністэрству культуры БССР, Саюзу пісьменнікаў БССР, усёй грамадскасці Беларусі.

У доме Максіма Багдановіча павінен быць музей. Без яго нельга ўявіць сабе Яраслаўль.



# Хто ратаваў дом Максіма Багдановіча

У 1985 годзе ў горадзе Яраслаўлі ўзнікла пытанне аб зносе дома па вуліцы Чайкоўскага, 28, дзе з 29 снежня 1912 года па 16 чэрвеня 1914 года сям'я Багдановічаў наймала кватэру.

31 жніўня 1985 года старшыня секцыі гісторыі пры Яраслаўскім абласным аддзяленні Усесаюзнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (УТАПГіК) Надзея Сяргееўна Клявакіна даведалася, што прэзідыум савета УТАПГіК прыняў доўгачаканую пастанову аб зберажэнні і захаванні дома, дзе жыў Максім Багдановіч, і стварэнні ў ім мемарыяльнага музея.

Пастанова прынята. Трэба пачынаць ствараць мемарыяльны музей.

Але, не гледзячы на пастанову, у хуткім часе ўзнікла пытанне аб зносе гэтага дома. На гэтым месцы планавалася пабудаваць сучасны шматпавярховы дом. Члены секцыі абмеркавалі сітуацыю, якая склалася з домам Максіма Багдановіча і далі тэлеграму ў Маскву ў Цэнтральны савет УТАПГіК РСФСР. З Масквы хутка прыйшла тэлеграма-адказ – прыпыніць работы аб зносе дома Максіма Багдановіча.

У Яраслаўскі аблвыканкам «на кавёр» была выклікана старшыня секцыі гісторыі Наталля Сяргееўна Зямлянская, дзе яе адлаялі ў партыйна-савецкім духу і... дазволілі прыпыніць знос дома Максіма Багдановіча.

Але ў гэты час, бачачы «бесхозность» дома, былі спробы яго марадзёрства і рабавання.

Каля дома Максіма Багдановіча дзяжурылі раніцаю, днём, вечарам, прыходзілі і ноччу Надзея Сяргееўна Аўчыннікава, Валянцін Аляксандравіч Ляпёшкін, Алег Авеніравіч Паркуян, пенсіянеры Таццяна Мікалаеўна Бялова і Міхаіл Іванавіч Бялоў.

На сцены дома прыклейвалі аб'явы аб часовай ахове гэтага дома на падставе Палажэння аб уноў выяўленых помніках гісторыі і культуры (в «Путеводителе о городе Ярославле» о доме Максима Богдановича сообщается в 1960 году). Потым А. Б. Зольнікаў, Н. С. Зямлянская і В. А. Ляпёшкін прымацавалі драўляную дошку! Але аб'явы і дошку не раз зрывалі. З дому выганялі хуліганаў, п'яніц, бамжоў, якія знайшлі тут прытулак, закалачвалі

дзверы, вокны, каб ўратаваць дом ад марадзёраў. У гэтым актыўны ўдзел прымалі Н. С. Зямлянская, А. Б. Зольнікаў, В. А. Ляпёшкін, А. А. Паркуян, Ю. Ф. Надзеждзін.

Нарэшце, Яраслаўскія аблвыканкам і гарвыканкам высунулі ўльтыматум – ці перанос дома Максіма Багдановіча ці знос. Наталля Сяргееўна Зямлянская пагадзілася на перанос дома ў іншае месца. Члены секцыі гісторыі потым папракалі яе за ўступку. Але ў той час гэта быў адзіны правільны выхад – захаваць дом Максіма Багдановіча, бо нярэдка ў выпадку нязгоды дамы «аўральным парадкам» зносілі ў выходныя ці святочныя дні, вечарам, ноччу і г. д.

Перанос дома пачалі, калі Наталля Сяргееўна Зямлянская паехала ў адпачынак. Выратаваў дом В. А. Ляпёшкін. Ён выпадкова прышоў паглядзець дом і убачыў, што яго разбіраюць і ён прымусіў будаўнікоў пранумараваць бярвенні. Крыху раней ад дома скралі флігель дома ў выхадны дзень. Але пенсіянеры Бяловы паспелі запісаць нумар машыны, пачалі пошук, знайшлі вінаватых, але гарадскія ўлады справу замялі і не давялі да суда. Флігель дома Максіма Багдановіча не вярнулі, хаця і ведалі, хто яго скраў. Выкрадальнікам аказаўся слесар аднаго з Яраслаўскіх навукова-даследчых інстытутаў. Ён атрымаў дазвол, купіў флігель за 40 рублёў і заадно прыхапіў яго маёмасць. І, толькі пасля ўмяшання праваахоўных органаў, той вярнуў рэчы, што належалі дому Максіма Багдановіча. Флігель дома адваяваць не ўдалося.

Актыўна ратавалі дом Максіма Багдановіча ў горадзе Яраслаўлі ад знішчэння:

Зямлянская Наталля Сяргееўна, старшыня секцыі гісторыі Яраслаўскага абласнога аддзялення УТАПГіК РСФСР, музейны работнік;

Зольнікаў Андрэй Барысавіч, намеснік старшыні Яраслаўскага абласнога аддзялення УТАПГіК РСФСР;

Ляпёшкін Валянцін Аляксандравіч, калекцынер, сабініст, краязнавец;

Паркуян Алег Авеніравіч, старшыня нефармальнага аб'яднання «Рэстаўратар», дапамагаў і ахоўваў дом;

Надзеждзін Юліян Фёдаравіч, журналіст, супрацоўнік рэдакцыі газеты «Северный рабочий», друкаваў у газеце матэрыялы, калі скралі флігель;





Бялова Таццяна Мікалаеўна і Бялоў Міхаіл Іванавіч, пенсіянеры, шукалі сляды прапаўшага флігеля дома Максіма Багдановіча і знайшлі;

Аўчыннікава Надзея Сяргееўна, ахоўвала дом ад рабаўнікоў.

# 1891–1991
# Багдановічаўскі каляндар

Ёсць на свеце такія зоркі,
якія ляцяць у далёкую вечнасць,
пакідаючы дзіўны свет.
Гэты свет асвятляе дарогу Пагоні,
ачышчае нашыя душы.
Той свет ёсць сама Пагоня
і нашае выратаванне.
Ёсць на свеце такія паэты,
што пяюць з надтрэснутым сэрцам
і апошні свой скарб аддаюць людзям.
Гэты скарб – ёсць наша праўда,
гонар, сумленне.
Той скарб – нашая Вечнасць.

А гэтай Зоркай – Паэтам быў, ёсць і будзе наш Максім Багдановіч.

Ясная зорачка ягонага жыцця скацілася, калі надыйшла яе 26 вясна.

Але ўспомніць яшчэ зорку свет
Бо ў сэрцах гарыць яе след.
Так свабодна, так ярка пражыць –
Лепшай долі няма на зямлі.

Ўсё кругом на мамент асвяціць
І пагаснуць у цёмнай імглі.
Ўсё знікае, праходзіць, як дым,
Светлы ж след будзе вечна жывым.

«С. Е. Палуяну», 1909 г.

Гэтыя словы сказаў Максім Багдановіч пра Сяргея Палуяна. Гэта можам сказаць і пра Максіма Багдановіча. Мы святкуем Багдановічаўскі 100-гадовы юбілей. Аб тым, як адзначаўся юбілей, нашы нататкі.





### Ялта

Ён марыў жыць сярод бяроз.
А над магілай – кіпарысы.
У смерці крымскія абрысы, –
Ён марыў жыць сярод бяроз.
Застылі ў смутку твару рысы,
Як жорстка насмяяўся лёс:
Ён марыў жыць сярод бяроз,
А над магілай –кіпарысы.

«Трыялет», Сяргей Кавалёў

У краіне светлай, ля сіняй бухты, на Лівадзійскіх могілках, сярод кіпарысаў стаіць сціплы помнік. На ім словы:

Хоць зерняткі засохшымі былі,
Усё ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.

Тут пакоіцца прах Максіма Багдановіча. Душа ж яго з намі.

Максімава слова гучала ў цёплыя майскія дні над магілай паэта. Упершыню музыка яго паэзіі звінела ў Ялце, дзе ён, адзінокі, паміраў і дзе сёння жыве некалькі тысяч беларусаў. Беларуская песня гучала і на пляцоўках горада і ў канцэртнай зале «Юбілейная», у тэатры імя А. П. Чэхава, у санаторыях. Выступалі ансамбль народнай музыкі «Свята», ансамбль «Сябры», пісьменнікі, артысты. Спецыяльная выстаўка, прысвечаная Максіму Багдановічу, адбылася ў музеі «Культура Ялты».

### Ніжні Ноўгарад

У Ніжнім Ноўгарадзе паэт пражыў 12 гадоў. Тут ён напісаў свае першыя вершы, ад цёткі Машы захапіўся беларускай песняй. У Ніжагародскай гімназіі Максім арганізаваў першы ў жыцці бунт супраць існуючых парадкаў.

11 лістапада ў Ніжнім Ноўгарадзе з'явілася вуліца імя Максіма Багдановіча. А на гарадскіх пляцоўках, у палацах культуры, у драма-тычным тэатры імя Максіма Горкага гучала слова Максіма і слова аб ім. Незабыўную сустрэчу з паэзіяй класіка беларускай літаратуры падарыла жыхарам гэтага волжскага гораду беларуская дэлегацыя.

## Яраслаўль

Максім пакідаў Яраслаўль на досвітку. Ён ехаў у Беларусь. Ад'язджаў Багдановіч з радасцю і сумам на сэрцы, бо з Яраслаўлем яго столькі звязвала. Пэўна, тады ён не мог і ўявіць, што тут яго не забудуць. Што ў горадзе яго юнацтва ў 1956 годзе будзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка, першая ў яго гонар, якая паведаміць людзям, што ў былой мужчынскай гімназіі з 1908 па 1911 год вучыўся вядомы беларускі паэт Максім Багдановіч.

Максім не мог нават і падумаць аб тым, што тут, на радзіме Мікалая Някрасава і Леаніда Собінава, у 1981 годзе з'явіцца першая вуліца Максіма Багдановіча. Не, пэўна, ён не думаў аб гэтым. А адзіны на сёння мемарыяльны музей Максіма за межамі Бацькаўшчыны, размешчаны там, дзе тварыўся яго бессмяротны «Вянок» і там, дзе «Вянок» быў упершыню ім убачаны, – хіба гэта не казка? Музей быў адкрыты 18 лістапада, і на яго адкрыцці яраслаўцы даведаліся, што хутка ў іх горадзе, дзякуючы мінскаму клюбу «Спадчына», скульптару Сяргею Вакару, беларускай эміграцыі Амерыкі будзе ўстаноўлены помнік Максіму Багдановічу – першы помнік беларускаму паэту за межамі Бацькаўшчыны.

Хіба думаў Максім, што ім стануць ганарыцца не толькі беларусы, але і яраслаўцы?.. Багдановіч пакінуў свой яраслаўскі дом.

Максім ехаў у Беларусь.

## Беларусь

Ён нядоўга гасціў на радзімай зямлі,
Але з тое пары і да сёння
Усё цвітуць васількі, што ў радку зацвілі.
Усё лятуць і лятуць тыя коні.
Яго зорка нязгасна над краем гарыць.
Бо і ў сэрцах святло запаліла.
Але гэтак ахвярна радзіму любіць...
Брацця, сёстры! Ці хопіць нам сілы?

«М. Багдановічу», Святлана Багданкевіч

Упершыню ў кожным горадзе, у кожнай вёсачцы, у школах і тэхнікумах 1 верасня прайшлі Багдановічавы ўрокі, а ў царкве і касцеле на станцыі Краснае служылася паніхіда ў памяць Максіма. У Ракуцёўшчыне нарадзілася Усебеларускае свята паэзіі.





У Гародні адбылося адкрыццё новай экспазіцыі Дома-музея паэта.

19 верасня над парламентам Рэспублікі Беларусь быў ўзняты яе дзяржаўны герб, успетая Максімам Багдановічам Пагоня, сімвал годнасці, мужнасці і незалежнасці беларускага народу.

У снежні ў Мінску, у Траецкім прадмесці, адбылося адкрыццё асноўнай часткі экспазіцыі музея Максіма Багдановіча. А вуліца Максіма Горкага стала насіць імя беларускага песняра – Максіма Багдановіча.

6 снежня мінчане змаглі ўбачыць вобраз Максіма Багдановіча, «красу, і светласць, і прастор» ягонай творчасці на мастацкай выстаўцы ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння паэта.

9 снежня ў НАН Беларусі адкрылася канферэнцыя вучоных-багдановічазнаўцаў, якая дапамагла прыблізіцца да таямніцы багдановічаўскай творчасці.

Заключным акордам свята стаў урачысты вечар, які адбыўся ў Дзяржаўным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета ў Мінску. Усіх яго ўдзельнікаў і жыхароў Беларусі прывітаў Генеральны дырэктар ЮНЕСКА Федэрык Маёр. І зноў гучала бессмяротнае слова Максіма Багдановіча.

## Кліўленд

Акадэмія, прысвечаная памяці Максіма Багдановіча, адбылася ў культурна-асветніцкім цэнтры «Полацак» 26 мая. У малой зале экспанаваліся две выстаўкі: «Вянок» Максіма Багдановіча» з твораў Я. Ціхановіча, А. Лапіцкай, Г. Грака і «Максімава Яраславія» з асабістага фотаархіва Святланы Белай. Былі зачытаны тэлеграмы, якія даслалі з нагоды акадэміі Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына», Беларускі ПЭН-цэнтр, калектыў газеты «Набат», сябры мінскага клуба «Спадчына».

У сваім дакладзе вядучая Святлана Белая выкарыстала фрагменты з рукапісу сваёй кнігі «Максімава Яраславія», а таксама запісы песняў, у выкананні вядомых на эміграцыі хораў. Лідзія Лазар-Ханенка прачытала па-ангельску вершы Максіма Багдановіча. На заканчэнні акадэміі ўсім яе ўдзельнікам былі дараваны памятныя граматы ў гонар 100-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча, выдадзеныя мінскім клубам «Спадчына».

## Чыкага

20 кастрычніка ў царкве св. Юрыя адбылася акадэмія ў гонар 100-годдзя з часу нараджэння Максіма Багдановіча. На пачатку

акадэміі былі зачытаны тэлеграмы, якія даслалі ўдзельнікам акадэміі часопіс «Полацак» і мінскі клуб «Спадчына».

Дакладчык акадэміі Мікалай Латушкін пазнаёміў прысутных з асноўнымі момантамі жыцця і творчасці класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. Ён жа прачытаў некалькі вершаў паэта, сярод якіх была любімая на эміграцыі «Пагоня».

У час акадэміі ахвярадаўцам на помнік Максіма Багдановіча ў Яраслаўлі былі ўручаны ганаровыя граматы клуба «Спадчына».

### Нью-Ёрк, ААН

У 1990 годдзе, у зале бібліятэкі ААН сабраліся людзі, каб адзначыць 500-годдзе выдатнага сына зямлі Беларускай першадрукара Францішка Скарыны. У 1991 годзе, 4 лістапада, прыйшлі сюды людзі, каб пакланіцца памяці яшчэ аднога пачынальніка. Пачынальніка беларускай крытыкі, паэта, які прынёс беларускую літаратуру ў дар усяму свету.

– Колькі будзе існаваць жыццё на зямлі, столькі сэрца кожнага беларуса будзе саграваць імя Максіма Багдановіча, – сказаў на адкрыцці вечара міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь П. К. Краўчанка.

– Усяго 26 свечак адпалала на зямным бяседным стале М. Багдановіча, – адзначыў у сваёй прамове шэф беларускай місіі пры ААН беларускі паэт Генадзь Бураўкін. – Калі ў маі 1917 года пагасла апошняя тоненькая і пахілая, побач не было ні сваякоў, ні сяброў, і выпадковыя людзі, якія паклалі ў камяністую крымскую зямлю высушанае туберкулёзам маладое цела, не здагадваліся нават, што хавалі аднаго з выдатнейшых беларускіх паэтаў, аднаго з самых любімых сыноў нацыі. Максім Багдановіч марыў, што беларуская культура панясе, нарэшце, свой дар усяму свету. Час гэты настаў. Мы з паклонам перадаём людзям свае духоўныя набыткі – і сярод іх чыстую Максімаву песню.

І чыстая, прыгожая песня Максіма Багдановіча зазвінела ў зале, якая чула песні найлепшых сыноў і дачок Зямлі. Песня гучала ў выкананні ансамбля «Песняры», які падрыхтаваў спецыяльную праграму для гэтага вечара-памяці. Гучалі «Ой, чаму я стаў паэтам», «У Максіма на кашулі», «Зорка Венера», «Лявоніха», «Вераніка» і іншыя. І шырока, павольна ў будынку ААН, над якім лунае бел-чырвона-белы сцяг, лілася старадаўняя і вечна маладая багдановічаўская «Пагоня».



# Вяртанне

Максім Багдановіч выйшаў з гімназіі. Вецер моцна дзьмуў з Волгі і раздуваў крысы яго паліто. Не верылася, што ў Яраслаўль прыйшла вясна. Было зімна, але на душы ўсё спявала. Хутка, вельмі хутка, ён здасць экзамены, атрымае дыплом Яраслаўскай мужчынскай гімназіі і паедзе на Бацькаўшчыну. Ён, нарэшце, пабачыць Беларусь, акунецца ў роднае адраджэнскае асяроддзе, пачуе прыгажосць роднай мовы. А далей – праца на карысць Бацькаўшчыны, намаганні праславіць яе як мага шырэй.

Максім Багдановіч выйшаў з гімназіі. Але нешта яго прымусіла затрымацца каля цяжкай брамы. Сёння сапраўды шчаслівы дзень, скончана гімназская навука. Няўжо ён больш ніколі не вернецца, сюды ў ягоную Alma Mater? Максім азірнуўся.

Колькі звязана ў яго з гэтым месцам! Сябры, любімыя настаўнікі, літаратурны гурток... Не, ён яшчэ вернецца сюды!..

Праз 83 гады Максім Багдановіч сапраўды вярнуўся ў Яраслаўль. Каб застацца тут назаўсёды. 28 мая 1994 года на Чырвонай плошчы, ля будынку Яраслаўскага дзяржаўнага універсітэту, былой мужчынскай гімназіі, устаноўлены бронзавы помнік Максіма Багдановіча – другі помнік за межамі Беларусі.

Гісторыя стварэння і ўстаноўкі помніка ў Яраслаўлі, у нечым нагадвае няпросты лёс самога Максіма Багдановіча.

Ідэя пабудовы помніка паэту ў Яраслаўлі, горадзе, дзе паэт правёў большую частку свайго жыцця, дзе былі надрукаваны ягоны адзіны прыжыццёвы зборнік «Вянок» і амаль уся крытычна-публіцыстычная спадчына, шматлікія вершы належала старшыні клуба «Спадчына» Анатолю Беламу. Ён жа ў 1991 годзе і пачаў збор грошай на пабудову помніка. Ягоную прапанову падтрымаў не толькі Мінскі культурна-асветніцкі клуб «Спадчына», Міністэрства культуры Беларусі, музей Максіма Багдановіча ў Мінску, Беларуская праваслаўная епархія, фірма «Дайнова», Міжвыдавецкі фотацэнтр, Саюз журналістаў Беларусі, выдавецтва «Хата», газета «Частный детектив», але і беларусы Амерыкі: Ніна і Павел Агалец, Уладзімір Бакуновіч, Міхась Белямук, Мікалай Валатоўскі, Мікалай Грэбень, Бранíслаў Даніловіч, Мікалай Латушкін, Яўген Макарэвіч, Міхась Каленік, Кастусь Калоша, Сяргей Карніловіч, Пётр Нягода, Мацвей Рэпкаў-Смаршчок, Святлана Белая.

Медны помнік Максіма Багдановіча для горада Яраслаўля быў адліты яшчэ ў чэрвені 1992 года і дастаўлены на сядзібу клуба «Спадчына» у горадзе Мінску па вуліцы Адаеўскага, 18.

Пачаўся працяглы і нудны працэс перамоў праз Міністэрства культуры Беларусі з мэрыяй горада Яраслаўля аб устаноўцы гэтага помніка. Анатоль Белы даверыўся шчырасці завярэнням тагачаснага міністра культуры Яўгена Вайтовіча і чыноўніка гэтага ж міністэрства Уладзіміра Уродніча ў іх намаганнях у справе ўстаноўкі помніка. І таму ўсе ліставанне і тэлефонные размовы ішлі праз іх.

Але аднойчы Анатоль Белы не вытрымаў і з трыбуны Першага з'езда беларусаў бліжняга замежжа, які праходзіў у сакавіку 1993 года ў Доме літаратара па вуліцы Фрунзе, 5 у горадзе Мінску, расказаў публічна аб чыноўнічай валтузні Міністэрства культуры Беларусі ў справе нежадання рабіць сапраўдную справу. Змест прамовы Белага тут жа данеслі Яўгену Вайтовічу. І вось, калі А. Белы ў чарговы раз наведаўся ў міністэрства, Я. Вайтовіч катэгарычна адмовіўся прыняць яго. Міністр заявіў на расійскай мове: «После того как вы выступили с упреками против меня, я с вами никаких дел иметь не хочу». Аб гэтай размове і стаўленні да ўстаноўкі помніка Максіма Багдановіча А. Белы напісаў у газету «Наша слова» (№ 7, 1993 г.). Пасля гэтага міністр разлаваўся «пуще прежнего». Ён накіраваў А. Беламу гнеўны ліст з выказваннем нездавальнення ягонымі выступленнямі на з'ездзе і ў друку і расповедам аб тым, як цудоўна працуе яго міністэрства і які выдатны ў яго чыноўнік Уладзімір Уродніч за плячыма якога некалькі персанальных мастацкіх выставак і галоўнае тое, што беларускі ўрад надаў яму годнасць заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі. А ў Анатоля Белага такога звання няма і наўрад ці калі-небудзь будзе.

Прайшоў яшчэ год. І перад 1 мая 1994 года Анатоль Белы вырашыў сам патэлефанаваць у мэрыю Яраслаўля. Тое што ён пачуў, яго проста ашаламіла. Аказваецца, мэрыя Яраслаўля ўжо 6 месяцаў патрабуе ад Міністэрства культуры Беларусі, каб беларускі бок прывез помнік Максіма Багдановіча ў Яраслаўль. У мэрыі Анатолю Беламу заявілі, што калі помнік не будзе дастаўлены праз тыдзень у Яраслаўль, то мэрыя не можа гарантаваць яго ўстаноўку ў гэтым годзе, бо на 28 мая запланавана правядзенне свята горада і адначасова намечана адкрыццё помніка Максіма Багдановіча.





Як жа так, чыноўнікі Міністэрства культуры Беларусі гаварылі А. Беламу аб адмаўленні Яраслаўля ва ўстаноўцы помніка – кіраўніцтва Яраслаўля ўжо 6 месяцаў патрэбуе яго прывозу. Не аднойчы Белы наведваўся ў міністэрства і там яго запэўнівалі, што звестак з Яраслаўля ніякіх няма. Ну і ну!

Але ў Анатоля Белага не было ні часу, ні жадання высвятляць такія супярэчнасці. Трэба было дзейнічаць хутка і вынікова – адводзіўся толькі тыдзень. У той жа дзень ён звярнуўся да міністра культуры, ім ужо быў Анатоль Бутэвіч, толькі з адной просьбай – дапамагчы перавесці помнік Максіма Багдановіча ў Яраслаўль. Адказ быў такі – транспарту ў міністэрстве няма, грошай на перавозку таксама няма. Але і гэта Белага не спыніла. Ён ведаў, хто па-сапраўднаму яму дапаможа ў гэтай справе. А. Белы папрасіў у міністра толькі аднаго – напісаць ад імя Міністэрства культуры на Мінскі аўтамабільны заводу просьбу ў садзейнічанні перавозкі помніка ў горад Яраслаўль. Уладзімір Уродніч напісаў такі ліст.

Сапраўдную бескарыслівую дапамогу ў дастаўцы помніка аказаў Анатолю Беламу выдатны чалавек, шчыры беларус – старшыня рады Таварыства беларускай мовы Завадскога раёна горада Мінска, сябра клуба «Спадчына» Мікола Лавіцкі. Ён арганізаваў на заводзе, дзе працаваў, і які адвозіў бракаваныя рухавікі на Яраслаўскі маторны завод, перавозку помніка Максіма Багдановіча. У пачатку мая помнік быў пагружаны ў машыну, разам з бракаванымі маторамі, і адправіўся ў Яраслаўль. Ехаць давялося без усялякага камфорту ў спальнай люльцы кабіны МАЗа, бо месца каля вадзіцеля заняла яго пляменніца, якая перавозіла для свайго падмаскоўнага дома, што ў горадзе Пушкін, сталярку – дзверы і аконныя рамы. У Яраслаўль яны прыехалі позна вечарам.

Анатолю Беламу здавалася, што ён добра ведае Яраслаўль, але аказалася, што ён ведаў яго толькі з вокнаў машын, аўтобусаў, тралейбусаў, таму яны раптам і апынуліся пасярод ночы ў цэнтры могілак. Эмоцыі, якія ўзніклі ў шафёра, былі неапісуемыя. Жах настолькі ахапіў яго, што ён затросся і ўзвыў. Вялікая грузавая машына з прыцэпам стаяла на вузкай дарозе пасярод магіл. Ні развярнуцца, ні даць наперад ці ў бок. Ёсць усе падставы заначаваць з памерлымі. Але дзякуй Богу, што Анатоль Белы гэтыя могілкі добра ведаў, бо кожны год па прыездзе ў Яраслаўль наведваў магілы цесця і швагра. Анатоль як мог супакоіў шафёра, хутка знайшоў патрэбную дарогу і праз 10 хвілін яны былі ўжо каля дома, дзе жывуць родныя яго жонкі. Яшчэ праз нейкі час выгрузілі помнік.

Як не прапаноўвалі шаферу застацца заначаваць, расслабіцца, скінуць стрэс, але ён жадаў толькі аднаго – хутчэй дабрацца да Тутаева (горад каля Яраслаўля, дзе знаходзіцца другі яраслаўскі маторны завод), каб раніцай перадаць бракаваныя і забраць узамен спраўныя маторы, каб у гэты ж дзень выехаць у Мінск. Швагер А. Белага Яўген праводзіў яго да тутаеўскай дарогі. Раніцай Белы быў ужо ў Яраслаўскай мэрыі, ва ўпраўленні культуры. Праз некаторы час кіраўніцтва мэрыі прыехала аглядаць помнік Максіма Багдановіча. Помнік усім спадабаўся.

Праз некалькі дзён А. Белы быў у Мінску. Міністру культуры ён перадаў афіцыйнае запрашэнне ад мэра горада Яраслаўля Віктара Валанчунаса прыняць удзел у святкаванні дня горада Яраслаўля і адкрыцці помніка Максіма Багдановіча.

Свята горада прызначалася на 28 мая 1994 года.

Перад Анатолем Бутэвічам паўстала складаная задача. Яму хацелася самому паехаць у Яраслаўль на адкрыццё помніка класіку беларускай літаратуры. Бутэвіч сам паэт і таму добра ведаў, што такі акт як узначальваць дэлегацыю на такім важным мерапрыемстве, можа быць толькі раз у жыцці, што такі ўдзел ужо становіцца гістарычнай падзеяй. З другога боку яго нешта стрымлівала. Анатоль Белы пачаў патрабаваць, каб у гэтую дэлегацыю быў уключаны і ён, як той, чыімі намаганнямі быў створаны гэты помнік.

А. Бутэвіч напачатку заявіў, што рашэнне канчаткова прыме прызначаны кіраўнік дэлегацыі. Калі высветлілася, што кіраўніком дэлегацыі прызначаецца яго намеснік Іван Карэнда, то А. Беламу было заяўлена, што ў сілу таго, што А. Белы па сваёй рабоце належыць да Міністэрства вышэйшай адукацыі, то Міністэрства культуры не мае магчымасці аформіць на яго ніякіх камандзіровачных, і тым болей уключыць у склад дэлегацыі. Вось такія кручкатворчыя бюракратычныя ўлоўкі! Але, каб падсаладзіць нейкім чынам горыч пілюлі, ці наадварот, паказаць усё іх чыноўнічае стаўленне да А. Белага, яны ўключылі ў склад гэтай дэлегацыі архітэктара Андрэя Карпука, які рабіў архітэктурную прывязку помніка Максіма Багдановіча да месца ў горадзе Яраслаўлі. Ён наогул ні да якога ведамства ў той час не належыў, бо быў ці то беспрацоўным, ці працаваў у нейкай прыватнай архітэктурнай майстэрні, якая ўвогуле не мела ніякіх адносін да Міністэрства культуры. Вось такія пірагі!

Дэлегацыя Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у складзе чатырох чалавек адправілася ў падарожжа, спачатку ў горад





Уладзімір, дзе ў тыя дні праходзіла свята славянскай пісьменнасці, а пасля павінна была прыехаць у Яраслаўль на ўрачыстае адкрыццё помніка. А. Белы, узяўшы ў БДУ, дзе ён працаваў, дадатковы адпачынак за свой кошт і купіўшы за свае грошы білет, адправіўся ў Яраслаўль.

Прыехаўшы ў Яраслаўль, ён каля тыдня кожны дзень з раніцы прыходзіў на пляцоўку, дзе ўстанаўліваўся помнік Максіма Багдановіча і ажыццяўляў аўтарскі нагляд за работай.

І вось, нарэшце, прыйшоў доўгачаканы дзень 28 мая 1994 года, як свята горада, так і адкрыцця помніка. Помнік намячалася адкрываць у 15 гадзін. Але ні раніцай, ні ўдзень беларуская афіцыйная дэлегацыя не з'явілася. Нервуецца начальнік упраўлення культуры мэрыі Яраслаўля Юры Арлоў, намеснік мэра Анатоль Яблычкін, які адказвае за гэтую ўрачыстасць, і мэр горада Яраслаўля Віктар Валенчунас у сэрцах заяўляе: «Што ж гэта вашы мудакі так загулялі ва Уладзіміры, што своечасова не могуць патрапіць на ўрачыстае адкрыццё ў Яраслаўль». І аддае загад свайму намесніку, каб А. Белага першым унеслі ў спіс прамоўцаў з нагоды адкрыцця помніка.

Калі да адкрыцця помніка Максіму Багдановічу засталося 40 хвілін прыехала беларуская дэлегацыя. Тут не будзем кранаць усе апраўдальныя прамовы Івана Карэнды і усе неадабральныя выказванні і красамоўныя выразы твару мэра. Пасля гэтай размовы Іван Карэнда, як налоўчаны вопытны чыноўнік, звярнуўся да намесніка мэра Анатоля Яблычкіна з высвятленнем спіса прамоўцаў на ўрачыстасцях адкрыцця помніка. Калі ён убачыў, што ў спісе першым значыцца імя А. Белага, то запярэчыў. Маўляў, што ён афіцыйны кіраўнік дэлегацыі і таму яго імя павінна стаяць першым. Калі намеснік мэра ўпісаў імя Івана Карэнды першым, ён тут жа запатрабаваў, каб імя члена афіцыйнай дэлегацыі пісьменніка Алеся Петрашкевіча стаяла другім на падставе афіцыйнасці.

І дзіўна было назіраць, як толькі што апазораны сваім спазненнем і ледзве не зрывам адказнага мерапрыемства чыноўнік выстаргоўваў свае ад Бога ці ад дзьябла дадзеныя прывілеі, гуляў у гульні, якія называюцца чыноўніцкай субардынацыяй ці «табелем аб рангах».

Анатолю Беламу было ўсё роўна якім па спісе выступаць, галоўнае для яго было сказаць яраслаўцам тое, чым кіраваўся ён у сваіх дзеяннях, калі рабіў помнік вялікага паэта і вялікага пат-

рыёта зямлі беларускай і чаму, менавіта, устанавіў яго ў Яраслаўлі.

Быў даволі халодны для гэтай пары года дзень. З раніцы ішоў дождж. Усе хаваліся ў паліто і курткі. Толькі мэр, яго намеснік і Анатоль Белы распрануліся і былі ў касцюмах.

Памяць пра Максіма Багдановіча патрабавала гэтага!

Мэр горада Яраслаўля Віктар Валанчунас, беларус па паходжанню, у сваім выступленні адзначыў:

– Адкрыццё помніка Максіму Багдановічу ёсць значная падзея ў жыцці горада! Гэты дар гораду Яраслаўлю яшчэ раз пацвярджае цесную сувязь паміж Яраслаўлем і Беларуссю. Хачу парадаваць усіх добрай навіной. Дом-музей Максіма Багдановіча, які захаваўся, дзякуючы намаганням мясцовых краязнаўцаў, журналісткі Святланы Белай і старшыні клуба «Спадчына» Анатоля Белага перададзены на баланс мэрыі горада. Гэта значыць, што з філіялу музея-сядзібы расійскага паэта Мікалая Някрасава «Карабіха» ён ператвараецца ў самастойны музей. Я абяцаю аддаць дом, які стаіць каля музея Максіма Багдановіча для культурных патрэб беларусаў Яраслаўля, якія яшчэ не маюць сваёй арганізацыі, але, думаецца, з цягам часу арганізуюць яе.

За В. Валанчунасам выступаў Іван Карэнда. Тут і пачалася яго паўгадзінная прамова. Гэта быў вялікі ўзор чыноўнічага краснабайства. Вылучыць нейкія цікавыя думкі ў гэтай прамове было немагчыма, бо гэта было нейкае шалушэнне паветра, ці зацягнуўшыся славесны панос. І, калі ўжо ўсім стала неўмагату, Іван Карэнда, нарэшце, выказаў самае сакраментальнае, дзеля чаго ён сюды быў накіраваны: «Примите, дорогие ярославцы, от имени белорусского народа и по поручению нашего правительства этот памятник». А. Белы стаяў побач з мэрам Яраслаўля. Ці ад таго, што ён ужо трохі прамёрз, слухаючы пустапарожняе краснабайства, ці ад таго, што засаромеўся ад такіх слоў, бо добра ведаў усю падаплёку як стварэння гэтага помніка, так і ўсе акалічнасці, звязаныя з яго дастаўкай, устаноўкай і нават адмаўленнем унясення А. Белага ў спіс членаў афіцыйнай дэлегацыі, мэр даволі выразна сказаў, каб пачулі тыя, хто стаяў побач: «Ну и болтун же выступающий!»

У сваёй прамове, якая гучала на мове Максіма Багдановіча, пісьменнік-драматург Алесь Петрашкевіч сказаў:

– Мы адкрываем помнік не проста паэту, мы адкрываем помнік геніяльнаму паэту, нашаму беларускаму Лермантаву. Гэта





другі помнік за межамі Беларусі, пастаўлены нашаму славутаму земляку. Першы ўзведзены паэту Янку Купалу ў Нью-Ёрку. Многа сэрца і душы, уклаў у тое, каб гэты помнік з'явіўся на гэтай зямлі наш зямляк Анатоль Белы і яго дачка Святлана, якая займаецца даследваннямі жыцця і творчасці Максіма Багдановіча. Нельга абмінуць і той дапамогі нашых суайчыннікаў, якія жывуць за мяжой. Ад свайго імя, ад імя Саюза пісьменнікаў Беларусі хачу перадаць шчырую падзяку беларусам Амерыкі, якія далучыліся сэрцам і душой да гэтай святой справы па стварэнню помніка класіку беларускай літаратуры. Лёс раскідаў беларусаў па ўсім свеце, і сёння беларусаў за межамі Беларусі прыкладна столькі ж, колькі беларусаў жыве на Бацькаўшчыне. Няхай жа Максім Багдановіч будзе той нітачкай, якая звязвае нашы гарады, нашы народы і нашы ўзаемаадносіны. Няхай жа гэты помнік стане сімвалам нашай дружбы. Я хачу прачытаць вам адзін з лепшых твораў Максіма Багдановіча:

## СЛУЦКІЯ ТКАЧЫХІ

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.
І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.
А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна, –
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбам зззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага ўзора,
Цвяток радзімы васілька.

Слова прадстаўляецца Анатолю Беламу:

– Менавіта сюды, Іаіль Быхоўскі, рускі духоўны дзеяч XVIII стагоддзя выхадзец з Беларусі, прывёз у Спаскі манастыр «Слова аб паходу Ігаравым», выдатнейшы помнік культуры ўсходніх славян. Менавіта, беларускія майстры XVII стагоддзя рабілі іканастас царквы Іллі Прарока, які і сёння здзіўляе сваёй прыгажосцю. У час першай сусветнай вайны сюды быў эвакуіраваны Мінскі настаўніцкі інстытут, дзе выкладаў У. М. Ігнатоўскі, М. І. Мароз, Х. Бурван, Х. Імшэнік, М. С. Кахановіч, Дз. А. Сцяпура, С. Курчэвіч-Сеўрук, М. Шымень і іншыя. Гэтыя прыклады можна працягваць. Максім Багдановіч звязвае нашыя народы. І адкрыццё гэтага помніка тут, у Яраслаўлі, помніка, у стварэнні якога прынялі ўдзел і беларусы з Амерыкі, гэта яшчэ адно сведчанне аб нашых цесных сувязях. Верш Максіма Багдановіча «Пагоня» – гэта сапраўдны гімн нашай Бацькаўшчыны і быў ён напісаны тут, у Яраслаўлі:

Толькі ў серцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах, –
Ўспомню Вострую Браму святую
І ваякаў на грозных канях.

Ў белай пене праносяцца коні, –
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

У бязмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі – гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, panяслісе
За тваімі дзяцьмі ўздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?

Бійце ў сэрцы іх – бійце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...





Маці родная, Маці-Краіна!
Не ўсцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач. Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

Пасля адкрыцця, да помніка Максіма Багдановіча падыходзілі яраслаўцы.

Міхаіл Савіцкі, яраслаўскі мастак, жывапісец, графік, старшыня яраслаўскай абласной арганізацыі Саюза мастакоў Расіі, працаваў з братам Максіма, Паўлам Адамавічам Багдановічам у Яраслаўскім хіміка-механічным тэхнікуме (Павел Адамавіч выкладаў там хімію), адзначыў:

– У горадзе Яраслаўлі адкрыта шмат выдатных помнікаў вядомым людзям Расіі. Гэта помнікі заснавальніку горада Яраслаўля, вялікаму князю кіеўскаму Яраславу Мудраму, стваральніку ў 1750 годзе першага ў Расіі прафесійнага тэатра ў Яраслаўлі, акцёру Фёдару Рыгоравічу Волкаву, які заклаў асноўныя прынцыпы рускай акцёрскай школы, вялікаму рускаму паэту Мікалаю Аляксеевічу Някрасаву. Але помнік класіку беларускай літаратуры Максіму Багдановічу не ідзе ні ў якае параўнанне з іншымі помнікамі. Помнік Максіму Багдановічу, які мы сёння адкрываем, самы лепшы помнік у нашым горадзе.

Антаніна Салаўёва, беларуска:

– Гэта месца стане для нас куточкам Беларусі! Мне верыцца, што аднойчы беларусы, якія жывуць сёння ў Яраслаўлі, прыйдуць да помніка, паклоняцца Максіму Багдановічу і скажуць: «Вітаем цябе, мая Беларусь!».

Людміла Волкава, нашая суайчынніца, якая жыве ў Яраслаўлі, дадала:

– Я дакладна ведаю, што ў маім жыцці адбылася значная падзея. У Яраслаўлі я маю сваю Беларусь. І, праходзячы са сваёй дачкой каля помніка Максіма Багдановіча, я абавязкова пакладу да яго свае лепшыя кветкі. Мы пастаім і памарым аб сваёй роднай Бацькаўшчыне, адчуем, яе дыханне і прысутнасць.

Уладзімір Ждан, беларус па паходжанню, сааўтар архітэктурнага праекту помніка, сказаў:

– Мне вельмі прыемна, што гэты помнік стаіць на яраслаўскай зямлі. І мне думаецца, што наш беларускі паэт аб’ядна беларусаў яраслаўскай зямлі, бо ён будзе нам прыкладам, як, знаходзячыся за межамі Бацькаўшчыны, служыць роднай Беларусі!

Максім Багдановіч вярнуўся ў Яраслаўль. Максім Багдановіч стаіць каля гімназіі, рабіна ціха схіліла галаву над ім. Беларусы адарылі свет многімі арыгінальнымі таленавітымі людзьмі. І прыйшоў час несці праўду аб гэтых людзях, несці гэты дар усяму свету, каб сцвердзіць нашу годнасць, каб сцвердзіць саміх сябе сярод іншых народаў.

Бронзавы Максім Багдановіч быццам бы спускаецца па прыступках з гімназіі да нас. Бронзавы Максім сочыць зоры, слухае нашыя размовы. Скульптар Сяргей Вакар надзяліў гэты помнік душой. І душа Максіма Багдановіча, як і ўся ягоная спадчына належыць нам, беларусам. Беражыце яе!

І яшчэ адзін маленькі і радасны штрышок. А калі ён радасны няхай стане радасным і для тых, хто сумесна суперажываў ва ўсіх мыканнях А. Белага па карыдорах беларускай улады дзеля адной мэты – устаноўцы помніка Максіма Багдановіча там, дзе калісьці ён жыў і тварыў дзеля будучае Беларусі.

Не гледзячы на тое, што Міністэрства культуры Беларусі не надало А. Беламу статуса афіцыйнага члена дэлегацыі, мэр Яраслаўля Віктар Валанчунас аддаў загад надаць яму статус афіцыйнага ганаровага госця горада Яраслаўля. Згодна гэтага загаду, былі налічаны камандзіровачныя за ўсе дні знаходжання Анатоля Белага ў Яраслаўлі.

Але самае галоўнае сталася ў тым, што Максім Багдановіч вярнуўся ў Яраслаўль.

Мы, беларусы, адарылі свет многімі таленавітымі людзьмі!

Мы прынеслі праўду ў Яраслаўль толькі аб адным з іх!

Перад намі стаіць задача несці праўду аб нашых таленавітых людзях усяму свету, каб сцвердзіць нашую годнасць, каб сцвердзіць саміх сябе сярод іншых народаў свету!



# Дадатак

# «Голос»

Штодзённая, грамадска-палітычная і літаратурная газета, выдавалася ў Яраслаўлі з 19.02.1909 г. па 1918 г. Выдаўцы К. Ф. Някрасаў і М. П. Дружынін. Рэдактар М. П. Дружынін. З 1912 года выдаваўся К. Ф. Някрасавым, з 1916 года пераходзіць калектыву супрацоўнікаў. Выданне газеты ў 1918 годзе часова спынілася і было пераіменавана на кароткі час у газету «Свободное слово».

Газета была разлічана пераважна на гарадское насельніцтва Яраслаўскай губерні, адлюстроўвала жыццё суседніх Валагодскай, Кастрамской, Уладзімірскай, Цвярской, Ніжагародскай, Архангельскай губерняў. Друкавала шмат матэрыялаў пра жыццё, быт гарадскога насельніцтва (аддзелы «Ярославльская жизнь», «Областной отдел», «Действия местных властей»). Інфармавала чытачоў аб важнейшых падзеях міжнароднага і ўнутраннага жыцця Расіі (аддзелы «По России», «Столичная жизнь», «Новости»).

Змяшчала матэрыялы аб духоўным і мастацкім жыцці гараджан, дзейнасці адукацыйных, кааператыўных, сельскагаспадарчых, прафсаюзных таварыстваў, мясцовых улад. Мела аддзелы бібліяграфіі, адукацыі, фельетонаў, літаратуры. Друкавала біржавыя курсы, рэкламу і аб'явы. Газета насіла ліберальны характар. Змяшчала і вострапалітычныя матэрыялы, за што штрафавалася цэнзурай. Так на газету быў накладзены вышэйшы для правінцыяльных газет штраф у памеры 500 рублёў за перадавы артыкул «Дворяне и земство», змешчаны ў № 33 ад 4.04.1909 г.

М. Багдановіч актыўна супрацоўнічаў з газетай «Голос». У 1958 годзе С. С. Каныгін, былы рэдактар газеты, у адказ на запытанне Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР паведаміў, што М. Багдановіч часта друкаваў у «Голосе» вершы, апавяданні, нарысы, артыкулы. Тады ж навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры І. І. Гарэцкім быў прагледжаны архіў «Голоса» за 1909–1917 гг. і з удзелам С. С. Каныгіна прачытаны ўсе тэксты за подпісам М. Б. і некаторымі псеўданімамі. С. С. Каныгін пацвердзіў, што М. Багдановіч з'яўляецца аўтарам такіх твораў, як «После концерта Яна Кубелика» (1909 г.), «Жду я...» (1910 г.), «Весеннее» (1910 г.) і іншых. Але па іншым крыніцам (успаміны С. С. Каныгіна, надрукаваныя на пішучай машынцы) М. Багдановіч пачаў супрацоўнічаць з «Голосом» з восені 1911 года, будучы студэнтам Дзямідаўскага юрыдычнага ліцэя.

За час супрацоўніцтва ў газеце М. Багдановічам надрукаваны наступныя творы: «Жду я...» (1910, № 21, 27 студзеня), «Весеннее» (1910, № 71, 31 сакавіка), «Из испанских мотивов» (1910, № 104, 13 мая), «Не сердись на меня, тихий друг» (1910, № 139, 25 чэрвеня), «После концерта Яна Кубелика» (1909, № 230, 6 снежня), «Несчастный случай» (1913, № 99, 101, 1, 3 мая), «Цензурные мытарства Н. А. Некрасова» (1913, № 189, 20 жніўня), «Мадонна» (1913, № 295, 25 снежня), «Катыш» (1916, № 83, 10 красавіка), «Из рассказа «Кленовые листочки» (1916, № 129, 8 чэрвеня), «Смерть» (1916, № 137, 17 ліпеня), «С. Д. Дрожин» (1913, № 284, 12 снежня), «Памяти Т. Г. Шевченко» (1914, № 46, 25 лютага), «Одинокий» (1914, № 226, 2 кастрычніка), «Н. К. Михайловский» (1914, № 22, 28 студзеня), «Львов» (1914, № 194, 24 жніўня), «Роман Тристана и Изольды в изложении Ж. Бедье» (1913, № 292, 21 снежня), «Н. М. Никольский. Древний Вавилон» (1914, № 3, 4 студзеня), «Собрание сочинений К. Рылеева и Одоевского» (1914, № 14, 19 студзеня), «Безумец» (1914, № 29, 5 лютага), «Желтые цветы» (1914, № 33, 12 лютага), «А. Н. Афанасьев. Народные русские легенды» (1914, № 50, 1 сакавіка), «Рабиндранат Тагор. Гитаиджали (Жертвопесни)» (1914, № 62, 15 сакавіка), «Теофиль Готье. Эмали и камеи» (1914, № 79, 5 красавіка), «Н. Снессарев», Мираж «Нового времени» (1914, № 129, 7 чэрвеня), «Жатва» (1914, № 141, 21 чэрвеня), «Полное собрание сочинений Е. А. Баратынского», «Собрание сочинений Е. А. Баратынского и Д. В. Веневитинова», (1914, № 153, 5 ліпеня), «Ю. Энгель. Музыкальный словарь» (1914, № 264, 15 лістапада), «Национальные проблемы» (1915, № 138, 19 чэрвеня), «А. Л. Погодин. Славянский мир» (1915, № 136, 21 чэрвеня), «Н. А. Рубакин. Среди книг» (1915, № 139, 21 чэрвеня), «Русский экскурсант» (1915, № 139, 21 чэрвеня), «Архив села Карабихи» (1916, № 24, 30 студзеня), «Письма А. П Чехова» (1916, № 65, 19 сакавіка), «Музыкальный современник № 1–6» (1916, № 76, 2 красавіка), «Отечество» (1916, № 115, 21 мая), «Г. В. Плеханов. Дневник социал-демократа» (1916, № 138, 18 чэрвеня), «С. М. Чевкин. Шестая держава» (1916, № 149, 2 ліпеня), «Валерий Брюсов. Семь цветов радуги» (1916, № 179, 6 жніўня), «Иван Морозов. Красный звон» (1916, № 188, 20 жніўня), «1916» (1916, № 200, 3 верасня), «Осенью» (1916, № 154, 8 ліпеня).

Газета змясціла ўспаміны аб паэце: мясцовага журналіста М. Магульскага «М. А. Богданович» (1917, № 124), яраслаўскага





паэта А. Д. Цітова «Памяти друга» (1917, № 128). У артыкуле М. Магульскага «М. А. Богданович» змешчаны пераклад М. Магульскага верша М. Багдановіча «Краю мой родны!..».

Захаваўся фотаздымак супрацоўнікаў газеты «Голос», зроблены ў 1915 годзе, сярод якіх стаіць чацверты злева М. Багдановіч. З журналістамі газеты ён падтрымліваў сяброўскія сувязі. Найбольш цёплыя адносіны склаліся ў яго з М. Г. Агурцовым, С. С. Каныгіным, П. А. Крыцкім, М. Магульскім, аб чым сведчаць успаміны, якія яны напісалі пасля смерці М. Багдановіча.

У апошні час былі знойдзены ў газеце новыя, раней невядомыя творы М. Багдановіча: «Мытарства беженцев» (1916, № 174, 31 ліпеня), подпіс «Ів. Февралёв», «Новые письма Л. Н. Толстого» (1915, № 226, 4 кастрычніка), без подпісу, але на прыналежнасць гэтага твора М. Багдановічу піша М. Г. Агурцоў у кнізе «Опыт местной библиографии. Ярославский край (1918–1924)» і іншыя.

# «Микроскоп»

Сатырычны штотыднёвы часопіс памерам 4–8 старонак, які выдаваўся з 1913 па 1914 год у Яраслаўлі, друкаваўся спачатку ў Яраслаўлі, у друкарні Нікалаевай, будынак Спаскага манастыра, з 46 нумара 1913 года у Рыбінску, у друкарні Дземінева, па вуліцы Сталыпінская, 34. Рэдактар-выдавец М. Д. Семяноўскі. Адносна часопіса «Мікроскоп» бацька паэта А. Я. Багдановіч у лісце ад 20 верасня 1928 года паведамляў наступнае; «*Гэта як бы сатырычны, а па сутнасці шантажны штотыднёвы невялічкі часопіс выдаваўся ў 1913 і 14 гг. у Яраслаўлі, а потым быў перанесены ў Рыбінск. Друкаваўся ён на паковачнай каляровай паперы ў адзін аркуш з дрэнна намаляванымі карыкатурамі – часопіс самага «нікчэмнага» характару. Досціпам, едкасцю сатыры ён не вызначаўся, а адзначаўся грубымі выпадамі супраць грамадскіх дзеячоў ці гандлёвых фірм і прадпрыемстваў, прычэпліваўся да якіх-небудзь паасобных выпадкаў – груба, з нацяжкамі, гвалтоўна. Ад яго кпін можна было адкупляцца, змяшчаючы абвестку ў гэтым брудным часопісу. Пачаўшы выходзіць зусім без абвестак, ён развіў такімі прыёмамі кліентуру, якая падтрымоўвала часопіс, змяшчаючы ў ім свае абвесткі*».

Часопіс меў пастаянныя рубрыкі: «Городская хроника», «Дневник обывателя», «Сенсационные разоблачения», «Остроты и шутки читателей «Микроскопа», «Почтовый ящик», «Подслу-

шанные разговоры», «Ростовская хроника», «Костромская хроника», «На рыбинские темы», «Хроника «Микроскопа» і іншыя. Асаблівай едкасцю выдзялялася рубрыка «Бесплатные объявления», дзе груба крытыкаваліся непажаданыя часопісу прадпрыемствы, гандлёвыя фірмы ці грамадскія дзеячы. Пачынаючы з першых нумароў, «Мікроскоп» вядзе барацьбу з штодзённай газетай «Голос». У № 12 за 1913 год часопіс змяшчае некалькі матэрыялаў супраць «Голоса» і яго супрацоўнікаў: «Вечерний мацион сотрудников «Голоса», «Не Критскому» і іншыя, у № 13 за 1913 год новы выпад на супрацоўнікаў газеты. Гэтыя напады паўтараюцца на працягу года.

У № 35 газеты «Голос» ад 12 лютага 1914 года змешчаны артыкул М. Багдановіча «Жёлтые цветы», у якім аўтар паказаў прадажную сутнасць часопіса. У адказ на выступленне М. Багдановіча часопіс ў № 7 за 1914 год змяшчае артыкул рэдактара Н. Д. Семяноўскага «Расшаркивающиеся лжецы», у якім паведамляе:

«*Да как еще! – посвятил журналу чуть не полномера.*

*С большой, вероятно незаслуженной нами добросовестностью г. Богданович, автор статьи «Желтые цветы» занялся изучением журнала за целый год. Шаг за шагом усидчиво и кропотливо собирал о журнале «Факты», имеющие целью повергнуть его в прах. Эта внимательность и добросовестность нам несказанно польстили.*

*Но грянул гром! Неожиданный, не из тучи и мы... остались невредимы.*

*Добросовестности у г. Богдановича хватило только на чтение журнала, но это не смутило «Голос» и он напечатал его статью*».

Далей часопіс спрабуе даць абвяржэнне артыкула М. Багдановіча, але бачна, што ўсе тлумачэнні «Мікроскопа» шыты белымі ніткамі..

Акрамя рэдактарскага матэрыяла ў № 7 змешчаны яшчэ два артыкулы «Разоблачили» (аб тэатры «Рекорд») і «По поводу желтых цветов» (аб старой і новай антрэпрызе г. Каралі). Усе гэтыя матэрыялы вылучае падтасоўка фактаў, грубасць і бесцэрымоннасць у адносінах да газеты «Голос» М. Багдановіча. Асабліва ў гэтым плане вылучаецца артыкул «По поводу желтых цветов», які паведамляе: «*Г. Богданович удивляется, откуда мы раньше знали, что г. Муромцев – премьер, первый герой-любовник, а*





*г-жа Максимова известная провинциальная артистка в амплуа молодой героини кокет? И что любопытнее, – говорит он, – написано это в то время, когда новая труппа г. Каралли не успела еще дать полно ни одного спектакля.*

*Для г. Богдановича это, правда, очень большой секрет.*

*Ведь человек совершенно не знаком с театром, и как он мне раз сознался, был в театре только один раз, и то 10 лет тому назад*».

Імя М. Богдановіча сустракаецца ў № 9 за 1914 год у нататцы ад рэдакцыі: «Помещенная г. Богдановичем из «Голоса» ложь относительно журнала, среди неосведомленных друзей журнала «Микроскоп» вызвала несколько запросов – правда ли что Журнал «Микроскоп» издается в Рыбинске.

Считаем, что нужным довести до сведения запрашивающих, что как и видно из обложки – журнал «Микроскоп» – Ярославский и издается в Ярославле и только печатается в Рыбинске».

Часопіс праіснаваў да 1914 года. З пагоршаннем ваеннага становішча на франтах Першай сусветнай вайны спыніў сваё існаванне.

**Літаратура**

Огурцов Н. Г. Опыт местной библиографии. Ярославльский край (1718–1924). – Ярославльского Губернского Сельскохозяйственного и кредитного Союза кооперативов. 1924 г.

Багдановіч М. Збор твораў. 1968. Т. 2. С. 545.

Багдановіч М. Поўны збор твораў у трох тамах. Мн., 1992–1994.

Падшыўка газеты «Голос» за 1909–1918 гады.

Падшыўка часопіса «Мікроскоп» за 1913–1914 гады.

# Вобраз Максіма Багдановіча ў выяўленчым мастацтве Беларусі

Гэты раздзел кнігі асвятляе вынік доўгай працы на ніве беларускага Адраджэння і першая спроба ў галіне выяўленчага мастацтва Беларусі паказаць мастацкі вобраз класіка беларускай паэзіі Максіма Багдановіча, які быў створаны калектыўнымі намаганнямі дзесяткаў выдатных беларускіх жывапісцаў, графікаў, скульптараў, медальераў, дызайнераў.

Нагадаем, што мастацкія альбомы-кнігі, прысвечаныя вялікім песнярам беларускай літаратуры Янку Купалу і Якубу Коласу, былі створаны да 100-годдзя з дня іх нараджэння. Такой вялікай пашаны аўтар «Вянка» да свайго 100-годдзя з дня нараджэння не атрымаў.

Наогул трэба адзначыць, што надзвычай складаны шлях прайшло вяртанне багдановічавых скарбаў да сучаснага беларускага чытача.

Напачатку творчасць паэта не разумелі не толькі некаторыя супрацоўнікі рэдакцыі газеты «Наша ніва», але нават блізкія да яго людзі, родныя і сябры ў Ніжнім Ноўгарадзе і Яраслаўлі.

Пазней фундаментальнае значэнне творчасці Максіма Багдановіча ўсвядомілі беларускія дзеячы літаратуры і мастацтва ў 1917–1920 гадах, супрацоўнікі газет «Гоман», «Наш сцяг», «Вольная Беларусь», «Беларусь», заснавальнікі літаратурнага аб'яднання «Узвышша», супрацоўнікі Інстытута беларускай культуры. У 1927–1928 гадах літаратурная камісія Інбелкульта пад рэдакцыяй І. І. Замоціна выдала двухтомнік твораў Максіма Багдановіча, у 1968 годзе Інстытут літаратуры АН БССР выдаў Поўны збор твораў у 2-х тамах, і нарэшце, у 1992–1995 годах Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР выдаў Поўны збор твораў беларускага паэта ў трох тамах. Нашы землякі-беларусы выдалі «Вянок паэтычнай спадчыны» Максіма Багдановіча (Нью-Ёрк – Мюнхен, 1960).

Што да праблемы ўвасаблення вобраза Максіма Багдановіча ў выяўленчым мастацтве, то трэба прызнаць, што і мастакі Беларусі таксама спазніліся. І тут ёсць свае аб'ектыўныя прычыны. Гэта і запозненнае выданне Поўнага збора твораў паэта, і поўная адсутнасць выдавецкіх заказаў на ілюстрацыю яго твораў, і ад-





сутнасць агульналітаратурнага і індывідуальнага музея паэта, дзе мастацкія творы, прысвечаныя Максіму Багдановічу, маглі б замаўляцца і назапашвацца, а таксама тыя агульнапалітычныя абставіны ў краіне, пры якіх увасабленне мастацкага вобраза беларускага паэта лічылася знакам праяўлення «нацдэмаўшчыны», а ў дачыненні да Максіма Багдановіча яшчэ і ўхваленнем чыстага эстэцтва, што не толькі не ўхвалялася тагачаснымі ідэолагамі, а нават жорстка каралася дзяржаўнымі ўладамі.

Праўда, у перыяд «беларусізацыі», калі ў краіне праявіўся вялікі інтарэс да роднай мовы, літаратуры, культуры і гісторыі народа, была зроблена першая работа, прысвечаная Максіму Багдановічу, яго драўляны бюст, выкананы народным мастаком Беларусі А. В. Грубэ.

Ці былі зроблены іншыя мастацкія творы, прысвечаныя Максіму Багдановічу, не вядома, бо ў каталогах мастацкіх выставак даваеннага часу твораў на тэму ўвасаблення вобраза паэта ў выяўленчым мастацтве ніводнага не выяўлена.

Бюст работы А. В. Грубэ захаваўся толькі на фотаздымках і да 1944 года ён знаходзіўся ў Мінскім мастацкім музеі. Далейшы лёс яго невядомы.

У 1927 годзе ў Заходняй Беларусі выйшла кніга Максіма Багдановіча «Вянок». Мастак Язэп Горыд змясціў у ёй графічны партрэт паэта. У пачатку 60-х гадоў XX стагоддзя вядомы беларускі мастак з Вільні Пётра Сергіевіч намаляваў партрэт Максіма Багдановіча, дзе паказаў паэта ў нацыянальнай вышыванай кашулі, што паслужыла добрым прыкладам для тых мастакоў, якія жылі на Беларусі.

Ужо ў 60–70-х гадах XX стагоддзя, калі па ўсёй Беларусі пачалася «хрушчоўская адліга», стаўленне мастакоў і грамадкасці да паэта пачало хутка мяняцца. Беларускі скульптар Сяргей Вакар у 1966 годзе абараняе дыпломную работу ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце, менавіта, праектам манументальнай скульптуры «Максім Багдановіч». Ад першага праекта да яго мастацкага ўвасаблення ў 1981 годзе прайшло 15 гадоў. Увесь гэты час выдатны і самаахвярны мастак працаваў над ідэяй увасаблення постаці генія беларускай літаратуры ў бронзе. Амаль што на кожнай значнай выстаўцы ён прадстаўляў новы праект. Ён бударажыў грамадскасць, прымушаў яе думаць, усведамляць веліч паэта, патрабаваў ад уладаў, каб Максім Багдановіч быў запатрабаваны беларускім народам. І да яго голасу прыслухоў-

валіся, бо ён быў настойлівым, сам жа мастак быў яшчэ і надзвычай таленавітым. Калі-небудзь наша нацыянальная інтэлігенцыя па-сапраўднаму ацэніць сілу ўздзеяння гэтага творцы на фарміраванне нашай нацыянальнай свядомасці, на яго ролю ў вяртанні нам любові да нашага маладога генія, у запатрабаванні ведання яго класічных вершаў, бо любіць паэта – значыць вывучаць, ведаць яго творчасць.

Але сапраўдны творчы ўздым беларускіх мастакоў ва ўвасабленні вобраза Максіма Багдановіча адбыўся ў 1981 годзе, калі пад націскам і запатрабаваннем дзеячоў творчай інтэлігенцыі ўрад Беларусі пайшоў на адпаведныя ўступкі і даў «высачайшы» дазвол урачыста адзначыць 90-годдзе з дня нараджэння Максіма Багдановіча. Як тады было прынята пісаць «ЦК КПБ і Урад БССР» прыняў пастанову па святкаванню гэтага юбілею. Сярод іх – урачысты вечар, прысвечаны Максіму Багдановічу, які адбыўся ў Беларускім тэатры оперы і балета, а таксама адкрыццё мастацкай выстаўкі, якая праходзіла ўсяго адзін тыдзень 8–15 снежня 1981 года ў Палацы мастацтваў.

На больш працяглы час паказу выстаўкі, мабыць, пабаяліся, а каб паказаць яе па іншым гарадам Беларусі, пра гэта нельга было тады і марыць. У гэтай выстаўцы брала ўдзел вялікая колькасць беларускіх мастакоў. Нават не таму, што ўсе яны адразу пранікліся нацыянальнай свядомасцю і ва ўсіх іх узнікла ўнутранае запатрабаванне звярнуцца да вобразу беларускага паэта і адлюстравання ў мастацкіх вобразах яго паэтычных твораў, а таму што Міністэрства культуры БССР па завядзёных часоў гарантавала праводзіць закупкі твораў і кожны спадзяваўся атрымаць сваю грашовую долю за яго «палкую любоў да Максіма Багдановіча».

На выстаўцы было прадстаўлена шмат жывапісных і графічных твораў, твораў скульптуры, медалі, якія ўсебакова і грунтоўна раскрывалі вобраз Максіма Багдановіча сродкамі мастацтва, дапамагалі спасцігнуць яго паэтычную творчасць. Каталог выстаўкі, які выйшаў са спазненнем на тры гады і ў дадатак гэтага зроблены на нізкім, як мастацкім (у ім усяго пададзена 4 рэпрадукцыі з выстаўкі), так і тэарэтычным узроўні (увогуле адсутнічае аналітычная і фактaлагічная распрацоўка дадзеных выстаўкі), дае ўсё ж нейкую падставу сцвярджаць аб яе маштабнасці.

Тут я паспрабую са сваіх вучнёўскіх і журналісцкіх нататкаў тых часоў дапоўніць як недахоп каталога, так і паказаць душэўны





парыў і ўздым, які адчувалі многія беларусы ў сувязі са святкаваннем 90-х угодкаў з дня нараджэння Максіма Багдановіча.

1981 год у Беларусі – гэта год Максіма Багдановіча – вялікага паэта, аднаго з вядомых дзеячоў нацыянальнай культуры. Але гэта было не толькі свята нацыянальнай беларускай культуры – гэта было свята ўсёй славянскай культуры – свята ўсяго славянскага сусвету. Вельмі ўзрушылі ўсю беларускую грамадскасць і, асабліва моладзь, словы лаўрэата Ленінскай прэміі, старшыні юбілейнага багдановічскага камітэта рускага паэта Ягора Ісаева, які заявіў:

«Ушаноўваючы Максіма Багдановіча, мы ўшаноўваем яго радзіму – Беларусь.

...Беларусь – раўнінная лясная краіна, але толькі па геаграфіі яна такая, а па духу свайму, па культуры – гэта краіна вяршынь, грамадзянскай мужнасці і сапраўднага таленту. Янка Купала і Якуб Колас – іх творчасць сапраўды вяршыні не толькі нашай, але і сусветнай паэзіі. Максім Багдановіч стаіць побач з імі.

Яго лёс – асаблівы. Такое кароткае жыццё і так многа ў ёй ад сэрца, ад трывожнай думкі, гарачага і таленавітага зробленага ў паэзіі, публіцыстыцы, крытыцы, перакладах».

Хто з нашых вялікіх беларускіх пісьменнікаў і паэтаў і дзеячоў культуры асмеліўся б у той час сказаць так пранікнёна, так узнёсла і так праўдзіва ацаніць дзейнасць любімага моладдзю паэта «чыстай красы», як зрабіў наш маскоўскі сябра?

Сказаць такое беларусу пра беларуса ў той час – гэта значыць зрызыкаваць, што цябе назавуць «нацыяналістам», а гэта было сур'ёзнае па таму часу абвінавачванне і амаль што пажыццёвае.

Свята, прысвечанае слыннаму паэту, пачалося з урачыстага адкрыцця яго помніка на былой Траецкай плошчы у скверы каля Беларускага тэатра оперы і балета. Нарэшце, здзейснілася мара многіх беларусаў. Максім Багдановіч зноў у каторы раз вярнуўся ў Мінск. Я падыходжу да Сяргея Міхайлавіча Вакара і першы букет кветак прэзентую яму за яго самаахвярную працу. 15 гадоў працы над вобразам самага паэтычнага, самага любімага сярод моладзі беларускага песняра. За гэтыя гады мастак зрабіў больш за 10 эскізаў і мастацкіх работ і ўсё гэта давёў да ладу, перавёў у матэрыял. Сам помнік Максіму Багдановічу – гэта песня, вылітая ў бронзе. У ёй Сяргей Вакар змог перадаць надзвычайны лірызм паэта, яго ўсхваляваннасць за лёс сваёй Бацькаўшчыны, за той лёс, які выпаў і на яго долю.

Помнік Максіму Багдановічу гарманічна ўліваецца ў тэатральную плошчу каля Беларускага тэатра оперы і балета. Ён як бы сустракае наведвальнікаў тэатра. Тут, побач з будынкам, некалі нарадзіўся паэт. Вышыня самой выявы паэта 4 м 60 см і 40 см плінтуса. І вельмі добра, што п'едэстал не ўзвышаецца над людзьмі, не прыдаўлівае наведвальнікаў сваёй магутнасцю і веліччу. Нізкі плінтус стварае ўражанне мажлівасці непасрэднага і жывога дотыку з паэтам, чалавечай сувязі з геніем беларускай, славянскай і сусветнай літаратуры.

Радаснай навіною было і тое, што закладзены літаратурны музей Максіма Багдановіча. Яму ўжо адведзены двухпавярховы будынак у Траецкім прадмесці, які ўжо у той час пачалі рэстаўрыраваць. Музей запрацаваў, бо да юбілейных святаў наладзіў у Дзяржаўным музеі БССР выстаўку сабраных рэчаў і дакументаў Максіма Багдановіча. І гэта дало вялікія надзеі, як на дасканалае вывучэнне творчасці паэта, так і на шырокую і сталую папулярызацыю яго жыццёвай і творчай дзейнасці.

Пасля адкрыцця помніка 9 снежня 1981 года ў 18 гадзін у Беларускім тэатры оперы і балету ў Мінску адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча.

На вечары прысутнічалі члены бюро ЦК КПБ начале з першым сакратаром ЦК КПБ Ціханам Якаўлевічам Кісялёвым, члены урада Беларусі. Гэта, па меркам таго часу, падкрэслівала, як урачыстасць, так і агульнанацыянальную значнасць гэтага мерапрыемства. Вечар адкрыў народны паэт БССР Максім Танк. Слова аб жыццёвым і творчым шляху паэта сказаў беларускі паэт Ніл Гілевіч. У сваіх нататках я адзначыла, што гэта была паэзія ў прозе. Запамяталіся выступленні паэтаў з братніх рэспублік – Рамана Лубкіўскага з Украіны (Львоўшчына), які параўноўваў Максіма Багдановіча з Іванам Франко; беларуса Ігара Шклярэўскага, які жыве ў Маскве, Эміліі Леўтэне з Літвы, Генадзя Мінчоўскага з Ленінграда, Генадзя Бядняева з горада Горкі і Івана Смірнова з горада Яраслаўля (Расія).

Вялікі рускі рэжысёр Канстанцін Станіслаўскі некалі казаў, што «театр начинается с вешалки», але крыху яго перафразіраваўшы, можна адзначыць, што гэты вечар пачаўся з запрашальнага білета так па-мастацку і з такой вялікай любоўю быў выкананы мастаком Міхасём Басалыгам.





Вечары памяці, прысвечаныя Максіму Багдановічу, прайшлі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, гасцямі студэнтаў былі вядомыя беларускія літаратары, кампазітар Юрый Семяняка, Раман Лубкіўскі з Украіны, прафесар Варшаўскага універсітэта паэт Алесь Барскі беларускага паходжання і інш. На Украіне – у Львове, у Сумскім педагагічным інстытуце, у гарадах Горкі і Яраслаўлі, дзе жыў Максім Багдановіч, у Маскве, у Цэнтральным доме літаратараў імя А. А. Фадзеева прайшлі ўрачыстыя святочныя вечары.

Аддзяленне грамадскіх навук АН БССР, Саюз пісьменнікаў БССР, Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР правялі навуковую канферэнцыю, прысвечаную творчасці паэта. Беларускае тэлебачанне ў дні святкавання юбілею паэта паказала святочныя юбілейныя вечары ў Беларускім тэатры оперы і балета ў Мінску і ў Цэнтральным доме літаратараў імя А. А. Фадзеева у Маскве, а таксама паказала некалькі перадач пра сучаснікаў паэта – беларускай пісьменніцы Зоські Верас і заслужаным настаўнікам БССР, пісьменнікам Васілём Савічам Гарбацэвічам, аўтарам успамінаў пра сустрэчы з Максімам Багдановічам у Яраслаўлі і іншымі. Беларускія выдавецтвы выдалі факсімільны зборнік Максіма Багдановіча «Вянок», успаміны аб паэце «Шлях паэта», складзены вядомай даследчыцай Максіма Багдановіча Нінай Ватацы, у выдавецтве «Юнацтва» – зборнік выбраных вершаў Максіма Багдановіча, у выдавецтве газеты «Голас Радзімы» – зборнік «Песня Максіма».

Былі выдадзены паштоўкі з выявай паэта, а таксама музычная пласцінка-дыск на вершы Максіма Багдановіча, акрамя гэтага мінскі завод імя Героя Савецкага Саюза М. Ф. Гастэла адліў памятныя значкі і медаль, прысвечаны Максіму Багдановічу.

Да ўшанавання памяці паэта падключылася не толькі сталічная грамадскасць, але і грамадскасць іншых гарадоў Беларусі – Гродна, Маладзечна. Так, беларуская філія маладзечанскіх мастакоў наладзіла выстаўку жывапісных і графічных твораў, выкладчыкі і навучэнцы музычнага вучылішча правялі канцэрт, прысвечаны Максіму Багдановічу.

На мастацкай выстаўцы, прысвечанай 90-годдзю Максіма Багдановіча, якая адкрылася 8 снежня 1981 года ў Палацы мастацтваў, было паказана 347 мастацкіх твораў больш за 200 аўтараў.

Гэта – скульптурныя, жывапісныя, графічныя партрэты, краявіды месцаў, дзе калісьці жыў і бываў паэт, сюжэты, падказаныя матывамі яго цудоўных вершаў.

Сама экспазіцыя выстаўкі была цудоўнай і з вялікім густам прадумана і аформлена. Шматлікія партрэты Максіма Багдановіча, хаця і зробленыя на аснове абмежаванага іканаграфічнага матэрыялу (некалькі вядомых фотаздымкаў розных гадоў) адлюстроўвалі асабістае бачанне і ўласнае разуменне паэта і яго эпохі, яго настрой і духоўнае становішча перамяжоўваліся з шматлікімі нацюрмортамі, улюблёныя матывам якіх быў «цвяток радзімы васілёк».

Ужо ў вестыбюлі Палаца мастацтваў наведвальнікаў як бы сустракаў сам Максім Багдановіч (скульптурная работа беларускага мастака Уладзіміра Ананькі). На першым паверсе, ў працяг знаёмства з выстаўкай, зноў сустракае скульптура Максіма Багдановіча (аўтар Сяргей Вакар), менавіта тая, якая паслужыла для стварэння вялікага бронзавага помніка паэту. Падняўшыся па шырокай лесвіцы на другі паверх, наведвальнікаў сустракае выдатная работа народнага мастака БССР Гаўрыла Вашчанкі «Маладняк», якая поўнасцю навеяна паэзіяй Максіма Багдановіча.

Тут хочацца нагадаць выдатныя жывапісныя палотны народнага мастака БССР Леаніда Шчамялёва «На зямлі бацькоў» і «У краіне светлай...», Уладзіміра Пасюкевіча «У краіне светлай...». Незвычайным зеленаватым каларытам пранізаны твор Івана Рэя «Шлях паэта», а дзесьці побач з дамінантай блакітнага колеру зроблены партрэт паэта жывапісцам Міколам Назарчуком. Сваёй мастацкасцю прываблівае работа заслужанай дзеячкі мастацтваў БССР Раісы Кудрэвіч «Максім Багдановіч».

Своеасаблівая і непаўторная па манеры пісьма і каларыстыцы, глыбокафіласофская работа беларускай мастачкі Нэлі Счаснай «Быць можа я не скончу жыць».

Уражвае работа Віктара Ціханава «Вянок паэту», выкананая ў старажытнай тэхніцы разьбы па ляўхасу, распісаная тэмпернымі фарбамі, як старажытная ікона, якая вылучае вялікі імпульс святасці, духоўнай чысціні і замілавання. Маладыя мастакі Уладзімір Кожух і Аляксандр Ксяндзоў прадставілі (кожны паасобку) свой «сямейны партрэт». На карцінах сям’я Багдановічаў, але кожны мастак вырашае гэтую тэму па-новаму, па-свойму.

Віктар Альшэўскі стварыў партрэт Максіма Багдановіча поўнага роздуму над лёсам Бацькаўшчыны, на яго твары сляды суму,





хваробы, адзіноты. Твор Міколы Селяшчука «Памяці Максіма Багдановіча» прасякнуты сімволікай і алегорыямі, знешнімі эфектамі. Ён як бы хоча паспаборнічаць з самім Максімам Багдановічам у валоданні формай, толькі адзін у паэтычнай, а другі – у мастацка-выяўленчай.

На выстаўцы прадстаўлена шэраг работ, якія можна ўмоўна назваць «Па месцах жыцця і дзейнасці Максіма Багдановіча». Сярод іх Віктара Шматава «Максім Багдановіч у Мінску. 1916 г.», Леаніда Асядоўскага «Наша ніва», нізка жывапісных твораў Барыса Аракчэева «Яраслаўль», «Крэмль», Волга», «Дзямідаўскі ліцэй», «Гімназія». Безумоўна гэтыя творы маюць не толькі мастацкую, але і гістарычную вартасць. Будучы народжаны на Яраслаўшчыне, мастак даволі дасканала ведаў мясціны, звязаныя з жыццёвым шляхам Максіма Багдановіча, вывучаў іх па старым матэрыялам і нават рэканструіраваў іх у сваіх творах. Да гэтай серыі адносіцца і работа Святланы Астроўскай «Дом у Ялце, дзе жыў Максім Багдановіч у 1909 г.», Ігара Ганяева «Успаміны дзяцінства. Дом Багдановіча ў Гродна», Уладзіміра Новіка «Веснавое сонца. Ялта», Міколы Селяшчука «Стары парк у Менску».

Сярод шматлікіх краявідаў і нацюрмортаў былі і такія творы, якія выпісаны з вялікай любоўю, пясчотай, у якіх найбольш глыбока выяўляецца адчуванне роднага краю, Бацькаўшчыны. Гэта найперш твор народнага мастака БССР Віталя Цвіркі «Ракуцёўшчына», заслужаных дзеячаў мастацтва БССР Леаніда Шчамялёва «Кветкі паэту» і Гаўрылы Вашчанкі «Узыйдуць там надзеі зёрны», Івана Дмухайлы «Песня Бярозак», «Гадзіна цішыні», жывапісца Леаніда Леўчанка «Раніца над Нёманам».

Сярод твораў, напісаных па матывах вершаў паэта, вылучаюцца работы Мікалая Апіёка «Ад родных ніў, ад роднай хаты», прысвечаная слуцкім ткачыхам, Валянціны Свентахоўскай «Кветкі асеннія, родныя, бледныя» і Пятра Свентахоўскага «Мінуўшчыны сляды».

Багата і разнастайна, па тэматыцы і па функцыянальнай накіраванасці, прадстаўлены раздзел графікі. Увесь першы паверх займалі мастакі-графікі. Тут дамініравалі нізкі ілюстрацый для выдання тых ці іншых кніг Максіма Багдановіча, яго партрэты, плакаты, прысвечаныя 90-годдзю паэта. Сярод графічных партрэтаў Максіма Багдановіча сваёй цэласнасцю, мастацкай завершанасцю, глыбінёй перадачы псіхалагічнага стану паэта вылучаўся афорт Сямёна Геруса «М. Багдановіч у Ялце». Тонкі па калары-

стыцы акварэльны партрэт беларускага мастака Івана Пратасені «А сэрца ўсё імкне да бацькоўскага краю» і каляровы лінарыт Міхаіла Басалыгі «Максім Багдановіч».

Разнастайныя па сюжэту, манеры і тэхіцы выканання прадставілі свае нізкі графічных твораў да вершаў Максіма Багдановіча заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Людвіг Асецкі («Ад родных ніў»), Генадзь Грак – 12 лінагравюр. Пранікнутае роздумам аб родным краі, выканана лінагравюра Яўгена Бусла «Толькі ў сэрцы трывожным пачую». Надзвычай філасофская работа ў тэхніцы афорта прадстаўлена заслужаным работнікам культуры БССР Эдуардам Агуновічам «Уступ». Два арлы з трыма галовамі рвуць цела маладой Беларусі – вось сімвал вечнага «супрацоўніцтва і садружнасці» Беларусі з «суседнімі брацкімі краінамі». Надзвычай цікавыя, арыгінальныя і непаўторныя каліграфічныя надпісы, зробленыя ў тэхніцы малюнка пяром і ў афорце, прадставіў Павел Семчанка. Нізку каляровых літаграфій (усяго 3 штукі) выканаў Рыгор Сітніца. Вабілі на выстаўцы і каляровыя малюнкі-краявіды Ракуцёўшчыны, якія прадставіў беларускі мастак Міхась Карпук.

Свае плакаты выставілі Уладзімір Васюк, Віктар Смаляк, Сяргей Саркісаў, Мікалай Стома. Тэма адна, але рознае выкананне, розная тэхніка і рознае бачанне пастаўленай задачы. Надзвычай цікавую рэканструкцыю малавядомага ў тыя часы фотаздымка Максіма Багдановіча ліцэйскага перыяду прадставіў Пётр Драчоў. Ён ажыццявіў вялікую працу – з цмянага маленькага фотаздымка зрабіў вялікі плакат, захаваўшы пры гэтым выключнае падабенства і перадаўшы ўвесь духоўны настрой паэта. Сваю рэканструкцыю старога Мінска і дома-музея Максіма Багдановіча прадставілі беларускі мастак Уладзімір Капшай і архітэктар Сяргей Багласаў.

Сярод скульптурных твораў, акрамя раней адзначаных Уладзіміра Ананькі і Сяргея Вакара, трэба адзначыць твор народнага мастака Беларусі Анатоля Анікейчыка «Сны аб Радзіме», выкананы ў бронзе, бронзавы бюст Максіма Багдановіча Сяргея Вакара, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі Льва Гумілеўскага «М. Багдановіч», Аляксандра Мятліцкага «М. Багдановіч» адліты ў бронзе, Аляксандра Шатэрніка «М. Багдановіч» адліты ў сілуміне.

Сярод твораў медальернага мастацтва – дэкаратыўны пласт «Страцім-лебедзь», выкананы ў шамоце Аляксандрам Зіменкам





і надзвычай вытанчаныя медалі мастакоў Генадзя Асташонка «М. Багдановіч», Льва Талбузіна «М. Багдановіч» і «Зорка Венера», выкананыя ў кераміцы, Галіны Гаравой «М. Багдановіч», выкананы ў фарфоры і медалі Сяргея Вакара, Юрыя Гудзіновіча і Станіслава Ларчанкі, адлітыя ў бронзе.

Габелены, дываны і бацікі многіх аўтараў распрацоўвалі тэму «зачараванага царства», таямніцы лясных азёраў, прыгажосці беларускіх кветак і ў першую чаргу «Цвятка радзімы...». Цэлая зала, адведзеная пад габелены і тэкстыль, проста зачароўвала наведвальнікаў багаццем каляровых спалучэнняў. Сярод арыгінальных прац у выбары тэмы і сюжэту аказаўся мастак з Баранавіч Сямён Свістуновіч, які ўвасобіў у габелене бессмяротны твор Максіма Багдановіча «Пагоня» і які праз 10 гадоў стаў нацыянальным гімнам адраджэння Бацькаўшчыны і дзяржаўным гербам Рэспублікі Беларусь.

На фарміраванне мастацкай выстаўкі да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча, якая адкрылася 6 студзеня 1991 года, паўплывала палітычная сітуацыя ў краіне. Гэта была мастацкая выстаўка ўжо ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь.

Мастакі, радыкальна накіраваныя да змены новых палітычных рэалій, што адбываліся ў краіне, патрабавалі і новых падыходаў ад Міністэрства культуры Рэспубліцы Беларусь у культурнай палітыцы і, асабліва, у падыходзе да новай канцэпцыі фарміравання экспазіцыі выстаўкі. Але Міністэрства культуры перабудоўвацца не жадала і вяло сваю справу па той наезжанай гадамі каляіне, якая ўжо даўно была адпрацаваная.

Мы не будзем кранаць пытанні, якія ставіліся тады радыкальна настроенымі мастакамі. Іх асноўны тэзіс быў накіраваны супраць заключэння папярэдніх заказаў з мастакамі на той ці іншы твор. Гэта дэкларавалася імі, як вялікая загана для развіцця мастацтва, бо давала магчымасць мастакам, якія атрымлівалі заказ, выстаўляць слабамастацкія творы, якія Міністэрства культуры БССР, паводле папярэдне заключанай дамоўленасці, павінна было выкупляць.

Але жыццё распарадзілася па-іншаму. У сілу таго, што ў Міністэрстве культуры Беларусі зніклі грошы – зніклі і ўсялякія папярэднія заказы. Ад гэтага беларускаму выяўленчаму мастацтву стала значна цяжэй, бо мастацтва можа развівацца толькі тады, калі ёсць адпаведныя грашовыя фінансаванні, фундацыі і інвестыцыі.

Але зноў вернемся да выстаўкі. Па прычыне такой вострай палітычнай размежаванасці адбылося тое, што асвячэнне мастацкай выстаўкі ў прэсе прайшло слаба. Такая паважаная ў той час газета як «Літаратура і мастацтва» аб выстаўцы дала толькі невялічкую інфармацыю, часопіс «Мастацтва» толькі правёў «круглы стол», дзе яго ўдзельнікі засяродзілі ўвагу не на праблеме ўвасаблення вобраза Максіма Багдановіча ў выяўленчым мастацтве, а на тым, што «сама экспазіцыя радасці і адкрыццяў несла менш, чым прагнула душа акрылённага адраджэннем беларуса», таму што «рабілася па старых канонах». Вось на гэтых «старых канонах» і была сканцэнтравана ўся ўвага «круглага стола».

Усе іншыя газеты і часопісы Беларусі абышліся маленькімі зацемкамі і двума-трыма фотаздымкамі. Міністэрства культуры Рэспублiцы Беларусь і Беларускі саюз мастакоў не знайшлі грошай, праявілі поўную абыякавасць да такой эпахальнай выстаўкі, так і не выдалі каталог.

Зноў жа пацвердзілася тое, што гонар нацыі – Максім Багдановіч, жыццё якога была надзвычай трагічным, нават на 100-гадовы юбілей не быў належным чынам ушанаваны і адзначаны. Выстаўка, якая ладзілася ў мінскім Палацы мастацтва (цяпер Рэспубліканская мастацкая галерэя) ў яго гонар, прайшла, але не захавала ніякай юрыдычнай падставы, бо няма каталога выстаўкі, а з мастацкага фонда чамусьці зніклі ўсе дакументы, якія б сведчылі аб гэтай выстаўцы і аб яе ўдзельніках, а тыя маленькія зацемкі ў газетах не даюць поўнага ўяўлення аб той вялікай працы, якую правялі беларускія мастакі ў справе ўвасаблення вобраза Максіма Багдановіча ў выяўленчым мастацтве.

Але хіба нам, беларусам, не прывыкаць да такога абсурду, які робіцца штодзённа і штомесячна, нават у тых сферах нашага жыцця і побыту, дзе рэй вядуць, як быццам бы на першы погляд адраджэнцы, якіх народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін трапна назваў «прафесійнымі беларусамі».

Пастараемся сваімі сціплымі журналісцкімі замалёўкамі тых часоў запоўніць той пропуск, які адбыўся ў адлюстраванні вобраза Максіма Багдановіча ў сродках масавай інфармацыі з нагоды юбілейнай выстаўкі.

Сярод жывапісных партрэтаў Максіма Багдановіча варта адзначыць работы Уладзіміра Сулкоўскага «Партрэт Максіма Багдановіча», Мікалая Апіёка «...І думкі імкнуцца», Віктара Барабанцава «На радзіме Максіма Багдановіча», Віктара Альшэўскага «Партрэт М. Багдановіча», Уладзіміра Пасюкевіча «Максім Багдановіч», Іосіфа Белановіча «Не кувай ты, шэрая зязюля», беларускага мастака Вячаслава Целеша з Рыгі і Міхаіла Чэпіка «Паэт». У кожным творы ёсць адчуванне паэтычнасці, узнёсласці, роздуму аб лёсе Радзімы. Сярод тэматачных карцін, у якіх адлюстраваны этапы жыцця паэта, неабходна адзначыць алейныя работы Міколы Назарчука «Прывет табе, жыццё на волі», Уладзіміра Тоўсціка «Нараджэнне паэта», Фелікса Янушкевіча «Ля сіняй бухты», Аляксея Ксяндзова «Увечары», дзе змешчаны маленькі Максім з бацькамі – Марыяй Апанасаўнай і Адамам Ягоравічам.

Звяртае ўвагу і жывапісная карціна мастака Рыгора Таболіча з Магілёва «Маці паэта». Вялікай рамантычнасцю і замілаваннем вылучаецца работа Пятра Назаранкі «Вераніка».

Нарадзіўся паэт і «Сусвет скалыхнуўся ад гуку». Так Павел Урублеўскі адзначае ў сваёй карціне нараджэнне Максіма Багдановіча. На выстаўцы было шмат прадстаўлена твораў па матывах вершаў Максіма Багдановіча. Гэта «Слуцкія ткачыхі» Алеся Панцюка, «Выйду белая з цёмнай вады» (паводле верша М. Багдановіча «Русалачка») Аляксея Марачкіна.

Былі творы, якія прысвячаліся памяці Максіма Багдановіча, напрыклад, Юрыя Гаўрына «Памяці Максіма Багдановіча», але было яшчэ больш твораў, якія не перагукаліся з яго творчасцю, але вылучаліся высокай мастацкасцю. Гэта Аляксея Марачкіна «Зімовыя мроі», Леаніда Шчамялёва «Каляднікі ў Ракаве», Алега Мацієвіча «Ноч у Жыровічах», Зоі Літвінавай «In kubus», Уладзіміра Савіча «Свята надыходу вясны», Міколы Селяшчука «Сон».

Як заўсёды, моцна і прадстаўніча выглядала графічная зала выстаўкі. Тут былі графічныя партрэты Максіма Багдановіча і, асабліва, шмат твораў, якія ілюстравалі творчасць паэта. Сярод гэтага багацця выдзялялася серыя твораў Антаніны Лапіцкай з выдатным літаграфічным партрэтам Максіма Багдановіча, серыя ілюстрацый – усяго 14 твораў – да зборніка «Вянок» пад назвай «Знічка» мастака з Гродна Аляксандра Ларыёнава, партрэт Максіма Багдановіча «Толькі ў сэрцым трывожным пачую...» беларускага мастака Алега Карповіча. Твор выкананы перкам і тушшу «Пагоня. Максім Багдановіч» мастака Міколы Рыжага з Барысава, а таксама лінарыт Яўгена Бусла «Усё лятуць і лятуць тыя коні».

Сярод твораў скульптуры на выстаўцы вылучаліся сваёй мастацкасцю і вытанчанасцю работы – бронзавы барэльеф «Зорка Максіма Багдановіча» мастака Валяр'яна Янушкевіча, работа выкананая ў гіпсе маладога мастака Генадзя Лойкі «Вянок тутэйшым маладым паэтам», а таксама кампазіцыя «Вянок» Сяргея Логвіна.

Людміла Пятруль прадставіла цыкл габеленаў на вершы Максіма Багдановіча «У зачараваным царстве». Гэта міфалагічныя істоты Падвея, Вадзяніка, Пугача, Лясуна, Змяінага цара. Цвіком выстаўкі, разбурэннем усталяваўшыхся стэрэатыпаў лічылася тое, што ў яе экспазіцыі ўпершыню былі прадстаўлены творы адкрыта авангардныя, эндэграундныя – такія як інсталяцыя Льва Талбудзіна і Яўгена Шумейкі.

Тут упамянуты далёка не ўсе мастацкія творы беларускіх жывапісцаў, скульптараў, графікаў, медальераў, дызайнераў, якія былі прысвечаны вобразу Максіма Багдановіча і яго творам у выяўленчым мастацтве Беларусі.

Для больш поўнага ўяўлення гэтай падзеі можна пазнаёміцца з «Каталогам мастацкіх твораў, прысвечаных Максіму Багдановічу, са збору Анатоля Белага ў Музеі выяўленчага мастацтва ў г. Старыя Дарогі», які змешчаны ў дадатку гэтай кнігі.



# Каталог мастацкіх твораў, прысвечаных Максіму Багдановічу, са збору Анатоля Белага ў Музеі выяўленчага мастацтва ў г. Старыя Дарогі

## ЖЫВАПІС

*Апіёк Мікалай Апанасовіч*. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. 1935 г. Мінск.

1. **Эскіз да партрэта Максіма Багдановіча «Ад родных ніў»**. ДВП, алей. 25,5×34 см. 1985 г.
2. **Эскіз да карціны «Слуцкія ткачыхі»**. ДВП, алей. 25,5×34 см. 1985 г.

*Аракчэеў Барыс Уладзіміравіч*. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. 1926 г. Мінск.

1. **«Музей Максіма Багдановіча ў Яраслаўлі»**. Палатно, алей. 97×155 см. 1991 г.
2. **«Яраслаўскі крэмль»**. Кардон, алей. 49×67 см. 1981 г.

*Скрыпнічэнка Георг Сяргеевіч*. 1940 г. Мінск.

**Эскіз да карціны «Слуцкія ткачыхі»**. Палатно, алей. 27×35 см. 1967 г.

*Ціхановіч Генрых Яўгенавіч*. 1937–2002 гг. Мінск.

1. **«На небе месяц устаў зялёны» (Максім і Вераніка)**. Кардон, алей. 25,5×33,5 см. 1991 г.
2. **Эскіз да карціны «Уладзіслаў Галубок і Максім Багдановіч. 1916 г. Перад паездкай у сірочы дом да Ядвігіна Ш.»**. Кардон, алей. 36,5×41,5 см. 1991 г.

## АКВАРЭЛЬ

*Пратасеня Іван Міхайлавіч*. 1931 г. Мінск.

**«М. Багдановіч. А сэрца ўсё імкне да бацькаўскага краю»**. Папера, акварэль. 50×60 см. 1981 г.

*Сташчанюк Віктор Пятровіч*. 1933 г. Мінск.

**Паводле верша Максіма Багдановіча «Ціхі вечар»**. Папера, акварэль. 42×41 см. 1991 г.

## ГРАФІКА

*Агуновіч Эдуард Канстанцінавіч*. Заслужаны работнік культуры Беларусі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. 1938 г. Мінск.

1. **«Максім Багдановіч. Уступ»**. Афорт. 60×46 см. 1981 г.
2. **«Максім Багдановіч. Крынічка»**. Аўталітаграфія. 83×70 см. 1991 г.
3. **«Ракуціёўшчына. 1911». «У родным краі ёсць крынічка Жывой вады...»**. Аўталітаграфія. 35×40 см. 1994 г.

*Басалыга Міхаіл Самуілавіч*. 1942 г. Мінск.
**«Максім Багдановіч»**. Кал. лінарыт. 21,5×21,5 см. 1981 г.

*Бусел Яўген Сяменавіч*. 1936 г. Мінск.

1. **«Максім Багдановіч. І толькі на цябе надзея Край родны мой»**. Лінарыт. 50×38 см. 1994 г.
2. **«Усё лятуць і лятуць тыя коні». Паводле верша Максіма Багдановіча «Пагоня»**. Лінарыт. 50×38 см. 1994 г.

*Герус Сямён Пятровіч*. 1925–1998 гг. Мінск.

1. **«Максім Багдановіч у Ялце»**. Аўталітаграфія. 45×60 см. 1981 г.
2. **«Максім Багдановіч»**. Аўталітаграфія. 61×46 см. 1991 г.

*Грак Генадзь Сцяпанавіч*. 1938 г. Мінск.
**Ілюстрацыі да вершаў Максіма Багдановіча**. Лінарыты. 16,5×11,5 см – 7 шт. 1991 г.

*Крывенка Анатоль Змітравіч*. 1940 г. Мінск.

**Партрэт Адама Ягоравіча Багдановіча**. Аўталітаграфія. 50×40 см. 1997 г.

*Купава Мікалай Мікалаевіч*. 1946 г. Мінск.

**«Максім Багдановіч. 1891–1917»**. Кал. лінарыт. 37×29 см. 1976 г.





*Лапіцкая Антаніна Афанасьеўна*. 1947 г. Мінск.

1. **Ілюстрацыі да вершаў Максіма Багдановіча**. Літаграфія. 11××10 см – 10 шт. 1981 г.
2. **«Максім Багдановіч»**. Аўталітаграфія 52×40 см. 1982 г.

*Немагай Ілля Уладзіміравіч*. 1930–2002 гг. Мінск.
**«Максім Багдановіч»**. Папера, вугаль. 70×56 см. 1979 г.

*Рыжы Мікалай Дзмітравіч*. 1953 г. Барысаў.
**«Максім Багдановіч. Пагоня»**. Папера, пяро, туш, тэмпера. 50×73 см. 1991 г.

*Семчанка Павел Апанасавіч.* 1938 г. Мінск.

1. **Фрагмент верша М. Багдановіча «Стацім-лебедзь».** Папера, афорт. 60×46 см. 1981 г.
2. **Фрагмент верша «Няма таго, што ранш было і толькі надпіс “Вераніка”».** Папера, афорт. 40×30 см. 1987 г.

*Сітніца Рыгор Сяменавіч*. 1958 г. Мінск.

**«Вянок пашаны паэту»**. Каляр. літаграфія. 1988 г. 3 шт.

1. **«Раманс»**. 60×80 см.
2. **«Пагоня»**. 60×80 см.
3. **«Слуцкія ткачыхі»**. 60×80 см.

*Сташчанюк Віктор Пятровіч*. 1933 г. Мінск.
**Паводле верша Максіма Багдановіча «Зімняя дарога»**. Папера, туш, пяро. 42×41 см 1991 г.

*Харытонаў Сяргей Міхайловіч*. 1957 г. Мінск.

**«Максім Багдановіч»**. Літаграфія. 15×11,5 см. 1991 г.

*Ціхановіч Яўген Мікалаевіч.* 1911–2005 гг. Мінск.

4. **«Максім Багдановіч. 1891–1981»**. Сух. іголка. 21×15,5 см. 1982 г.
5. **«Максім Багдановіч. Ад родных ніў, ад роднай хаты...»**. Сух. іголка. 29×19,5 см. 1981 г.
6. **«Максім Багдановіч»**. Сух. іголка. 32,5×24,5 см. 1981 г.
7. **«Максім Багдановіч. Зорка Венера ўзышла над зямлёю»**. З кніг Алеся Бачылы. Лінарыт. 21×13 см. 1963 г.

*Цыркуноў Алесь Іванавіч*. 1948 г. Мінск.

**Падзяка клуба «Спадчына» за ахвярванне на помнік Максіму Багдановічу ў г. Яраслаўлі.** Цынкаграфія. 41××23,5 см. 1991 г.

## ПЛАКАТ

*Анкуда Аляксандр Яўгенавіч*. Мінск.

**«Да 130-годдзя Адама Ягоравіча Багдановіча»**. Папера, шоўкаграфія. 75×35 см. 1998 г. Выданне клуба «Спадчына».

*Васюк Уладзімір Уладзіміравіч*. 1947 г. Мінск.

**«Да 90-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча»**. Прысвечаны выстаўцы выяўленчага мастацтва Беларусі. Папера, шоўкаграфія. 80×60 см. 1981 г.

*Крукоўскі Уладзімір Якаўлевіч*. 1937 г. Мінск.

1. **«Максім Багдановіч. 1891–1991»**. Шоўкаграфія. 90×60 см. 1991 г.
2. **Плакат, прысвечаны адкрыццю мастацкай выстаўкі ў Палацы мастацтва з нагоды 90-годдзя М. Багдановіча**. Шоўкаграфія. 90×60 см. 1981 г.

*Саркісаў Сяргей Уладзіміравіч.* 1951 г. Мінск.

**«Максім Багдановіч. 100 год з дня нараджэння»**. Кал. друк. 85×58 см. 1991 г.

*Цішын Ігар Мікалаевіч.* 1958 г. Мінск.

**«Максім Багдановіч. 1891–1991»**. Кал. друк. 90×60 см. 1991 г. Выд. «Беларусь».

*Выданне Беларускага Інстытута Навукі і Мастацтва (ЗША)*

**«Максім Багдановіч (1981–1991). Бейце ў сэрца іх – // Бейце мячамі! // Не давайце // Чужынцамі быць»**. Кал. друк. 52×41 см. 1991 г.

*Невядомы мастак*

**Да 90-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча.** Рэспубліканскае свята паэзіі 29 жніўня 1981 г. Кал. друк. 90×66 см. 1981 г.





## ЭКСЛІБРЫСЫ

*Хілько Юрый Іванавіч.* 1960 г. Мінск.

**«Максім Багдановіч. Экслібрыс А. Б. [Анатоля Белага]».** Лінарыт. 9,5×9,5 см. 1991 г.

## СКУЛЬПТУРА

*Астаф'еў Эдуард Барысавіч.* 1942 г. Мінск.

**Пагрудны гарэльеф «Максім Багдановіч».** Гіпс, танір. 50××40 см. 1981 г.

*Вакар Сяргей Міхайлавіч.* Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. 1928–1998 гг. Мінск.

1. **Эскіз помніка Максіма Багдановіча**. Бронза, ліццё. 50×17××9 см. 1966 г.
2. **Фрагмент помніка Максіма Багдановіча**. Медзь, выкалатка. 50×38×34 см. 1994 г.

*Ларчанка Станіслаў Міронавіч.* 1938–2003 гг. Мінск.

**«Максім Багдановіч».** Сілумін, ліццё, дрэва. 36×10×5 см. 1981 г.

*Несцярэўскі Мікалай Лаўрэнцьевіч.* 1931 г. Мінск.

**Бюст Адама Ягоравіча Багдановіча.** Сілумін, ліццё. 90×60××70 см. 1997 г.

*Пакульніцкі Леанард Іосіфавіч.* 1953 г. Мінск.

**Эскіз да помніка М. Багдановіча для Ялты «Зорка Венера».** Гіпс таніраваны. 30×20×7 см. 2000 г.

*Платонаў Юрый Анатольевіч.* 1958 г. Астрашыцкі Гарадок.

**Скульптурны партрэт Максіма Багдановіча.** Гіпс. 45×25××25 см. 1981 г.

## МЕДАЛЬЕРНАЕ МАСТАЦТВА

*Асташонак Генадзь Адамавіч.* 1955 г. Мінск.

**«Максім Багдановіч. 1891–1991»**. Тэракота, вашчэнне. Дм. 9,5 см. 1981 г.

*Вакар Сяргей Міхайлавіч. Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі.* 1928–1998 гг. Мінск.

1. **«Максім Багдановіч. 1891–1981».** Сплаў свінца і волава, ліццё. Дм. 11 см. 1981 г.
2. **«Максім Багдановіч. 1891–1981».** Бронза, ліццё. Дм. 19,6 см. 1981 г.

*Гаравая Галіна Аляксандраўна.* 1941 г. Мінск.

**Юбілейны медаль да 90-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча**. Фарфор. 18,5×16,5 см. 1981 г.

*Гудзіновіч Юрый Уладзіміравіч.* 1952 г. Мінск.

1. **«Максім Багдановіч».** Тэракота, вашчэнне. Дм. 6,5 см. 1981 г.
2. **Адваротны бок «Максім Багдановіч. 1891–1991».** Тэракота, вашчэнне. Дм. 6,5 см.1981 г.

*Зіменка Аляксандр Іванавіч.* 1946 г. Фаніпаль.

1. **Плакета па твору М. Багдановіча «Слуцкія ткачыхі»**. Кераміка, кал. паліва. 20,5×16,5 см. 1981 г.
2. **Плакета па твору М. Багдановіча «Стацім-лебедзь»**. Шамот, кал. паліва. 40×40 см. 1991 г.

*Костка Алесь Леанідавіч.* 1962 г. Мінск.

**«Максім Багдановіч. 1891–1917»**. Кераміка, вашчэнне. 8,5××6,5 см.

*Ларчанка Станіслаў Міронавіч.* 1938–2003 гг. Мінск.

**Плакета «Максім Багдановіч»**. Кераміка, дымленне. 15,5×12,5 см. 1981 г.

*Логвін Сяргей Анатольевіч.* 1959 г. Мінск.

**Памятная плакета да 90-годдзя Максіма Багдановіча. «І тчэ, забыўшыся, рука // Заміж персідскага ўзора // Цвяток радзімы васілька»**. Кераміка, вашчэнне. 14,5×14,5 см. 1981 г.

*Мурамцаў Генадзь Ільіч.* Прафесар, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. 1931 г. Мінск.

**Медальён «Максім Багдановіч. Яраслаўль 1909–1916»**. Гіпс таніраваны. Дм. 50 см. 1991 г.





*Несцярэўскі Мікалай Лаўрэнцьевіч.* 1931 г. Мінск.

**Памятны медальён да 135-годдзя Адама Ягоравіча Багдановіча**. Тэракота, вашчэнне. 17,5×14 см. 1997 г.

*Сташчанюк Віктар Пятровіч.* 1933 г. Мінск.

**Плакета «Летапісец». Паводле М. Багдановіча**. Медзь, выкалатка. 16×8 см.1991 г.

*Талбудзін Леў Іванавіч.* 1942 г. Мінск.

1. **Юбілейны медаль да 90-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча «Максім Багдановіч. 1891–1917»**. Бронза, ліццё. Дм. 7 см. 1981 г.
2. **Адваротны бок «Зорка Венера ўзышла над зямлёю, Светлыя згадкі з сабой прывяла»**. Кераміка. Дм. 7 см. 1981 г.

*Невядомы мастак*

**Юбілейны медаль да 90-годдзя з дня нараджэння Максіма Багдановіча. «Максім Багдановіч. 1891–1981».** Сілумін, штамп. Дм. 7,2 см.

## ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

### ПАШТОЎКІ, КАНВЕРТЫ

Выд. Міністэрства сувязі СССР: Гознак. Паштоўка. Афармленне *Е. Галубінскай.*

**«100 гадоў з дня нараджэння. Беларускі паэт Максім Багдановіч. 1891–1917»**. Фота., кал. друк. 14,5×10,5 см. 1991 г.

Выд. Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва (ЗША). Паштоўка.

**«Да 100-годдзя ад нараджэння беларускага паэта Максіма Багдановіча. 1891–1917»**. Фота., кал. друк. 14,5×10,5 см. 1991 г.

Выд. «Беларусь». Паштоўка. Афармленне *Міхаіла Баразны.*

**«Максім Багдановіч. 1891–1991»**. Фота., кал. друк. 14,5××10,5 см. 1991 г.

Выд. Клуба «Спадчына». Паштоўка. Афармленне *Анатоля Белага*.

**«Мінскі грамадска-асветніцкі клуб «Спадчына» віншуе Вас з 100-гадовымі ўгодкамі класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча. 1891–1991»**. Цынкаграфія. 14,5×10,5 см. 1991 г.

Выд. Таварыства Беларускай мовы імя Францыска Скарыны. Паштоўка. Афармленне *Ігара Марачкіна*.

**«9 снежня 2001 г. Максіму Багдановічу – 110». «Ён, гэты дзень, яшчэ настане – І ачуняе старана»!»**. Фота., кал. друк. 10×7 см. 2001 г.

Выд. Дабрачынны фонд «Талака» г. Баранавічы і гарадское аддзяленне ТБМ імя Францыска Скарыны. Паштоўка. Афармленне *Міхася Шостака*.

**«100 год з дня нараджэння. Максім Багдановіч»**. Фота., кал. друк. 10,5×14,5 см. 1991 г.

Выд. Міністэрства сувязі Беларусі. Канверт.

**«М. Багдановіч. 110 гадоў з дня нараджэння»**. 7×8 см. Афсетны друк. 2001 г.

**ВЫМПЕЛ**

*Саркісаў Сяргей Уладзіміравіч*. 1951 г. Мінск.

**«100 год з дня нараджэння. Максім Багдановіч»**. Тканіна, шоўкаграфія. 16×15 см. 1991 г.

**ЗНАЧКІ**

*Саркісаў Сяргей Уладзіміравіч*. 1951 г. Мінск.

**«100 год з дня нараджэння. Максім Багдановіч»**. Пластмаса. Дм. 4 см. 1991 г.

*Невядомы мастак.*

**«Максім Багдановіч»**. Сілумін, танір., штамп. 2,5×1,5 см. 1981 г.

**ЗАПРАШАЛЬНЫЯ БІЛЕТЫ, ЗАКЛАДКІ, ВІНЕТКІ**

*Басалыга Міхаіл Самуілавіч.* 1942 г. Мінск.

**Запрашенне на ўрачысты вечар, прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча**. Папера, фота, малюнак, кал. друк. 21×34 см. 1981 г.





*Саркісаў Сяргей Уладзіміравіч*. 1951 г. Мінск.

1. **Запрашенне на ўрачысты вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння Максіма Багдановіча**. Папера, малюнак, кал. друк. 9×18,3 см. 1991 г.
2. **Закладка, прысвечаная 100-годдзю М. Багдановіча**. Малюнак, кал. друк. 4×18,3 см. 1991 г.
3. **Вінетка, прысвечаная 100-годдзю М. Багдановіча**. Малюнак, кал. друк. 9×18,3 см. 1991 г.

*Сокалаў-Кубаў Генадзь Генадзіевіч*. 1942–1999 гг. Мінск.

**Запрашенне на вечар, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння вялікага беларускага паэта Максіма Багдановіча ў Доме літаратара**. Папера, тэхніка выцінанкі. 11,5×10,2 см. 1991 г.

*Якунін Уладзімір Міхайлавіч*. 1924 г. Гродна.

**Нізка закладак**. Выд. «Полымя». 19,5×5 см. 1991 г.

1. «Вось сімвал твой...»
2. «Не згасла сонца...»
3. «Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш»
4. «Ад родных ніў...»

## ПОМНІКІ, УСТАНОЎЛЕНЫЯ ПРЫ ЎДЗЕЛЕ АНАТОЛЯ БЕЛАГА Ў ГАРАДАХ БЕЛАРУСІ І РАСІІ

1. **«Максім Багдановіч»**. Медзь, выкалатка. 250×38×34 см.
   Устаноўлены 28 мая 1994 г. у г. Яраслаўлі.
   Кіраўнік праекта *Анатоль Белы*.
   Скульптар *Сяргей Вакар*.
2. **Бюст «Адам Ягоравіч Багдановіч»**. Бронза, ліццё.
   Устаноўлены 29 мая 1998 г. у г. п. Халопенічы.
   Кіраўнік праекта *Анатоль Белы*.
   Скульптар *Уладзімір Лятун*.
3. **Бюст «Адам Ягоравіч Багдановіч»**. Сілумін, ліццё. 90×60×50 см. 1997 г.
   Устаноўлены 1 верасня 2001 г. у г. Старыя Дарогі на сядзібе Музея выяўленчага мастацтва фонд Анатоля Белага.
   Кіраўнік праекта *Анатоль Белы*.
   Скульптар *Мікола Несцярэўскі*.

4. **Бюст «Максім Багдановіч»**. Медзь, выкалатка. 50×38×34 см. 1994 г.

Устаноўлены 1 верасня 2001 г. у г. Старыя Дарогі на сядзібе Музея выяўленчага мастацтва фонд Анатоля Белага.

Кіраўнік праекта *Анатоль Белы*.

Скульптар *Сяргей Вакар*.



# ЗМЕСТ

Замест прадмовы....5

ЯРАСЛАЎЛЬ У ЛЁСЕ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА (МАКСІМАВА ЯРАСЛАВІЯ)

Цвяток радзімы — васілёк....13
«Я, бальны, бесскрыдлаты паэт»....19
«Шмат у нашым жыцці ёсць дарог»....25
«Ўчора шчасце толькі глянула нясмела»....35
«Заціхніце, мукі кахання...»....44
«Я не самотны, я кнігу маю»....52
«Ты не згаснеш, ясная заранічка»....59
Перапісчык....70
Паклiканы Адраджэннем....75
Сны аб Беларусі....83
Мастацкая публіцыстыка Максіма Багдановіча....88
Псеўданімы Максіма Багдановіча....96

МАКСІМАВА «АДЫСЕЯ»

Новыя творы Максіма-кніжніка....101
З чаго пачыналася мая Ярославія....106
Пра невядомыя творы Максіма-кніжніка....111
Ці справядлівыя папрокі?....113
Гісторыя адной знаходкі....118
Дом Максіма Багдановіча: ці будзе ў ім музей?....120
Хто ратаваў дом Максіма Багдановіча....125
1891-1991 Багдановічаўскі каляндар....128
Вяртанне....133

**ДАДАТАК**

«Голос» ..... 145

«Микроскоп» ..... 147

Вобраз Максіма Багдановіча
ў выяўленчым мастацтве Беларусі ..... 150

Каталог мастацкіх твораў, прысвечаных
Максіму Багдановічу, са збору Анатоля Белага
ў Музеі выяўленчага мастацтва ў г. Старыя Дарогі ..... 163

Фотадакументы ..... 173

**Белая** Святлана Анатольеўна

**Яраслаўль у лёсе**
**Максіма Багдановіча**
(дакументальнае эсэ)

Рэдактар *Анатоль Белы*
Камп'ютэрная вёрстка *Вадзім Нога*

Падпісана ў друк 24.01.2006. Фармат 84х108/32. Папера афсетная.
Гарнітура Times New Roman, Classic Russian. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 10,2. Ул.-выд. арк. 9,1. Наклад 299 асобнікаў. Заказ 000.

Надрукавана з арыгінал-макета заказчыка ў друкарні
ПУП Ходр БелТІЗ. 220004, г. Мінск, вул. Вызвалення, 9.
Спецыяльны дазвол (ліцэнзія) № 02330/0056661 ад 29.03.2004.